Валеры Гапееў

# Я размалюю для цябе неба

Валеры Гапееў

# Я размалюю для цябе неба

*Аповесць, п'еса, апавяданні*
*Рэальнасць, містыка, фантастыка*

Мінск
«Мастацкая літаратура»
2013

УДК 821.161.3-31/-32
ББК 84(4Беи)-44
Г19

ISBN 978-985-02-1377-8

© Гапееў В. М., 2013
© Афармленне. УП «Мастацкая літаратура», 2013

# КСЮХІНА ПОЛЕ

*Кароткая аповесць*

## 1

— Баб, чаго мяне бацька так ненавідзіць?

Баба Каця абірала маладую бульбу і, здалося, пытання не пачула — усё так жа старанна і спрытна церла нажом, галавы не павярнула: на твары ні жылка не варухнулася.

Але Сяргей не стаў паўтараць сваё пытанне — ён дакладна ведаў, што бабуля яго пачула. І таму спакойна працягваў прывязваць гачык да вуды.

Бацька быў учора. Добра выпіўшы, ён прыехаў сюды з нейкім сваім таварышам. Сяргей быў у двары — акурат скроб рыбу, што налавіў у невялікай копанцы за бабуліным агародам. Меншую баба засмажыць, а што большая — Сяргей сушыць. Слаба бярэ карась у копанцы. Вось у рацэ — плотка, акунь, шчупак выходзіць на паляванне! На шчупака спінінг трэба, ды спінінг Сяргею паабяцаў адзін мясцовы даць на месяц...

Бацька нейкі час, скрывіўшы рот у п'янай усмешцы, назіраў за Сяргеем, потым са злосцю выціснуў:

— Гляджу, байструк, няблага ўладкаваўся!

Што было нечаканым для Сяргея — бацька (як казаў Сяргею меншы брат) літаральна ў ладкі

пляскаў, калі Сяргей два месяцы таму не вярнуўся ў кватэру ні праз дзень, ні праз тыдзень. Нечаканай для Сяргея была і рэакцыя бабы Каці: калі тым ранкам пасля праведзенай ля вогнішча ночы адмахаў шашою дванаццаць кіламетраў да бабулінай хаты і яна пабачыла яго ў веснічках стомленага, нявыспанага, адно што спытала:

— Няўжо пешкі, унучак?

— Пешкі, баб,— адказаў Сяргей і, зачыніўшы веснічкі за сабой, спытаў-папрасіў: — Пусціш жыць, бабуля? З бацькам нельга ўжыцца...

Баба Каця зірнула на яго пільна і адказала з уздыхам:

— То што ж, жыві...

Прыязджала маці. Прывезла з сабой рэчы Сяргея. Не ўгаворвала, не плакала. Толькі сум у вачах, глыбокі, аж зацягвае, ды пакорлівасць у кожным руху...

Маці прыязджала на кожныя выхадныя. Разам з малодшым братам Сяргея, дзесяцігадовым Юркам.

І вось — бацька. Недзе на душы ў Сяргея заставалася надзея на прымірэнне. Вось калі б бацька зайшоў і сказаў: «Ну, сын, што было, тое прайшло. Я вінаваты, ды і ты не божая аладка. Давай забудзем — ды будзем жыць далей...» — усё б змянілася. Сяргей гатовы быў дараваць. І прызнаць сваю віну — няхай ён і мог яе аспрэчваць...

Але ў бацькі, гэта было відавочна, толькі дадалося нянавісці да яго, Сяргея:

— Бач ты яго, незалежны які стаў, вырадак зарэчанскі...

Сяргея перасмыкнула. І не столькі ад «байстрюка» — і раней такое чуў ад бацькі, колькі ад той злой нянавісці, на якой быў настоены п'яны голас.

— Які ён табе байструк? — нечакана пачуўся гнеўны крык бабы Каці. Яна выйшла на голас з ся-

нец.— Сын ён твой, калі ты за гарэлкай свету белага не бачыш і дзяцей сваіх.

— Маўчы, карга старая,— абыякава адмахнуўся ад яе бацька Сяргея.— Ключы давай ад хлява, дзе мая салярка стаіць.

— Ідзі, забірай,— баба Каця рашуча прайшла цераз невялікі двор да хлеўчука.— Забірай, і каб нагі тваёй больш не было на маім двары.

— Калі захачу, тады зайду,— пасмейваўся бацька, выносячы з хлеўчука дзве каністры з дызпалівам.— Ты мне яшчэ даплачваць павінна, што тваю дачку ўзяў і во байструка выгадаваў.

— Цьфу на цябе! — плюнула ўслед яму баба.— Каб ты не даехаў, куды б ты ні ехаў!

— Ты кляні мацней,— выскаліўся бацька.— Мне тады больш шанцуе!

Учора Сяргей нічога не стаў пытацца. І сёння б не стаў, і наагул бы — не пытаўся. Але чамусьці ўрэзалася ў свядомасць двойчы паўторанае бацькава слова «байструк». Было — і раней бацька вызвераўся з-за якой дробязі на Сяргея, зрывалася гэтае ганебнае слоўца з ягоных вуснаў. Але тады бываў бацька куды больш п'яны. І не было столькі нянавісці.

Калі першы раз бацька так абазваў Сяргея (прынамсі, калі Сяргей гэта свядома запомніў), ён ужо ведаў, што гэта слова азначае. І здзівіўся тады, што маці змаўчала. Не сказала ніводнага слова супраць! Быццам і насамрэч Сяргей не ў законным шлюбе народжанае дзіця, а да замужжа маці на свет з'явіўся. Нібыта нагуляла яго маці невядома з кім. Дык жа потым адумысна цікавіўся Сяргей, крадком зазірнуўшы ў сямейныя дакументы: ён нарадзіўся праз два гады пасля шлюбу! Чаму ж змаўчала маці? Чаму трывае п'яныя прыдзіркі, ніколі не пярэчыць, чаму моўчкі гатуе яму сняданак і полудзень, гатавала

нават пасля той ночы, калі ў п'яным бяспамяцтве і раз'юшанасці бацька біў посуд, цягаў яе самую за валасы і патрабаваў нечага?

У маці Сяргей спытацца не мог — нешта ўнутры яго стрымлівала ад простага, на першы погляд, пытання: чаму бацька называе яго байструком?

Ён бы і ў бабулі вось так наўпрост не стаў пытацца. Пытанне: «Чаму ён мяне так ненавідзіць?» — узнікла само па сабе, Сяргей і выдыхнуў яго адразу.

Баба Каця спаласнула нож, адклала ўбок, выцерла рукі аб фартух, прысела. Сяргей адчуў хваляванне і напружанне — тое, што бабуля столькі часу маўчала, не спяшалася з адказам, падказвала яму: ён зараз пачуе нешта надзвычай важнае для сябе.

— Хай лепш ад родных пачуеш, чым ад людзей,— ціха прамовіла бабуля.— Ды і бацька твой розум зусім згубіў. Думалі — час усё зраўнуе, загладзіць, аднак жа во як выйшла — з дому цябе выгнаў...

— Я сам пайшоў,— запярэчыў ціха Сяргей.

— Што дзеці робяць — тое бацькі думаюць,— адказала на гэтае пярэчанне баба.— Дачушка мая, твая маці, з суседам нашым сябравала. Добры хлопец быў, самастойны. Дужа яны сябравалі, ужо і пра вяселле пачалі пагаворваць. Толік, хлопец гэты, сабраўся ў Сібір, на заробкі. Ліда, маці твая, супраць была, ды і я адгаворвала, і бацькі яго. А ён жа — ні ў якую! Паехаў на цэлых паўгода. Ліда вучылішча акурат скончыла, на працу ў горад пайшла. Вярнуўся Толік з добрымі грашыма, ды зноў сабраўся ехаць. А Ліда супраць — не пушчу, калі са мной жыць збіраешся, то і паслухай адразу. От яны і пасварыліся. Ды і дужа пасварыліся, Толік праз тыдзень — зноў у Сібір. І аж на цэлы год. А Лідка — замуж, за бацьку твайго. Адгаворвала я яе, а толку ніякага. Месяц пасустракаліся — і вяселле.

Хоць якое там вяселле... Жылі... Неяк жылі, напачатку быццам і добра. Толькі Лідка ніяк зацяжарыць не магла. А праз год Толік з Сібіры прыехаў. Лідка якраз ў адпачынку была, тут, у мяне. То Толік ці не штовечар прыходзіў: і на калені станавіўся, і кляўся, і абяцаў. Грошай ён шмат зарабіў, ашчаджаў там. Доўга яны між сабой гаварылі. Лідка нічога пра гэтыя размовы мне не апавядала. Аднаго разу сабралася і, маўклівая, вусны сціснула — падалася ў горад да мужа. Вярнулася праз тры дні і ў той вечар Толіка на двор не пусціла. Чула, сказала яму: «Не, позна». А бацьку твайму ці то сама што наказала, а ў таго на п'яны розум усё шыварат-навыварат выйшла, ці мо суседзі добрыя данеслі. Прыехаў... Выпіўшы добра. То і быў тут сорам на ўсю вёску: з Толікам яны пабіліся. Толік яму твар збіў на горкі яблык. На суткі яго былі пасадзілі. Адбыў суткі — і з'ехаў. Прыязджае раз у год цяпер. Пуцёвым чалавекам стаў, ды адзін, так і не ажаніўся. Пытаюся — смяецца, аднолюб, кажа, усё чакаю...

А ты от акурат праз дзевяць месяцаў пасля той бойкі і нарадзіўся. Лекары казалі, што неданасіла цябе Лідка паўмесяца цэлых. Ды бацька твой пра гэта слухаць не слухаў: не мой сын, ад Толіка. Ты і маленькім да бацькі падобным не быў: і вочы, і валасы цёмныя — ад маёй маці, тваёй прабабкі. Ды як на тое і Толік жа цыганаваты. А бацька твой руды, тварам шырокі, нос пляскаты, вялікі, а ў цябе ў маленстве такі тварык файны быў, бы ў лялькі. І цяпер во які...

— Дык чаго маўчыць маці? — Сяргей проста выкрыкнуў гэтыя словы, ад пачутага ён і не ведаў, што думаць. Усё блыталася ў галаве. І недзе далёка, бы за хмарай маланка пранеслася адна, усё апальваючы сабой, думка: а калі б яго бацькам быў дзядзька Толік?

Гэтага суседа бабы Каці Сяргей ведаў. І нават здружыўся з ім летась — разам рыбачылі на рэчцы. І менавіта дзядзька Толік абяцаў Сяргею спінінг. Ён павінен прыехаць праз тыдзень-другі — так казала баба Марыя, ягоная маці.

— Чаго маўчыць, чаго маўчыць,— нечакана раздражнёна загаварыла баба Каця.— Як замуж пайшла — так і маўчыць. Нічога мне не кажа. Колькі прасіла, яшчэ толькі пабачыла, што за жыццё ў іх пачалося, казала-прасіла: кідай, не будзе ладу. Ды дзе там! Хто ж мяне старую-дурную слухаць будзе. От жыў бы Сцяпан, сказаў бы сваё слова...

Дзед Сцяпан памёр рана — Сяргей яго не памятае, мо два гады яму тады было. Казала маці, што быў яе бацька надта ж строгі, яна яго пабойвалася, калі і дзеўкай была, і хто ведае, як бы з тым замужжам яе было, каб не хварэў тады дзед Сцяпан і апошнія пяць гадоў свайго жыцця нікому ні ў чым не пярэчыў, з усім згаджаўся, быццам тым самым апраўдваўся перад сваімі хатнімі за столькі гадоў беспярэчнай улады свайго слова над імі.

У гэтую ноч Сяргей ніяк не мог заснуць. Чаму маўчыць і трывае маці? Вельмі просты і зразумелы напрошваўся адказ: трывае, бо вінаватая. І калі так, то сапраўдны бацька Сяргея — дзядзька Толік. Але што далей?

## 2

Вось гэта пашанцавала! Першы раз пайшоў Сяргей рыбачыць на рэчку — і так бярэ. У невялікай затоцы (яе летась паказаў Сяргею дзядзька Толік) акуні хапалі гачок, не паспяваў яшчэ добра стаць на вадзе паплавок. Ды такія ладныя ўсе, адзін у адзін. Потым бы распужаў хто акунёў. Сяргей прайшоў крыху далей, да зарасніку чароту. Тут пачала браць плотка.

Эх, пра такую рыбалку толькі марыць!

Сонца яшчэ не высока, ледзьве грэе сваімі прамянямі. Над вадой цячэ, перавальваецца клубамі сівы туман. Ціша да звону ў вушах. Шырокая роўная плынь ракі — як застыла вада. Гачык з прынадай кладзецца на ваду бязгучна, адна невялікая хвалька роўным кругам не дабягае да сярэдзіны ракі, губляецца ў спакойнай магутнай плыні. Варухнуўся паплавок і адразу булькнуў уніз напалову, вынырнуў, паківаўся, бы жывая істота, раздумваючы: што рабіць далей — знерухомець ці нырцануць углыб? Ці памкнуцца ўправа, у чарот, імкліва набіраючы хуткасць, або ўлева — на роўнядзь?..

Сяргей асабліва любіў вось такія моманты, калі за першай спробай плотка брала прынаду пасапраўднаму, калі так важна было ўгадаць, не — інтуітыўна адчуць, што вось ён — найлепшы момант падсечкі!

І з кароткім усплёскам узлятае над цёплай вадой трапяткая стужка срэбра, блішчыць на сонцы кожнай лускавінкай, аж вочы прымружваеш...

Васьмілітровае вядзерца поўнае — плоткі, акуні, колькі карасёў, дзясятак прыгажуноў язёў...

Бабы дома не было — пайшла па чарніцы. Першыя ягады паспявалі на сонечных палянах, і першыя слоікі напоўненыя стаялі на зэдліках узбоч недалёкай ад вёскі шашэйнай дарогі, і першыя рублі зараблялі вяскоўцы сваім няхітрым «ягадным бізнесам».

Сяргей не любіў збіраць ягады. Вось грыбы — іншая справа. Баба Каця яму напаказвала такіх патаемных мясцін, адкуль з пустым кошыкам не вернешся ні ў якую пару. Ці сухмень будзе, ці вымачыць, а ў тых мясцінах грыбы растуць. Але яшчэ не падышлі добра грыбы.

З задавальненнем Сяргей выпатрашыў рыбу, засаліў вялікіх акунёў, большых плотак. Рэшту —

смажыць. Хто не спрабаваў, таму не апавядзеш, якой смачнай бывае смажаная рыба, толькі злоўленая, што яшчэ гадзіну-дзве назад гуляла ў рэчцы.

Сяргей смажыў рыбу ля невялікай лазні, якую рабіў некалі дзед Сцяпан. Тут раней і бацька з сябрамі ладзілі баляванне: смажылі шашлыкі, пілі гарэлку і разбаўлены спірт. Пад старой яблыняй, якая зялёным шатром навісла над лазняй, было месца для вогнішча з невялікім столікам і трыма нізкімі лаўкамі. Тут זацішна і вельмі ўтульна. З трох бакоў ад чужога вока затулялі месца хата, густы малліннік, хлеў, а з чацвёртага боку адкрываўся далягляд на раку, лугі, цёмна-сінюю паску далёкага лесу.

Сяргей прынёс дроў, расклаў агонь. Алей, мука, цыбуля, рыба — на століку. Талеркі прынёс, патэльню разагрэў...

Ух, пах які пайшоў! Аж у ноздрах заказытала і жывот адгукнуўся вуркатаннем у прадчуванні смачнай ежы. Не дзіва — у роце яшчэ каліва не было, калі не лічыць пары яблыкаў...

Першую патэльню засмажыў, пераклаў гатовую рыбу ў залацістай хрумсткай скарыначцы на талерку.

— Дай паесці!

Сяргей уздрыгнуў і павярнуўся на голас. Ля зарасніку малінніку стаяла дзяўчо ў кароткай нясвежай саколцы і вылінялых джынсах. Хударлявая, гадоў пятнаццаці. Акуратны, але праставаты твар, тонкія вусны, пад выразнымі светлымі бровамі — глыбока пасаджаныя, прымружаныя неяк занадта вочы, зрэнкі якіх не сунімаліся — бегалі, бегалі бы ў пошуку небяспекі. Ці чаго патрэбнага, прынаднага. Чарнявыя валасы падрэзаныя па плечы, добра не расчасаныя. Што ўразіла — колер скуры твару: нейкі шараваты. Загар такі ці што?

Можна было б сказаць пра яе твар «мілавідны», аднак позірк вачэй быў настолькі па-дзіцячы непасрэдны, залішне просты, што складвалася ўражанне, быццам дзяўчыне гадоў сем-восем. Ды яшчэ заўсёдна прыадчыненыя ці то ва ўсмешцы, ці то ў нейкай грымасе вусны выглядалі ненатуральнымі...

— Цябе што, закляніла? — насмешліва перапытала дзяўчына.— Паесці дай!

— Ідзі рукі мый,— адказаў Сяргей, бо нечакана для сябе найбольш звярнуў увагу на яе сапраўды брудныя рукі.

— Яны чыстыя, а гэта,— дзяўчына раскрыла да Сяргея далоні ў зялёна-бурых плямах,— не адмываецца.

— Ну, то ідзі еш,— сказаў Сяргей.

З'яўленне гэтай дзяўчынкі збянтэжыла яго: хто яна такая? Адкуль тут узялася?

— Ты хто? — спытаўся ён.

Дзяўчына ўжо ела, як па-сапраўднаму згаладалы чалавек: спрытна абірала зубамі мяса з рыбін, набівала поўны рот, жавала хутка-хутка, глытала і адразу брала другую рыбіну.

— Хі-хі-хі-хі,— нечакана захіхікала яна.— Дзеўка я. Паказаць?

— Я бачу, што не мужык,— яшчэ больш разгубіўся Сяргей ад такога адказу.— Ды не спяшайся, я хлеба прынясу.

— Ага, нясі,— з набітым ротам адказала дзяўчына.

Сяргей павярнуў рыбу, што смажылася на патэльні, пайшоў у хату па хлеб.

Калі вярнуўся, дзяўчына ўсё прагна ела, абсмоктваючы пальцы. «Адкуль яна на маю галаву і маю рыбу? Патэльню рыбы ўклала...»

Папраўдзе, рыбы было не асабліва шкада — яшчэ патэльні на дзве будзе, хопіць яму з бабай. Але як так можна бесцырымонна, нахабна проста

прыйсці на чужы двор і літаральна патрабаваць, каб цябе пакармілі? «Такая з голаду дакладна не памрэ»,— падумалася з усмешкай, і гэтая думка развесяліла: вось жа, не думаў, не чакаў, што сустрэнецца і з такім чалавекам...

— Чакай, хлеб вазьмі... Ды не спяшайся, падавішся,— Сяргей адкраіў пару лустаў хлеба.— Не буду ведаць, куды труп несці.

— Які труп? — збянтэжана спынілася дзяўчына.

— Твой,— без жарту адказаў Сяргей.— Як падавішся, хто цябе хаваць павінен?

— Во ім,— выгукнула дзяўчына і паказала кукіш у бок малінніку.— Я іх сама ўсіх перахаваю.

— Гэта каго — усіх?

— Бацьку, мачыху, дачку яе,— пачала пералічваць дзяўчына.— Фільку дурнога, Веньку-сволач...

— Чаго Філька дурны?

— Таму што. Зловіць, зацісне ў кут, лапае, сліну пускае. І не выдзярэшся, бо здаровы,— пакрывілася ад успамінаў дзяўчына.— А ты сам рыбу лавіў?

— Сам,— адказаў Сяргей, яшчэ больш разгубленыы словамі дзяўчыны.— Ты можаш па-чалавечы сказаць: хто ты і адкуль?

— Ксюха я... — дзяўчына абсмактала пальцы, хутка выцерла іх аб джынсы, стомлена села на нізкую лаўку.— О, як я наелася... Ты яшчэ доўга рыбу смажыць будзеш?

— Пакуль усю не засмажу...

— А-а, добра, перадыхну.

— Перад чым перадыхнеш? — не зразумеў Сяргей.— Збіраешся ўсю рыбу з'есці? Не, усёй не дам. Нам з бабай таксама паесці рыбы хочацца.

— Я рыбы наелася. У рабы запісвацца не буду, уцякаць не хачу. Ты ж мяне ціскаць будзеш тады, як усю пасмажыш?

Сяргей аж застыў, абвальваючы плотку ў муцэ.

— З якога ляду мне цябе ціскаць?

— Як — з якога? — са здзіўленнем у голасе перапытала дзяўчына, быццам Сяргей не ведаў самых простых рэчаў. Працягнула з лёгкім раздражненнем настаўніцы, перад якой тупаватае дзіця: — Паводле правілаў: накарміў смачным — маеш права. Бо ў мяне больш няма нічога.

Сяргей пільна зірнуў на дзяўчыну, і мо першы раз яны так доўга глядзелі адно аднаму ў вочы. Вочы Ксюхі былі шэра-блакітныя, у іх не было ніякай хітрасці — толькі лёгкае здзіўленне: што за дзівак гэты хлопец?

— Так,— сказаў Сяргей сур'ёзна.— Давай, Ксюха, я буду задаваць табе пытанні, а ты — адказвай. Не хочаш — ідзі адсюль, туды, адкуль прыйшла.

— Ну, задавай,— Ксюха пацепнула плячыма, усім сваім выглядам паказваючы гатоўнасць цярпліва тлумачыць гэтаму не сквапнаму, але такому бесталковаму хлопцу надзённыя правілы жыцця.

— Добра,— Сяргей не стаў спяшацца, спакойна зняў гатовую рыбу з патэльні, накладваў новую порцыю.

— Дзе гэта такія правілы ёсць, каб за ежу ды нешта там аддаваць?

— Як — дзе? У нас,— адказала дзяўчына.— Ну, можна ў рабы запісацца, з пасылкі разлічыцца... Але ў рабах адзін раз пабыла, ну яго, цяжка дзень лётаць. А пасылкі не прыходзяць.

— «У нас»— гэта дзе? — цярпліва перапытаў Сяргей.— У якім месцы?

— Ну, ты праўда мехам прыплюхнуты,— дзяўчына аж запсіхавала.— У інтэрнаце, дзе яшчэ?

— Інтэрнатаў шмат розных...

— От жа! У нашым інтэрнаце, для дэбілаў і псіхаў.

— А ты хто?

— Я — псіх,— проста адказала дзяўчына.

— Зразумела,— прамовіў Сяргей, хоць яму ніколькі не стала зразумела.— Што, цябе не кормяць там?

— Кормяць. Але ж смачнага хочацца.

— Ты казала пра мачыху. А маці дзе?

— П'яная пад цягнік кінулася, мне два гады было. Гэта я з-за яе такая.

— Якая?

— Ну, псіх. Яна піла, пакуль мяне насіла. А я чытаць не ўмею.

— Брэшаш...

— Ага, брашу,— засмяялася дзяўчына.— Умею, навучылі. А рашаць задачкі не магу. Як толькі пачну думаць — адразу галава кружыцца.

— А ты чыя? Я цябе ў вёсцы раней не бачыў.

— А мяне бацька да цёткі прывёз. Ну, гэта сястра маёй маці. Цётка — скнара, грошы хавае. Учора з полудня напілася, я толькі яблыкі ела.

— Так, няблага табе жывецца... — працягнуў Сяргей.— Даўно ты ў інтэрнаце?

— Я там жыву. На лета бацька забіраў раней, а цяпер яны ўсе на мора паехалі, а мяне — да цёткі. Добра тут у цябе... — Дзяўчына лягла на лаўку бокам, з цікавасцю назірала за Сяргеем.— Нейкі ты не злы, і рыбу гатуеш смачна. І прыгожы ты. Вочы такія чорныя і зусім не страшныя. І валасы чорныя, прыгожыя. Як цыган... І твар чысты. У нашых хлопцаў усё ў скулках, асабліва лоб і падбароддзе... Мабыць, у цябе дзевак шмат. Шмат, а?

— Абыходжуся без дзевак,— рэзка адказаў Сяргей.

— Мне праз паўгода сямнаццаць будзе,— пакрыўджана адказала дзяўчына.— Я проста худая... А цалавацца ўмею...

— Ды замаўчы ты!..— усур'ёз зазлаваў Сяргей.

І дзяўчына нечакана ў адзін момант сцялася ў камячок, як у чаканні ўдару.

Настрой у Сяргея сапсаваўся. Напачатку яму было цікава даведацца, хто такая гэтая дзяўчына, адкуль яна, прыемна было і адчуць задавальненне ад таго, што накарміў яе. І раптам перад ім адкрыўся невядомы яму раней бок чалавечага жыцця, вычварны, нечаканы ў сваёй агіднасці, проста неверагодны, каб быць сапраўдным. Але ўспомнілася, як настаўнік фізікі пераказваў ім словы аднаго вядомага чалавека: «Гэта настолькі неверагодна, што можа быць рэальным». І значыцца, аповед гэтай Ксюхі — самая што ні на ёсць рэальнасць.

Нейкі час Сяргей маўчаў, стараўся не глядзець на дзяўчыну. Яна таксама сцішылася. Праз колькі хвілін Сяргей скончыў смажыць рыбу. Зірнуў на лаўку — Ксюха ляжала, заплюснуўшы вочы, роўна дыхала. Ну, далібог — спала! Сяргей міжволі сцішыўся сам, прысеў каля вогнішча насупраць, запаліў. Самому есці нешта расхацелася.

От жа скажы, якая моцная рэч — параўнанне. Дзень таму, ды што дзень — гадзіну таму, калі скрэб рыбу і ўспамінаў, як піў тут бацька са сваімі сябрукамі, Сяргея гняла думка: чаму бацькі яго аднакласнікаў гатуюць шашлыкі з сынамі для ўсёй сям'і? У чым ён вінаваты, што бацька не прызнае яго за свайго сына? Лёгка з такім жыць? І вось прыйшла Ксюха. Тут выявілася, што чорны колер мае градацыі: больш чорны, менш чорны...

Параўнаць яго, Сяргея, жыццё з жыццём таго ж Юрыя Хаванскага, дык Сяргей жыве — горай не бывае. А як цяпер паставіць побач праблемы Сяргея і праблемы гэтай хударлявай Ксюхі?

«Паказчыкі любой сістэмы залежаць ад пункту адліку». Вось і скажы цяпер, што фізіка не мае дачынення да жыцця.

Асцярожна прыкрыў гатовую рыбу талеркай згары, прыбраў на століку — неўзабаве баба Каця павінна вярнуцца з ягад, акурат тут і папалуднуюць. Ксюха насамрэч спала, нават не варухнулася.

Але калі Сяргей адлучыўся ў хату і там забавіўся — мыў талерку і патэльню, дзяўчына знікла.

Сяргей толькі пацiснуў плячыма — і добра, клопату меней, але потым зірнуў на столік. Паловы бохана хлеба не было, засталіся толькі адрэзаныя Сяргеем лусты. Падняў талерку — смажаных рыбак паменела на трэць. «Што з табой зробіш...» — уздыхнуў Сяргей.

Не было ні злосці, ні прыкрасці: няхай наядаецца. Без страху нечым плаціць.

## 3

— Ета ж Алены-нябожчыцы дачка,— тлумачыла баба Каця Сяргею, калі ён апавёў пра дзіўны «візіт дамы» на іх агарод.— Бацька піў, маці піла, то і дочкі той самаю сцежкаю... Алена маладзейшая была, замуж выйшла, нарадзіла во дзіця на гора. Муж яе моцна біў. Казалі, у горадзе пад цягнік кінулася. А старэйшая, Зіна, доўга ў дзеўках сядзела... Чапляліся да яе розныя, на месяц-другі. Потым распісалася з адным. От, было ліха на вёску... У нейкую ноч увесь мак на агародах павыдзіралі. І я маку шмат садзіла. З ім пірагі заўсёды пякла. А то ж набрыдзь гэтая яго павыдзірала. Пайшлі бабы да яго сварыцца, а там іх — кагал цэлы, маладыя, а вочы — бы шкляныя, такія страшныя... Участковы быў прыехаў, то разагнаў тое кодла. Ды ненадоўга... Збіраліся па начах, на агародах людскіх шнырылі, усё той мак шукалі. То нам міліцыя забараніла яго сеяць. А адзін год міліцыя прыехала, дык на пляцы адным, там старая Ганна жыла, каноплі знайшла.

Ірвалі яе, потым палілі — не прадыхнуць было. Ды Зінка са сваім усё адно недзе тыя каноплі вырошчваюць — як ноч, так і цягнуцца да іх аднекуль гэтыя, з вачыма шклянымі. І грошы мае Зінка, каб штодзень піць... Прытон тама,— сумна закончыла баба Каця і нечакана з надрывам папрасіла: — То ўнучак родненькі, толькі ж ты з імі не знайся, не хадзі туды! І дзеўку гэтую накарміў, ды гані! Бо звядзе, вой звядзе...

— Ды ну цябе, баб! — псіхануў Сяргей.— Я што табе — нарык? Ці ў мяне галавы ўжо няма? Не збіраюся я ні паліць, ні калоцца.

— То і добра, унучак, то і добра,— заспяшала баба.— Там жа такія маладыя, здаровыя, толькі жыццё пачынаецца, а ў вачах ужо ні розуму, ні жадання. Пустыя вочы...

— Што, ты па вачах чалавека вызначаеш? — спытаў Сяргей, абы каб перавесці размову на іншую тэму.

— А то як жа іначай,— упэўнена адказала баба Каця.— Глядзі чалавеку ў вочы — усё зразумееш. Што ў чалавека ўсярэдзіне — тое ў вачах...

Сонца пачало хіліцца да захаду — Сяргей зноў пачаў збірацца на рыбалку. Пайшоў на сваё ранішняе месца.

Бралася куды слабей, затое акуні былі большыя, так ірваліся пры падсечках, што Сяргей стаў пабойвацца за лёску — ён жа пачапіў старую, якую яшчэ год таму набывала маці. Сонца пляскатым яскрава-чырвоным дыскам павольна апускалася да зямлі, павялічваючыся ў памерах і губляючы свой бляск, набрыняла барвовасцю. У гэтым відовішчы было нешта страшнаватае: здавалася, што сонца, крануўшыся зямлі, наагул пачарнее.

За спінай пачулася шорганне — нехта ішоў. Сяргей няспешна азірнуўся — і ёкнула ўсярэдзіне:

да затокі набліжаўся сусед бабы Каці — дзядзька Толік.

Ён здаля яшчэ пазнаў Сяргея — шырокая ўсмешка на твары і ўзнятая ў прывітанні правая рука.

Падышоў, прыветна ўсміхаючыся, працягнуў руку:

— Ну, здароў быў, зямляк. А я іду і думаю: хто гэта на нашым месцы рыбачыць?

— Добры вечар,— Сяргей пацiснуў працягнутую руку і адчуў на сваёй моцны мужчынскі поціск. Яго раптоўна ўсхвалявалі словы дзядзькі — «наша месца».

— Ну, як тут сёння? — дзядзька прысеў, запаліў, не спяшаючыся размотваць вуды.

— Нармалёва,— адказаў Сяргей.— Раніцай дык не паспяваў закідваць: акунь браў, туды пад чарот — плотка. Язёў колькі... І цяпер не блага — за гадзіну во дзясятак падняў,— Сяргей кіўнуў на вядзерца.

— Малайца... — Дзядзька запусціў руку ў вядзерца, дастаў акуня.— Бач, прыгажун які... Ну, дарэмна я тады спінінг не ўзяў. Ат, заўтра на зорцы ранішняй прыйдзем. Прыйдзем?

— Прыйду,— махнуў галавой у адказ Сяргей і ў гэты момант падсек — вялікі, мо найбольшы са злоўленых, акунь ірваўся на лёсцы.

— Ах ты... — Дзядзька патушыў цыгарэту, устаў на ногі.— Чаго ж я сяджу, калі ты маіх акунёў цягаеш?

Сяргей толькі ўсміхнуўся. Дзядзька закінуў вуды, адышоўшы крокаў на пяць ад Сяргея. І адразу ў яго стала браць, падсек — і невялікая плотка засерабрылася ў промнях заходзячага сонца.

— З пачынам! — павіншаваў Сяргей з усмешкай.

— Ага! — весела адказаў дзядзька і хапіўся за другую вуду, падсек — і выцягнуў ладнага акуня.— От,

адразу пара! Ну, жаніцеся,— ён зачэрпнуў вады ў цэлафанавы мяшэчак, пусціў туды рыбін.

Недзе з гадзіну рыбачылі моўчкі. Калі сонца схавалася цалкам і ад ракі пацягнула сырой прахалодай, дзядзька гукнуў Сяргея:

— Ну што, збіраемся!

— Ды ўжо,— згадзіўся Сяргей, зрабіў закід і запаліў.

Дзядзька падышоў да яго з ужо складзенымі вудамі і мяшэчкам з рыбай — няблага нашморгаў. Прысеў побач, запаліў сам.

— Даўно паліш? — спытаў Сяргея.

— Не, паўгода,— адказаў той.

— Значыцца, з шаснаццаці гадоў?

— Ага,— кіўнуў Сяргей.— Бо я маці паабяцаў, што да шаснаццаці паліць не буду.

— Стрымаў слова, значыцца... Як там маці? Як сам?

— Фігова,— шчыра адказаў Сяргей, бо адчуў сур'ёзную шчырасць у пытанні.— Я ў бабы яшчэ ад траўня жыву. З бацькам пасварыўся. На вечар не пускаў п'яны, кінуўся з гумавым шлангам біцца. Ну... Я той шланг выхапіў, яму руку закруціў, тауханўў. Ён жа п'яны... упаў. А мамка... Маўчыць і маўчыць. Трывае. Бацька накідваецца штодзень, пачынае правы качаць.

— Дык што ж ты адну маці там кінуў? — лёгка ўпікнуў дзядзька Сяргея.

— Калі я там — там куды страшней. Ненавідзіць ён мяне. З-за мяне і скандалы.

Дзядзька маўчаў у адказ. Маўчаў і Сяргей, назіраючы за паплаўком, які павольна выпісваў невялікія кругі — моладзь гулялася з паплаўком...

Дзядзька запаліў другую цыгарэту.

Сяргей вырашыў, што мае права спытаць — і спытаў, не стаў пакідаць пытанне ў глыбіні

свядомасці, бо даўно ўжо зразумеў простае правіла: супалі жаданне і магчымасць — то пытай і рабі. Адкладзеш, потым адно з адным доўга разам не збягуцца.

— Дзядзь Толь, мяне бацька байструком абзывае,— пачаў Сяргей, не паварочваючы галавы да мужчыны, скіраваўшы позірк на паплавок.— А маці, не памятаю, каб заступілася калі,— маўчыць. Баба на днях апавяла мне... што вы з маці збіраліся ажаніцца. Ну, і пра тое, што біліся з бацькам, і што бацька лічыць мяне не сваім сынам, а... вашым. Дзе праўда?

Пакуль Сяргей выгаворваў сваё доўгае пытанне, дзядзька пільна ўглядаўся ў плынь ракі. Ён маўчаў хвілін колькі, потым спытаў:

— А трэба праўда?

— Мне — трэба,— цвёрда адказаў Сяргей.— Вы жывіце сабе, як хочацца вам, а мяне хлуснёй няма чаго цяпер грузіць.

— Што ж, маеш рацыю... — Дзядзька сарваў травіну, пажаваў, выкінуў, зноў палез па цыгарэты. Але запальваць не стаў, круціў у руках цыгарэту з запальнічкай.— Што ж, маеш рацыю,— паўтарыў сам сабе.— І маеш права ведаць. Але... ёсць у жыцці чалавека моманты, калі ён сказаць не можа. Ну, з розных там прычынаў. Верыш?

— Чаму не веру? Веру,— кіўнуў Сяргей.

— Вось. Так атрымалася ў жыцці, што не магу я табе ні слова на тваё пытанне адказаць. Не крыўдуй — але не магу.

— Зразумела,— з лёгкай горыччу адказаў Сяргей.— Вам у свае дарослыя гульні гуляць даражэй.

— То не гульні,— стаў апраўдвацца дзядзька.— Зрэшты, ты сам усё можаш даведацца. Без усялякіх падказак. Дакладна і бесперэчна.

— Гэта як? — здзівіўся Сяргей.

— Як любы дарослы чалавек. Для простых смяротных ісціна апошняй інстанцыі — суд.

— Не ўцяміў,— адказаў Сяргей, але прадчуванне незразумелай пакуль перспектывы захапіла яго.— Вы пра які суд?

— Напачатку дамовімся,— дзядзька Толік усё ж запаліў, зацягнуўся колькі разоў глыбока.— Вось пра што дамовімся: я табе не падказваю, што трэба рабіць. Я табе толькі апавядаю, як можна зрабіць... Ёсць такая навука, генетыка, чуў?

— Не дурны...

— Ну, выбачай. Суд сёння можа скарыстоўваць генетычную экспертызу для доказу таго, з'яўляецца той ці іншы чалавек родным для іншага ці не з'яўляецца.

— І што мне рабіць? Ісці ў суд?

— Я не кажу табе, што трэба рабіць,— дзядзька зрабіў націск на «трэба»,— ты можаш сёння, як грамадзянін, звярнуцца з заявай у суд, дзе просіш дакладнага адказу на пытанне: гэты грамадзянін мой бацька ці не мой. Суд па тваёй заяве прызначае правядзенне экспертызы.

— Так проста? — з сумневам запытаўся Сяргей, бо выглядала ўсё на словах дзядзькі на дзіва лёгка.

— Не, хлопча, не так проста,— дзядзька вытрымаў паўзу.— Грошы трэба. І яшчэ там будуць пытанні...

— Шмат грошай?

— Не ведаю дакладна,— шчыра адказаў дзядзька.— Адно магу сказаць — не маленькія.

— Зразумелая цяпер гэтая прастата,— горка ўсміхнуўся Сяргей.— Усё ў жыцці проста, калі грошай нямерана.

— Ну, не ўсе пытанні і грошы вырашаюць,— асцярожна запярэчыў дзядзька.

— Ага, лекцыя па выхаванні патрыятызму,— пакрывіўся Сяргей.— Ну, можа, скажаце, якія праблемы не вырашаюць грошы?

— За грошы не купіш шчасця.

— Ага! Так і ведаў. Я іншае ведаю дакладна: без грошай шчасця можа сёння і не быць.

— Твая праўда,— згадзіўся дзядзька.— У кожнага шчасце сваё. А калі сур'ёзна, то за грошы купіш слугу і прастытутку, але не сябра і каханне.

— А як яны мне і не трэба? — насмешліва спытаў Сяргей.— Калі мне неабходныя менавіта служка і прастытутка?

— Аднойчы і я так падумаў,— ціха адказаў дзядзька.— Гады прайшлі — і я зразумеў, што нечага вельмі патрэбнага і каштоўнага пазбаўлены. Пераказваць не буду — кожны сам вызначае свае каштоўнасці ў жыцці. Але я цвёрда перакананы: людзі без сяброўства і кахання — не цалкам людзі.

— Ну, няхай і так.— Сяргей рэзка падняўся, забраў вуды і рыбу і шпарка пайшоў сцяжынкаю ад ракі. Яго душыла крыўда.

— Чакай,— паклікаў дзядзька.— Ды чакай жа, кажу, будзь мужчынам!

Сяргей прыпыніўся, павярнуўся і моўчкі чакаў. Дзядзька таксама падхапіў вуды, мяшэчак з рыбай і падышоў да яго.

— Я пра сябе гаварыў, а не пра цябе,— пачаў ён.— І сяброўства, і каханне з намі не нараджаюцца. І да кожнага кожнае ў свой час прыходзіць. Потым: адна справа жыць без сябра, іншая — сябрам нікому не быць. Розніцу бачыш?

— Бачу,— ціха адказаў Сяргей, адчуўшы ніякаватасць за сваю псіхаванасць.

— Вось і добра... Ты, як што вырашыш рабіць, калі будуць якія цяжкасці там... ну з грашыма, то звяртайся — я пазычу... надоўга.

— Дзякуй, разбяруся сам,— мякка адмовіўся Сяргей.— Лета вялікае.

— Але ж і грошы не маленькія,— заўважыў дзядзька Толік і перавёў размову на іншае: — Заўтра

зранку прыйдзеш? Я спінінг вазьму. Шчупак ужо, бачна, на паляванне выйшаў.

— Не, заўтра не прыйду,— адмоўна крутнуў галавой Сяргей.— Мне ў горад трэба.

— Ну, трэба, то едзь...

Яшчэ хвіліну назад Сяргей збіраўся менавіта на рыбалку зранку — дурнем трэба быць, каб прапускаць, калі так бярэ. Але раптоўна, услед за пытаннем дзядзькі пра ранішнюю рыбалку, узнікла рашэнне: ехаць у горад. Трэба ехаць у горад. Завезці сушаную рыбу прадпрымальніку, сказаць, што будзе праз тры-чатыры дні дзясяткі тры добрых акунёў. І вырашыць пытанне з судом, з генетычнай экспертызай. Словы дзядзькі пра яе не выходзілі з галавы. Сяргею здавалася, што, як толькі ён патрапіць у горад, усё незразумелае для яго знікне, складзецца дакладны план. А будзе план — тады будзе прасцей...

## 4

Сяргей прыехаў у горад рана, яшчэ давялося чакаць, пакуль адчыніцца гандлёвы шапік прадпрымальніка, якому ён прывёз рыбу. Заплацілі яму няблага, ад навіны пра акунёў прадпрымальнік пацёр рукі:

— Лаві, хлопча! Тут у суседа ўжо шчупачкі ёсць — так што і іх чакаю. Самая гарачыня пайшла, піва бяруць... Не лянуйся, будзе табе капейка.

Сяргей паабяцаў і шчупакоў, радуючыся свайму «бізнесу»,— на руках была добрая сума, не трэба ў бабы прасіць. Зараз во вырашыць справы, патэлефануе Юрысу — пап'юць піва. Бо Юрысу грошай на піва не дадуць...

Адышоўся ад шапіка і стаў разгублены: а куды цяпер? У які суд? Горад не праясніў пытанне, а

наадварот, сваёй велічынёй, мітуслівасцю, гаманой толькі прынёс больш разгубленасці. Не, у вёсцы ўсё куды прасцей... Куды ісці?

Дадому? Ключы ў яго ёсць — маці прывезла. Бацькі дома няма, маці таксама будзе на працы, малодшы брат — у лагеры. Зайсці?

Сеў у аўтобус. Пакуль ехаў, бяздумна гледзячы ў акно, выйсце знайшлося: у яго ж ёсць знаёмы міліцыянер! Ён дакладна падкажа! Толькі б заспець яго дома...

Пашанцавала дык пашанцавала — Сяргей ішоў у свой двор, а насустрач яму — участковы, малады яшчэ мужчына.

— Дзень добры, Віктар Іванавіч,— павітаўся Сяргей, прыпыніўся, паказваючы, што хоча спытацца нешта.

— Здарова, Сяргей! — малады лейтэнант працягнуў руку.— Надакучыў горад? Збег у вёску?

— Ды ведаеце ж бацьку,— не стаў крывіць Сяргей.— Так усім спакайней.

— Яно так,— сумна згадзіўся ўчастковы.— Не хацеў казаць, ды ты хлопец разумны: спакойна ў вас апошнія дні, і бацька твой асабліва не напіваецца. От як...

— Мне маці казала,— адказаў Сяргей.— Спытаць хачу... Ёсць у вас хвілін дзесяць?

— Пытай, знойдзем час.

— Карацей, мне ў суд трэба... Хачу даведацца, хто мой бацька насамрэч.

— Вось гэта справа,— агаломшана сказаў лейтэнант, зняў фуражку з галавы.— Першы раз у маёй практыцы такое. Як я разумею, папытацца наўпрост сэнсу не будзе?

— У тым і справа,— адказаў Сяргей.— Бацька мяне за сына не лічыць. Мама маўчыць. Ды... не магу я ў яе спытаць.

— Зразумела... Адзінае табе магу сказаць дакладна: маеш права. Але з заканадаўствам не ведаю як. Табе-то шаснаццаць ёсць, але ж наўрад ці прыме суд ад цябе такую заяву. Трэба будзе неяк па-іншаму... Другое: гэта будзе каштаваць вялікіх грошай. У кожным выпадку трэба табе да адвакатаў, у юрыдычную кансультацыю. З пашпартам і грашыма, тысяч дваццаць ці больш. Там табе усё дакладна патлумачаць. Вось так, Сяргей. На ўсё трэба грошы...

— Ды я ўжо ведаю гэтае правіла. Дзякуй. Пайду па пашпарт...

— Юрыдычная кансультацыя бліжэйшая ведаеш дзе?

— Ведаю, неяк праходзіў міма.

— Ну, поспехаў, хлопец,— участковы паціснуў руку Сяргея на развітанне.— Калі што — звяртайся. Ведаеш жа, дзе жыву?

— Ведаю,— Сяргей паціснуў руку ў адказ і нечакана для сябе спытаў: — Там у бабулі... у вёсцы прытон сапраўдны... Нарыкі... Ведаеце?

— Ведаем мы, хлопча, пра гэты прытон,— уздыхнуў участковы.— Але так проста яго разагнаць — ніякага сэнсу, у іншым месцы збяруцца. Ды і яшчэ шмат нюансаў... Ты сам асцярожней там...

— У мяне яшчэ дах не паехаў, каб за наркатой бегаць,— з крыўдай у голасе адказаў Сяргей.

— Я не пра тое,— сур'ёзна заўважыў участковы.— У вёсцы, лічы, адны старыя, а наркаманы, калі ломка ў іх, на што заўгодна здольныя. Лепш два разы ўцячы, чым адзін раз быць збітым ці наагул з дзіркай у жываце. Вось я пра што.

— Дзякуй, я пакуль нікога не сустракаў. Рэчка — бабулін дом — уся мая дарога.

— Ну, бывай здаровы. Глядзі там... На ўсялякі выпадак, запішы нумар майго мабільніка. Ну, надарыцца што якое...

— Ага, дзякуй.

Сяргей запісаў у мабільнік нумар участковага, і яны разышліся.

Сяргей заходзіў у сваю кватэру з неспадзяваным хваляваннем — нібы ў чужую без ведама гаспадароў. І кватэра, у якой ён пражыў свае шаснаццаць гадоў, у ягоную адсутнасць за два месяцы набыла нейкі чужы выгляд, незнаёмыя пахі. Як быццам нічога не змянілася — тая ж ідэальная чысціня (маці надта ж сачыла за гэтым), тыя ж рэчы, тыя ж сцены.

Але нешта было іншым. І гэта нешта нібыта казала Сяргею, што ён тут болей не гаспадар, што кватэра не прымае яго, гоніць. Ён агледзеўся яшчэ раз і зразумеў, чаму кватэра стала не яго. Тут не было ягоных рэчаў. У вітальні — ні ягонага адзення, ні хоць чаго з абутку. Вось пантофлі бацькі, маці, брата. Сяргеевых няма. Нічога з ягонай вопраткі няма на вешалцы.

Усё як быццам правільна — маці ж прывезла яму яго адзенне і рэчы. З усяго, што ягонае ў гэтай кватэры,— тое, што цяпер на ім...

«К чорту! Скажу маці, няхай разводзіцца, і паедзем да бабулі жыць. Хай хоць задавіцца тут адзін. Чаго яна трывае? Што нам тут губляць? З вёскі ў горад можна і на працу ездзіць, і ў школу. Я ж езджу...»

Сяргей не стаў затрымлівацца ў кватэры — толькі знайшоў свой пашпарт (у тумбачцы маці ў спачывальні). Было крыху сорамна корпацца ў гэтай тумбачцы, як і ніякавата было наагул заходзіць у спальню бацькоў.

...Было — ён даўно, малым, убег у спачывальню позна ўвечары, перапужаны ўдарамі грому і маланкай за акном свайго пакоя. Ён пабачыў... не памятае, што ён пабачыў. У адзін момант перад ім апынуўся раз'юшаны шырокі твар бацькі, які быў яшчэ страшней за гром на вуліцы. Бацька балюча схапіў

яго за вуха і літаральна зацягнуў назад, у дзіцячы пакой. «Цыц, байструк!» — шыпеў бацька ў адказ на ціхае падвыванне Сяргея ад болю. «Цыц, кажу! Кладзіся, і каб ніколі больш блізка не падыходзіў да дзвярэй спачывальні! Зразумеў, смаркач? Блізка каб не падыходзіў!»

Сяргей тады накрыўся з галавой, рукамі яшчэ заціснуў вушы — і так доўга ляжаў, давячыся слязьмі страху і крыўды. І маці тады не падышла, не суцешыла...

Да юрыдычнай кансультацыі Сяргей дабраўся хутка. Пачакаў хвілін пятнаццаць у чарзе, нервова кранаючы грошы ў кішэні, якія атрымаў за рыбу: ці хопіць?

Маладзенькая дзяўчына-адвакат з кірпатым тварам і вялікім жыватом — цяжарная — здзіўлена зірнула на Сяргея, калі ён назваў ёй прычыну свайго прыходу. Але адно пацікавілася, ці ёсць у Сяргея трыццаць тысяч заплаціць за яе паслугі.

— Ёсць,— хрыпата адказаў Сяргей і падумаў, што піва з Юрысам сёння не пап'е. Нічога, іншым разам...

Раптоўна ён зразумеў, што ўчарашняе імпульсіўнае жаданне яго набывае рысы сапраўднай справы. Ці слушна ён робіць? Навошта гэта? А калі ён даведаецца праўду? Любую? Што далей? Будзе ад гэтага лепш ці горш? Але адмахнуўся ад гэтых пытанняў: задумаў зрабіць — рабі! Што будзе — тое і з'ясі. Бо не рабіць — нічога не ведаць. Грошай вось толькі шкада — адразу ўсе аддаць толькі за пытанне...

— Вы, малады чалавек, ведаеце, што суд у дадзеным выпадку прызначыць правядзенне экспертызы, але аплачваць яе давядзецца вам? — ветла спытала адвакат, назвала суму.

— Ведаю... У мяне... ёсць грошы на гэта,— адказаў Сяргей, хоць унутры ад пачутай лічбы нешта абарвалася.

— Добра. Што вы жадаеце даведацца: ці з'яўляецца нейкі грамадзянін вашым бацькам, ці нешта іншае?

— Хто з дваіх мой бацька...

— Вось як... Але ж адзін запісаны ў пашпарце вашым бацькам, так?

— Я... не ведаю, ці бацька ён насамрэч.

— Зразумела... На жаль, вам давядзецца пачакаць. Выбачайце, але для падачы такой заявы ад свайго імя трэба мець васямнаццаць поўных гадоў, быць паводле закону паўналетнім.

— Чакаць?— разгубіўся Сяргей, бо ніяк не думаў, што справа, якая зрушылася з месца і магла быць вырашана ў бліжэйшы час, спатыкнецца на, здавалася, роўным месцы.

— Так, вам трэба чакаць,— мякка адказала адвакат і тут жа падказала выйсце: — Альбо з заявай можа выступіць іншы чалавек. Гэта можа быць ваша маці, ваш бацька...

— А... нехта чужы? — вырвалася ў Сяргея.

— Чужы? Можа і чужы, калі ён пераканае суд у неабходнасці правядзення такой экспертызы, у сур'ёзных падставах...

Адвакат нечакана змянілася тварам — з сухога афіцыйнага ён стаў зусім мяккім, спагадлівым, і спытала:

— А маці... не хоча?

— Не ведаю,— ледзь чутна адказаў Сяргей. Толькі цяпер ён успомніў, што не падумаў пра тое, як паставіцца маці да ягонага рашэння. Трэба яе ўгаварыць...

— То паразмаўляй з маці... Ідзі, грошы плаціць не трэба,— сказала адвакат, спачувальна зірнула, і Сяргей не стрываў яе чысты позірк цёплых вачэй — хутка адвёў у бок свае вочы.

Была і невялікая радасць ад таго, што засталіся грошы ў кішэні, але ўсё накрывала нечаканая про-

рва перашкоды: трэба чакаць. А можа, не чакаць? Спытаць маці? Ці... дзядзьку Толіка?

Сяргей і сам не заўважыў, як, раздумваючы над сваёй праблемай, патрапіў, бы на аўтамаце, на аўтастанцыю. Забыўся на Юрыса і піва. Нічога, цяпер не той настрой...

Вяртаючыся сцяжынкай ад аўтобуснага прыпынку да бабулінай хаты, Сяргей са здзіўленнем нібыта паглядваў на сябе згары: нічога сабе ён задумаў справу! Але разам з захапленнем ад сваіх дзеянняў (вось жа змог!) было і адчуванне ненатуральнасці ўсяго, што адбывалася з ім. Бо для яго, 16-гадовага, натуральнымі былі рыбалка і продаж сушанай рыбы, «бізнес» на грыбах, якім займаюцца ягоныя аднагодкі, хто не лянуецца і не лічыць ганебным для сябе пастаяць з кошыкам ля трасы. Але не вызначэнне сапраўднага бацькі...

Аднак Сяргей вырашыў — і ведаў, што будзе доўжыць справу да той кропкі, пакуль або будзе вынік, або ўпрэцца ў такую сцяну, якую, упэўніцца, не пераадолее. Так было з маленства.

## 5

Баба Каця — простая вясковая баба. А вось жа разумее, пра што можна пытацца, пра што — не. Сказаў Сяргей, што ў горад трэба, бачыла, як рыбу браў з сабой — ні словам не абмовілася. Вось цяпер прыехаў — баба дома, перабірае грыбы. Бач ты, набрала невялікі кошык баравічкоў! Невялікія, крамяныя.

— Ну, як з'ездзіў? — спыталася.

— Добра,— адказаў Сяргей, прысеў побач, узяў, не ўтрымаўся, грыб у рукі.— Прыгожы які.

— Ага, сама прадаваць такія. А за рыбу добра плацяць?

— Не вельмі,— адказаў Сяргей, у думках дзівячыся бабінай празорлівасці: бач ты, пра ўсё здагадалася.

— А за грыбы вой добра даюць,— падзялілася баба навіной.— Суседка панесла кошычак, то адразу і забралі. Мала хто грыбы носіць, ды іх і не багата шчэ, каласавічкі... От, перабяру, думаю, што рабіць...

— Як — што? — усміхнуўся Сяргей.— Бульбу з грыбамі рабі, баб! Лета вялікае, хопіць яшчэ і на трасу.

— І тое праўда,— уздыхнула баба Каця.— У Бога дзён многа... Толік прыходзіў, сусед. Раней у яго адпачынак пачаўся. Прынёс табе вуду нейкую, у сенцах стаіць. Казаў, вы збіраліся сёння на рэчку, а яму справа пільная ў горадзе...

— Добра,— адказаў Сяргей.

Гэтая навіна пра спінінг адгукнулася прыемным хваляваннем: бач, не забыўся дзядзька. Недзе каля трох гадзін, калі гарачыня пачала спадаць, Сяргей са спінінгам пашыбаваў на рэчку. Добра, што шлях не такі блізкі — можна многае перадумаць за гэтыя паўгадзіны. Тут лёгка думаецца, менавіта не марыцца, а думаецца. Мо рытмічны крок не дае думцы разагнацца і ўзляцець летуценнем, ператварыцца ў фантазію.

Што зменіць гэтая экспертыза ў іх сям'і? Ну, няхай скажуць, што бацька — сапраўды яго бацька. І што? Стане бацька іншым? Трэба пераконваць маці, каб разводзілася... А як яе пераканаць? Апошні раз яна прыязджала, дык быццам і весялейшая была, не надта засмучаная. Няўжо прычына ўсіх бедаў у сям'і — ён, Сяргей? Калі яна столькі гадоў жыве, трывае, мабыць, ёсць нешта, што трымае яе ў іх трохпакаёўцы...

З гэтымі думкамі Сяргей і падышоў да ракі. Удалечыні, уніз па рацэ былі відаць постаці рыбакоў. Бліжэйшы быў са спінінгам.

З лёгкім трымценнем у руках (не ўмее ж добра!) Сяргей зрабіў першы закід. Няўдалы — блясна ўпала зусім блізка і не ў тым месцы. Выкруціў, закінуў яшчэ раз. Ужо лепш...

Дваццаты ці то трыццаты ўжо закід — і ніякага выніку. Сяргей на колькі крокаў падымаўся ўгару па плыні, абіраючы чыстыя месцы. Не падабалася такая рыбалка. Акунёў ці плотак ужо нашморгаў бы колькі...

Урэшце ірванула. І так, што Сяргей не паспеў разблакаваць катушку, лёска напялася, і, баючыся, што яна вось-вось лопне, Сяргей подбегам памкнуўся берагам, за рыбінай, якая, нябачная, уладна цягнула лёску. Саўладаў з хваляваннем, прыпыніўся ў зручным месцы, адпусціў катушку, але прытарможваў, не даваў раскручвацца вольна. Калі напятасць аслабела, паспрабаваў намотваць лёску на катушку. Атрымалася... Зноў трошкі адпусціў, калі адчуў на другім канцы моцнае супраціўленне і штуршкі. Такім чынам ён валэндаўся з чвэрць гадзіны. Урэшце штуршкі спыніліся, нацяжэнне зменшылася, і Сяргей падкручваў, падцягваў да сябе рыбіну. Пабачыў шчупака ў цёмнай вадзе і амаль што расчараваўся: шчупак быў усяго ў локаць даўжынёй. Няўжо гэта ён мог ірваць спінінг з рук? Але калі выцягнуў рыбіну на бераг — паверыў. Шчупак быў тоўсты, з вялізнай галавой, можа, на трэць цела і зубастай пашчай. Добра, што дзядзька разам са спінінгам перадаў і торбачку з рознымі прынадамі рыбацкімі. Былі там і кшталту медыцынскіх інструментаў, падобныя да нажніцаў. Адны ўсунуў шчупаку ў пашчу, разявіў, зафіксаваў, другім захапіў і хоць з цяжкасцю, але вызваліў блясну.

Не, зусім не маленькі шчупак! Уга, які добры! Сяргея ахапіў азарт. Прайшоў на ранейшае месца, дзе ўзяў першы шчупак, зноў пачаў кідаць спінінг.

І ўжо на пятым закідзе адчуў штуршок — ёсць! Цяпер Сяргей быў куды спакайнейшы і вывуджваў шчупака, стоячы на адным месцы, не бегаючы берагам. Гэты шчупак быў куды меншы, але Сяргей не засмуціўся. Хутка вызваліў блясну — і зноў пачаў закідваць.

Пасля чацвёртага шчупака, мо такога ж, як і першы, больш не брала. Сонца ўжо кранулася чырвоным краем зямлі. «Досыць на сёння. І так пашанцавала, аж да «не бывае». Гэткі ўлоў!»

## 6

Лес сустрэў цішынёй і прахалодай. Кеды на нагах намоклі ў роснай траве, ісці было не вельмі прыемна. Але тут, у лесе, расы не было, і Сяргей перастаў звяртаць на такую дробязь увагу: цяпер галоўнае — грыбы. Гэтыя мясціны ён ведаў добра — штолета бываў тут. Збіраць грыбы Сяргей любіў. І найбольш тады, калі хадзіў па іх адзін. Баба Каця хутка заўважыла ягонае жаданне быць у лесе аднаму, то не набівалася ў спадарожнікі. Адно, што апавядала пра мясціны, у кожнай з якіх былі свае назвы, як да якой прайсці, чым кожнае месца бывае багатым і ў якую пару.

Звечара яшчэ баба Каця «праводзіла інструктаж»:

— У Махавым ля маладога бярэзніку мусяць быць абабкі, у Доўгім, там, дзе лес рэдкі, спусцішся пад горкі — шукай маладых грыбоў. Лісічкі патрапяцца. У Казлова нічога не будзе, хіба пройдзеш праз яго, зірнеш — і ідзі пад Старыну: там светла і вільгаці стае, павінныя парасці каласавічкі...

Каласавічкі — баравікі першыя, якія з'яўляюцца акурат той парой, калі каласуе — выходзіць у колас — жыта.

Ужо гадзіны тры блукаў нетаропка Сяргей лесам. Кошык быў напоўнены на тры чвэрці — аднымі баравікамі.

Лес супакойваў, насычаў нетаропкасцю, упэўненасцю ў сабе.

«Пасяліцца б тут ды жыць,— разважаў Сяргей.— З голаду памерці лес не дасць. Жылі ж сабе дзікія плямёны... Які сэнс было выбірацца з лесу? Тут жа так усё проста: здабывай ежу ды адпачывай. Ніхто табе нічога не вінен, і ты нікому нічога не вінен. Сапраўдная воля...»

Наведаўшы ўсе названыя бабай Кацяй у яе «інструктажы» мясціны, Сяргей углыбіўся далёка ў лес — стары, густы і змрочны. Высокі падлесак не даваў вольна ісці, але Сяргей, абмінаючы зараснікі, проста ішоў наперад.

Нечакана пасвятлела — паказалася невялікая паляна, залітая сонечным святлом. На самой паляне ўзвышаўся зараснік нейкай высокай расліны, падобнай да крапівы. І цягнула незвычайным пахам: вострым, казытлівым, ні да чаго ранейшага не падобным. На краю паляны з аднаго кораня раслі ажно чатыры бярозы, ад іх невялікім клінам уразаўся ў паляну густы зараснік з маладзенькіх светлых бярозак. Да чатырох бярозак так і цягнула падысці і прысесці. Сяргей не стаў супраціўляцца свайму жаданню.

Абапёршыся спінай аб камель адной з чатырох бяроз, сядзела дзяўчына і нешта засяроджана рабіла. Хударлявыя лапаткі пад лінялай саколкай рытмічна варушыліся. Па гэтай некалі блакітнай саколцы ды па хударлявасці Сяргей пазнаў дзяўчыну — Ксюха. Наступны крок Сяргей зрабіў смялей, адумысна, каб не спужаць дзяўчыну.

Але яна спужалася. І так, што Сяргей спужаўся сам.

Адначасна з хрустам пад нагой Сяргея дзяўчына рэзка азірнулася, сцялася — і ў наступнае імгненне адпушчанай спружынай, не ўстаючы адразу на ногі, а так, на кукішках, зрабіла два імклівых скачкі наперад. Потым азірнулася, кінулася назад, схапіла пакет з нечым шэра-зялёным, скруціла — і стрымгалоў шуснула ў зараснік маладых бярозак.

Сяргей застыў. Яго скаланула: дзяўчо ў гэтыя імгненні было не проста падобным да перапалоханага знянацку звярка — Ксюха ўвасобілася ў звярка ці, правільней, на кароткія секунды страціла ўсё нажытае чалавечае, цывілізаванае, выпусціўшы на волю найгалаўнейшы інстынкт жывога — самазахавання.

Няўжо ён, Сяргей, такі страшны, што мог так напалохаць дзяўчыну? Ці мо яна падумала, што яе зараз будуць біць за крадзеж тых няшчасных смажаных плотак і кавалка хлеба?

Сяргей прысеў ля камлёў бяроз побач з тым месцам, дзе сядзела дзяўчына. Адчуў, як стаміліся ногі. Добра так пасядзець, так добра... Толькі пах... Што так пахне? Перавёў позірк на паляну з зараснікамі «крапівы», далей — на маладыя бярозкі.

І пабачыў вочы. Ксюха вызірала з-за лістоты, быццам невялікі злосны звярок: напасці не можа, бо слабейшая, а прагнаць са свайго месца госця неабходна...

— Дурніца, вылазь, чаго баішся? — няголасна гукнуў Сяргей.— Не злую я за тую рыбу.

— Ты адзін? — асцярожна спытала Ксюха.

— Адзін.

Ксюха выйшла з зарасніку, раптоўна асмялеўшы, з газетным скруткам. Уселася на сваё месца, разаслала газеціну. У ёй — падсохлыя лісце і суквецці. Разраўняла акуратна на газеце — відавочна, для сушкі.

— Ты не глядзі, што я худая, так магу... І вочы павыдзіраю!

— Ды на ляд ты мне трэба,— адмахнуўся Сяргей.— Што тут робіш адна?

— А то не бачыш? — здзівілася Ксюха.— Каноплі сушу. Збіраю і сушу.

— Каноплі?

Сяргей устаў, падышоў да бліжэйшай расліны, сарваў суквецце, расцёр у руках, паднёс да носа. Шыбануў востры пах. Пах, які ні з чым больш не зблытаеш. Дык вось як пахнуць каноплі... Прысеў зноў.

— Ты што — нарык? — са знявагай спытаў Ксюху.

— Не-а,— адказала тая.— Так, іншы раз, калі наб'юць ці сумна так стане, што плакаць хочацца.

— А на што збіраеш столькі?

— Прадам. Веньку прадам. Не будзе чапляцца. Шмат насушу... Венька мяне паважаць будзе...

— І пачым прадаваць будзеш? — насмешліва спытаў Сяргей.

— Пяць касякоў — долар,— упэўнена адказала Ксюха.— Чула, цётка так казала.

— Касяк — гэта што?

— Вой, ты зусім цёмны,— скрывілася, як ад кіслага, Ксюха.— Касяк — гэта касяк. Каб паліць...

— Зразумела, светлая...

— Толькі ты не кажы нікому — мяне заб'юць, калі цётка даведаецца. Гэта ж яна са сваім зэкам тут садзіла...

— Садзілі тут каноплі? — не паверыў Сяргей, бо вельмі ж мала паляна была падобная да поля.

— А ты думаў, яна тут сама нарасла? Ага...

— А ты сама як гэтае поле знайшла?

— За цёткай была крадком следам пайшла. Увечары прыйшлі чацвёра, цётка ім прадала і кажа:

«Больш няма, заўтра прыйдзеце». Яна зранку ў лес — а я за ёй. Там,— Ксюха махнула ў бок маладога бярэзніку,— сабранае сушыцца пад плёнкай. Але я там не бяру, бо здагадаецца. Сама збіраю во і сушу.

— І багата назбірала ўжо?

— Не... Не дужа... Баюся памногу. Як цётка сюды сходзіць — я за ёй. А хочаш, давай папалім!

— Не хачу.

— А ты паліў?

— Не, не паліў.

— Цю, дурань,— насмешліва працягнула Ксюха.— То ж такі кайф.

— І які кайф?

— Ну, кайф проста... — Ксюха зморшчыла лоб у намаганні падабраць словы.— Хораша, як папаліш. Увесь свет харошы-харошы, людзі добрыя і смешныя. І смяяцца хочацца, весела-весела. Добра так — нічога дрэннага не існуе, не памятаеш яго... Кайф... Толькі потым есці так хочацца! — Ксюха засмяялася.— Гэта я ў цябе рыбу пакрала спецыяльна, бо папаліць збіралася.

— Ну, і які сэнс у тваёй наркаце? — скептычна заўважыў Сяргей.— Пяць хвілін радасці, поўныя нагавіцы гадасці. Я б паліў і паліў, каб хоць маленькія праблемы знікалі. Хіба ж знікае нешта, калі на яго забудзеш? Кайф знайшла яшчэ. Кайф сапраўдны — гэта калі над табой вісіць нешта, галавы не дае ўзняць — а потым ты яго скідаеш урэшце. А то не кайф, а дурніца сапраўдная.

— Ты — дурны і нічога не разумееш,— упэўнена адказала Ксюха.— Як пакаштуеш, то потым і кажы!

— Які сэнс дзярмо ў рот несці, калі і так вядома, што яно — дзярмо? — хмыкнуў Сяргей.

— Ты мяне не выхоўвай! Стае ў мяне выхавальнікаў! — агрызнулася Ксюха.

— На ляд ты мне трэба,— стомлена і абыякава адказаў Сяргей.— У мяне сваіх клопатаў стае.

— Цю, якія ў цябе клопаты? Кватэра ёсць, маці, баба, бацька. Рыбу лавіць умееш, смажыць...

Сяргей памаўчаў колькі часу — не было яму што адказаць. Дастаў цыгарэты, запаліў.

— Хочаш, цябе навучу рыбу лавіць?

— Праўда? — недаверліва скасіла на яго вочы Ксюха.— І што, злоўленая мая будзе?

— Дзівачка,— усміхнуўся Сяргей.— Вядома, твая.

— О! А калі пойдзем?

— Хоць гэтым вечарам. Як сонца пачне хіліцца — прыходзь.

— І ты мне вуду дасі? — усё яшчэ не верыла Ксюха.

— Ды не рукамі ж ты будзеш лавіць, дам,— адказаў Сяргей цвёрда, і Ксюха толькі лыпнула вачыма.

— Эх, шкада, я не твая дзеўка,— уздыхнула яна.— Ты харошы...

Сяргей толькі хмыкнуў пра сябе. Ён глядзеў на гэтае «поле» каноплі, і супраць ягонай волі недзе ў падсвядомасці жылі, варушыліся пачутыя ад Ксюхі словы: «Цётка прадае... Тут грошай — на год жыць... Буду Веньку прадаваць...»

Каноплі вось тут, цяпер, набылі іншыя рысы: з наркотыка пакрысе рабіліся таварам. Так і павінна быць: ты наркаман, каноплі — наркотык, ты не наркаман, а гаспадар гэтых канопляў — яны тавар.

Дарагі тавар... Як там казала Ксюха? Пяць касякоў — долар. А на гэтым полі колькі ж можна назбіраць? На колькі касякоў? Гэтулькі грошай... Каму прадаць потым гэта дабро? То справа іншая. У паралельным «Ж» класе наркаманы ёсць. Гэта не для каго ні таямніца. У гэты клас сабралі пасля дзевяці з усіх паралельных, лічы, адных дэбілаў. Каму ў галаву такая ідэя прыйшла — невядома.

Пачалі фармаваць класы з рознымі ўхіламі — матэматычны, фізічны, філалагічны...

Добра, у класе Сяргея згаварыліся і ўсе запісаліся ў матэматычны. Ды яшчэ і класная — матэматык. То клас цалкам застаўся класам. А іншыя класы разбівалі, тусавалі вучняў... «Ж» клас — без ніякіх ухілаў. Ім абы скончыць школу. Карацей, адсеў з усіх класаў. Сяргей меў усе шанцы ў той клас патрапіць. Яму без розніцы, дзе давучвацца, бо асаблівых сяброў у класе не меў, але ж гэтае дзяленне на разумных і тупых... Не па сабе стала, калі дырэктар сказала на класным сходзе, што трое з іх класа, і Сяргей у іх ліку, будуць пераведзеныя ў «Ж» клас. Маўляў, навошта час губляць на вас, калі вам тыя веды нікольнкі не трэба і вытворныя ды інтэгралы з дыферэнцыяламі для вас былі і застануцца граматай кітайскай?

Сяргей тады сказаў, што наагул у школу больш у такім выпадку не пойдзе. І яшчэ двое — Арцём, худы, няскладны, з мянушкай Багамол, і Насця тое ж сказалі. Насці што — ёй хоць у дзявятым замуж можна было ісці: па габарытах сваіх ужо класную перагнала. Шапталіся і ўголас казалі, што яна са старшакласнікамі гуляе... А дырэктару толькі і трэба было тое пачуць — ідзіце, досыць з вамі вэшкацца. Але тут Юрыс быў умяшаўся: кажа, мы згодныя трох з іншых класаў узяць, але нашых не чапайце. А пераведзяце, то: «Я чужых асабіста так зачмыру, збягуць праз тыдзень са школы, не тое што з класа!» Карацей, лямант не маленькі ўзняўся. Дырэктар ажно пабялела, мабыць, ніяк не чакала такога супраціву. Юрка Хаванскі яе амаль дабіў: «Ваша ідэя фармавання такіх класаў — гэта, пасутнасці, расізм!» Яму да лямпачкі быў лёс Сяргея, Насці і Арцёма, так, захацелася ў агульным тлуме пакрасавацца сваёй дасціпнасцю.

Класная ледзь супакоіла ўсіх. Дырэктар з чырвоным тварам выскачыла з аўдыторыі. Класная загадала ўсім сядзець бы мышам пад мятлой — і за ёй. Ціха сядзелі... Класная вярнулася, сказала: «Усе застаюцца. Пад маю асабістую адказнасць. Калі будуць тройкі ці двойкі за чвэрць у каго з траіх, ці Насця нас пакліча на вяселле да выпускнога балю...» Яна не дагаварыла, але ўсе зразумелі.

Такім чынам Сяргей не патрапіў у «Ж» клас. Трэба думаць, што ідэя з гэтым дзяленнем і дырэкцыі потым не падалася салодкай: той клас за год стаў літаральна некіруемым. Класная неяк прызналася, што лепш усе 24 гадзіны ў суткі будзе весці адзін урок у любым іншым класе, чым 45 хвілін — там. Было — адзін запаліў прама на ўроку, мог нехта і мацюка загнуць... А паспрабуй выкінь з класа, калі ты — жанчына маладая, а перад табой — дзяцюк, плечы куды шырэйшыя за твае клубы. Ды яшчэ пасміхаецца: «Не маеце права прымяняць фізічную сілу!» Трох хлопцаў з таго класа летась судзілі за сапраўднае рабаўніцтва: у падвыпіўшага мужыка адабралі грошы і мабільнік, збілі нагамі, нос зламалі... Пару хлопцаў з 11 «Ж» Сяргей неяк заўважыў на дыскатэцы з вытарашчанымі вачыма, зрэнкі шырока расплюшчаныя, смяяліся, як дурні, з паднятага пальца. Тады і даведаўся, што так выглядаюць укураныя. Хлопцы былі абое на ўліку ў інспекцыі па справах непаўналетніх... Ім і можна будзе прапанаваць каноплі...

Ксюха, падварушыўшы сваю «здабычу», заплюшчыла вочы — драмала, здаецца.

— Ну, я пайшоў,— Сяргей узняўся з зямлі.— Хадзем лепш грыбы шукаць...

— Ну іх, не ем грыбоў,— не расплюшчваючы вачэй, адказала Ксюха.

— Дурніца, яны ж смачныя,— як маломудзіцёнку даводзіў Сяргей.— Лічы — мяса.

— Ха! Былі б яны смачныя ды карысныя, ды яшчэ як мяса, іх бы ваўкі даўно паелі.

— Ваўкі смажыць грыбоў не ўмеюць,— хутчэй самому сабе адказаў Сяргей.— То прыходзь, як павечарэе.

— Ага,— кіўнула Ксюха.— Ты толькі не прагаварыся там...

— Трэба мне...

## 7

— Уй, паплавок пацягнула, пацягнула!

У гэтым Ксюхіным крыку былі і спалох, і радасць дзіцяці, і захапленне: трэба ж, паплавок яе вуды ажыў, нябачная рыбіна павольна, але рашуча цягнула пад вадой прынаду.

— То цягні сама! Падсякай! — уладна загадаў Сяргей, які стаяў за тры крокі ад Ксюхі.

Яна падсекла. Так шмарганула, што плотка літаральна выстралілася з вады, пераляцела на лёсцы дугой цераз галаву, умякнулася ў траву. А Ксюха ўжо хапіла рыбіну ў свае рукі і падскоквала, прысядала, круцілася на месцы:

— Злавіла, злавіла!

«Ну чыста рытуальны дзікунскі танец»,— з усмешкай падумаў Сяргей, падыходзячы.

— Во, глядзі, глядзі, якая вялікая! — крычала радасна Ксюха.

— І праўда, немаленькая,— пахваліў Сяргей як малое дзіця, бо што тут было хваліць — звычайная плотка. Але столькі шчаслівых чорцікаў скакала ў зусім дзіцячых цяпер вачах дзяўчыны, што не падзяліць з ёй яе радасць — лічы, што абакрасці.

— Віншую! Малайчына! З першай рыбінай.

Сяргей зняў плотку з гачка, кінуў у вядзерца з вадой, хутка начапіў прынаду на гачык.

— Цяпер сама закідвай. Вучыся, вучыся. Не буду ж я за цябе штораз закідваць.

Ксюха вучылася на дзіва хутка: кемлівая. Але галоўнае — яна імкнулася паўтарыць адзін у адзін кожны рух Сяргея.

Можа, на пяты раз у яе атрымалася хораша. Паплавок лёг туды, куды яна і цэліла. Тварык яе яшчэ пры закідзе быў сур'ёзна-засяроджаным, яна ажно вусны прыкусіла і цяпер, як толькі паплавок знерухомеў, прысела, памятаючы наказ Сяргея: «Не стаяць, рыба цябе бачыць». Увага не толькі вачэй, а ўсяго яе цела, здавалася, была скіраваная на паплавок.

Пакуль Сяргей дапамагаў дзяўчыне, у самога пачапілася плотка і зацягнула паплавок далёка ў чарот. Сяргей асцярожна выцягваў рыбіну адтуль, каб не зачапіцца за што. Плотка яго была куды большай за тую, што вышмаргнула з вады Ксюха, але Сяргею не захацелася хваліцца ёй. Яшчэ настрой у рыбачкі знікне...

Пакуль чапляў прынаду на свой гачок, пачуў кароткі ўсплёск. Азірнуўся цераз плячо — Ксюха акуратна даставала з вады яшчэ адну плотку. Падышоў, яна ўжо сама зняла рыбіну з гачка.

— Гэта большая,— стрымана сказала яна.

А самую яе — гэта так было відаць па вачах — ажно распірала ад удачы. І не столькі ад злоўленай плоткі, колькі ад таго, што ў яе ўсё атрымліваецца, як паказвае Сяргей.

— Ды большая, большая,— Сяргей сам не змог стрымаць радасці ад таго, што ў Ксюхі ўсё так добра складваецца, ён амаль механічна працягнуў руку і лёгка ўскудлаціў валасы на галаве дзяўчыны: — Малайчына!

Але не паспеў дагаварыць, як Ксюха ўмомант сціялася пад ягонай рукой, наспружынілася. Зірнула

з-пад ілба загнаным у кут звярком. Спагадлівая ўсмешка яшчэ заставалася на вуснах разгубленага Сяргея, а з вачэй Ксюхі знікала, знікла звярыная насцярожанасць, яна расслабілася, усміхнулася з палёгкай.

— Дзякуй... Я яшчэ буду лавіць?

— Вядома, дзівачка,— ідзі, лаві! Навічкам шанцуе — сёння ўся рыба твая.

Ксюха ўсміхнулася — шырока, з удзячнасцю. Ужо спрытна начапіла чарвяка і паспяшалася закінуць. Сяргей пайшоў да сваёй вуды. Нейкае незразумелае пачуццё поўніла яго, не давала засяродзіцца на рыбалцы. Сумесь жалю, радасці, хвалявання — і ўсё ад аднаго таго крапання да валасоў дзяўчыны, ад аднаго яе позірку, яе ўсмешкі...

Брала неблага, і Сяргей цешыўся гэтаму, але не таму, што болей паловіць сам,— таму, што раз-пораз Ксюха рэзка падсякала, і чарговая плотка апыналася ў яе зграбных руках.

«Гэткая здольная. І спрытная,— падумалася Сяргею.— Яе б апрануць па-чалавечы».

Яны рыбачылі, а ўжо і сонца амаль што схавалася, толькі самы крайчык дыска свяціўся развітальна, ужо і браць стала рэдка. Ксюха закідвала, прысядала і назірала за паплаўком з тым самым засяроджаннем, з якім рабіла гэта напачатку.

— Збірайся, пойдзем ужо,— пагукаў Сяргей.— Пакінь у рэчцы назаўтра рыбы.

— Вось яшчэ адну — і ідзем, добра? — папрасілася Ксюха.— Ну самую маленькую, вось такую,— яна ледзь-лезь развяла пальцы на руцэ.

Сяргей усміхнуўся ў адказ, зматаў сваю вуду.

— Вось, апошняя! — Ксюха радасна ўзняла ўгару вудзільна, на гачку вільготна пабліскала плотка. Хутка зняла рыбіну, укінула ў вядзерца, апусціла туды руку: — Ого, колькі рыбін! А ёй, наемся!

І нечакана спахмурнела, прысела ля вядзерца. Сяргей падышоў, хутка зматаў яе вуду.

— Чаго нос павесіла?

Ксюха маўчала.

— Ну, што маўчыш?

— А куды мне рыбу несці? — Ксюха ўзняла на Сяргея вочы, разгубленыя ад паўсталай для яе праблемы.— Зараз да цёткі занясу, яна засмажыць і сажруць з зэкам. Зранку пахмяліліся, у полудзень зноў пілі, потым спалі. А ў хаце хлеба няма. Чакаюць, калі хто купляць каноплі прыйдзе... І сама я смажыць не ўмею.

— Так, задачка,— Сяргей раздумваў адно імгненне.— Хадзем да маёй бабы. Там пасмажым тваю рыбу, маю. Навучышся заадно. Там і паясі.

— А можна? — недаверліва спыталася Ксюха.

— Можна,— хмыкнуў Сяргей.— Я кажу — значыцца можна.

— А баба не пагоніць?

— За што?

— А што я рыбу ў цябе тады пакрала?

— Яна не ведае.

— Ты не сказаў? — Ксюхіны вочы акругліліся ад здзіўлення.

— Не, вядома ж. Навошта было казаць?

— Ты — харошы! — Ксюха радасна падскочыла.— Клас, ты не закладваеш!

— Дзівачка ты,— буркнуў Сяргей, зніякавеўшы ад такой пахвальбы.— Хадзем.

Скрэбці рыбу ля лаўкі ім дапамагала баба Каця. Управіліся хутка, пасля смажылі рыбу, абіралі бульбу, якую баба потым паставіла варыцца на газу. Калі сцямнела, Сяргей улучыў пераноску — яна вісела скручаная ў лазні. Так некалі рабіў бацька, калі заседжваўся тут з сябрамі да позняй ночы. І вячэралі тут жа.

Ксюха ела гэтым разам на дзіва спакойна, акуратна. «Цяпер не баіцца, што больш не дадуць»,— вырашыў Сяргей. Яшчэ больш здзівіўся, калі Ксюха першая перастала есці.

— Во, а я наелася,— засмяялася.— Вачыма б яшчэ ела, так смачна, а ўжо не лезе.

— То возьмеш з сабой ды падагрэеш уранку,— параіла баба Каця.

— Ага, вазьму,— хутка пагадзілася Ксюха, нібыта чакала такой прапановы, і вочы хітравата бліснулі.

Баба прынесла мяшэчак, склала ў яго ўсю смажаную рыбу, якая засталася, дадала два кавалкі хлеба. Калі Ксюха пайшла, Сяргей адправіў бабу адпачываць: сказаў, што сам прыбярэ і перамые посуд. Баба не ўпарцілася. Пасля таго, як управіўся, Сяргей зноў прыйшоў за столік пад лазняй. Была ўжо ноч.

Сяргей сядзеў, глядзеў на зорнае неба, на ражок месяца, які здаваўся такім адзінокім у вялікім-вялікім небе. І раптоўна адчуў сябе такім жа самотным ва ўсім свеце. Колькі часу, лічы, дарэмна, цягае з сабой мабільнік — ніхто яму не тэлефанаваў, апрача двух ці трох разоў — маці. Ды і сам каму ён тэлефанаваў? Хіба што таму прадпрымальніку. Так добра цяпер тут, такі быў добры вечар — і няма з кім падзяліцца гэтым ціхім шчасцем. Хіба што баба ды гэтае дзяўчо... Хутчэй бы ў меншага брата заканчваўся лагер (маці аддала яго ажно на дзве змены). Сяргей бы навучыў і яго лавіць рыбу, разам бы хадзілі па грыбы. Можа, Юрысу патэлефанаваць? Няхай бы прыехалі з Лёшкам на рыбалку, дні на два. Начаваць жа ёсць дзе, хата вялікая. Зранку патэлефанаваць трэба. Абавязкова...

Ужо збіраўся ісці ў хату, як у лазні пачулася (ці здалося?) нейкае шаргаценне. Прыслухаўся — так і ёсць, нешта там варушылася.

«Вожык залез,— падумаў Сяргей.— Дзверы ж прыадчыненыя. Вызваліць трэба небараку, там па-

рог высокі, сам не выберацца». Зайшоў у лазню, пасвяціў запальнічкай. На падлозе нічога не было відаць. Прыўзняў запальнічку вышэй — на чорным ад часу і пары палку спала Ксюха, падклаўшы пад голаў дзве свае далоні. Здавалася — яна ўсміхалася нечаму ў сне. Мяшэчак з рыбай і хлебам ляжаў побач з ёй.

Нешта комам падступіла да горла. Сяргей выйшаў ціха ў прымыльнік, пасвяціў сабе — недзе тут павінен вісець вялікі махровы ручнік... Вось ён. Зняў, вярнуўся ў парыльню і, у поўнай цемры ўгадваючы цела на палку, прыкрыў ручнікам дзяўчыну. То цяпер цёпла, а пад раніцу будзе золка.

Ціха выйшаў, асцярожна, каб не зарыпелі, прычыніўшы дзверы.

Засынаючы, нечакана ўспомніў той дотык да галавы дзяўчыны. Мяккія ў Ксюхі валасы. І цёплыя.

## 8

Баба Каця пабудзіла Сяргея, як ён і прасіў,— калі сонца прыўзнялася над лесам. Сяргей узяў кошык, пачакаў момант, калі баба выйшла за хлеў, і хутка прыхапіў падрыхтаваны з вечара вялікі цэлафанавы мяшок. У лесе ён скіраваўся напрасткі да таго самага Ксюхінага поля. Не спяшаўся, але ішоў шпарка. Надта не зіркаў па баках, але ж вось цікава — грыбы, маладыя баравікі, проста лезлі сёння пад ногі. Нібы нехта ўладны, усёмагутны грыбы з тых патаемных мясцін сабраў ды расставіў на шляху Сяргея. Можа, каб дарога была даўжэйшая, можа, каб перадумаў Сяргей, не хадзіў на Ксюхіна поле, каб збіраў баравікі, а не тыя каноплі.

«Нічога, і баравікоў назбіраю, калі такая ўдача, і канопляў...» — думаў Сяргей над гэтым незвычайным

ураджаем баравікоў на ягоным шляху. Тут не хочаш, а пачнеш думаць над нечым ірэальным: во адзін маладзенькі баравічок ледзь ўратаваўся ад красоўкі: яшчэ б імгненне, і Сяргей бы яго проста расціснуў, бо затуліўся каласавічок старым лістком. Гэты зрэзаў, а вока ўжо другі прыкмеціла — на колькі крокаў убок. Падышоў, а там ужо два, другі яшчэ лявей ад першага. Зрэзаў, у кошык паклаў, азірнуўся звыкла — яшчэ адзін вабіць чорна-брунатнай шапачкай, за ім ужо трэба наагул назад вяртацца...

«Гэтыя зрэжу і пайду прама,— вырашаў штораз Сяргей.— Зраблю справу — пахаджу па грыбах». Але як пройдзеш міма чарговага прыгажуна! Два крокі ўбок ступіць не цяжка. Ды і не ўцячэ тое поле...

Вось і яно ўрэшце. Сяргей пастаяў збоку ў густым кустоўі, прыслухаўся: нідзе нічога не чуваць. Асцярожна прабраўся ў зараснік маладога бярэзніку. Пабачыў там вытаптаную паляну. Пасярод яе на разасланай дзяружыне ляжалі тоўстым слоем сарваныя каноплі. Відавочна — учора сарваныя, толькі прывялі.

Сяргей стаў абходзіць паляну. Велічыня яе ўразіла: яна была не круглай, а вузкай і выцягнутай. Адзін канец яе пачынаўся ад тых чатырох бярозак, а другі спускаўся ў невялікае, высахлае цяпер балотца. І Сяргей пераканаўся, што менавіта тут каноплі сеялі спецыяльна, бо болей ад бяроз яны раслі ўжо не асобнымі купкамі, а суцэльнай сцяной. Трава на зямлі была сухая і жорсткая, без расы, чаплялася за ногі.

«Сапраўдная плантацыя...»,— падумаў Сяргей, адставіў убок кошык, разгарнуў мяшок. Збіраў каноплі спакойна, не баючыся, што яго тут нехта пабачыць: месца не грыбное, выпадковыя людзі сюды не зазірнуць. А гаспадары поля былі ўчора — бач, нарыхтавалі сушыцца...

Праз гадзіну рукі яго сталі рудавата-зялёнымі. Ад моцнага дурманлівага паху не было паратунку. Нават галава пачала балець. І мяшок запоўніўся амаль напалову.

«Досыць на сёння»,— вырашыў Сяргей. Трэба дыхнуць на чыстым паветры. Месца для сушкі канопляў Сяргей прыгледзеў яшчэ раней. Шырокай паскай сінеў сярод бяроз і асін гушчар ельніку. Грыбы там ніхто шукаць не будзе — зямля ўсланая ігліцай, сухая, ды і прабрацца праз калючы зараснік — не вялікае задавальненне. Сяргей літаральна на кукішках поўз, цягнучы за сабой мяшок. Кошык з грыбамі пакінуў пад першай елкай. У сярэдзіне гэтай густой паласы ельніку трапляліся невялікія прагаліны. Але Сяргей абраў для сябе невысокую разлапістую елку. Падпоўз пад яе, нажом разрэзаў мяшок. На адной яго палове разраўняў змяты свой «збор», другой паловай мяшка прыкрыў. Вось так будзе добра. І дождж пойдзе — не страшна. Адламаў яшчэ некалькі сухіх галінак елкі, кінуў згары — не так у вочы кідацца будзе выпадковаму грыбніку, які адважыцца сюды палезці.

Ён і сам не ведаў дакладна, навошта яму тыя каноплі. Але той факт, што яны каштуюць грошы, стрэмкай сядзеў у ягонай свядомасці, і не было моцы пазбавіцца гэтага пачуцця: вось жа, грошы — рукамі бяры, чаго ты міма ходзіш? Сяргей разумеў усю рызыкоўнасць справы, ведаў, што пераступае мяжу закона, што можа ўсё гэта скончыцца непрыемна, але як далёка быў той закон, тыя правілы ад гэтага лесу, ад гэтай паляны! Тут жа нікога! Нікога няма... Ён яшчэ і сам не ўяўляў дакладна, што будзе рабіць з гэтай насушанай каноплі, але пакідаў на потым тыя думкі. Ёсць магчымасць — рабі...

...Доўга хадзіў потым па грыбах, ногі збіў. Нібыта ў зямлю пахаваліся тыя грыбы, якія гадзіны тры таму проста самі лезлі пад ногі. Ледзь дабраў да поўнага.

З кошыкам адразу рушыў на трасу. Там ужо стаялі колькі чалавек — таксама прадавалі грыбы і чарніцы.

Сяргей стаў воддаль, за імі, каб не казалі, што забег наперад. Паставіў кошык на зямлю, дастаў цыгарэты. Падносячы запальнічку, адчуў, які вострыя пах ідзе ад ягоных рук. «Памыць трэба хутчэй. І самому памыцца. Прасмярдзеў дрэнню...»

Не паспеў падпаліць, як мякка прашамацелі колы аўто побач. Азірнуўся: жанчына-пасажыр з пярэдняй сядушкі дзівілася на яго кошык з захапленнем.

— Не перабраныя? — спытала яна.

— Не, толькі з лесу,— адказаў Сяргей, схаваў цыгарэту ў кішэню.

Жанчына выйшла, прысела ля кошыка, брала па чарзе баравічкі, аглядала.

— Бач, якія ладныя, чысценькія. Вадзім, вазьмі з багажніка наш кошык!

Кіроўца прынёс свой кошык — на выставу з такім, а не ў грыбы. Спытаў, колькі Сяргей хоча за грыбы.

— Ну, не важыў... Першы раз прадаю...

— Эх ты, не выйдзе з цябе камерсант,— усміхнулася жанчына.— Вадзім, учора на рынку за прыблізна такі кошык колькі пыталі?

Мужчына адказаў, дастаў партманет і адлічыў грошы, працягнуў Сяргею.

— Бяры, грыбнік.

— Дзякуй, шчаслівай дарогі! — Сяргей стрымаў сваю радасць: ён разлічваў на суму ўдвая меншую.

Настрой быў цудоўны — гэтак добра пачаўся дзень!

Хата была прымкнёная — баба Каця таксама падалася ў лес. Управіла сваю гаспадарку: восем курэй і чародка гусей — і пайшла. З сабой у яе два кошыкі, адзін простакутны. З лыка, вядома, яго баба носіць за плячыма. Туды — грыбы. І другі, таксама з лыка. Зручная ручка, але ёсць і лямкі закінуць за плечы ці, калі на плячах месца ўжо занятае, павесіць сабе на грудзі. То для ягад. У кошыкаў свая назва: вярэнькі. Чаму вярэнькі, невядома. Але цікава...

Сяргей знайшоў ключ у схованцы, пра якую ведаў. Стаў адчыняць дзверы, як з агарода, з боку лазенькі, пачуўся кароткі, нейкі ненатуральны смяшок: «Хі-хі». «Ксюха? — здагадка ўзнікла сама сабой.— Ну, зараз папытаюся, як спалася на голых дошках».

Напіўся вады (во чаго хацелася яшчэ ў лесе), пайшоў у агарод.

Першае, што кінулася ў вочы: закіданы рэшткамі смажанай рыбы — галовамі, косткамі, крошкамі і кавалкамі хлеба стол. Літаральна так, як бывала тут уранні пасля бацькавых «пасядзелак». І першая думка апякла: тут бацька.

Але то быў не бацька. Хлопец, даўганогі, у адных шортах, загарэлы да чарнаты, з на дзіва белымі, коратка падстрыжанымі валасамі, засяроджана нешта рабіў на сваіх каленях. Побач на лаўцы сядзела Ксюха і заваражана, ну, зусім як на ўчарашні паплавок, глядзела на рукі хлопца. Сваім прыродным пачуццём маленькага звярка яна адчула прысутнасць трэцяга — Сяргея — і ўскінула на яго кароткі цікаўны позірк: ёсць для яе небяспека ці не.

— О, Сяргей прыйшоў! — У яе вачах ужо была толькі непасрэдная радасць і больш — ніякіх

пачуццяў.— А мы з Венькам касяк набіваем, зараз будзем каштаваць, ці добрая...

Хлопец — Венька — з-пад ілба назіраў за Сяргеем. У позірку нічога добрага не было, толькі насцярожанасць.

Сяргей стаяў, збянтэжаны ад пабачанага. Злосць гарачай хваляй уздымалася ў ім аднекуль знізу і спакваля насычала цягліцы цела пругкасцю і сілай ад лытак ног да кулакоў.

Хто ён такі? Якое ён мае права сядзець тут, і не проста сядзець, а есці, свінячачы за яго, Сяргеевым сталом? Хто дазволіў яму тут паліць наркату? І яшчэ адно вярэдзіла, ад чаго было балюча: учора Ксюха так аддана глядзела на яго, Сяргея, учора яна тут была такая шчаслівая ад простых і зразумелых рэчаў. А сёння яна есць вачыма гэтага Веньку, глядзіць на яго, сядзіць ля яго, як... служка ля гаспадара.

— Цябе сюды хто клікаў? — са спакоем, у якім адчуваўся выклік, звярнуўся Сяргей да Венькі.

— Чувак, чо, лаўкі шкада?

У голасе Венькі была прапанова міру і адначасна — папярэджанне, што тут баязліўцаў няма.

— Ты вушы мыў? — пайшоў на абвастрэнне сітуацыі Сяргей, бо не збіраўся ніколькі «сябраваць» з гэтым нарыкам. Тое, што Венька — наркаман, казалі ягоныя вочы: крыху пукатыя, з чырвонымі павекамі. Пра гэтыя прыкметы не аднойчы казалі ў школе на розных лекцыях ды акцыях.— Я спытаў цябе: хто цябе сюды клікаў? — з пагрозай паўтарыў пытанне Сяргей.

— Во, Ксюха паклікала,— паблажліва адказаў Венька, паслінявіў край паперчыны, згорнутай у трубку.— Харэ гнаць, сядай, касяк вялікі, на траіх хопіць.

— А ён не ўмее,— захіхікала Ксюха.— Навучы яго, Вень.

Сяргея перамкнула.

— І не збіраюся вучыцца. Пайшоў адсюль. І хуценька.

— Нарываешся, чувак,— спакойна адказаў хлопец, але ўстаў з лаўкі.— Хадзем, Ксюха.

Ксюха з гатоўнасцю падхапілася з месца.

Венька прыпыніўся ў кроку насупраць Сяргея, змерыў насмешлівым позіркам:

— Не па паняццях жывеш... Сустрэнемся яшчэ, чувачок.

— У адным месцы бачыў я твае паняцці. Падарунак паабяцаць? — Сяргей сціснуў кулакі і ледзьледзь памкнуўся наперад.

— Мы табе падарункаў наробім. Не панясеш...

— Шчэ тут пастаіш момант і гаўкнеш хоць слова — цябе адсюль панясуць.

Венька толькі выскаліўся, але адказваць не стаў: зразумеў, што Сяргей не жартуе.

— Ксюха! — бы сабаку, павабіў за сабой Венька дзяўчыну, загадаў: — Вядзі да цёткі...

Яны пайшлі, а Сяргей яшчэ колькі часу стаяў, застыўшы на адным месцы. У гэтыя хвіліны ён адчуваў сябе не проста абкрадзеным. Быццам нехта нахабны, брудны, залез у ягонае жыццё, насвінячыў там. Утаптаў у свой бруд усё светлае і добрае.

«Няблага пачаўся дзень...» — прамовіў Сяргей свае думкі там, на трасе, калі за добрыя грошы прадаў той кошык баравікоў. Маці некалі даводзіла яму, што ўсё дрэннае, што спаткае нас у жыцці,— тое не пакаранне за нейкі ўчынак, а перасцярога. Ты нешта не тое зрабіў, не так рабіў, не па-людску — вось і атрымлівай ды радуйся, што так, а не горай.

Сяргей паверыў бы ў гэтую «тэорыю», але дзе і што сёння ці ўчора ён зрабіў няправільна? Сёння — краў каноплі на тым полі? Дык гэта ж не ў людзей дабро красці! Не хлеб ён краў!

Толькі нечага не выходзілі з галавы тыя ранішнія баравікі на ягоным шляху, нібыта некім адумысна расстаўленыя, абы толькі не дайшоў ён да таго Ксюхінага поля...

А як добра ўсміхалася ў сне Ксюха на палку ў старой лазні і як агідна хіхікала сёння...

## 9

— Сынок, што ж ты ўдумаў? — Сяргей першы раз бачыў такі позірк маці. Не, і раней яна глядзела на яго і з маленнем, і са здзіўленнем. Але цяпер яна хоць і сказала «сынок», ды звярталася быццам да іншага чалавека. Бо быў у ейных вачах страх.

Маці прыехала ўвечары. Сяргей адразу сказаў ёй пра тое, што збіраецца праз суд даведацца, хто яго сапраўдны бацька.

— Што ты маўчыш, сынок?

— Я не хачу, каб мяне называлі байструком,— адказаў ціха, але цвёрда.

— Ты не байструк, Божачка. Што ты хочаш ад п'янага чалавека? Ён бацька твой...

— Чаго ён мяне так ненавідзіць? Чаму ты ніколі не заступаешся, калі ён мяне байструком называе?

— Бо не трэба п'янаму пярэчыць.

— А цвярозы ён лепшы?

— Сыночак, трэба вучыцца прабачаць. Тады і нам даруюцца нашыя грахі.

— У чым я грэшны? У тым, што жыву?

— Вой, сыночак, усе мы грэшныя.

— Я табе сказаў: не хачу, каб мяне называлі байструком.

— Я ж кажу табе, сынок: ніякі ты не байструк. І бацька твой гэта ведае. То я вінаватая, неданасіла цябе.

— Ну і выдатна! Я яму цвярозаму тое заключэнне экспертаў у пысу суну, каб падавіўся!

— Сяргей, Сяргей! — Голас маці стаў суворым.— Нельга так! Ён бацька твой!

— А яму можна,— насмешліва адказаў Сяргей.— Ён мяне для таго і нарадзіў, каб выхоўваць тым газавым шлангам, абзываць, кпіць... Досыць з мяне! Я табе хацеў сказаць, прасіць хацеў, каб кідала ты яго, каб сюды, да бабы пераехалі жыць разам. Я што, не бачыў, як ён з цябе здзекуецца? Чаго ты трываеш?

— Я трываю, бо гэта мой крыж,— ціха адказала маці.— Ты гэтага пакуль не зразумееш.

— Ага, куды мне!

Тут баба Каця выйшла з сянец:

— Ты свой крыж нясі, ды пра дзяцей думай. Казала я табе — кідай, не будзе жыцця. Дык во цяпер ужо і сын просіць. Гэты чалавекам вырас, Бог дапамог насуперак усяму. А як у малодшага скалечыць душу? Крыж гэта яе! То нечага на дзяцей яго ўзвальваць.

— Мама, не лезь у маё жыццё!

— Не лезу! — узвілася раптам баба. — Во колькі гадоў не лезу — і ўнук да мяне жыць прыйшоў, у сваёй хаце яму месца няма. Сама як цень ходзіш, забылася ўжо, як смяяцца.

— На ўсё воля Божая,— ціха, але непахісна прагаварыла маці.

— Во, Лідка, во, дзіця,— з болем працягнула баба Каця.— Ты душу сваю супакоіш, а дзеці? Ты думала пра іх?

— І дзяцей Бог не пакіне.

— Гэта які Бог дазволіў маткам дзяцей на яго скідваць?! — з адчаем спытала бабуля.— То хай дарослых да сябе такіх прыбірае! — выгукнула са злосцю.

— Ды досыць вам,— Сяргей памкнуўся пайсці да лазні.

— Сын, пастой,— папрасіла-загадала маці.— Не рабі нічога, не збірайся на дурную справу.

— Якую справу, Сяргейка? — спуджана спытала баба Каця.— Што ты збіраешся рабіць?

Сяргей прыпыніўся і, робячы націск на кожным слове, сказаў:

— Я хачу, каб суд правёў экспертызу. Я хачу ведаць і я буду дакладна ведаць, ці бацька мне мой бацька.

— Я ж сказала табе! — умольна выгукнула маці.— Хочаш, я на калені перад табой стану, перад абразамі паклянуся?

— Вой, Сярожанька, што ж ты ўдумаў, унучак родненькі! — ці не загаласіла баба.— Хто ж гэта бачыў такое...

— Не трэба мне клясціся,— ледзь стрымліваючы свой адчай, загаварыў Сяргей.

Яго душыла крыўда: як жа так, гэтая экспертыза толькі на радасць маці, яна ж кажа, што бацька Сяргея — яго цяперашні бацька. Ды хіба не трэба раз і назаўсёды заляпіць п'яны бацькаў рот сапраўднай паперкай з пячаткай, каб на ўсё астатняе жыццё заціх, каб дакараў сябе, колькі жыў...

— Чаго ты баішся, мама? Няхай ён баіцца, няхай яму будзе сорамна!

— На ўсё воля Божая,— зноў завучана адказала маці.

— Ну, калі на ўсё ягоная воля — то і на мяне таксама! — нечаканая знаходка акрыліла Сяргея.— Будзе воля Бога, як ты кажаш, будзе і экспертыза. Не дазволіць Бог — не будзе.

Маці замаўчала, яна, па ўсім, разгубілася ад адказу сына. Але калі загаварыла, Сяргей зніякавеў: ён ніяк не чакаў пачуць цяпер у голасе маці металічныя ноткі і нават адразу не змог асэнсаваць тое, што пачуў:

— Апрача Божай волі ёсць воля бацькоў. І дзеці не могуць ісці супраць іх волі, як людзі не могуць ісці супраць волі Божай. Калі такое адбываецца, Бог адварочваецца ад людзей, а бацькі — ад дзяцей.

Сказала — і пайшла з двара, на вуліцу: нечакана ўпэўненай хадой, падкрэслена выпрастаная, са сціснутымі вуснамі.

Сяргей пайшоў туды, куды збіраўся — да лазні, развесіць прасоленую рыбу на прасушку.

Баба Каця прыйшла следам.

— Сяргейка, патлумач мне, што ты ўдумаў, га?

Прысела на лаўку, знясіленая ад гаворкі, ад дзённых турбот. Пакрыты глыбокімі зморшчынамі твар свяціўся дабрынёй, а ў куточках выцвілых вачэй блішчэлі слязінкі.

— Ды нічога такога, баб, не перажывай,— адказаў Сяргей, не перапыняючы работы — нанізваў рыбу на тонкую драціну.— Ён кажа на мяне — «байструк». Усе шаснаццаць гадоў абвінавачвае маці ў нечым. Вось... А я цяпер дарослы, магу сам. Карацей, цяпер суд можа правесці генетычную экспертызу і дакладна сказаць: я бацькаў сын ці байструк.

— Гэта паводле крыві? — нечакана зацікаўлена спытала баба Каця.

— Паводле крыві, баб. Ёсць у кожнага чалавека гэтак званы генетычны код. У родных людзей ён падобны. Усе справы.

— А мо не трэба, унучак? Што ж бацька тады скажа?

— Мне ўсё адно, што ён скажа.

— Дык сорам жа які... Дзе ж такое бачна, каб сын праз суд жывога бацьку шукаў? — заківала ў скрусе галавой бабуля.— Да чаго свет дайшоў...

— Хай яму сорамна будзе. Я ў тую кватэру ўсё адно такім не вярнуся. Не выганіш, то ў цябе во жыць буду.

— Як жа мне цябе выганяць? Што ты кажаш такое? Я і хату на цябе ўжо адпісала.

— Гэта як — адпісала? — прыпыніўся Сяргей.

— Во памру, то хата твая будзе. Згодна дакументаў. Ніхто не забярэ... Унучак, не сарамі маці. У горадзе казаць стануць. Нашто, каб імя яе паласкалі і тваё?

— Баб, дык жа калі Бог супраць, то выправіць,— паспрабаваў аджартавацца Сяргей.

— Бог людзям не забараняе нічога...

— Во як? Дык нашто ён тады трэба? — шчыра здзівіўся Сяргей.

— Бог чалавека стварыў і волю яму даў.

— Якая ж у мяне можа быць воля, калі, як ёсць Бог, то ёсць лёс, дзе ўсё прадвызначана?

— Так, лёс ёсць. І Богу ўсё ведама.

— Баб, не можа так быць: альбо воля, альбо лёс, Богам вызначаны.

— Не, унучак,— цярпліва стала тлумачыць баба.— От глядзі — яблыня. Камель у яе адзін, а далей — тры сукі вялікія, ад кожнага сука яшчэ галіны, ад тых галін — яшчэ галіны. От то і ёсць твой лёс, Богам дадзены: абірай, якой галінаю да сонца выбірацца. Бог табе не стане нідзе замінаць. Але ён ведае, чым кожная галінка заканчваецца, чым твой шлях абраны скончыцца.

— Во як? — Сяргей агаломшана глядзеў на яблыню.— А і праўда, вось не прыйдзі я да цябе — усё б іначай было. Не пайдзі тады на рыбалку — і... Слухай, баб, дык твой Бог глядзіць, ведае — і што робіць? Нічога? На ляд людзям такі Бог?

— Бог не толькі глядзіць, унучак,— не пакрыўдзілася баба.— Ён нам падказвае, перасцерагае, вучыць... Трэба толькі яго навуку бачыць, слухацца ягоных падказак. Бог як бацька добры для дзяцей сваіх: любіць і церпіць, калі паўшчувае, калі па азад-

ку шлёпне. А калі адракаюцца ад яго дзеці, перастаюць слухаць, то і Бог ад іх адварочваецца. Але ж некалі за ўсё нам плаціць, за ўсё адказваць... То ты падумай, унучак: са злосцю ды нянавісцю ў сэрцы добрыя справы не робяцца.

## 10

Сонца яшчэ толькі ўздымалася. Сяргей прыхапіў спінінг і сцяжынкаю паспяшаўся да ракі. Нешта сёння было халаднавата. І неба ў аблоках, толькі на ўсходзе чыстае, але і туды напаўзаюць ірваныя паскі бялявых хмурынак.

План на сённяшні дзень быў простым: цяпер во — рыбалка, потым у лес. Пашанцуе, то прынясе грыбоў. Не — збярэ яшчэ паўмеха каноплі. З таго Ксюхінага поля яе можна вазамі вазіць...

Не патэлефанаваў учора хлопцам... Ну і няхай, ён не абавязаны ўрэшце ім адпачынак ладзіць. Раз ён нікому не патрэбен, то і яму ніхто тут не здаўся. Во ўвечары Ксюха прыйдзе, пойдуць зноў плотак лавіць. Мо ўжо з'едзе гэты Венька адсюль. У бабы Каці трэба спытаць коўдру якую ды пад галаў што — і няхай сабе Ксюха начуе спакойна ў лазенцы.

Вада ў рацэ падалася нейкай халоднай. Нібыта чужая, невядомая. Мо тое з-за неба, шэрага ўжо цалкам. Шэрая вада, сталёвага колеру. Небяспечная, варожая...

Не шанцуе сёння: і дзясяты, і дваццаты закід спінінга — ні аднаго штуршка. Хоць бы дзеля смеху нешта шмарганула хоць адзін раз. Блясну змяніў, кідаў і кідаў, аж рука стала нямець. Дзве гадзіны мінула, і толькі потым хапіў блясну шчупачок, зялёны яшчэ зусім, маленькі. Лепш бы яго наагул не было — сорамна вяртацца з такім уловам. Кволая надзея, якую быў ажывіў гэты шчупачок, хутка згасла:

яшчэ закідваў, усё далей і далей ідучы ўверх па плыні, і нічога, хоць ты плач ад крыўды.

Не шанцавала.

«Дурань, хоць бы вудачку ўзяў, плотак бы нацягаў,— лаяў сам сябе Сяргей.— Вось жа не шанцуе... Нічога, у іншым месцы будзе ўдача»,— паспрабаваў падбадзёрыць сам сябе, але лёгкая трывога, якая апусцілася ў ягоную душу нібыта з шэрага ранішняга неба, падрасла, не давала спакою, быццам казала, што няўдачы гэтага дня яшчэ толькі пачынаюцца.

«Ат, рыбалку такую!» — вырашыў Сяргей, азірнуўся назад: кіламетры за тры зайшоў. Мільганула і згасла кволае жаданне ісці назад, закідваючы спінінг. Няўдача нібыта падганяла яго: хутчэй у лес, абвергнуць тое дурное прадчуванне.

Ужо і дзень разгарэўся — сонца свяціла праз густое мроіва размытай плямай, але было нечакана горача. Задуха напаўзала ад ракі. Мабыць, будзе навальніца. Даўно пара дажджу прайсці, баба Каця штодня пазірае на неба і слухае прагноз надвор'я па тэлевізары. Ды і Сяргею надакучыла штовечар вёдрамі ваду са студні цягаць, паліваць змарнелыя грады. Трэба паспяшыць. На дождж раней абеду не сабярэцца, але ж нельга марудзіць.

Бабы дома не было. Стаяла на стале патэльня з яечняй, малако, аладкі ў талерцы. Хутка перахапіў, за кошык — і пашыбаваў напрасткі праз бабін агарод у лес, не выходзячы на вуліцу.

Лес быў ціхі-ціхі, рыхтык замерла ў ім усё ў прадчуванні нейкай дзеі, адно ў вяршынях дрэў уладна шумеў вецер. Дзіўна, але ж у полі ветру зусім не адчувалася...

Сяргей ішоў хутка, нешта нібы падганяла яго. Непрыемная сухасць травы пад нагамі быццам падказвала: няма тут грыбоў. Ішоў і ішоў далей, зда-

валася, не абіраў дарогі, а ногі самі неслі яго на тую паляну.

Магчыма, таму, што недзе ў глыбіні свядомасці жыла думка: там, ля тых бяроз можа сядзець дзяўчына. Баязлівая, адзінокая, безабаронная...

На Ксюхіным полі, як называў паляну Сяргей, адчуваўся подых гарачага ветру. Каноплі былі сухімі, жорсткімі, а пах ішоў ад іх такі, што ажно ў носе казытала і лёгка тлуміла ў галаве.

«Гэта ж колькі тут гэтай заразы...» Раптам уявілася, як на гэтае поле збіраюцца наркаманы з усіх куткоў, хапаюць суквецці, сядаюць проста на зямлю, паляць — і вось ужо ўсё поле займаюць не людзі, а прыдуркаватыя істоты з пукатымі вачыма... Адагнаў ад сябе відовішча.

Ля бяроз нікога не было. Прыслухаўся. Ціха... І птушкі ніякай не чуваць. Што тут рабіць птушкам, у такім смуродзе... Сеў, выцягнуў ногі, абапёрся спінай і галавой аб шурпаты камель. Прымружыў вочы і слухаў, як шуміць бяроза...

Далёкі смяшок прагучаў і замёр. Сяргей імкліва прысеў на кукішкі, прыслухаўся — нідзе нічога. «Падалося»,— падумаў, а той смяшок нібыта чакаў гэтай думкі хлопца, прагучаў зноў: выразны, гучны і непрыемна хвалюючы, знаёмы.

Нешта падказвала Сяргею, што трэба сыходзіць адсюль, бегчы ў лес, уцякаць ад гэтага поля і смеху на ім, але ён устаў і некалькі крокаў асцярожна зрабіў у кірунку гукаў — акурат у гэтым баку быў зараснік таго маладога бярэзніку. У бярэзніку было нешта кшталту будана: некалькі маладых бярозак былі надломлены-надсечаны на ўзроўні метра ці болей, схіленыя да цэнтра верхавіны ўтваралі дзіравы дах. Сценамі служылі некалькі яшчэ ссечаных меншых бярозак, лістота на якіх ужо скруцілася, згубіла свой бляск.

Сяргей адразу не змог разгледзіць: што там, у гэтым будане, адно бачылася нейкая валтузня. Яшчэ бліжэй падышоў, і зноў пачулася знаёмае (ужо дакладна знаёмае!) бязглуздае «хі-хі». Так хіхікала толькі Ксюха. Гэта ўразіла яго настолькі, што, пакуль нічога не разумеючы, не ўяўляючы нават з кім і з чым ён можа тут сустрэцца, чаго хіхікае Ксюха, Сяргей зрабіў яшчэ некалькі ўжо неасцярожных крокаў да будана.

Нічога не хруснула пад нагой, а раптоўна перад Сяргеем расціснутай спружынай паўстаў Венька. Ён выглядаў бы карыкатура на юнака — такі быў худы. Ногі яго былі прыгнутыя, сам сціснуўся і трымаў, крыху высунуўшы перад сабой, вялікі тоўсты нож.

«Гэта ж штык-нож ад аўтамата Калашнікава»,— падумаў Сяргей, і думка гэтая здавалася вось цяпер вельмі важнай, найгалоўнейшай.

— А, чувачок прыйшоў! — пачуў Сяргей выціснутае праз зубы.

У гэтых слоўцах, у паставе Венькі, а галоўнае — у ягоных вачах Сяргей адчуў столькі нянавісці, злой рашучасці, што раптоўна зразумеў: калі ён не зрушыцца з месца, у наступнае імгненне ўкураны наркаман кінецца на яго. Проста з выстаўленым наперад штык-нажом...

— Хі-хі-хі,— пачулася раптам з будана.— Венька, не рэж Сяргея, ён клёвы, рыбы не шкадуе. Сяргей, хадзі сюды, утраіх будзем, хі-хі-хі...

— Валі, чмо! — яшчэ з большай пагрозай прамовіў Венька, нават не азірнуўшыся назад.

І Сяргей адступіў крок, яшчэ адзін, не зводзячы вачэй з ляза штык-нажа. Потым зірнуў у вочы Веньку і сцяўся: там была толькі звярыная злосць, там не было нічога, што б нагадвала хоць пра які інтэлект, розум чалавечы.

— Ы-ы-ы! — Венька ірвануўся ў кірунку Сяргея, і толькі кошык у руках уратаваў: хутчэй інстынктыўна, чым абдумана, Сяргей рэзка ўзмахнуў ім перад сабой, адначасна б'ючы нагой па выстаўленай наперад назе Венькі. Лазовы кошык выцяў збоку скіраваную наперад руку з нажом, Венька нязграбна крутнуўся, упаў...

— Вень-ка-а-а! — заверашчала дзіка ў тым дзіравым будане Ксюха і выскачыла з яго: — Гад, не чапай Веньку! Парву!!!

Сяргей спужаўся толькі цяпер — спужаўся не нажа ў руцэ Венькі, не самога Веньку, які стаў уздымацца на кукішкі, а Ксюхі. З выпуклымі чырвонымі вачыма, у якіх застыла лютасць, з перакошаным разяўленым ротам, узнятымі крыху ўгару рукамі з растапыранымі, скручанымі пальцамі, яна была падобная да нейкай містычнай істоты з фільма жахаў. Гэта была Ксюха — і гэта не была Ксюха. Сяргея перасмыкнула ўжо ад агіды, страх здушыў горла: яму раптам уявілася, што гэтая фурыя кінецца на яго і ўвап'ецца ў горла сваімі зубамі...

Усё гэта працягвалася толькі адно імгненне, а ў другое Сяргей ужо бег праз зараснік каноплі, бег, не абіраючы кірунку, у свядомасці білася толькі адна цвярозая думка: леваруч нельга бегчы, там балаціна...

За ім ніхто не гнаўся, ён разумеў гэта, але цяпер не страх гнаў яго, а агіда і адчай.

Спыніўся, пакрысе супакоілася дыханне.

Але не супакоіліся думкі, наадварот, скакалі адна праз адну... «Як жа так, як жа так магло атрымацца!?» — балюча стукала ў скронях галоўнае. Сяргей ніяк не мог спалучыць у адзінае: Ксюха, такая слабая, безабаронная істота, якая так цешылася злоўленым рыбінам, якая так шчыра, падзіцячы была шчаслівая тым вечарам, якая колькі

разоў пазірала на яго, Сяргея, з захапленнем, сёння згубіла ўсё чалавечае, ірвалася дзікім зверам на яго, Сяргея, каб дзерці, кусаць...

Думкі шукалі адказу, адказу прагнуў распалены мозг, і адказ знайшоўся. Не надта складаны, бо ўсё ж было побач: то яна, нарката, то каноплі, вось што віной... «Колькі ёй трэба выпаліць гэтай дрэні, каб забыць на ўсё чалавечае? Колькі яе самой ёсць... Пераціснеш адной рукой. Не, дакладна яна сказала напачатку: Венька — сволач! Ксюху ён скарыстоўвае, як захоча. То не для сябе збірала каноплі Ксюха — вось каму. Бо ведала: будзе здзекавацца, будзе біць... І паліла цяпер з ім, бо прымусіў...» — Сяргей быў упэўнены ў сваёй выснове. І дакладна ведаў: Ксюху білі, не аднойчы білі — вунь як яна ўздрыгнула, калі ён крануўся яе валасоў. Яна любога дотыку баіцца, бо кожны дотык ранейшы быў з болем звязаны, ці са знявагай, ці з гвалтам...

«Сволачы, што яны робяць?! Каму казаць? Каму жаліцца? Каму яна наагул трэба, гэтая Ксюха?» — Сяргей звяртаўся ў думках да некага нябачнага магутнага, бо разумеў — няма ж насамрэч да каго звярнуцца з такім пытаннем. «Я — псіх»,— так казала Ксюха пра сябе. «А каму яны трэба, з псіхічнымі адхіленнямі? Тут са здаровымі зладу няма...»

Адказ быў знойдзены, і цяпер думалася лягчэй, складна думалася, хоць і пытанні адно за адным узнікалі, але адчуваў Сяргей, што сёння яму самому шукаць адказы, тут вось, у лесе, адразу шукаць, а не чакаць іх ад некага. «Як жа так можна жыць? Як можна жыць такім ксюхам? — ужо спакойна разважаў Сяргей.— Што тут на свае праблемы скардзіцца? Якія там тыя праблемы: бацька п'яны сварыцца, абзывае? Ды ляд цябе бяры, я дарослы чалавек, давучуся неяк гэты год у бабы, там — войска, пасля працаваць пайду. Ёсць у мяне за што

зачапіцца: бабуля ёсць, маці, брат меншы. А ў Ксюхі хто ёсць? Бацька? Ды які ён ёй бацька, калі кінуў у сям'і алкашоў-наркаманаў?»

Думкі віліся і віліся, пераскоквалі з месца на месца, бы камары мак таўклі ў галаве Сяргея. Ён канчаткова супакоіўся, хадзіў і хадзіў цяпер ужо незнаёмым лесам. Прысеў, запаліў цыгарэту, агледзеўся: месца было нязнанае. «Выберуся,— падумаў на гэта млява.— Я — выберуся...»

З гадзіну ён ішоў у адным кірунку, потым — у другім хвілін сорак, пакуль не трапіў у знаёмы лес. Прысеў зноў на вываранень, запаліў. Не думаў, проста адпачываў. Зрэшты, думаць асабліва не было над чым — план складзены. Перашкодзіць тыя не змогуць — яны, хутчэй за ўсё, ужо ўцяклі адтуль. Ды і калі не ўцяклі, то ўжо выветрылася дрэнь з іх галоў. А нармальных Сяргей не баяўся. Ні таго Венькі, ні Ксюхі. Абы каб ніхто трэці не падышоў...

Сяргей хутка дайшоў да ельніку, дзе хаваў сабраныя раней каноплі. Сабраў усё ў той разрэзаны мяшок і пашыбаваў з ім на Ксюхіна поле. Кошык пакінуў у ельніку.

Не тоячыся, пацягнуў мяшок у каноплі. Нагледзеў месца: тут як быццам самая густая, сухая ўжо амаль трава ўнізе...

Пайшоў у лес прама, ломячы і топчучы перад сабой расліны з дурманлівым пахам — пракладваў сцежку. Збіраў сухое сучча, цягнуў туды, дзе пакінуў свой разрэзаны мяшок і горку сабраных канопляў, зноў збіраў, зносіў... Аж пакуль куча не вырасла да той велічыні, якая задаволіла Сяргея. Потым шукаў ялінкі ў лесе, ламаў іх старыя сухія лапкі — такія загараюцца ад адной запалкі, успыхваюць — не патушыш.

Прысеў перад гарой сухога галля, выцягнуў добра змяты ў час працы цыгарэтны пачак. Зірнуў — апошняя цыгарэта. «Ну, няхай і будзе самая

апошняя»,— прыняў нечаканае для сябе рашэнне, прыпаліў і той самай запалкай падпаліў тонкія галінкі хваёвых лапак. Адно зацягнуўся і кінуў цыгарэту ў купу сушняку.

Праз тры-чатыры хвіліны полымя шуганула ўгару гарачымі языкамі, нясцерпна стала сядзець. Занялася трава здолу, курчылася ў агні, успыхвала і падала попелам лісце каноплі, агонь імкліва распаўзаўся па паляне. Густы белы дым стаў уздымацца над лесам, едкі, удушліва-дурманлівы.

«Вось цяпер паліце, дыхайце, пакуль магчымасць ёсць»,— без злосці, з'едліва думаў Сяргей, адышоўшы ў глыб лесу з надветранага боку. Спакойна рушыў да ельніку, забраў свой кошык, пашыбаваў далей у лес — шукаць грыбоў. Ён не перажываў з-за таго, што можа здарыцца сапраўдны пажар — ведаў, што дым пабачаць хутка з іх вёскі, а ў вёсцы — лясніцтва, там вышка спецыяльная назіральная стаіць. Ды і вецер гнаў полымя ў бок балотца, няма там чаму гарэць асабліва. Пабачаць дым, прыедуць — вось і няхай дзівяцца, што за ўраджаі выспяваюць у іхніх лясах, калі не могуць адразу ўгледзець...

Сяргей хадзіў доўга — можа, гадзіны чатыры. Кошык быў пусты: толькі жменька лісічак, якія за гэты час ужо і пацерліся.

Каласавічкі — яны такія: вывліснуць брунатнымі вільготнымі зоркамі на кароткі час і знікнуць. Чакай цяпер ужо сапраўдных грыбоў бліжэй да восені...

Дождж так і не пайшоў. Распагодзілася, гарачыня сушыла.

— Няма грыбоў, баб,— Сяргей паставіў кошык пад страху.— А есці што ёсць?

— Зараз, зараз,— заспяшалася баба.— Нешта ты надта змарнелы. Не здарылася чаго?

— Ды не, баб,— нявесела ўсміхнуўся Сяргей.— Заблукаў быў.

— Хто не блукае, той не ходзіць,— заўважыла баба.— Ды не пужайся, лес добраму чалавеку зла не прынясе. Пажару там не бачыў, нашыя леснікі ездзілі, нешта гарэла?

— Не, не бачыў. А лесу я не баюся,— ціха і сур'ёзна адказаў Сяргей.— Тут людзей баяцца трэба...

Ён паеў, колькі часу ляжаў на канапе, даючы адпачынак нагам — яны нязносна гулі. А на душы было лёгка. Быццам зрабіў неверагодна складаную і патрэбную справу. Яму патрэбную. І яшчэ некаму. Быў упэўнены, што дакладна некаму яшчэ патрэбную. Ксюха яго б не зразумела. І не зразумее. Ёй і ведаць не трэба.

Пасля полудня пайшоў на рыбалку, хоць вельмі хацелася ўпасці і заснуць. Але цягнула сесці на беразе ракі, глядзець на спакойную роўную плынь. Цяпер вада ў рацэ мусіць быць цёплай, сваёй...

Амаль не брала, але Сяргей ніколькі не засмучаўся. Хіба гэта так важна ў жыцці? Сяргей не ведаў, што ў жыцці галоўнае. Але гэтае пытанне яго не турбавала. Няхай галоўнае застаецца невядомым. Куды важней ведаць, што з'яўляецца другасным. Тады шлях відней...

Вярнуўся да бабы, калі сонца цалкам схавалася.

— Во не шанцуе мне сёння,— без скрухі паказаў бабе мяшэчак з некалькімі плоткамі і адным акунём.— Дзень такі ці што?

— Іншым разам пашанцуе,— упэўнена адказала баба.— Тут гэтая дзяўчына прыходзіла, чакала цябе каля лазні мо гадзіны са тры. Я яе на рэчку адпраўляла, ды яна не схацела ісці...

— Ксюха? — хутка спытаў Сяргей і адчуў нязвычнае лёгкае хваляванне.

— Чаго ж ты яе, унучак, бы тую котку ці казу клічаш? — нечакана паўшчувала баба.— Якая ж яна Ксюха?

— І праўда, баб,— усміхнуўся згодна Сяргей.— Яе клічуць Аксанай...

# СЕРТЫФІКАТ

*Школьная п'еса ў чатырох дзеях*

## ДЗЕЙНЫЯ АСОБЫ

Вольга Фёдараўна, дырэктар школы, у гадах.

Жэнька, дзяўчынка 3-4 гадоў, яе ўнучка.

Таццяна Іванаўна, настаўніца, гадоў 25—30.

Міхаіл Міхайлавіч, бізнесмен, 40 гадоў.

Ірына, школьніца, капітан каманды, упэўненая, дзелавая.

Раман, школьнік, гітарыст, спявак, паэт, сімпатызуе Ірыне.

Андрэй, школьнік, «ачкарык», надта сціплы, «батан».

Сяргей, школьнік, упэўнены ў сабе, разважлівы, разумны, сябруе з Тамарай.

Тамара, школьніца, спакойная, не надта выразная, сябруе з Сяргеем.

Лёшык (Аляксей) Грушык, школьнік, весялун, амаль блазан.

Гарадская школа невялікага горада. Дзея адбываецца напярэдадні фінальнай раённай школьнай гульні брэйн-рынг. Час пасля заняткаў, у школе пуста.

# ПРАЛОГ

На сцэне цёмна. Па чарзе героі выходзяць наперад, высвечваюцца святлом пражэктара. Размаўляюць па тэлефонах.

Ромка *(з гітарай)*. Вітаю, братуха! Слухай, Алесь, я развучыў песню. Супер! Цудоўна. Зайздрошчу табе — у тваім юнацтве такія песні былі. Хочаш, праспяваю крышку? *(Кладзе мабільнік на крэсла побач, прысядае, іграе і спявае.)*

Раскажы мне пра дождж, раскажы.
Хто ў небе збірае дажджы,
Што шматдзённа ліюць на маю галаву?
Хто ў небе збірае дажджы?
Пакажы мне сябе, пакажы,
Не чакай, покуль час прабяжыць.
Слова моўчкі аддай
І пытанні здымай,
Не чакай, покуль час прабяжыць.
Грэшны кавалак неба бачыш ты навылёт,
Што табе заўтра трэба, што табе як сваё?

Ну як, табе падабаецца? Ды ведаю я, што не з маім голасам... Слухай, ты на фінальнай гульні будзеш ад газеты? А капітана нашага сфатаграфуеш? Ты ж мне абяцаў, што здымак Ірыны будзе на першай старонцы. Хто, мы прайграем?! Ну не, прайграць мы не можам ніяк. Гэта гульня — як заключны акорд песні. У нас такая каманда ўрэшце сфармавалася — мы як адзін дыхаем і думаем. А, ну так, думаем не як адзін... але як табе сказаць, у нас мазгі кожнага нібыта разам падлучаны да нейкага цэнтра і звязаны між сабой *(смяецца)*. Ну так, спецыялізацыя нейкая ёсць... Я вось за музыку, літаратуру і жывапіс адказваю, іншыя за свае часткі... Так, я на трэніроўку зараз. Абед у лядоўні,

калі прыйдзеш раней за бацькоў. Ага, бывай. К чорту! Э, не забудзь пра здымак.

Ірына. Мамачка! Я пабегла. У кватэры прыбрала, паабедала. Ну не ведаю, колькі мы будзем. Сёння — апошняя рэпетыцыя, заўтра адпачнем, перад гульнёй. Ат, ды не перажывай ты, высплюся некалі. Ну, вось пасля фіналу і выспплюся. Не, дакладна ўжо ніякіх мерапрыемстваў не будзе... Ну што ты ўсё «не хвалюйся, не хвалюйся». А ты б не хваляваўся? Ды не ў гульні справа. Вядома ж, гэта проста гульня. Не трэба мне тлумачыць. А якая розніца, гульня ці справа якая сур'ёзная, калі ты адказваеш за ўсіх? Чаму я капітан? Сама не ведаю. Ну, абралі мяне, пацягнула. Хлопцы кажуць, ім лягчэй мне падпарадкоўвацца, чым калі б нехта з іх быў капітанам. Ды слухаюцца яны мяне, ты бачыла б, як слухаюцца. Таму і перажываю — яны ж мне вераць... Добра, мамачка, добра. Ага, да вечара...

Сяргей. Алёнка, ты забрала Кацю з садка? Малайчынка. Мама ў другую змену, ведаеш. Я сёння ў школе затрымаюся. Гуляйцеся добра, не крыўдзі малую. І пераапрані. На пліце стаіць каша грачаная, на патэльні катлеты. Разагравай у мікрахвалёўцы, пліту не запальвай. Ну, што я табе прынясу, грошай няма сёння. Заўтра. Абяцаю. Калі гэта я абяцаў і не выконваў? Ну вось і не кажы абы-чаго. Усё, урокі я дапамагу зрабіць, як толькі прыйду. Нікому не адчыняй дзверы, пакуль не паглядзіш у вочка. Незнаёмым не адчыняй ніяк. Добра, што памятаеш, але іншы раз пачуць не зашкодзіць. Будзь разумнічкай. Чакайце мяне.

Лёшык. Мама, ты прыйдзеш, не пужайся асабліва — там на кухні фіранка падралася. Ну не я гэта, не я. Васёк. Васёк, кажу, кот наш. Скокнуў на фіранку, кіпцюрамі зачапіўся... яна і паехала. Ды не чапаў я яго. Не ганяў... Мы трэніраваліся толькі. А то

ты не ведаеш... Рэакцыю я трэніраваў... Мам, гульня паслязаўтра, а ты пачынаеш крычаць на мяне. У мяне ж слабая нервовая сістэма, стануць дрыжаць рукі, зраблю два фальш-старты — і ўсё, труба. Твайго сына пасля пройгрышу каманда адправіць у рэанімацыю. Мам, ну... Во, я грошы выйграю! Заплачу за фіранкі. Ну чэсна, там прызавы фонд вялікі. Кажу, вялікі. Хопіць і мне на шакаладку. Добра, дамовіліся. Не праўда, ёсць фонд... ну, не скажу пакуль, колькі, прадпрымальнік адзін вылучыў грошы. Ага, чэсна ўсё табе аддам. Не, доўга не будзем...

Т а м а р а. Сяргей, слухай, ты мяне сёння правядзеш? Не, сёння не страшна, да ночы ж не будзем, але справа ёсць. Тут мама на выхадным была, дык у шафах рэвізію праводзіла. У мяне, як выявілася, столькі рэчаў засталося, я з іх даўно вырасла, нешта па разу-два апранала. Карацей, мы тут доўга думалі з мамай: куды дзяваць і ўспомнілі пра тваіх дзяўчынак. Многае падыдзе тваёй Алёнцы. Джынсы, спаднічкі, кофтачкі, гарнітурчык, куртачка... Ну, слухай, я ведаю, што ты горды і ўсё такое. Ды не выкідваць жа добрыя рэчы! Куды я іх панясу? Я б прынесла зараз у школу... Але ж пакет вялікаваты атрымаўся і... не хачу свяціць ім там. Дык зойдзем да мяне? Ага, выдатна, Сярожка... Пабачыш, твая Алёнка будзе шчаслівая сёння — новыя рэчы для дзяўчынкі заўсёды радасць. Усё, сустрэнемся...

А н д р э й. Алё, слухаю... Гэта ты, Анжэла? *(Усхвалявана.)* Ніяк не чакаў... Не, што ты, мне так прыемна цябе чуць... Ты будзеш капітанам? Чакай, чакай... Вось як... Бацька дапамог... Ты не рада? Разумею... Я не ведаю, што і сказаць. Я пакуль нават не магу ўсвядоміць усяго, што ты сказала... Мабыць, мне лепш выйсці з каманды... Прабач, калі ласка, ну прабач... Я падумаў, калі ты мне тэлефануеш... Ты не хочаш, каб вы выйгралі? Так, пачынаю разумець.

Што я магу сказаць? Трымайся, Анжэла. Так, трымайся. Ну, хіба яны там не людзі ў камандзе, не разумеюць? Нічога, усё некалі стане на сваё месца. Патрывай... Увечары пагаварыць не атрымаецца? Паўгадзіны толькі... Добра. Я напішу табе. Ага, зайду праз акаўнт Антаніны... Сястра неяк заўважыла ў мяне адчыненую старонку, пытаецца, што гэта за дзяўчына, ад імя якой я пішу. Рассакрэцяць мяне некалі. Што зробіш, усё таемнае некалі робіцца яўным. Так, такі закон...

## ДЗЕЯ 1

Кабінет дырэктара. Стол літарай «Т», канапа, шафа з кнігамі. Заходзіць Вольга Фёдараўна, вядзе Жэньку за руку.

Вольга Фёдараўна. Так, Жэнечка, вось твая любімая канапа ў бабуліным кабінеце, сядай. Што зробіш, калі мама твая на курсах, а тата ў другую змену. І бабе во не было клопату, дык пачала гуляць у брэйн-рынг... Што табе даць, унучачка? *(Глядзіць па шуфлядах стала.)* Фламастары ў мяне ёсць, ёсць папера... Будзеш маляваць?

Жэнька *(адмоўна мятляе галоўкай)*. Не буду!

Вольга Фёдараўна. Ну, зараз я табе кніжачак самых розных назбіраю... *(Падыходзіць да шафы.)* Ты пашкадуй бабулю, у мяне гэтулькі спраў неадкладных, такія дні адказныя...

Жэнька. Не буду!

Вольга Фёдараўна. А божачкі. Мяне шкадаваць не будзеш ці кніжкі глядзець?

Жэнечка. Усё не буду.

Вольга Фёдараўна. Ага. Зразумела. *(Сама сабе.)* Новае пакаленне абірае...

Жэнечка *(гучна, радасна)*. Пэпсі!

В о л ь г а  Ф ё д а р а ў н а *(з лёгкай скрухай глядзіць на дзіця).* А донечка ж ты мая... А што будзеш рабіць?

Ж э н е ч к а. Піць!

В о л ь г а  Ф ё д а р а ў н а *(стомлена).* Піць пэпсі не дам, ад яго зубы не растуць. Чым займацца будзеш? Што ў садку рабілі?

Ж э н е ч к а. Самалёты! Буду рабіць!

В о л ь г а  Ф ё д а р а ў н а *(радасна).* Самалёты рабілі? І ты навучылася? Вой, малайчына. Зараз я табе паперы *(перабірае розныя паперы на сваім стале).* Гэта трэба... гэта... Во, чыстая белая папера, новая. Рабі свае самалёты.

Жэнька бярэ паперу, сядае на канапе, пачынае нешта складваць. Забавілася.

Заходзіць Таццяна Іванаўна.

Т а ц ц я н а  І в а н а ў н а. Можна да вас, Вольга Фёдараўна?

В о л ь г а  Ф ё д а р а ў н а. Заходзьце, заходзьце, Танечка... Прысядзьце.

Сядаюць за стол.

Т а ц ц я н а  І в а н а ў н а. Вой, так хвалююся, Вольга Фёдараўна! Проста баюся, страх нейкі напаў.

В о л ь г а  Ф ё д а р а ў н а. Ну, хвалявацца вам і трэба, Таццяна Іванаўна, а як жа без хвалявання? Я за свае гады не адвучыла сябе ад хвалявання, а вы ж толькі пачынаеце. Верыць — вось што галоўнае. У іх трэба верыць. Вы выдатную каманду падабралі, настрой у дзяцей цудоўны... Рэпетыцыя зараз?

Т а ц ц я н а  І в а н а ў н а. Так. Апошняя, генеральная. Заўтра вырашылі дзень адпачынку зрабіць.

В о л ь г а  Ф ё д а р а ў н а. Гэта правільна. Я думаю, не трэба і сёння надта ўжо напружвацца. Пазаймайцеся трохі ды ідзіце да мяне. Перад такім фіналам

супакоіцца добра трэба. Я печыва з цукеркамі прынесла, пап'ем гарбаты...

Жэнька. Баба Воля, я хачу цукерку.

Вольга Фёдараўна. Вой, во табе, забылася, выбачай, унучка. *(Дастае з шуфляды цукерку, дае Жэнечцы.)*

Энергічны стук у дзверы, заходзіць Міхаіл Міхайлавіч. У руках — скураная тэчка для дзелавых папер.

Міхаіл Міхайлавіч. Вітаю цудоўных жанчын. Калі я не памыляюся, вы — дырэктар? *(Глядзіць запытальна-сцвярджальна на Вольгу Фёдараўну.)*

Вольга Фёдараўна. Так, дырэктар. Хто вы і што хацелі?

Міхаіл Міхайлавіч. Я — чалавек, Вольга Фёдараўна... не памыліўся, так вас называць? Зайшоў па справе... *(Ацэньваючы, аглядае Таццяну Іванаўну.)* А вы — Таццяна Іванаўна?

Таццяна Іванаўна *(трохі сумеўшыся пад нахабнаватым позіркам)*. Так, Таццяна Іванаўна.

Міхаіл Міхайлавіч. Што ж, выдатна. Я — Воранаў Міхаіл Міхайлавіч, чалавек справы, то прапаную перайсці адразу да справы.

Вольга Фёдараўна. Якой справы вы чалавек і што за справа да нас, Міхаіл Міхайлавіч? Сядайце, калі ласка, але павінна папярэдзіць, што ў нас вельмі мала часу.

Міхаіл Міхайлавіч сядае за стол, па-гаспадарску закідвае нагу на нагу.

Міхаіл Міхайлавіч. Усё залежыць ад вас. У мяне ў нашым горадзе бізнес: будматэрыялы, перавозкі. Бізнес не такі і вялікі, але ён дазваляе мне аказваць спонсарскую дапамогу школе, у якой вучыцца мая дачка. Маю магчымасць дапамагчы і

вашай школе... *(Азірае кабінет, прыцмоквае.)* Беднавата ў вас, школа старая.

Вольга Фёдараўна. Так, пачалі з прыемнай прапановы. Але, я ведаю, што за проста так такія прапановы не робяцца? Што хочаце ў адказ?

Міхаіл Міхайлавіч *(радасна).* Выдатна! Адразу бачна разумнага чалавека. Справа ў тым, шаноўная Вольга Фёдараўна, што я вельмі люблю сваю дачку. Паслязаўтра ў яе дзень народзінаў. І паслязаўтра будзе што? Правільна, фінал па брэйнрынгу. Мая дачка — капітан каманды, і я хачу, каб яна выйграла.

Фольга Фёдараўна амаль спалохана глядзіць на мужчыну.

Таццяна Іванаўна *(разгублена).* Выбачайце, але ж у камандзе нашых супернікаў капітан — хлопец...

Міхаіл Міхайлавіч. Быў. Быў хлопец, шаноўная Таццяна Іванаўна. А цяпер капітан — мая дачка. І я прашу вас пасадзейнічаць у тым, каб яна стала капітанам каманды-пераможцы.

Вольга Фёдараўна *(з насмешкай, з'едліва).* Вы разумееце, што вы нам прапаноўваеце?

Міхаіл Міхайлавіч. Вядма ж, шаноўная Вольга Фёдараўна. *(Расшпільвае тэчку, дастае аркуш памерам А4.)* Вось, прапаноўваю сертыфікат сваёй фірмы. Грашовы сертыфікат. Тут указана сума, стаіць пячатка фірмы і мой подпіс. Вам застаецца толькі ўпісаць свае даныя. І — карыстайцеся паслугамі фірмы.

Вольга Фёдараўна *(глядзіць на сертыфікат, на твары з'яўляецца цень роздуму).* Вы не зразумелі мяне, Міхайлавіч. Вы прапаноўваеце нам, каб мы прадалі дзяцей. Хоць сума... Вы шчодры спонсар...

М і х а і л  М і х а й л а в і ч. Ну, толькі не трэба так драматызаваць. Гэта элементарная дзелавая здзелка. У дзяцей наперадзе яшчэ хопіць такіх перамог. Гэта гульня. А я прапаную справу.

Т а ц ц я н а  І в а н а ў н а. Як вы так можаце? Мы, настаўнікі, павінны будзем навучыць дзяцей... такой гульні?

М і х а і л  М і х а й л а в і ч. Вы — маладая жанчына... Гэта добра, вельмі добра, Вы прыгожая... Але я вам павінен сказаць...

В о л ь г а  Ф ё д а р а ў н а. Што ўсё прадаецца і купляецца?

М і х а і л  М і х а й л а в і ч *(да дырэктара)*. Не, не так. Прадаць можна ўсё. А вось купіць — не. Не атрымаецца купіць памяць. Гандляваць памяццю можна, а купіць яе — нельга. Так, я вас папрашу, шаноўныя, гаварыць пра справу. Вас не задавальняе сума? Турбуе, што сказаць дзецям? У сертыфікаце пазначана, што вы можаце карыстацца і паслугамі. Калі ласка, бярыце мой мікраўтобус і адпраўляйце дзяцей на экскурсію... Я ўсё палічыў і ўлічыў.

В о л ь г а  Ф ё д а р а ў н а *(задумліва)*. Баюся, не ўсё вы ўлічылі. Да прыкладу таго, што Вы пойдзеце адсюль разам са сваім сертыфікатам...

М і х а і л  М і х а й л а в і ч *(усміхаючыся)*. І прайграю?

В о л ь г а  Ф ё д а р а ў н а. Так.

М і х а і л  М і х а й л а в і ч *(жорстка)*. Ведаеце, чаму мы жывём бедна? Бо мы думаем не пра рэальнасць, а будуем паветраныя замкі. Мы не бачым зямлі пад нагамі, а потым жахаемся, што забрылі ў балота. Вы, Вольга Фёдараўна, думаеце, што я — такі страшны чалавек без прынцыпаў?

В о л ь г а  Ф ё д а р а ў н а *(з гонарам)*. Вымушана прызнацца, што пакуль бачу такога.

М і х а і л  М і х а й л а в і ч. Вось, гэта тое, пра што я і кажу: не жаданне зазірнуць далей і глыбей... Так,

каб не марнаваць мне мой час, скажу наўпрост: я — чалавек справы, а значыцца, заўсёды раблю ўсё магчымае, каб дасягнуць мэты. Выйгрыш для дачкі — справа майго гонару. І яе каманда выйграе. Дарэчы, я яшчэ скажу вам, што мной са згоды кіраўніцтва вашага аддзела адукацыі ўстаноўлены прэміяльны фонд гульні. Я выдаткоўваю 450 еўра. Так што вашы дзеці атрымаюць чыста грашыма ў любым выпадку 150. Ім хопіць добра адпачыць. Паўтару: гэта справа майго гонару. І каманда дачкі выйграе. Я не адступлю.

Таццяна Іванаўна *(з жахам).* Падкупіце суддзяў?

Міхаіл Міхайлавіч *(са скрухай).* Божа, які тон, якія словы... Шаноўныя жанчыны! Як дзелавы чалавек я прыйшоў да вас з дзелавой прапановай. Чэсна прапанаваў свае тавары для рамонту, сваіх рабочых, аўтобус для паездкі дзяцей на экскурсію. Вельмі вялікая сума. Я шчыра хацеў, каб вы... нейкім чынам кампенсавалі свой пройгрыш у брэйн-рынгу. Але мушу вам сказаць, што я мог і магу цяпер абысціся куды меншымі затратамі! Мне не трэба падкупляць ніякіх суддзяў! Шасцёра вашых гульцоў — па 100 еўра кожнаму. І ўсе пытанні будуць знятыя. Нават адной сотні хопіць ці трохі больш. Ваш вядомы ў горадзе кнопачнік Аляксей Грушык здасць гульню, не задумляючыся, бо я ведаю пра яго матэрыяльнае становішча. А яму гэта не складана: трошачкі прамарудзіць з націсканнем кнопкі два-тры разы. Дзеля падстрахоўкі я куплю ўсіх астатніх — і нехта з іх дасць загадзя няправільны адказ, збакланіць, так кажуць? Увесь заўтрашні дзень у маім распараджэнні, у мяне — усе іх нумары тэлефонаў. Вы і ведаць не будзеце, хто канкрэтна вінаваты. Дык вось цяпер думайце: па 100 еўра атрымліваюць вашы гульцы — і зліваюць гульню. Мая перамога. Ці школа атрымлівае вось

гэты сертыфікат на некалькі тысяч, якога хопіць на рамонт і экскурсію. Вы разам з дзецьмі прымаеце рашэнне... Цяпер яшчэ скажыце, што я зрабіў непрыгожа, калі прыйшоў да вас з адкрытым забралам?

Вольга Фёдараўна. І як загадаеце нам патлумачыць дзецям?

Міхаіл Міхайлавіч. Не збіраюся загадваць. Вы педагог, лепш за мяне ведаеце. Мне здаецца, шчырасць, шаноўная Вольга Фёдараўна, павінна правіць баль. Шчырасць і толькі шчырасць. Дзецям самім будзе прыемна... ахвяраваць нечым сваім на карысць школы. Галоўнае, як падаць... Дарэчы, у сертыфікаце пазначаны тэрмін яго дзеяння — заўтрашні дзень. То бок, вам заўтра неабходна скласці дамову на неабходныя будматэрыялы, паездку, аформіць дакументы.

Вольга Фёдараўна. А вы і праўда... дзелавы чалавек. Умееце ставіць умовы.

Міхаіл Міхайлавіч *(задаволена)*. Так, шаноўная, так. Дакументы будуць аформлены заўтра, але там будзе пункт, што скарыстацца ўсім вы зможаце толькі праз тры дні. Пасля гульні. Я павінен падстрахавацца...

## ДЗЕЯ 2

Класны пакой, два сталы пастаўлены побач, на іх — лямпа ці званок і кнопка для націскання — атрыбутыка для брэйнрынгу. Простыя крэслы вакол стала.
Заходзяць Лёшык і Ромка. У Ромкі ў руках гітара.

Лёшык. Ба-ба-бам! Шаноўная публіка! Мы тут і цяпер! Асабліва ўражлівых, цяжарных жанчын і дзяцей папрашу заплюшчыць вочы! Лепшы

кнопачнік горада Аляксей Грушык ака Лёшык пачынае! *(Сядае за стол насупраць кнопкі, спрабуе яе — пасля кароткіх націсканняў успыхвае святло.)*

Р о м к а *(сядае насупраць Лёшыка).* Размінаешся? Што гэта з рукой?

Л ё ш ы к *(аглядвае руку, на ёй драпіны).* Лёгкія цялесныя пашкоджанні пры трэніроўцы!

Р о м к а. Ну?

Л ё ш ы к. А ты думаў! Я тут кроў сваю за вас праліць гатовы, эрудыты. Ніхто мяне не цэніць.

Р о м к а. Харэ, не трапіся. Чым падрапаў?

Л ё ш ы к. Ну, вось, сябар называецца. І ты, Брут?! І ты мне не верыш? *(Спакойна апавядае, з ніякаватасцю.)* Ды гэта... Успомніў, як адзін майстар-кнопачнік трэніраваўся дома з катом. Ну, праўда, не жартую. Рэакцыю адпрацоўваць вельмі добра. Галоўнае, каб кот хацеў гуляць.

Р о м к а. А твой хацеў, бачу? Ці наадварот?

Л ё ш ы к. Хацеў, чарцяка, але ж надта спрытны. Тут галоўнае, паспець хапіць яго за вуха і аддзёрнуць руку. Адразу не атрымлівалася. Ну, але праз гадзіну заняткаў ці то кот згубіў рэакцыю, ці то яе набыў. Правяраем?

Р о м к а. Добра. Рукі на стол!!! Бла-бла-бла. Бла-бла-бла-бла-бла. Бла-бла??? *(Робіць паўзу і адразу тузае моцна адну струну, Лёшык імгненна рэагуе, націскае на кнопку. Запытальна глядзіць на Ромку.)*

Р о м к а. Ого! І праўда, кот дапамог.

Л ё ш ы к *(усміхаецца).* А ты думаў!

Р о м к а. Працягнем.

Яшчэ два-тры разы трэніруюцца.
Заходзяць І р ы н а, А н д р э й, Т а м а р а, С я р г е й.

І р ы н а. О, малайцы якія, трэніруюцца. *(Заўважае на руцэ Лёшыка драпіны, усхвалявана.)* Што гэта ў цябе?

Л ё ш ы к *(мнецца)*. Так, дробязь... Усё нармальна.

Р о м к а. Наш Лёшык засвоіў новую методыку трэніровак...

С я р г е й. Яшчэ неставала... Пазаўтра — фінал, досыць эксперыментаў.

Л ё ш ы к. Ну, вы мяне не вучыце. А тэхніка не мной прыдумана. З жывёламі трэніравацца. У іх, ведаеш, рэакцыя якая? Кот б'е лапай — міргнуць не паспяваеш.

Т а м а р а. Ваў, ты ката ў трэнеры запісаў?

Р о м к а *(грае на гітары, спявае як частушку)*.

Лёшык Тому не цалуе
Кажа: потым, потым, Том.
Яна йдзе, а ён на кухні
Трэніруецца з катом.

Л ё ш ы к *(б'е левай рукой па патыліцы Ромку, ускоквае верхам на крэсла, ногі на сядзенні, сам — на спінцы, звычна камандуе)*. Дамы і спадары! Лэдзі і джэнтльмены! Сябры і сяброўкі! Таварышы і таварышыні! Мы пачынаем фінальную гульню!

Усе хутка сядаюць за стол, кладуць рукі на стол.

Л ё ш ы к *(аглядае пільна ўсіх)*. Пытанне такое...

І р ы н а. Дзе ты іх адшукваеш?

Л ё ш ы к. Кот падказвае. Слухаем... Ага! Каралеўскі штандар над Букінгемскім палацам у Лондане ніколі не бывае прыспушчаны, нават пры смерці манарха. Бо краіна заўсёды з манархам — маецца ж нашчадак. Увага, пытанне: у сувязі з якой падзеяй была парушана гэта традыцыя ў мінулым стагоддзі? Дзынь!

Яшчэ перад «дзынь» Ірына ставіць на стол сціснуты кулак з паднятым пальцам. Лёшык уважна пазірае на яе, усміхаецца.

Лёшык. Так, будзем лічыць, што я выйграў кнопку. Адказ?

Ірына (*марудліва, відавочна, яна не ведае адказу).* Адказваць на гэта пытанне буду я, капітан каманды Ірына Мікуліч. *(Адначасова яна амаль умольна пазірае на сваіх сяброў — у іх на тварах разгубленасць.)* Мы лічым, што парушэнне дадзенай традыцыі адбылося ў сувязі...

Андрэй *(нясмела)*. Са смерцю Уінстана Чэрчыля.

Усе глядзяць знізу ўверх на Лёшыка, які ківаецца з боку ў бок, паказваючы «не».

Лёшык. Як мы рады, як мы рады — каманда не ўзяла ачко! Правільны адказ: у сувязі са смерцю прынцэсы Дыяны.

Сяргей. Чорт... Трэба запомніць, факт цікавы.

Ромка. У мяне заўвагі. Ірына, ты назвала сябе, але не назвала каманду, не назвала школу. Другое: трэба было гэтым разам паўтарыць пытанне. Так дзясятак лішніх секунд набяжыць. Вунь, Андрэй хоць няправільную версію даў.

Ірына. Усё слушна, нешта разгубілася. Не сабралася як след. Добра. Лёшык, яшчэ пытанне будзе? Толькі без уступу давай.

Лёшык. О'кей. *(Задумляецца.)* Паважаныя гульцы! Як вы ведаеце, у нас у горадзе праходзіць першы чэмпіянат па брэйн-рынгу. Сёння — фінальная гульня. За некалькі дзён да фіналу ў гульні з'явіўся шчодры спонсар, і сёння каманда-пераможца атрымае 300 еўра, тыя, хто прайграюць — напалову менш. Увага, пытанне: з якога ляку гэтаму дзядзьку выкладаць такую суму?

Агульнае ўзрушэнне.

Дзеці. Што ты пляцеш? Праўда?

— Лёшык, кажы нармальна?

— 300 еўра ў фінале? Клас, добра на шасцярых дзеліцца.

— На семярых трэба дзяліць, Танечку не забудзьце.

— Лёшык, што за дзядзька?

Толькі Андрэй безуважна сядзіць за сталом, трымаючы кулак з паднятым вялікім пальцам.

Лёшык *(ківаючыся на крэсле)*. Увага, адказвае Андрэй!

Усе сцішваюцца.

Андрэй *(хвалюецца, трохі заікаючыся)*. Дзядзька — Воранаў Міхась. Бізнесмен, гандляр, мае некалькі крам.

Сяргей. Ты што, праўда?

Тамара *(крывіцца)* Гэтага не хапала.

Ірына. Андрэй, не цягні! Гэта што, праўда? Адкуль ведаеш?

Андрэй. Яны... Ён дом купіў... Побач з суседзямі нашымі. Мне цётка Аляўціна пераказвала. Яго дачка, Анжэла... цяпер капітан каманды нашых супернікаў.

Сяргей. Вось жа гадства якое. Набыў месца!

Ромка. Ну, а нам якая справа? Наша справа — выйграць. Дзе там Танечка, пачынаць пара.

Тамара. Як агідна... Ведаю я яго.

Ірына. Лёшык, ты адкуль ведаеш пра спонсарства?

Лёшык. У мяне свая разведвальная агентура! *(Мяняе тон.)* Кнопачнік іхні мне тэлефанаваў. Казаў, што хацеў адмовіцца ад фіналу. Я ўгаварыў.

С я р г е й. Дурань, трэба было, каб сыходзіў — за два дні яны кнопачніка не знайшлі б, мы б выйгралі без праблем.

І р ы н а. Чэсна трэба гуляць...

Заходзяць дырэктар В о л ь г а  Ф ё д а р а ў н а і Т а ц ц я н а І в а н а ў н а. Усе ўстаюць. Лёшык імкнецца хутка саскочыць з крэсла, але падае, падхопліваецца і трымаецца левай рукой за правую, паднёсшы яе блізка да твару.

Л ё ш ы к. А-а-а, дурная галава!

І р ы н а *(усхопліваецца з месца)*. Што з рукой?

Л ё ш ы к *(з крыўдай)*. От жа, не пра галаву папыталася, а пра нейкую руку.

Узрушэнне, да Лёшыка падыходзяць дырэктар і настаўніца.

В о л ь г а  Ф ё д а р а ў н а. Грушык, што такое? Не можаш без сваіх штукарстваў. Што з рукой?

Т а ц ц я н а  І в а н а ў н а. Грушык, дзе баліць?

Усе заціхаюць, глядзяць на руку Лёшыка.

Л ё ш ы к *(пакалыхвае сваёю рукой перад тварам, трагічна)*. Не памірай, не памірай, мая залатая... Не памірай... *(Павольна складае пальцамі правай рукі фігу і паказвае сам сабе.)* О, ажыла, усё нармальна, можам трэніравацца! *(Хутка сядае за стол, быццам нічога і не было, потым падымаецца, спахапіўшыся.)*

В о л ь г а  Ф ё д а р а ў н а. Ну, Грушык, некалі ты ў мяне атрымаеш... на грушы.

Р о м к а *(падроблена пад Міронава, трагічна)*. Лёшык, беражы руку!

В о л ь г а  Ф ё д а р а ў н а *(задумліва)*. Сядайце, сядайце... Так, дзеці... вы ўжо такія дарослыя, што і дзецьмі вас не назавеш. Але ж дзеці... Здаецца, толькі ўчора прыйшлі... Памятаю ж, якія банты былі на Ірыне, як адзін згубіўся, колькі было слёзак...

Сяргей. Нешта вас, Вольга Фёдараўна, на сентыментальнасць прабіла перад фіналам. Няйначай, нешта непрыемнае хочаце нам сказаць?

Вольга Фёдараўна. Я вось думаю, Сяргей, ці быў ты маленькім? Як ні ўспамінаю — усё ты нейкі задумлівы, у сябе паглыблены, дарослы зусім... Так, ёсць мне вам што сказаць. У вас наперадзе — яшчэ сотні перамог, вялікіх і малых. Тое, што вы дайшлі разам з Таццянай Іванаўнай да фіналу — гэта цудоўна. Гэта амаль перамога. Але так складваецца... так жыццё прадыктавала сёння, што гэты фінал вам трэба прайграць.

Павісае цішыня.

Ірына. Як капітан каманды... я маю права задаць пытанне?

Вольга Фёдараўна. Вядома ж, Ірыначка.

Ірына. Чаму?

Вольга Фёдараўна. Вой, Таццяна Іванаўна, паглядзіце, калі ласка, што там Жэнечка робіць? Пакінулі дзіця на бабу, а тут у бабы свае клопаты.

Таццяна Іванаўна выходзіць.

Вольга Фёдараўна *(сядае на крэсла, сумна)*. Я скажу наўпрост: калі вы прайграеце, то школа атрымае спонсарскую дапамогу на рамонт... Вы ж самі бачыце, якая яна ў нас. Вы атрымаеце мікраўтобус для экскурсіі...у Вільню. Вось такія справы. Я вас прашу зразумець мяне. Я прыняла гэтую прапанову.

Сяргей. А нас не пыталіся? І хто гэты спонсар? Ці не Воранаў Міхась?

Вольга Фёдараўна. Так... Адкуль ты ведаеш?

Сяргей. Не я, мы ведаем. Ведаем, што ён набыў месца капітана ў камандзе супернікаў для сваёй

дачкі. Ведаем, што прызавы фонд — 450 еўра ягоных грошай. Значыцца, ён і вас купіў? Я адмаўляюся ад гульні. *(Устае, каб пайсці.)*

Т а м а р а (*устае ўслед за Сяргеем*). Я таксама адмаўляюся ад гульні.

І р ы н а. Стойце, стойце! Гэта працай за ўсё — пайсці ўсім! *(Да дырэктара.)* Вольга Фёдараўна, як жа так? Вы нам зараз прапануеце... не, мне нават не верыцца, што вы нам прапануеце. Вы вучылі... вы вучылі быць нас заўсёды... вы казалі аб прынцыповасці...

С я р г е й *(перабівае)*. Прынцыповасць — гэта для адказаў на ўроках. А ў жыцці — вось як яно. Нас купляюць і прадаюць...

В о л ь г а  Ф ё д а р а ў н а. Не трэба так. Насамрэч усё куды складаней. Вельмі цяжка ўсё адразу патлумачыць.

І р ы н а *(хвалюецца, але цвёрда)*. Але тады мы не прымаем правілы. Мы будзем гуляць!

У гэты час заходзіць Т а ц ц я н а  І в а н а ў н а.

Т а ц ц я н а  І в а н а ў н а *(да дырэктара)*. Усё нармальна, Жэнечка пайшла ўніз, у фае гуляецца. Я папрасіла вахцёрку, яна паназірае.

В о л ь г а  Ф ё д а р а ў н а. Дзякуй, Таццяна Іванаўна. Чулі?

Т а ц ц я н а  І в а н а ў н а. Чула. Ірына! Сяргей! Тамара! Раман! Андрэй і ты, Лёшык! Я вас рыхтавала гэтулькі часу... Гэта і мая гульня, першая. Я толькі год у вашай школе, гэты поспех — мой першы педагагічны поспех. Але... так склалася.

І р ы н а *(умольна)*. Ну, чаму так, Таццяна Іванаўна! Няўжо гэтыя грошы каштуюць так шмат? Ды мы аддамо прызавы фонд школе! Мы выйграем гэтыя 300 еўра!

Таццяна Іванаўна. Я, мабыць, не маю права казаць, але я скажу. *(Глядзіць на дырэктара, якая падперла шчаку рукой і задумалася.)* Размова ідзе не пра трыста, а пра пяць тысяч. Гэта адно. Нам перададзены сертыфікат. І мы можам скарыстацца ім толькі заўтра. Такая ўмова. Калі... Калі б Вольга Фёдараўна адмовілася ад сертыфіката, сёння ці заўтра кожнага з вас пачалі б купляць паасобку. Сяргей, вось ты, ведаю ж, не багацей. У цябе толькі маці, а яшчэ дзве сястрычкі. Ты адмовішся, калі заўтра да цябе звернецца Воранаў з прапановай зліць гульню і заплаціць, добра заплаціць?

Сяргей. Я яго пашлю...

Таццяна Іванаўна. Гэта ты зараз кажаш вось так. Вось тут і цяпер. Але і гэта не галоўнае. Галоўнае тое, што такая ж прапанова, ён нам сказаў адразу, будзе да кожнага. Да кожнага з вас!

Ірына. Дык што, вы думаеце, што нехта з нас зліе гульню? Дык можа, скажаце адразу, хто?

Вольга Фёдараўна *(уздымае галаву, уздыхае).* Дзеці, дзеці... Дарослы свет — жорсткі свет. Не ў тым справа, што нехта пакваліцца на грошы. А ў тым, што такія прапановы будуць кожнаму. І кожны будзе ведаць, я буду ведаць, і Таццяна Іванаўна будзе ведаць, што вам кожнаму прапаноўвалі.

Ірына. Дык і няхай, няхай прапаноўвае! Пайшоў ён!

Лёшык *(незразумела).* Ну, гэта яшчэ колькі ён прапануе. У мяне, ведаеце, ад пэўнай сумы неяк рэзка зніжаецца рэакцыя!

Ірына. Лёшык! Ты калі-небудзь будзеш сур'ёзна гаварыць?

Лёшык. А я што? Я ўвесь — сур'ёзнасць і роздум... Атрымаць грошы не за тое, што робіш, а за тое, што не робіш... Як цікава... Я так яшчэ не зарабляў.

Сяргей *(б'е далонню па стале)*. Гад! Ён жа нас не купіў, ён нас у пастку зачыніў!

Вольга Фёдараўна. Я не сумнявалася, што ты дойдзеш да гэтага без маёй падказкі.

Ірына і іншыя. Сяргей, што за пастка? Ты пра што кажаш? Што, і выйсця няма?

Сяргей. Амаль няма. Я ведаю гэтага бізнесмена. Ён не такі просты, як падаецца. Вы што, не зразумелі? Калі мы адмаўляемся ад таго сертыфіката, то атрымліваем кожны прапанову асабіста. І калі раптам прайграем — хто будзе вінаваты? Разумееце? Лёшык прайграе кнопку адзін раз — мы будзем думаць, што ён куплены. Нехта з нас дае няправільны адказ — значыцца, будзем перакананы, што гэта ён прадаўся і зліў гульню. Калі прайграем — мы будзем думаць, што сярод нас — здраднік, які пажывіўся. Разумееце?

Вольга Фёдараўна. Так, Сярожа, так... Я не хацела, каб вас пачалі купляць кожнага паасобку.

Лёшка. Правільна! Лепш прадаць усіх адразу, мехам!

Ірына. Нам трэба выйграваць! Нам трэба толькі выйграваць!

Ромка. Ірына... Уяві, як нам будзе гуляць у камандзе, калі ўсе будуць ведаць, што кожнаму з нас была прапанова зліць гульню? Калі я ўздыму палец на палове пытання, калі Лёшык выйграе кнопку — ты дасі мне адказваць? Ці адкажаш сама, няправільна, а тады ўжо я буду думаць пра цябе, што ты зліваеш? Я ўпэўнены, што гэты дзядзька і далей нешта прадугледзеў. Скажам, будзе тупое спонсарскае пытанне, на якое адказ той камандзе будзе вядомы.

Лёшык. Я вазьму кнопку!

Ромка. А адказ?

І р ы н а. Адно пытанне гульню не зробіць. І... я думаю, не, я ўпэўненая, ён не купіць вядоўцу і журы. Будзе занадта відавочна. Яму для формы трэба менавіта наш пройгрыш, няўзятая кнопка, няправільны адказ.

Л ё ш ы к. Прапаную ўрачыста спаліць сертыфікат, адправіць Таццяну Іванаўну па хлеб і ваду, зачыніць нас тут усіх у класе на заўтрашні дзень і адабраць мабільныя тэлефоны!

І р ы н а. Ну, Лёшык...

С я р г е й. А што? Нармальны ход. Вельмі нават рэальны.

Р о м к а. Усё адно заўтра заняткаў няма. Маты ў спартовай зале возьмем. Выспімся...

В о л ь г а   Ф ё д а р а ў н а. Дзеці, вы што? Якое хлеб і ваду? Якое зачыніць? Я ўзяла сертыфікат і запоўніла графы. Заўтра будуць складзеныя дамовы на пастаўку будматэрыялаў і замоўлены мікрааўтобус! Я не казала, каб вы шукалі выйсце — нам трэба выконваць дамову!

Павісае цішыня. Ромка перабірае гітарныя струны.

Р о м к а. Слухайце, а я песню вывучыў. Хацеў вас потым здзівіць... ды лепш цяпер. *(Спявае з лёгкім сумам. Яму падпяваюць у другой частцы.)*

Раскажы мне пра дождж, раскажы.
Хто ў небе збірае дажджы,
Што шматдзённа ліюць на маю галаву.
Хто ў небе збірае дажджы?
Пакажы мне сябе, пакажы,
Не чакай, покуль час прабяжыць.
Слова моўчкі аддай
І пытанні здымай,
Не чакай, покуль час прабяжыць.

Грэшны кавалак неба бачыш ты навылёт,
Што табе заўтра трэба, што табе як сваё?

Раніцай свежы позірк ці вечаровы змрок?
Дай мне руку і пойдзем. Ціха, за крокам крок.

Затрымай над вачыма руку,
Каб не зведаць ад сонца пакут.
У выглядванні хмар, што абклалі абшар,
Каб не зведаць ад сонца пакут.
І трывай, покуль сілы, трывай.
Хай не глянецца за небакрай,
Дый не сціхне ў ілжы
За штуршок да мяжы
Тое, што мне ніхто не казаў.

Грэшны кавалак неба бачыш ты навылёт,
Што табе заўтра трэба, што табе як сваё?
Раніцай свежы позірк ці вечаровы змрок?
Дай мне руку і пойдзем. Ціха, за крокам крок.

Лёшык *(Устае з месца, напявае з вясёлым адчаем).* Дай мне руку і пойдзем — наш будзе сертыфікат... Эй, народ, нешта на вашыя турботы пакуль актыўна рэагуе толькі мой мачавы пухір... Э-е, вы мяне прабачаеце? То ж так натуральна... То я пайду, пайду, пайду... *(Выходзіць.)*

Сяргей. Пайсці трэба падумаць, папаліць... *(Уздымаецца з месца).*

Таццяна Іванаўна. Сяргей! Ты ж мне кляўся, што не будзеш у школу прыносіць цыгарэты!

Тамара. А ён трымае слова, Таццяна Іванаўна. Ён не прыносіць...

Таццяна Іванаўна лыпае вачыма. Сяргей выходзіць.

Тамара. Выбачаюся, мне трэба патэлефанаваць сястры... *(Выходзіць.)*

Маўчанне. Ромка перабірае струны. Ірына падымаецца з месца.

Ірына. Прайдуся... Я хутка. *(Выходзіць.)*

Андрэй *(мнецца)*. Выбачайце, я таксама... у прыбіральню, вось... *(Выходзіць.)*

Ромка *(азіраецца па баках)*. Мабыць, кожны ў адзіночку вырашыў падумаць. Я таксама падумаю, добра, Вольга Фёдараўна? Мяркую, праз пяць хвілін усе будуць на месцы...

Вольга Фёдараўна. Ідзі, Раман, ідзі...

Нейкі час цішыня.

Таццяна Іванаўна. Як думаеце, што яны прыдумаюць?

Вольга Фёдараўна. Таццянка, тут няма чаго прыдумляць. На нашу школу ўпалі грошы з неба — і ад іх адмовіцца? Яны дарослыя людзі, яны мусяць зразумець, што адзін раз у жыцці можна пераступіць праз свае прынцыпы, сысці ўбок, не лезці на ражон. Колькі часу пройдзе — гульня забудзецца, а яны праз дзесяць гадоў сустрэнуцца ў гэтай школе і будуць успамінаць, як далі магчымасць прывесці да ладу свой клас!

Таццяна Іванаўна. І ўсё адно — так непрыгожа атрымалася. Які мы ім урок даем...

Вольга Фёдараўна. Урок жыцця. Сапраўднага. Гэта магчымасць для іх выявіць свой сапраўдны клопат пра школу. Магчымасць зразумець дарослых, хоць на хвілінку адчуць іх праблемы. Вы не былі ў маёй скуры, вы не ведаеце, што сёння дырэктар — гэта перш за ўсё загадчык гаспадаркі, прараб, бухгалтар і грузчык і яшчэ даставала, выбівала, папрашайка... Калі нехта даведаецца, а даведаюцца, гэта Воранаў дакладна зробіць, што я адмовілася ад такіх грошай дзеля магчымага — уявіце — толькі магчымага выйгрышу, мяне здымуць з работы. Адразу ж. Бо атрымаецца, я магла б сэканоміць

бюджэтныя сродкі і не сэканоміла? Гэта злачынства па сённяшнім часе, вось так, дарагая Таццянка.

Таццяна Іванаўна. Я разумею... Не-не, я цалкам, вядома, не разумею, не магу ўявіць... Але ж так прыкра: вось прыйшоў чалавек з грашыма — і ён галоўны. І ён купляе наш гонар, нашу перамогу... І гэта ўжо тут, у сценах школы. А што будзе за імі?

Вольга Фёдараўна. Вось і добра, што дзеці сутыкаюцца з гэтым цяпер. Не думаю, што ў іх толькі зараз, бы ў тых кацянят, прарэзаліся вочы. Яны ведаюць куды больш за тое, пра што мы думаем.

Лёшык *(заходзіць)*. О, а куды гэта ўсе разбегліся? А, я так і думаў — пабеглі навыперадкі да таго бізнесмена...

Таццяна Іванаўна. Грушык, табе не сорамна?

Лёшык *(са спалохам аглядвае сябе)*. Што, шырынку не зашпіліў зноў?

Таццяна Іванаўна. Божа, калі ты выдурняеш, Грушык?

Лёшык. Ужо, ужо, Таццяна Іванаўна. Вось, уяўляеце, выйшаў, іду, а мне насустрач — я. Я так спалохаўся! А ён, ну, гэты другі я, пытае ў мяне: «Ты калі выдурняеш, Грушык?» От як вы цяпер. Ну, я так са страху і кажу: ад гэтага моманту! А ён мне: пакляніся. Я і пакляўся, далібог.

Вольга Фёдараўна. Чым пакляўся?

Лёшык. Самым дарагім, што ў мяне ёсць — сваім новым мабільнікам!

Вольга Фёдараўна. Я так і падумала.

Таццяна Іванаўна. І што той, каторы насустрач ішоў?

Лёшык. Хто? А, той? Вы ўяўляеце, я дастаю свой мабільнік, паказваю яму: во, маўляў, калі не выдурняю ад гэтага моманту, то хай ён ляснецца аб падлогу з чацвёртага паверха! І гэты, каторы другі я, таксама дастае свой мабільнік! Ну, такі, як

і ў мяне. Толькі ў другой руцэ трымае. Што за ліха думаю, падыду бліжэй, такі мабільнік ці іншы... Падыходжу...

Таццяна Іванаўна. І?

Лёшык. Вось вам тут і «І». Да люстэрка я падышоў...

Заходзіць Сяргей.

Лёшык. Дагнаў?

Сяргей. Каго?

Лёшык. Бізнесмена. Ці ты не за ім бегаў?

Сяргей. Не, не дагнаў. Хоць і хацелася...

Заходзіць Ромка. Потым іншыя. Апошняй — Ірына. Расаджваюцца.

Лёшык. Усе на месцы? *(Па-дзелавому, амаль урачыста.)* Агульны сход каманды брэйнг-рынга будзем лічыць адкрытым. Старшыня — Ірына Мікуліч. Сакратар я, Аляксей Грушык. Слухаецца пытанне аб продажы д'яблу шасці душ 11-краснікаў і дзвюх дарослых, жаночых. Сума вялікая, абмеркаванню не падлягае. Паступіла прапанова прадацца і не рыпацца. Будзем галасаваць? Тайна ці адкрыта? А можа, ёсць іншыя прапановы?

Сяргей. Досыць дурэць.

Лёшык *(з выклікам)*. А што ты прапануеш? Чаго вы муляецеся?

Сяргей. Адстань.

Ірына. Лёшык, няма прапаноў. Не ведаю.

Вольга Фёдараўна. Вам тут яшчэ Таццяна Іванаўна скажа патрэбныя словы, тыя, якія вы мусіце ведаць. А я пайду. Вы — каманда, памятайце пра гэта. І пра тое, што вы — школьнікі. І пра тое, колькі вам школа дала. *(Выходзіць.)*

Таццяна Іванаўна. Ведаеце, мне так прыкра. Але... дырэктар пражыла жыццё, яна — разумная

жанчына. Зразумейце яе. Калі яна адмовіцца ад сертыфіката — гэта стане вядома вышэй, у аддзеле адукацыі. Ёй не даруюць такога... разбазарвання бюджэтных сродкаў. Пройдзе месяц-другі, трэці... неўзабаве выпускны... вы пойдзеце са школы, якая будзе вам удзячная. Кожны настаўнік, дырэктар. Вы будзеце і праз гады прыходзіць сюды як людзі, якія аднойчы ахвяравалі сваёй перамогаю дзеля рэальнага дабрабыту школы.

Сяргей. Усё так, Таццяна Іванаўна. Я жыццё трошкі ведаю. Мы яшчэ не адзін раз мусім збочыць перад такімі воранавымі. Проста... агідна вось так — здацца без бою.

Тамара. Ён у горадзе штодня ўсё большым царком сябе адчувае. Тры крамы, сын на такой тачцы ездзіць... І дачцэ ўжо купіў аўто, кабрыялет. Такія аб нас ногі выціраюць... Ім адзін, другі раз саступі — і яны цалкам сябе тут багамі адчуваюць.

Ірына. Калі я адмоўлюся ад капітанства, то гэта — мая здрада вам?

Лёшык. А то! І мы цябе тут жа чацвяртуем — нас чацвёра хлопцаў. Андрэй!

Андрэй *(са спалохам)*. Што?

Лёшык. Паможаш мне, Ромку і Сяргею чацвертаваць Ірыну?

Ірына. Лёшык, досыць! Я сур'ёзна пытаюся!

Ромка. Ірына, выхад любога з нас з каманды цяпер — гэта самае простае, што ён можа зрабіць. Памыў рукі — ды і ўсё. Адмова ад гульні — гэта непрымальна. Гэта горшае, што можа быць.

Ромка кратае струны гітары пад мелодыю песні, якая гучала раней. Пад гукі гэтай мелодыі заходзіць Вольга Фёдараўна.

Вольга Фёдараўна *(узрушана, з адчаем і абурэннем)*. Я ніяк не чакала... Гэтага дакладна я не магла ўявіць ні пры якім раскладзе. Гэта... Гэта

не ўкладваецца ні ў якія рамкі! Вы разумееце, што ўтварылі? Хто гэта зрабіў?

Таццяна Іванаўна *(падхопліваецца)*. Што здарылася, Вольга Фёдараўна?

Вольга Фёдараўна *(азірае па чарзе кожнага вучня)*. Нехта з іх скраў сертыфікат. Пакуль мы тут сядзелі, сертыфікат знік з майго стала.

Таццяна Іванаўна *(прыкрывае рот далонню, паварочваецца)*. Дзеці, вы што? Вы разумееце, што гэта — крадзеж? Сертыфікат — гэта грошы!

Вольга Фёдараўна. Я так разумею, пытацца мне цяпер адразу ва ўсіх марна. Таццяна Іванаўна, хадземце са мной. Ірына, праз дзесяць хвілін я чакаю цябе ў сваім кабінеце. З сертыфікатам. Калі сертыфікат не вернецца на мой стол, я выклічу міліцыю. Жартачкі скончыліся, Грушык, не разяўляй рот.

Лёшык *(разгублена)*. Ды маўчу я, маўчу... А рот, гэта так, па звычцы... А вы дзверы зачынілі?

Вольга Фёдараўна. Якія дзверы?

Лёшык. Ну як — уваходныя. А то злодзей ірване зараз з сертыфікатам.

Вольга Фёдараўна *(са злосцю)*. Грушык, ты забываешся, калі можна жартаваць, а калі — нельга!

Вольга Фёдараўна і Таццяна Іванаўна выходзяць.

## ДЗЕЯ 3

Ромка *(напявае)*. Дай мне руку і пойдзем...

Тамара *(затуляе далонню струны)*. Не трэба цяпер... Адыдзем?

Устаюць, адыходзяць наперад сцэны. Святло гасне, асветлены толькі яны двое.

Тамара. Ромка, чуеш... Як думаеш, хто мог узяць сертыфікат?

Ромка. Адкуль жа мне ведаць... Я нікога не бачыў...

Тамара. Я таксама нікога не бачыла на калідоры. Але нехта ж змог!

Ромка. Я вось падумаў... Калі б у мяне была нянавісць да Воранава, як у Сяргея, я узяў бы.

Тамара. Ты думаеш — Сяргей?! Адкуль у яго нянавісць?

Святлом пражэктара высвятляецца фігура Сяргея ў глыбіні сцэны: напружаная, кулакі сціснутыя.

Ромка. Мне Сяргей неяк абмовіўся, я зразумеў, што ў яго на гэтага Воранава зуб ёсць. Ну, ты Сяргея ведаеш, ён жа ўсё ў сабе носіць, не надта выкладвае свае праблемы перад іншымі. Думаю, Сяргей змог бы. Ён хлопец рэзкі. А ты, калі мяне клікала, нешта ж сказаць хацела? Ты думаеш, красці сертыфікат — выйсце?

Тамара. Не думаю, што выйсце. Але ў такім становішчы... Я проста пільна глядзела на Ірыну. Яна гэтай гульнёй жыла літаральна. Не ведаю, калі і спала. Я не кажу, што яна магла ўзяць, але ж... вось калі стаўлю сябе на ейнае месца — я змагла б... Мабыць, змагла...

Сядаюць на месца. Наперад сцэны выходзяць Сяргей і Ірына.

Ірына. Сяргей, я хачу спытаць... ты — самы сур'ёзны, я веру табе, я ўпэўнена ў табе... Як ты думаеш, хто мог узяць гэты чортаў сертыфікат?

Сяргей. Лёшык.

Высвятляецца Лёшык, нечакана для ўсіх хмуры, засяроджаны.

І р ы н а. Ты што? Сур'ёзна?

С я р г е й. Так, сур'ёзна. На такую дурніцу ў яго розуму хопіць...

І р ы н а. Вось як... дурніца. Ведаеш, а мне неяк Тамара прызналася. Кажа, я ўпершыню спазнала нянавісць. Мне цікава стала, пытаюся ў яе: і хто гэта шчаслівы? А яна мне адказвае: Воранаў. Я яго, кажа ненавіджу. У Тамары ёсць, мне здаецца, прычыны, забраць той паганы сертыфікат.

Высвятляецца постаць Тамары, засяроджаная. Сяргей і Ірына ідуць на месца, выходзяць наперад Лёшык і Андрэй.

Л ё ш ы к. Слухай, Андруха, ты ў гэтай кампаніі такі ж птах, як і я? Ну, цябе тут за арла не лічуць, хоць ты і не верабей... Гэта я верабей. А ты — дрозд. Але ж усё адно з атрада вераб'іных. Так?

А н д р э й *(разгублена)*. Так. Яны з аднаго атрада...

Л ё ш ы к. Во, а я табе пра што? То я ў цябе як певень у гусака і пытаю: *(рэзка, асуджальна)* ты ўзяў сертыфікат? У вочы глядзі, у вочы!

А н д р э й *(спалохана)*. Я не браў... Не браў...

Л ё ш ы к *(спакойна)*. Я так і думаў. А хто ўзяў? Варушы сваімі батанічнымі мазгамі. Яны ж у цябе працуюць як аналітычнае бюро пры ЦРУ. Хто?

А н д р э й *(папраўляе акуляры, моршчыцца, марудліва, раздумліваючы)*. Калі ацэньваць сітуацыю з пункту гледзішча страты духоўных каштоўнасцей, то найбольшую паразу атрымлівае Ірына.

Пражэктар высвятляе Ірыну.

Л ё ш ы к. Ну ты загнуў, Андруша. Я табе што, акадэмік ці ты на кафедры? Прасцей: чаму яна?

Андрэй. Бо яна — капітан. Гульню злівае не каманда — яна. Яна нікога не зможа вымусіць зліваць, значыцца, павінная будзе сама. Гэта будзе яе асабісты пройгрыш... А ты на каго думаеш?

Лёшык. Я? Андрэй, ты калі-небудзь заўважаў, каб я думаў?

Андрэй. Я ведаю... Ты думаеш па-іншаму... Але ты мог узяць.

Лёшык. Я? Чаму?

Андрэй. Бо ты рызыковы.

Лёшык. А-а, дзякуй, я падумаў, ты скажаш, што я дурны.

Андрэй. У дадзеным кантэксце гэтыя словы амаль сінонімы. *(Спалохана зàмірае, глядзіць на Лёшыка.)*

Лёшык. От чаго я цябе стукнуць не магу, а? Ведаеш?

Андрэй *(спалохана)*. Не ведаю...

Лёшык. Бо ты кажаш заўсёды тое, што думаеш. А як можна стукнуць за думку? А хто яшчэ мог узяць сертыфікат? Напруж мазгі?

Андрэй. Я ўжо напружваў. Усе.

Лёшык. Вядома ж! Я цябе пра прычыны пытаюся.

Андрэй. Я пра прычыны і кажу. Антыпатыя Тамары і Сяргея да Воранава заўважныя адразу, у Ромкі і мяне могуць быць схаваныя прычыны.

Лёшык. Ёк! Андруха, ты мог узяць сертыфікат?

Андрэй *(з гонарам папраўляе акуляры)*. Табе не абавязкова ведаць усё пра мяне.

Ідуць за стол.

Ірына. Што будзем рабіць?

Маўчанне ў адказ.

Ну, скажыце мне нешта. Мне ж зараз да Вольгі Фёдараўны ісці. Што я ёй скажу?

Лёшык. Ну, пра надвор'е пагаворыце... Вунь які вецер узняўся, мабыць, навальніца будзе...

Ірына *(амаль істэрычна)*. Лёшык, колькі можна! Чаму ты ў самыя пакутлівыя для мяне хвіліны яшчэ імкнешся паздзекавацца з мяне? Няўжо так цяжка зразумець, што мне трэба цяпер не твае дурныя жартачкі, а рэальная дапамога словам?

Лёшык *(ніякавее, нешта мямліць, потым гучна)*. Я не здзекуюся...

Ірына. Ат...

Андрэй. Тут я падумаў... Можна мне сказаць?

Ірына. Вядома, Андрэй, кажы.

Андрэй. Я падумаў, прааналізаваў... Калі ніхто з нас сертыфікат не браў... Ну, калі б нехта ўзяў, дык прызнаўся б цяпер... сярод сваіх... бо лічу, няма сэнсу хаваць, бо...

Сяргей. Андрэй, канкрэтней, а? Ты не на гульні, дзе трэба цягнуць секунды.

Андрэй. Прабачце... дык вось. Калі мы былі ўсе тут... І дырэктар была з намі... Не было аднаго чалавека. Ён мог узяць.

Ірына *(з неразуменнем)*. Ты пра каго, Андрэй?

Сяргей *(узрушана)*. Таццяна?

Андрэй *(пасля кароткай паўзы)*. Таццяна Іванаўна хадзіла па просьбе Вольгі Фёдараўны ў яе кабінет.

Ірына. Ну ты выклаў версію!

Тамара. Як яна магла ўзяць, калі яна нас угаворвала зліць гульню, пераконвала?

Сяргей. Рацыя ёсць у словах Андрэя. Адкуль нам ведаць, хто там пра што думае? Казаць можна многае, а думаць зусім пра іншае.

Ромка *(грае на гітары мелодыю пахавальнага марша, робіць гучны пройгрыш)*. Ведаеце што,

7 Зак. 1650

сябры мае? Нехта ўзяў сертыфікат. Ён яго ўзяў, не параіўся з іншымі. Цяпер маўчыць. А трэба адказваць. То не адной Ірыне зараз ісці да дырэктара, а ўсім. Разам. І там будзем казаць...

Сяргей. Што казаць?

Ромка. Мабыць, праўду. Так будзе нармальна. Чэсна. Ісці ўсім.

Сяргей. Нармальная думка. Але... прапаную на пяць хвілін усім разысціся. Каб адзін другога не бачыў. І сустрэцца ў кабінеце дырэктара.

Тамара. А гэта дзеля чаго?

Ірына. Навошта, Сяргей?

Андрэй. Правільная прапанова наконт разысціся. Каб той, хто ўзяў сертыфікат, змог выцягнуць яго са схованкі і прынесці да дырэктара... Калі перадумае.

Лёшык. А я нікуды не пайду, я тут застануся.

Сяргей. Чаму?

Лёшык. Дык... неяк сумна ісці ў туалет і нічога там не рабіць. Згодзен?

Ірына *(убок, з жалем)*. Божа, што за клоўн...

Усе разыходзяцца. Лёшык ускоквае з нагамі на крэсла, сядае на спінку.

Лёшык *(напявае, фальшывіць, гучна, але з незразумелым адчаем)*. Што табе заўтра трэба, што табе як сваё?

## ДЗЕЯ 4

Дзейныя асобы тыя ж, што і ў другой дзеі.
Кабінет дырэктара.

Вольга Фёдараўна *(задумліва)*. Ніяк не думала, ніяк не думала. Ну, няхай бы ўжо нехта сказаў:

не гуляю! Выходджу з каманды, калі такі прынцыповы. Гэта было б чэсна, гэта было б зразумела, гэта было б прымальна. Але красці? У мяне са стала? 30 гадоў я не замыкала кабінет, у мяне аркушыка паперы не знікла ніколі. А тут... Не, пара мне на пенсію, пара. З гэтымі дзецьмі мне не працаваць. Я іх не разумею. І ў камандзе ж — дасціпныя, выхаваныя, разумныя. Што ўжо казаць пра іншых?

Таццяна Іванаўна. Дазвольце сказаць, Вольга Фёдараўна... Я яшчэ маладая, то мне, можа, лягчэй іх зразумець... Вось, я думаю, што той, хто ўзяў сертыфікат, ён зрабіў гэта... імпульсіўна. Пад уздзеяннем эмоцый. Не трэба спяшацца з міліцыяй, упэўнена, што ўсё мы вырашым. Вось прыйдзе зараз Ірына...

Вольга Фёдараўна. Нешта надта доўга яна ідзе...

Таццяна Іванаўна. То я пайду паклічу...

Адчыняюцца дзверы, на парозе застывае Лёшык, азірае ўважна кабінет.

Лёшык. Вось дык маеш... Я найсмялейшы! Вольга Фёдараўна, прашу гэта залічыць!

Вольга Фёдараўна. Я цябе, Грушык, не чакала.

Лёшык. Дык я з той пароды, што самі падаюць. Ну, Грушык жа... Ведаеце, яны, грушы, вось вісяць, вісяць, а потым раз! Мне аднойчы ў дзеда ў вёсцы звалілася проста на галаву.

Вольга Фёдараўна *(стомлена, з'едліва).* Гэта было ў дзяцінстве?

Лёшык. А што, траўма цяпер выяўляецца? *(Хапаецца за галаву, абмацвае яе.)* Дык дазвольце зайсці?

Вольга Фёдараўна. Дзе ваш капітан?

Лёшык. А гуляюць недзе ўсе. Думаюць. І, вось чуе маё сэрца, ломяць дзверы кабінета інфарматыкі. *(Глядзіць уважна на Таццяну Іванаўну.)*

Таццяна Іванаўна. Божа, што ты кажаш? Навошта ламаць дзверы майго кабінета?

Лёшык. Ну... Там жа сканер добры і прынтар. Навошта нам адзін сертыфікат, калі можна зрабіць два? Ці тры?

Вольга Фёдараўна. Грушык, што адбываецца? *(Устае пагрозліва з-за стала.)*

Лёшык. Ды жартую я, жартую... *(Хутка.)* Мы вырашылі прыйсці да вас усе разам, каб... каб знайсці адказы на пытанні, мабыць. Так рашылі. Во, мяне ўжо Сяргей пхае.

Лёшык увальваецца ў кабінет, заходзіць Сяргей.

Сяргей. Ці можна, Вольга Фёдараўна?

Вольга Фёдараўна. Ну, калі вырашылі разам — заходзьце. Сядайце.

Заходзяць Лёшык і Сяргей за імі амаль адразу ўсе. Рассаджваюцца, хто дзе. Бліжэй да стала дырэктара — Ірына, далей Тамара, Сяргей. На канапе — Андрэй, Лёшык, Ромка з гітарай.

Лёшык *(раскідвае рукі на канапе)*. Слухайце, во праўду кажу: колькі часу глядзеў на гэтую канапу і думаў: во каб на ёй пасядзець! Гэткая яна мне зручная падавалася! І каб яшчэ гарбаты з сочывам папіць...

Сяргей *(ціха)*. Зараз будзе... кава з какавай.

Вольга Фёдараўна (*азірае ўсіх пільным позіркам).* Так, не чакала, ніяк не чакала. Але мяне радуе, што вы ўсе прыйшлі. Значыцца, усё *(падкрэслівае)* вернецца на месца, забудзем гэтую прыкрасць, як кажа Таццяна Іванаўна, гэты эмацыйны эпізод, і — будзем жыць далей. Бо жыц-

цё — кароткае. Вельмі кароткае. І калі яшчэ пачаць яго труціць такімі вось... недарэчнасцямі, то жыць часу не застаецца. Ірына, што вы вырашылі мне ўсе разам сказаць? І дзе сертыфікат?

Ірына *(павольна ўстае з-за стала, збіраецца з думкамі).* Так атрымалася, Вольга Фёдараўна. Гэта — мая гульня. Мая каманда. І я — іх капітан. Мы вытрымалі шмат гульняў, мы сталі сапраўднай камандай. Гэты фінал — магчымая нашая пуцёўка на вобласць. Мы марылі пра тое, што некалі выб'емся ў вышэйшую лігу. Бо той, хто не марыць пра найвышэйшае, не дасягае і сярэдзіны.

Вольга Фёдараўна *(перабівае незадаволена).* Навошта ты мне гэта апавядаеш?

Ірына. Каб вы зразумелі, што мне нельга пакінуць каманду — гэта будзе здрада. Але я не магу сказаць Лёшыку, каб ён спецыяльна прайграваў кнопку. Я не магу сказаць нікому з маіх гульцоў, каб зліў адказ. І я не магу сама зліваць гульню, бо я ў адказе за каманду... Я не магу іх прадаваць. Гэта я ўзяла сертыфікат.

Агульнае хваляванне, усхліпы, прыдушаныя воклічы.

Вольга Фёдараўна *(пасля паўзы).* Што ж, лагічна, недзе я так і падазравала. Добра, кладзі яго на месца — і справа на гэтым скончана. Заўтра будзем размаўляць прадметна... з кожным паасобку.

Ірына. Сертыфіката няма.

Вольга Фёдараўна. Як — няма?

Ірына. Я... падрала яго і кінула шматкі праз акно. Цяпер вецер... ён падхапіў... разнёс. Я не магла трымаць яго ў руках.

Вольга Фёдараўна. Мне здаецца, ты, Ірына, не разумееш да канца, што зрабіла... Мне шкада, але ў такім разе размаўляць будзем па-іншаму...

Ромка *(кратае гучна струны, адкладвае ўбок гітару і пад запытальныя позіркі ўсіх уздымаецца з месца).* Ірына, ты капітан, табе, вядома, за ўсё адказваць... Ды я ж не збіраюся заставацца сволаччу. Ты адказваеш за ўсіх нас, але не гэтым разам. Я павінен адказваць за сябе. Вольга Фёдараўна, Ірына сертыфікат не брала. Яго ўзяў я.

Лёгкае ўзрушэнне.

Вольга Фёдараўна. Вось як? І што ж ты адразу не прызнаўся? Не сорамна было прымушаць дзяўчыну браць на сябе віну? Ты сядай, Ірына. Ну, і што ты хацеў гэтым давесці? І дзе сертыфікат?

Ромка. Ды я нічога не збіраўся даводзіць. А сертыфікат... заўтра будзе. Я ўзяў яго і перадаў Алесю, брату.

Вольга Фёдараўна. А брат пры чым?! А-а-а, вунь яно што... Брат — журналіст, так? І вы вырашылі...

Ромка. Мы вырашылі вывесці на чыстую ваду гэтага Воранава. Ён ужо занадта нахабна пачынае купляць і прадаваць людзей, іх інтарэсы. Брат мне тэлефанаваў... нядаўна, пытаўся, ці праўда, што Воранаў купіў месца капітана для сваёй дачкі. Гэта будзе сорам на ўвесь раён, калі мы здамо гульню. Усе будуць гэта разумець, будуць шаптацца, паказваць на нас пальцам. Няхай ведаюць праўду.

Таццяна Іванаўна *(агаломшана).* Раман, а вы з братам разумееце, што гэтым артыкулам вы літаральна нішчыце Вольгу Фёдараўну? Вы падумалі, як яна будзе выглядаць у гэтай сітуацыі? Гэта... гэта неверагодна! Вы ж топіце ні ў чым не вінаватага чалавека! Вы топіце ўсю школу!

Ромка. Мы хочам сказаць усяму гораду праўду.

Таццяна Іванаўна. Праўда часцей забівае людзей, а не дае ім жыццё!

Вольга Фёдараўна *(налівае ў шклянку вады, п'е. Шклянка заўважна дрыжыць).* Мне цяпер, Раман, прасіць цябе і брата, каб вы далі мне дапрацаваць да пенсіі адзін год? Прыніжацца перад вамі?

Ромка. Не трэба нас прасіць. Навошта вам прыніжацца? Вы тут пры чым? Але маўчаць нельга...

Сяргей *(уздымаецца рашуча).* Ромка, сядзь на месца і не палохай Вольгу Фёдараўну. Давядзеш зараз са сваім братам чалавека да інфаркту. Я табе шчыра вось тут скажу, пры ўсіх: твая фантазія занадта дрэнная. Ты дрэнна прыдумаў, на хаду, калі пачуў, як Ірына паспрабавала ўзяць віну на сябе. Я спецыяльна для цябе дадам: калі хоць слова пра гэты чортаў сертыфікат прасочыцца ў прэсу, я з табой паразмаўляю... па-мужчынску. *(Да дырэктара.)* Вольга Фёдараўна, гэта Ромкавы фантазіі. Ён марыць, як некалі стане крутым журналістам і будзе праводзіць свае расследаванні. Ды і сімпатызуе ён нашаму капітану, кінуўся на выручку... *(Да Ромкі.)* Ды не глядзі ты на мяне, як Ленін на буржуазію. Ні для кога ў школе не сакрэт, што табе Ірына падабаецца... Дык вось, Вольга Фёдараўна, у Рамана блеф. Не браў ён сертыфіката. І нават попелу яго не змог сабраць, бо я попел ва ўнітаз спусціў.

Вольга Фёдараўна *(разгублена, адкідваецца на спінку крэсла).* Які попел, Сяргей?

Сяргей. Той, які застаўся ад сертыфіката.

Вольга Фёдараўна. Ты спаліў сертыфікат?

Сяргей. Спаліў.

Вольга Фёдараўна. О, Божа, што сёння за дзень... Ты сур'ёзна? Навошта, Сяргей? Ты ж — самы разумны, самы дарослы з усіх! Ты хіба не разумееш, што такое грошы на рамонт школы?

Сяргей. Разумею я, што такое грошы. І разумею, што такое, калі іх нестае. Разумею, што адчуваюць бацькі, калі адмаўляюць дзецям не ў цукерках ужо, а ў яблыках і апельсінах. Разумею, як цяжка весці меншую сястрычку з садка паўз гэтыя шапікі з садавінай. Бо сам ваджу. Мая мама... працуе ў краме гэтага Воранава. Напачатку было ўсё добра. А потым... Яе зарплата зменшылася ўдвая. Там пры разгрузцы мех з цэментам падзярэцца, там шкліна трэсне, там цвікоў не хопіць — усё гаспадар загадваў спісваць на прадаўцоў. Караў штрафамі. У апошнія паўгода ён зменшыў зарплату ўсім у сваёй фірме. Цяпер вы разумееце, адкуль гэта спонсарская дапамога? Гэта — не дададзеныя яго работнікам грошы. Дык што мне за радасць ад таго, што школа атрымае тыя грошы, якія б магла атрымаць мая мама, на якія б я мог набыць сёстрам ананас, пра які меншая ўжо трызніць? Ну, вось скажыце шчыра: вам, як дырэктару, трэба тыя грошы, якія Воранаў фактычна адняў у іншых, каб урэшце пасадзіць сваю дачку ў капітанскае крэсла каманды-пераможцы? Ды мала гэтага. У дадзеным жа выпадку ён, Воранаў, робіць мяне саўдзельнікам. Калі мы зліваем гульню — гэта значыць я сам, па сваёй волі буду спрыяць яму, Воранаву, у ягоных справах. Дык я не буду. І іншым не дам. Бо люблю маці і сваіх сясцёр. Іншыя няхай клапоцяцца за сябе. А я буду адстойваць сваіх. І да канца адстойваць.

Вольга Фёдараўна. Так, ты кажаш пра сур'ёзныя рэчы, Сяргей. Пра вельмі сур'ёзныя. Але я мушу табе нагадаць, што ты здзейсніў злачынства. Разумееш? Злачынства. Ты скраў. Ты мог бы апавесці пра вось гэта ўсё раней, яшчэ ў класе — і справа магла б скончыцца інакш. Мне ж адкуль ведаць... Але зло нельга перамагчы злом... Што ж, астатнія могуць быць вольныя на сёння. Заўтра пагаво-

рым. А ты, Сяргей, сядай за стол, вось табе чыстая папера — пішы, як ты краў, дзе паліў, куды кідаў...

Школьнікі пераглядваюцца між сабой, усхваляваныя. Сяргей падыходзіць, бярэ аркуш, сядае.

Тамара *(рашуча ўздымаецца з месца)*. Сяргей... Не трэба мяне выгароджваць. Я здольная сама адказаць за свае ўчынкі. *(Да дырэктара.)* Сертыфікат узяла я.

Вольга Фёдараўна. Не разумею... Вы за каго мяне трымаеце?

Тамара. Што тут незразумелага? Я асабіста трымаю вас за дырэктара. І таму кажу: сертыфікат узяла я.

Вольга Фёдараўна. Гэта цікава ўжо. Сяргей, што ты на гэта скажаш?

Сяргей (*разгублена маўчыць, потым пытаецца ў Тамары*). Тамара, я... не разумею, навошта, гэта...

Тамара *(перабівае, далей — адчайна, на мяжы зрыву)*. Затое я ўсё разумею. І цябе разумею. Дзякуй табе, але не трэба мяне бараніць вось цяпер. Не трэба. Я сама... Я скажу вам усім больш, я скажу, што проста радая, што так атрымалася, што гэты сертыфікат можна было ўзяць, падраць на самыя дробныя шматкі... І я драла яго з задавальненнем! Так, з задавальненнем! Вы не верыце? Я вось таксама не верыла, што нянавісць можа прыносіць і радасныя пачуцці... ад помсты. Я адпомсціла. Нічога ў яго не атрымаецца, і яго гламурная дачка, пустая і нікчэмная, не стане капітанам пераможцаў, не паедзе на вобласць! І ейны фотаздымак не з'явіцца на першай старонцы нашай газеты.

Тацццяна Іванаўна. Божа, пра што ты кажаш, Тамара? Адкуль у цябе нянавісць? Якая помста? Што ён табе зрабіў?

Т а м а р а. Мне? Мне — нічога. А ў вас, Таццяна Іванаўна, ёсць родныя людзі? Вось у мяне ёсць. Родная цёця. Малодшая маміна сястра. Яна жыве ў іншым горадзе, але мы часта ездзім да яе. Да яе і ейнага сына. Майго стрыечнага брата. Хлопец — інвалід, наш равеснік. У яго ДЦП, не можа хадзіць. Такі разумны хлопец, вы б ведалі! А якія вершы ён піша!

В о л ь г а  Ф ё д а р а ў н а. Не разумею, пры чым тут той сертыфікат? Патлумач, калі ласка.

Т а м а р а. А што тут тлумачыць? Вы яшчэ не зразумелі, што той хлопец — дзіця Воранава? Ён так быў затлуміў галаву цёці Аліне, што яна забылася на ўсё. Ён жыў у яе кватэры, як муж: яна гатавала яму есці, яна мыла ягоную бялізну. А ён гэтым часам думаў пра свой будучы шлюб. З іншай. Бо ў той іншай быў вельмі заможны і ўплывовы бацька. Там былі грошы. І аднойчы ён сышоў ад цёці Аліны. Калі яна праз месяц паведаміла яму, што цяжарная, ён... Карацей, сказаў, што ён ні пры чым. І каб болей яму не тэлефанавала, бо ў яго вось-вось вяселле. Вось так... І вы мяркуеце, што я магла ўтрымаць сябе, упусціць такі момант, каб не адпомсціць хоць нечым? Не, я сябе б перастала паважаць.

Т а ц ц я н а  І в а н а ў н а. Выбачай, Тамара, але ж сёння ёсць генетычная экспертыза... Твая цёця можа замовіць яе — і яе сын будзе атрымліваць тое, што яму належыць як сыну Воранава.

Т а м а р а *(сцішана)*. Мы ўгаворвалі цёцю Аліну. Але яна наадрэз адмаўляецца. У яе ёсць гонар.

В о л ь г а  Ф ё д а р а ў н а. Гонар гонарам, а сыну трэба шмат чаго! Не бярэ сабе — хай думае пра яго будучыню... Дый, чакайце, чакайце, пра што мы гаворым? Не гэтае пытанне мы мусім зараз абмяркоўваць. Божа, вось гэта дзянёк... Што будзем рабіць, Тамара? Ды сядай, не стой...

Т а м а р а. Рабіце, што хочаце... *(Сядае.)*

В о л ь г а  Ф ё д а р а ў н а. А нешта ж трэба рабіць... У першую чаргу высветліць, хто насамрэч быў у маім кабінеце. Хто канкрэтна вінаваты. Мне важна ведаць адно імя. Бо яму адказваць за злачынства. Паўтараю — за злачынства. Калі гэта ты, Тамара, з табой я паразмаўляю асобна. А іншыя могуць ісці. Я стамілася...

Андрэй сядзіць, зіркаючы сабе на калені, на якіх трымае свой мабільны тэлефон. За ім падглядвае крадком Лёшык.

А н д р э й *(хвалюючыся, здымае акуляры, цярэбіць іх у руках, зноў апранае).* Дазвольце сказаць, Вольга Фёдараўна?

В о л ь г а  Ф ё д а р а ў н а. Ну, скажы нешта разумнае, Андрэй. Я ўжо не ведаю, што тут думаць.

А н д р э й. Яны вам усе ілгуць, Вольга Фёдараўна.

В о л ь г а  Ф ё д а р а ў н а. Хто — усе? Ты пра што, Андрэй?

А н д р э й. Я магу гэта давесці... Усе хлусяць. Ірына, Раман, Сяргей і Тамара кажуць няпраўду. Ніхто з іх не браў сертыфікат. Я не выключаю такую магчымасць, што яны маглі ўзяць, але яны не бралі.

Т а м а р а. Чым ты дакажаш?

С я р г е й. Батанік, ты рызыкуеш, ведаеш гэта?

А н д р э й. Ведаю, разумею.

В о л ь г а  Ф ё д а р а ў н а. Цішэй усе. Сяргей, без пагроз, не забывайся, дзе знаходзішся. Кажы, Андрэй.

А н д р э й. Напачатку Тамара... Тамара, ты ж трымала ў руках сертыфікат? Як была напісаная там сума і якая сума там стаяла? Ты ж павінная была ўпэўніцца, што гэта менавіта сертыфікат...

Т а м а р а. Андрэй, што ты хочаш ад мяне? Я не памятаю!

Андрэй. Вось... Суму немагчыма было не пабачыць. Немагчыма ўзяць сертыфікат і не памятаць, як ён выглядаў. Значыцца, Тамара ў руках сертыфікат не трымала. Далей... Ірына сказала, што выкінула шматкі за акно... Але толькі ў класах можна адчыніць форткі акон ці само акно, а ўсе класы, апрача нашага, зачыненыя. З калідора такое немагчыма было зрабіць. А стаяць і драць сертыфікат у кабінеце дырэктара вельмі ж рызыкоўна. І Ірына таксама не скажа, якая сума была на сертыфікаце, як была напісаная. Так, Ірына?

Ірына *(з роспаччу).* Не скажу.

Андрэй. І Ромка не скажа, а ён перад тым, як перадаваць брату сертыфікат, тым больш павінен быў бы пераканацца, што гэта менавіта ён. Ды і не ў тым справа. Праз акно перадаць сертыфікат магчыма толькі з нашага класа, а тут вецер такі — яшчэ падхопіць ды панясе на дах ці куды далёка. Значыцца, перадаць яго можна было толькі з рук у рукі. Я... тут пяць хвілін далі кожнаму, дык я схадзіў уніз і спытаў у вахцёра, ці выходзіў хто з нашых. Нікога не было. І ніхто не заходзіў у школу. Вось...

Сяргей. Андрэй, я цябе адразу папярэджваю: я не збіраўся разглядваць нулікі і ўнікаць у тэкст сертыфіката...

Андрэй *(вінавата ўсміхаецца).* Гэта няважна ў дачыненні да цябе. Сяргей, у прыбіральні ў школе немагчыма спаліць паперыну, каб не засталося паху, ды яшчэ такую фарбаваную, як сертыфікат. Смуроду было б на ўвесь паверх. А я таксама ў прыбіральню хадзіў... Нічога ў прыбіральні ты не паліў. І не паліў нават, і на вуліцу ты не выходзіў. Ты сказаў, нібыта паліць, але гэта больш каб Таццяну Іванаўну пацвеліць.

Сяргей. Ты зараз дагаворышся.

Вольга Фёдараўна *(да Сяргея).* Сяргей, я прасіла не забывацца. Што за пагрозы?

Андрэй. Як бы там ні было, але ж праўда важней. І зусім яна нікога не забівае. Праўда толькі на першы погляд, у першыя дні страшная. А потым — лягчэй, я ведаю. Я колькі разоў маці малым падманваў, пакуль гэта зразумеў.

Вольга Фёдараўна. Чакай, чакай, Андрэй. Мне нецікава слухаць пра тое, хто не браў. Ты скажы мне, хто мог узяць.

Андрэй. Узяць было не праблемай. І Таццяна Іванаўна магла ўзяць.

Ірына. Ты што, з глузду з'ехаў?

Сяргей. Ну ты, батанік, дагаварыўся.

Вольга Фёдараўна. Ціха!

Таццяна Іванаўна. Ты, Андрэй, мяне абвінавачваеш?

Андрэй. Ды не, Таццяна Іванаўна, не абвінавачваю. Я кажу, што вы маглі ўзяць, але ж вам яго няма куды было дзець... У вас торбачка, вунь ляжыць, зусім маленькая. Вы, я заўважыў, вельмі акуратная, не станеце складваць дакумент у некалькі столак. А кабінет інфарматыкі зачынены на некалькі замкоў, і там ключ заядае, хвілін пяць патраціць трэба... Не, вы не бралі.

Таццяна Іванаўна. Ну, дзякуй, суцешыў...

Вольга Фёдараўна. Выдатна, выдатна...

Сяргей *(пра сябе, галасна)*. Шэрлак Холмс недароблены... пагаворым.

Андрэй. Вольга Фёдараўна, дазвольце мне аркуш паперы?

Вольга Фёдараўна працягвае яму паперу. Андрэй нешта малюе на аркушы, піша, потым працягвае дырэктару.

Так выглядаў сертыфікат, Вольга Фёдараўна? І сума там не ў тысячах еўра, а ў беларускіх рублях, у мільёнах. Здаецца, пяцьдзясят. Так?

Вольга Фёдараўна *(разгублена)*. Так... Але што гэта значыць?

Андрэй. Гэта значыць, што толькі я адзін ведаю, як выглядаў сертыфікат. І значыцца, сертыфікат узяў я.

Сяргей. Ну ты даеш...

Ромка. Вось дык маеш...

Ірына. Андрэй, а твой залаты медаль? Ты падумаў? Божа...

Тамара. Вось табе і ціхі сціплы хлопчык...

Вольга Фёдараўна. Ну і выдатна. *(Адчайна.)* Хоць дакладна буду ведаць — хто! Можа, патлумачыш, навошта? У цябе таксама цётка? Ці маці працуе ў Воранава? Ці дзядзька на радыё «Свабода»? Ці так гонар каманды хацелася абараніць? Выйграць у імя чаго?

Андрэй *(вінавата)*. Не, Вольга Фёдараўна. Я проста не хацеў прадавацца двойчы. Я ведаю, як гэта агідна, калі прадаешся. Я не хацеў, каб гэта адчулі ўсе мае сябры.

Вольга Фёдараўна. Пастой, пастой... Гэта як — не хацеў прадавацца двойчы?

Андрэй. Бо мяне Воранаў ужо купіў адзін раз. З усімі маімі пачуццямі і адчуваннямі. Узяў і купіў.

Сяргей. Ты што, засланец, шпіён у нашай камандзе?

Ромка. Ну, выкладвай, Андруха!

Андрэй. Не буду выкладваць. Вы не следчыя. Досыць таго, што ведаеце.

Ірына. Андрэй... так несправядліва. Калі ты зрабіў гэта дзеля нас, як ты кажаш, то дзе... доказ? Можа, у цябе нейкія іншыя планы, асабістыя...

Андрэй. Ведаеш, Ірына, чалавекам заўсёды кіруе толькі яго самалюбства. Гэтае ахвяраванне дзеля ўсіх сабой — лухта. У першую чаргу чалавек думае пра сябе. Так, іншым разам і ахвяруе сабой.

Але галоўная прычына — ён сам. Дык вось, у мяне... вельмі асабістая прычына.

Сяргей. Не будзеш казаць?

Андрэй. Не.

Вольга Фёдараўна. Ні мне, ні міліцыі?

Ірына. Вы будзеце выклікаць міліцыю?

Вольга Фёдараўна. А што загадаеш рабіць?

Андрэй. А што міліцыянер? Яму галоўнае — прызнанне, а не прычына ўчынку.

Лёшык *(гучна, так нечакана для ўсіх, што ўсе нібыта першы раз бачаць яго)*. Ведаю я тваю прычыну. Не прызнаешся сам — я скажу. Пры ўсіх. *(Пабачаўшы, што на яго ўсе глядзяць з нямым здзіўленнем, падскоквае з месца.)* Ну і што вы ўсе на мяне глядзіце так, быццам гэта не я, а вось гэты вазон кветкавы загаварыў? Я — не мэбля! Оле-оле-оле! Я-не-мэбля! Я Лёшык, памятаеце? Ваш кнопачнік. Хоць дурны, затое спрытны. Ну, успомнілі? Ірына, я — Лёшык. Ну, чаго ты так дзівішся, Сяргей? Во, бачу, успомнілі... Малайцы! Андрэй! Будзеш казаць, ці мне?

Андрэй *(упарта, зняўшы акуляры)*. Ніхто нічога не ведае. Апрача мяне і самога Воранава.

Лёшык. І мяне. Я быў асабістым сакратаром Воранава. Ну, у тым жыцці. І ён мне ўсё апавёў.

Андрэй *(пачынае сумнявацца)*. Ты... нічога не можаш ведаць.

Лёшык. Затое я магу бачыць. І бачыў. Мабільнік у цябе хвайны. А я літаральна хвараю на мабільнікі. Ну, от што зробіш. Купіў сабе такі круты — гляджу, а ў цябе яшчэ круцей! Несправядліва, зноў мяне абышлі.

Андрэй. Ты... бачыў? Фота?

Лёшык. Яго толькі дурань не мог пабачыць... а, ну во яшчэ такі закаханы летуценнік, як Ромка. Ты занадта доўга дзівіўся на фотаздымак.

Ірына. На які здымак? Пра што вы?

Тамара. Здаецца, я пачынаю разумець... Андрэй, гэта здымак — дачкі Воранава?

Андрэй *(сцішана, сарамліва)*. Так. Лёшык бачыў Анжэлу.

Некаторы час усе маўчаць, Андрэй аглядвае ўсіх, разумее, што яму трэба апавядаць.

Мы ж жылі ў адным двары, хадзілі ў адзін садок. Вельмі сябравалі. І цяпер... сябруем. Крадком, праз сеціва. *(З нечаканым адчайным выклікам, у бок Тамары.)* І ніякая яна не пустая лялька! Вы б ведалі, як ёй жыць, калі ўсё за яе вырашаюць: дзе вучыцца, з кім сядзець за партай, якое насіць адзенне, а галоўнае — з кім сябраваць! Думаеце, ёй лёгка? У чацвёртым класе... мы любілі збірацца разам у яе на кватэры. Я дык штодня прыходзіў. У яе шмат было чаго цікавага. Камп'ютар новы, фільмы розныя, гульні. Мы малявалі... яна цудоўна малюе. Але бацькі запісалі яе ў музычную школу, яшчэ — на танцы... Вось... Аднойчы я прыйшоў, а Воранаў адчыніў дзверы, не пусціў мяне, а сам выйшаў на лесвічную пляцоўку. Дастаў з партманета дзесяць долараў і сказаў, што гэта мне, але каб я больш да іх не прыходзіў...

Ірына *(з жалем)*. Ты ўзяў?

Андрэй. Я разгубіўся. Я ж малы зусім быў. А тут — ажно дзесяць долараў. Воранаў яшчэ нешта гаварыў, я ўжо не памятаю. Пайшоў, а я стаю, трымаю гэтыя долары і мне так было агідна! Прыйшоў дадому, толькі потым успомніў, што долары ў руцэ сціснутыя. Мама пабачыла, напужалася. А я сказаў, што знайшоў. Так яны ў мяне і ляжаць. Па сёння. Вось... я больш не буду прадавацца. Пайсці з каманды я не магу, але прадавацца не буду. І потым... Для Анжэлы так будзе лепш. Яе там узненавідзелі. Калі мы зліем гульню, ёй будзе вельмі цяжка...

Вольга Фёдараўна *(пасля паўзы).* Добра. Андрэй, нясі сертыфікат — і ідзіце дадому. Заўтра збяромся. Таццяна Іванаўна вам патэлефануе, у які час. У мяне ад вас галава баліць.

Андрэй. Няма... сертыфіката.

Вольга Фёдараўна. Я бачу, што няма. Дык прынясі. Хуценька.

Андрэй *(разгублены стаіць).* Не магу...

Вольга Фёдараўна. Андрэй, ты — адзін з двух нашых патэнцыйных медалістаў. Ты ўяўляеш сабе, што цябе чакае, калі сертыфікат не будзе праз пяць хвілін на стале? Што ты мне зараз прапануеш рабіць?

Андрэй маўчыць, трэ шкельцы акуляраў.
Паўза зацягваецца.

Лёшык *(устае, пляскае Андрэя па плячы, цісне так, што той мусіць сесці).* Андрэй праўду кажа, Вольга Фёдараўна. Не можа ён прынесці сертыфікат.

Вольга Фёдараўна *(моршчыцца).* О, Божа, Грушык, а ты што хочаш сказаць?

Лёшык *(сур'ёзна напачатку, потым пачынае з сарказмам).* Неяк у шостым класе я бацьку быў выказаў: што гэта за прозвішча ў мяне такое — Грушык? Хай бы Груша хоць, а то — Грушык. Прозвішча Грушык. А я сам — Лёшык. Праўда, клёва? Настаўнікі кажуць — Грушык. Аднакласнікі — Лёшык. І толькі адзін чалавек сёння, тут, назваў мяне двойчы імем Аляксей. Маім імем! Мне яго мама дала! Заўважылі? Не заўважылі, бо я гэта сам сябе так называў. Аляксей я, ведаеце, не? Не Лёшык, не Грушык. Аляксей мяне клічуць. Вой, выбачайце, Вольга Фёдараўна, даруйце, калі ласка, дарагія аднакласнікі... Пераходжу да тэмы. Андрэй, устань!

Андрэй падхопліваецца спалохана.

Андрэй, як сябар сябру, кажы: ты пераканаў Вольгу Фёдараўну, што ні Ірына, ні Сяргей, ні Тамара, ні Ромка, ні Таццяна Іванаўна не бралі сертыфікат?

Андрэй. Я... Я пераканаў.

Лёшык. Выдатна. Ты намаляваў на аркушыку паперы, як выглядаў сертыфікат?

Андрэй. Я... намаляваў.

Лёшык *(настойліва, эмацыянальна, як сапраўдны следчы).* А цяпер кажы сам, каб я не правяраў, кажы хутка, у вочы мне глядзі, у вочы, і памятай, што мы з табой з атрада вераб'іных класа птушкі! Кажы: які апошні сайт на сваім тэлефоне ты наведаў, пакуль тут ішлі прызнанні тваіх сяброў у нязздзейсненых злачынствах? Кажы хутка, у вочы, глядзі, у вочы, сам праверу, Андрэй! Маўчыш? Падказваю: гэта быў сайт фірмы Воранава?

Андрэй *(пакутліва праглынае сліну).* Так, яго сайт.

Лёшык. Апошняя старонка, якую ты глядзеў — рэкламны ролік пра сертыфікат, які можа выдаваць фірма сваім пастаянным кліентам? Хутчэй!

Андрэй. Так...

Лёшык. Ім павярніся цяпер і скажы: я пабачыў сертыфікат на старонцы сайта фірмы Воранава на сваім мабільным! Кажы, хутчэй! *(Разварочвае Андрэя да ўсіх, але той падае на канапу, абхоплівае галаву рукамі і заціхае.)*

Паўза, гнятлівая. Усе глядзяць на Лёшыка.

Вольга Фёдараўна. Грушык... Э-э-е, Аляксей, што гэта было?

Лёшык. Ды нічога асабліва, псіхаэмацыйная атака з арсеналу супрацоўнікаў ФБР. Да суседкі жаніх з Амерыкі прыязджаў, навучыў. Вынік дадат-

ны: кліент раскалоўся і прызнаўся, што сертыфікат змог намаляваць таму, што за хвіліну да свайго нібыта прызнання бачыў яго ў сеціве. А лічбу пра пяцьдзясят мільёнаў я таксама запомніў, хоць там казалася пра пяць тысяч еўра.

Вольга Фёдараўна. Ну, я хоць і не на «ты» з камп'ютарам, але пра сайт зразумела. Я не пра гэта пытаюся. Што ты хацеў гэтым сказаць мне і сябрам?

Лёшык. Сябрам? Ды вы што, Вольга Фёдараўна?! Якія ж гэта сябры? Як я магу называць сябрамі людзей, якія імкнуцца скрасці ў мяне адзін-адзіны шанц?

Ірына. Ты пра што, Лёшык....

Вольга Фёдараўна *(выпраўляе)*. Аляксей...

Ірына. Ты пра што, Аляксей? Хто ў цябе што крадзе?

Лёшык. Вы ўсе тут: ты, Тамара, Сяргей, Ромка і во — нават Андрэй з аднаго са мной атрада вераб'іных крадзеце ў мяне славу.

Вольга Фёдараўна. Божа... Аляксей, не муч мяне. Ідзі прынясі гэты сертыфікат, я зараз пастаўлю імбрык, у мяне тут цукеркі і печыва, спецыяльна прынесла, пасядзім, пасмяемся, пап'ем гарбаты.

Лёшык *(спуджана)*. Вой, толькі не трэба пра ежу... Мой страўнік... Андрэй!

Андрэй. Што?

Лёшык. Пытанне, хутка: колькі рознай хімічнай гадасці ўваходзіць у такі сертыфікат, які выдае Воранаў?

Андрэй. Ды... не ведаю. Фарбы там шмат... Свінец зноў жа — цяжкі метал.

Лёшык. Вось, Вольга Фёдараўна: якая гарбата, якое печыва? Мой страўнік не можа перастраваць пакуль адзін-адзіны сертыфікат! *(Падае на канапу і трымаецца за жывот.)*

Вольга Фёдараўна *(устае).* Што?

Ірына. Ты... ты з'еў сертыфікат?

Сяргей *(амаль з захапленнем і адчаем).* Ну, я ж казаў — ён можа! Ён такое можа!

Лёшык *(устае).* Усё, спазм прайшоў. Ага, Вольга Фёдараўна, я з'еў сертыфікат. І вось уявіце, як тое было мне рабіць, які ж ён нясмачны, а часу зусім мала было, вада з-пад крана агідная... А яны ўсе вырашылі адабраць у мяне славу! І гэта сябры?

Вольга Фёдараўна. Так. Досыць, Грушык! Досыць! Не рабі з мяне клоўна!

Лёшык *(сумна, недзе з адчаем, недзе са сцёбам).* Клоўн, Вольга Фёдараўна, не можа рабіць клоўнамі іншых.

Вольга Фёдараўна. Не зразумела.

Лёшык. Дык што тут незразумелага? Клоўн — я. Я — Лёшык Грушык, блазан і ачомак. Гэта ж з мяне ржуць, як коні. Гэта я зрываю ўрокі сваімі прыдуркаватымі пытаннямі, гэта з-за мяне маладзенькія настаўніцы баяцца ісці ў наш клас. Ад мяне можна чакаць нейкае падколкі, гэта я сцябаюся над харошымі і паспяховымі, гэта я смяшу, смяшу, смяшу... І ўсе смяюцца. І мяне не ўспрымаюць іншым — я толькі блазан. Я нікому не сябар, хто з клоўнам сябраваць будзе? Вось, нават Андруха, хоць мы з ім з аднаго атрада вераб'іных, не захацеў дзяліцца са мной сакрэтам мабільным, давялося падглядваць.

Таццяна Іванаўна *(не можа стрымацца, перабівае).* Лёшы... Аляксей, Лёша, ну навошта ты так кажаш? Ты ж ведаеш, што ад цябе на палову залежыць поспех каманды.

Лёшык. Гэта вы праўду кажаце, Таццяна Іванаўна. У каманды ад мяне карысці, як ад будніка раніцай. Праўда ж, не? Найхутчэйшая рэакцыя! Вось мяне і ўзялі. Была б хуткая ў некага

іншага — узялі б іншага. Вой. Выбачайце, Вольга Фёдараўна! Нешта я тут разнюніўся зусім. Дык вось, афіцыйна вам заяўляю, што я ўзяў і з'еў сертыфікат. Чаму? Бо хачу праславіцца! Вось вы ўяўляеце: у якой яшчэ школе будзе вучань, які з'еў грашовы сертыфікат на пяцьдзясят мільёнаў, а? Не будзе! А ў нас ужо ёсць! Ды пра мяне ўсе газеты напішуць, яшчэ і тэлебачанне прыедзе. Ромка, гад! Будзь хоць адзін раз чалавекам, апавядзі брату ўсё як ёсць — я дам яму эксклюзіўнае інтэрв'ю, прадасць ва ўсе газеты — сто мільёнаў заробіце! Гэта ж сапраўдны геройскі ўчынак! Ды не перажывайце вы так, Вольга Фёдараўна! Я ж — блазан, які з мяне попыт? Ды і з атэстатам у мяне праблем няма — які ёсць, такі і будзе. А слава — застанецца. Прыеду праз дзесяць гадоў на сустрэчу, а ўсе вакол: о, гэта той самы, што сертыфікат з'еў!.. Вось адзінаццаць гадоў прабыў у школе, і хіба хоць які-небудзь учынак зрабіў, каб запомніўся людзям, каб, называючы маё імя, не ўсміхаліся паблажліва, а сказалі хоць слова адно сур'ёзнае? Каб сказалі — Аляксей, а не Лёшык... Вось, цяпер будзе ўчынак: я з'еў сертыфікат на пяцьдзясят мільёнаў.

Т а м а р а. Навошта табе такая слава? Слава Герастрата...

Л ё ш ы к. Ну, не скажы, не скажы, Тамара. Герастрат ён што знішчыў? Прыгажосць! Во, дзякуючы вам я столькі ўсяго ведаць стаў, аж самому страшна. Вось, там прыгажосць. А грошы ёсць што? Правільна, зло! Я знішчыў крышку зла! Крышку, але знішчыў! Ды якая розніца! Вы ўсе — зоркі. У вас веды, дасціпнасць, аналітычны склад розуму. Вы гонар школы. А я што? Я блазан. Я ўсе адзінаццаць гадоў у школе — Лёшык, нікчэмнасць смешная, клоўн. Я — толькі маленькая, незаўважная тэхнічная частка вашай каманды цяпер, я — самы

несур'ёзны чалавек, у якога ў галаве адно жартачкі ды падколкі. Вось, Ірына, калі б я раптам сказаў, што кахаю цябе ад пятага класа, ты б вочы вылупіла, праўда?

Ірына *(агаломшаная)*. Ты? Мяне? Ты... кахаеш?

Лёшык. Вось, што і трэба было давесці... Ты, Ромка, смяяўся, што я з катом трэніруюся, яшчэ прыпеўку прыдумаў... А ты ведаеш, я дома прыладу зрабіў быў, месяц трэніраваўся перад тым, як прыйсці да вас і папрасіцца ў каманду. Хацеў... Хацеў з вамі быць... У камандзе... Стаць такім, як нехта з вас. А застаўся... Лёшыкам, блазнам... Кнопачнікам толькі... Мы выйграем фінал, ну калі дазволіць гуляць нам Вольга Фёдараўна. У мяне ж унутры энергіі на пяцьдзясят мільёнаў, усе кнопкі выйграю! Але далей... далей шукайце сабе іншага кнопачніка. Спрытных хлопцаў стае, ды і ахвотных будзе навалам.

Ірына. Ну гэта ж няпраўда! Навошта ты так кажаш! Я... ведаю цябе іншага! Ты ведаеш, што кажаш няпраўду! Хлопцы, ну скажыце яму! Хіба ён не выцягнуў нас на паўфінале? Лёша, гэта не ты, ты не еў гэты сертыфікат! Я... Я не буду капітанам без цябе!

Лёшык *(засаромеўся)*. Ды... чаго ты так... Не трэба перажываць. Ну падумеш, клоўн трошкі расслабіўся...

Андрэй. Ты столькі пытанняў для нас напрыдумляў, столькі фактаў цікавых пазнаходзіў... Як цікава трэніроўкі праходзяць... Які ты блазан?

Сяргей. Лёшык, досыць гнаць! Так, Лёшык, не падабаецца — скажы, буду клікаць па-іншаму. Каманда без цябе — не каманда! І ты гэта ведаеш. Што ты, як дзяўчына, просішся на кампліменты? Хочаш, каб цябе пашкадавалі? Зараз, выйдзем, я табе скажу пару слоў. Разнюніўся.

Ромка *(да Сяргея)*. Я вось думаю, можа тыя самыя хімічныя рэчывы ў сертыфікаце падзейнічалі на работу яго мозга?

Лёшык *(абмацвае галаву)*. Не, не можа быць, Ромка. Уздзейнічаць можна толькі на тое, што ёсць.

Тамара. Лёшка, што ты нясеш? Колькі разоў твае смешачкі літаральна ратавалі нас ад спрэчак і скандалаў? З табой весела ж заўсёды, ты самыя вострыя моманты згладзіш жартам, няўжо ты не разумееш? Ну... ставіліся так... называлі...

Таццяна Іванаўна. Дарэчы, маладыя настаўніцы і напраўду вельмі баяцца ісці ў ваш клас, Аляксей. Я вось таксама баялася. Але толькі першы месяц. Затое потым як хто вяртаецца з усмешкай вясёлай на твары, усе ў настаўніцкай ведаюць — быў урок у вашым класе. А ўсміхацца не так часта нам даводзіцца. Дарэмна ты так на сябе. І жарты твае звычайна да месца, і дасціпныя. І Вольга Фёдараўна можа сказаць...

Вольга Фёдараўна. Ну вось што, Грушык... Аляксей Грушык. Той самы рэдкі выпадак, калі я табе гатова паверыць. Толькі ведаеш, наўрад ці атрымаецца ў цябе праславіцца. Нешта мяне зусім не радуе перспектыва быць дырэктарам школы, у якой вучань з'еў сертыфікат на пяцьдзясят мільёнаў. Я пакуль не ведаю, што як будзе і што будзе, але высновы я мушу зрабіць і я іх зраблю. Андрэй слушна сказаў, што кожны чалавек у першую чаргу кіруецца сваім асабістым «я», але ў тым і справа, што гэтае «я» вельмі і вельмі залежыць ад выхавання нашага, ад таго, якімі мы выраслі... *(З чыста жаночым хваляваннем.)* Жывот не баліць?

Лёшык. Ды не, Вольга Фёдараўна. Страўнік у мяне можа цвікі пераструвоўваць. Што яму нейкіх пяцьдзясят мільёнаў...

Вольга Фёдараўна. Ага, і праўда, што тыя пяцьдзясят мільёнаў. Так... Ніяк я не чакала, што мне давядзецца рашаць такую задачу. Ідзіце дахаты... Ідзіце...

Усе ўстаюць, каб ісці. У гэты момант адчыняюцца дзверы, нечая рука прытрымлівае Жэнечку, якая заходзіць, несучы ў руках некалькі папяровых самалётаў.

Жэнька. Баба Воля, глядзі, якія ў мяне самалёты! І я хачу гарбаты! З цукеркамі!

Вольга Фёдараўна. Добра, Жэнечка, добра... пакладзі свае самалёты, зараз пойдзем дадому... Там пап'ем гарбаты.

Сяргей *(прыўздымаецца з месца насустрач дзяўчынцы, прысядае перад ёй).* Ну, Жэнечка, пакажы мне, што ў цябе за самалёты? Ух ты, сама рабіла? Якія прыгожыя!

Жэнька. Сама. У садку навучылася.

Сяргей *(бярэ адзін-другі самалёт у рукі).* Ух ты, якія ж хвайныя самалёты... О! А які гэты прыгожы!

Жэнька. Гэта пасажырскі! Толькі ён дрэнна лётае...

Сяргей *(разгарнуў крылы самалёта).* Цікава, цікава... О, які ў цябе каштоўны самалёт. І чаму гэты самалёт можа дрэнна лётаць, калі ён сертыфікаваны... Бачыш, тут і літары прыгожыя, прыгожа намалявана... Давай-ка мы зірнем, можа, унутры ў самалёце нейкая няспраўнасць? *(Разгортвае ўвесь самалёт.)* Не, няма няспраўнасці... Во, толькі подпіс: Воранаў. Пячатка. Пяцьдзясят мільёнаў. *(Устае і паказвае дырэктару, якая ўздымаецца з крэсла, а потым усім сябрам разгорнуты цалкам самалёт, які быў зроблены з сертыфіката.)*

Лёшык *(устае, абхоплівае галаву рукамі).* А-а-а! Усё. Я не перажыву! Дзіця скрала ў мяне сусветную славу! *(Падае на канапу.)*

Сяргей гэтым часам перадае дырэктару сертыфікат. Тая ўсхвалявана прымае яго, разглядае.

Усе стаяць, збянтэжаныя глядзяць на дырэктара.

Вольга Фёдараўна *(усхвалявана, стрымліваючы сябе).* Жэнечка... ты ўзяла гэты аркуш з майго стала?

Жэнька. Дык ён жа прыгожы, баба!

Вольга Фёдараўна маўчыць, паўза цягнецца.

Вольга Фёдараўна. Ты, унучачка, аддай мне назад гэты аркуш, я табе шмат іншых дам, добра?

Жэнька. А цукерку?

Вольга Фёдараўна. Ага, і цукерку. І праўда, пап'ем зараз гарбаты... з цукеркамі і печывам... Таццяна Іванаўна, улучыце, калі ласка, там імбрык...

Паўза.

Вольга Фёдараўна *(павольна, абвёўшы позіркам усіх).* Цяпер я ведаю, што вас не купіць ні воранаў, ні сарокін, ні гусеў... *(Спакойна, без эмоцый дзярэ сертыфікат адзін, другі і трэці раз.)*

Гасне святло, потым адразу ж запальваецца. У цэнтры стаіць Ромка з гітарай, вакол яго ўся каманда, абняўшыся за плечы, з аднаго боку — Вольга Фёдараўна з унучкай Жэнькай, з другога — Таццяна Іванаўна.

Ромка *(спявае, яму падпяваюць, урачыста-велічна).*

Затрымай над вачыма руку,
Каб не зведаць ад сонца пакут.
У выглядванні хмар, што абклалі абшар,
Каб не зведаць ад сонца пакут.
І трывай, покуль сілы, трывай.
Хай не глянецца за небакрай,
Дый не сціхне ў ілжы
За штуршок да мяжы
Тое, што мне ніхто не казаў.

Грэшны кавалак неба бачыш ты навылёт,
Што табе заўтра трэба, што табе як сваё?
Раніцай свежы позірк ці вечаровы змрок?
Дай мне руку і пойдзем. Ціха, за крокам крок.

З а с л о н а

# ВАРТАЎНІК,
## АЛЬБО КОЛЦЫ ОДРЫ

*Амаль фантастыка*

### ПРАЛОГ

У мяне цяпер адзін занятак: завесці генератар, адлучыць яго пасля васьмі гадзін працы і даць ноўтбуку разрадзіць свае акумулятары. Потым я ізноў заводжу генератар. І так штодня. Ужо некалькі месяцаў. У мяне адна мэта, адзін сэнс, і ўсё маё жыццё ў гэтым ноўтбуку, які не можа быць спынены.

...Ілля Калінін, вялікі, нават трохі няўклюдны, за трыбунай пачуваўся няўтульна. Ён паводле напісанага падзякаваў Нобелеўскі камітэт за прэмію і потым, чырванеючы і заікаючыся, нечакана для ўсіх дадаў:

— Я ведаю, вы ўсё ўжо назвалі... Але я... вось, я жадаю... прашу вас зваць гэтае... адкрыццё не колцамі Калініна, а колцамі... Одры. Вельмі прашу.

У зале прашамацеў ветрык здзіўлення, потым пачуліся нечыя хліпкія воплескі, а ўжо авацыя ўслед — пасля таго, калі задуменны сум на твары старшыні змяніўся проста-такі прамяністай усмешкай. Здаецца, толькі ён адзін памятаў, што такое Одры.

І яшчэ ведаў я. Праўда, гэта было не што такое, а хто такая...

## 1. КОЛЦЫ ОДРЫ

...Толькі я адзін з нашай групы бываў у гасцях у Іллі. У першы свой прыход я і пазнаёміўся з Одры Хэпбёрн.

Напачатку трохі асалапеў, але не ад самой галаграмы, а ад гэтай жанчыны. У ёй было нешта незразумелае, няўлоўнае. Так і хочацца сказаць — незямное, але, стоячы перад ёй, усведамляў — яна самая што ні на ёсць зямная, яна — найсапраўднейшая. Калі першая разгубленасць прайшла, я зразумеў, што рабіла Одры найсапраўднейшай: у ёй усё было цудоўна, і гэтае цудоўнае не было штучным. Нашыя жанчыны яшчэ да 15 гадоў мадэлявалі свае пысачкі, бюсты, тулавы, ногі, рукі, валасы, пазногці, вушы, словам — усё. Ідзеш вуліцаю — і раптам ловіш сябе на думцы, што ідзеш па велізарнай краме сярод шпацыруючых вялікіх лялек.

Одры Хэпбёрн... Каралева прыгажосці ўсіх часоў і народаў. Ледзь раскосыя, вялікія, выразныя вочы з туманам, рэзка акрэслены, акуратны, правільнай формы нос, невялікі рот з пачуццёвымі вуснамі, прыгожыя роўныя зубы — выпраменьвалі цеплыню натуральнасці. Нават з халоднай галаграмы.

— Вось чаму ты на нашых дзяўчат увагі не звяртаеш... — з разуменнем працягнуў я.

— Яны яшчэ і дурніцы да таго ж,— абыякава адказаў Ілля, абышоў галаграму, стаў ля стала.

У гэтым было нешта — ён не прайшоў скрозь галаграму, а абмінуў яе...

— А чаго ты яе не ажывіш? — спытаў я.— Напэўна ж, у цябе дадзеных досыць. У нашым аддзеле но-

вая версія электроннай галавы ёсць, больш паловы лагічных адказаў...

— Не,— рэзка спыніў мяне Ілля.— Гэта... блюзнерства. Лепей, зоймемся справай...

Так, нас чакала справа. Учора ля аўтамата з кавай ён падышоў да мяне:

— Ты ў механіцы моцны... Разумееш, мне трэба колцы... З электрамагнітамі... І такая сістэма кіравання, якая дазваляла б улучаць магніты па чарзе. Каб па крузе бег згустак магнітнага поля. Разумееш?

— Не складана,— адказаў я.— З якой хуткасцю каб бег?

— З хуткасцю святла... І хутчэй...

І вось сёння мы ўзяліся за працу. З улікам магчымасці элементнай базы нашае колца атрымалася больш за 10 метраў у дыяметры — яго мы майстравалі на лецішчы Іллі, проста пад адкрытым небам. Пасля ўлучэння яно засвяцілася ўсярэдзіне блакітнаватым святлом і — нічога больш. Ніякія прыборы нічога не рэгістравалі. Проста святло. І котка, ахвярна кінутая ўнутр колца, толькі прынюхвалася лянотна...

Потым я рабіў яшчэ адно колца, і яшчэ адно. Паводле формулаў Іллі мяняў кірунак і хуткасць магнітнага згустка, фазнасць, палярызацыю хваль поля кожнага колца... І аднойчы наш піражок з трох колцаў успыхнуў унутры... чорным святлом. Ілля кінуў туды камень — камень знік. Котку мы пашкадавалі, і яе кідаць не сталі.

Так Ілля адкрыў выхад у гіперпрастору. На колцы накінуліся некалькі інстытутаў і акадэмій — вывучалі, спрачаліся, эксперыментавалі. Разабраліся з эфектам тунэлю, што стваралі колцы — у ім прастора сціскалася да неверагодна малых памераў. Прадмет, што трапляў у тунэль, сам па

сабе набываў хуткасць у мільёны разоў большую за хуткасць святла.

Сістэму колцаў звалі колцамі Калініна, пакуль вось цяпер, на ўручэнні Нобелеўскай прэміі ён не даў ёй іншае імя — колцы Одры.

## 2. ЦЕНЬ ОДРЫ

Потым Ілля прыйшоў да мяне.

— Машына часу... яна магчымая. Дапаможаш зрабіць?

— Чаго ж не зрабіць? Апавядай,— ніколькі не здзівіўся я.

— Любая хваля не гасіцца да нуля. Яна жыве вечна. Так?

— Ага, так,— не стаў я аспрэчваць фізічныя пастулаты.

— Вось... Я цяпер крыкну — ты пачуеш. А калі ты ў любы ад мяне бок адбяжыш з хуткасцю вышэй за хуткасць гуку, то пачуеш гэты крык яшчэ раз. Потым яшчэ можна адбегчы — і зноў пачуць...

— Стоп,— спыніў я Іллю.— Хочаш Одры з мінулага выкрасці?

Ілля пачырванеў.

— Мінулае ёсць, але яно... нематэрыяльнае. Мы з табой стаім вось тут — і кожную секунду ўся інфармацыя пра нас нясецца ў космас. Мінулае існуе... як кіно. Калі цяпер паляцець на хуткасці вышэй за хуткасць святла ў любы бок — можна паглядзець малюнак нашай з табой гутаркі. Галоўнае — прыняць усе хвалі. Далей паляцім — старэй зловім малюнак. Вось...

Я майстраваў паводле накідаў Іллі прыймач. Ён задаў такія параметры адчувальнасці і такі дыяпазон хваль, што гэта ў прынцыпе не магло праца-

ваць. Але ў мяне атрымаўся ў выніку сканер на дыскрэтным дыяпазоне. З зададзенай адчувальнасцю. Ілля да таго часу прымайстраваў свой ноўтбук да колцаў — ён распрацаваў сістэму кіравання, якая, ён спадзяваўся, будзе працаваць.

Ідэя была вельмі простай: мы робім прыймач, наладжваем яго так, каб ён улучыўся ў пэўны момант. Колцы Одры заносяць наш прыймач неверагодна куды, так далёка, куды электрамагнітныя хвалі ад нас яшчэ не дайшлі. Там прыймач спыняецца, улучаецца і фіксуе тое, што прыходзіць. Потым мы яго вяртаем назад, разганяючы колцы ў зваротны бок.

Усё спрацавала — і сістэма кіравання Іллі, і нашыя колцы, і мой прыймач.

Праз гадзіну мы глядзелі чорна-белы фільм пра нас саміх, якія рыхтавалі да адпраўкі прыёмнік.

Потым Ілля сказаў, што мы едзем у Англію. Разам з нашымі колцамі. І новым прыймачам, які я павінен зрабіць за тыдзень. Я зрабіў.

...Мы спыніліся на беразе нейкае ракі — сюды Ілля цягнуў мяне з такой зацятасцю і такой упэўненасцю, быццам нарадзіўся тут і рос да паўналецця.

— Тут...

У гэтым месцы рака рабіла плаўны выгін, дробячыся на водмелі на мільёны невялікіх бліскавак-хваль. Вербы ля берага нізка апускалі свае галіны, здалёк яны здаваліся заслонай сцэны. Сама сцэна — гэта бераг, што збягаў да вады золатам пяску.

Тут быў спектакль, тут ішло дзіўнае дзейства! Ледзь калыхаліся пад ветрам галіны вербаў — вось, толькі што там, за імі, схавалася прыма. Варта толькі гучна і шчыра крыкнуць «Біс!» — яна выйдзе на паўторны паклон...

Мы замерлі, аглушаныя цішынёй і адчуваннем чарадзейства.

— Яна... была тут,— прахрыпеў Ілля, потым адкашляўся.— Одры Хэпбёрн была тут, на гэтым беразе. Вербы... тады былі іншыя вербы, гэта выраслі ўжо новыя. Гэтае месца ахоўваецца таемна... Тымі, хто любіць Одры.

## 3. УСМЕШКА ОДРЫ

Увесь дзень пайшоў на падрыхтоўку і праверку, наладку, рэгуляванне. Да ночы мы ўсталявалі прыймач у цэнтр колцаў. Ілля запусціў праграму і потым хвіліны дзве стаяў, тупа сузіраючы экран манітора.

— Не атрымліваецца? — гэтак жа тупа спытаў я.

— Баюся...— шэптам адказаў Ілля.— Я ведаю яе толькі паводле кінафільмаў, паводле роляў. А тут... На гэтым беразе яна была адна. Яна была сама сабой. Яна пісала потым, што была шчаслівая тут. І пісала пра гэтыя вербы, іх галіны, што як заслона тэатральнай сцэны. Я баюся пабачыць... Баюся пабачыць зусім не тое, што чакаю.

— Ты марыш пра рамантычную русалку, а тут мы ўгледзім з табой нейкую цётку? Добра, я першы пагляджу, а потым табе пакажу,— геранчна прапанаваў я.

— Не, разам паглядзім,— асуджана адказаў Ілля і націснуў на «энтэр» ноўтбука.

Прыймач знік ва ўзніклым чорным тунэлі. Ён з'явіцца тут праз восем гадзін — і павінен прынесці нам запіс таго, што было тут, на гэтым беразе, 247 гадоў таму.

Спалі мы не больш за тры гадзіны. Потым пілі каву, маўчалі. Віднела. Я выварнуў змесціва свайго заплечніка, пачаў збіраць лазеры.

— Гэта навошта? — здзіўлена запытаўся Ілля.

— А, глядзець, дык глядзець,— адмахнуўся я.— Кіно адразу глядзець будзем. Галаграфічнае. Чаго нам у манітор вытарашчвацца ўдвух.

Расставіў лазеры. Стала зусім светла.

Колцы сталі, тунэль знік. Прыймач быў халодны і вільготны навобмацак. Я падлучыў яго да ноўтбука. Ілля ў гэты час безуважна глядзеў туды — на заслону вярбовых галінак. Я падышоў да яго, сеў побач — мы цяпер дзелім усё на дваіх (бо і прэмію Нобелеўскую Ілля чэсна падзяліў напалам).

Улучыліся лазеры. Жудасныя перашкоды — цёмная сцяна незразумела чаго. Потым сістэма наладзілася, і на месцы цяперашніх вербаў у паветры намаляваліся іншыя. Вымалеваўся іншы бераг, крышку — але іншы. Рака іншая.

І з ракі выходзіла жанчына. Одры Хэпбёрн.

Па яе вільготнай скуры, якая нагадвала паверхню няспелага персіка, абмінаючы акуратныя, ледзь апушчаныя ўніз жывыя грудзі, збягалі кропелькі вады. Мяккі круглявы жывот. Нязвыкла было бачыць вялікі цёмны трыкутнік густых кучаравых валасоў унізе жывата — у тыя часы не было ў правілах у жанчын пазбаўляцца цалкам там валасоў. Не сучасныя — недасканалыя паводле формы, але дзівосныя сцёгны. Маленькія, амаль дзіцячыя ступні ног.

У мяне перахапіла дыханне. Ілля таксама не дыхаў.

А Одры ішла да нас — проста насустрач сонечным промням, што падалі на яе тонкіх ліній твар. Яна ледзь прымружылася, гледзячы па-над намі і... усміхнулася.

Ком падступіў да горла. На мяне раптам абрынулася ўсё адразу: ахвярнасць матчынага кахання, безабароннасць аголенай жанчыны, жарсць закаханай жонкі.

Мне закарцела заплакаць. Малюнак стаў ледзь размазаным. Дзесьці ў падсвядомасці мільганула думка, што мне трэба працерці вочы.

Одры стаяла каля нас, і хоць скрозь яе прасвечваў бераг сапраўднай ракі, яна была жывой. Такой жывой, што нам стала сорамна — мы падглядалі за жанчынай, якая купаецца.

Одры ўсміхнулася яшчэ раз, мяккай, усё разумеючай і даруючай усмешкай, быццам нам усміхнулася, быццам магла ведаць пра нашую прысутнасць — і павольна стала адыходзіць пад вярбовую заслону. Яна ледзь калыхала сваімі невялікімі сцёгнамі, прайграваючы, ох як прайграваючы ў прыгажосці і грацыі нашым сённяшнім жанчынам — як прайграе жывая жанчына ідэальнай гумовай лялькі на подыуме... Калыхнуліся галінкі вярбы.

Одры знікла.

— Я прыйду па цябе,— хрыпла пакляўся сам сабе Ілля.

І тады я спалохаўся.

## 4. ВЯРТАННЕ ОДРЫ

Усмешка Одры пераследвала мяне ўвесь месяц. За гэты час я насыціўся сапраўднай нянавісцю да нашых жанчын: не мог бачыць падцягнутую, гладкую, практычна штучную скуру твараў, аднолькава ідэальныя формы целаў. Але больш за ўсё мяне вар'явалі ўсмешкі, што ўсе як адна паказвалі абсалютна аднолькавыя, ідэальна белыя і ідэальна роўныя зубы...

Одры ўсміхалася мне праз радкі на маніторы, калі я разлічваў новыя ўзмацняльнікі для прыймача, яе стан узнікаў у кароткім пыху дымлівай смугі пры паянні чарговай платы. І Одры сустракала мяне дома — цяпер і ў мяне быў яе галаграфічны малюнак: калі яна выходзіць з вады. Мне была ўжо знаёмая кожная складачка на ейным целе, я ведаў коль-

касць кропелек вады на яе грудзях, я палічыў, колькі валаскоў у яе вейках. Я любіў замарудзіць моцна-моцна рух галаграмы, стаць блізка-блізка — і ўсмешка Одры, мяккая і далікатная — усмешка сапраўднай жанчыны — раскрывалася, квітнела цэлыя паўгадзіны проста ля маіх вачэй.

Як жа мне хацелася дакрануцца вуснамі! — хоць на самае кароткае імгненне! — да гэтых вуснаў. Зараз я разумеў Іллю. І я здагадваўся — не, я быў упэўнены, што ён гэтак жа застывае перад яе ўсмешкай па вечарах.

Я рабіў новы прыймач, Ілля прападаў у Інстытуце Цела — паводле ягоных прапаноў яны будавалі новую ўстаноўку ўзнаўлення матэрыі.

— Разумееш,— апавядаў мне Ілля,— кожная клетка стала перадае інфармацыю пра сябе звычайнымі электрычнымі імпульсамі. У 20 стагоддзі людзі ўлоўлівалі імпульсы ў бачнай частцы спектра, у гукавой. Але гэта мізер у параўнанні з тым, што перадае цела чалавека, асабліва ягоны мозг... Твой прыёмнік павінен сабраць абсалютна ўсе імпульсы. Я закончыў праграму, якая расфармуе гэты струмень на мільярды раўчукоў. Потым... потым кожны асобны раўчук будзе адказваць за ўзнаўленне матэрыі — у ім ляжыць уся інфармацыя пра гэты мікраўчастак. Мы злучым ужо матэрыяльныя раўчукі ў адзінае цэлае...

— Ты звар'яцеў,— сур'ёзна сказаў я.— Ты хочаш стаць богам?

— Бога няма... Ёсць законы фізікі... І мы іх пазнаем...

— А ты падумаў пра тое, што калі ўсё атрымаецца, калі мы матэрыялізуем Одры — як ёй будзе тут? І... і раптам яна назаўтра пабяжыць у нашыя дурныя салоны рабіць сабе вусны пухлейшымі, зубы бялейшымі, грудзі...

— Не трэба... Не трэба так пра Одры... Ты зробіш прыймач?

— Зраблю,— амаль злосна адказаў я.

Менавіта гэтага я і баяўся — што Ілля загаворыць пра матэрыялізацыю.

Але я зрабіў прыймач. І мы ізноў адправіліся на той бераг ракі.

Сеанс прайшоў нармальна.

Месяц, пакуль ішла расшыфроўка тэрабайтаў атрыманай інфармацыі, я практычна не выходзіў з дому. Добра, быў адпачынак.

Ілля зайшоў увечар, моўчкі прысеў на канапку.

— Заўтра пачынаем працэс матэрыялізацыі. Прыйдзеш?

— Прыйду,— паабяцаў я, хоць мне не хацелася нікуды ісці. Проста сядзець і глядзець на галаграму.

Назаўтра я быў у Інстытуце Цела. Ён быў такі ціхі, што мае крокі аддавалі рэхам. Усе замерлі — пачынаўся працэс. Ён павінен быў ісці больш за пяць гадзін. Колькі кавы было выпіта за гэты час, я не ведаю. Ва ўсялякім разе, я не бачыў ніводнай групы або групкі, дзе б нехта не трымаў у руках кубак.

У «акварыуме» — у пакоі са шкляна-люстранымі сценамі — завяршылася дзея. Сотні вачэй былі прыкаваныя да невысокага ложа, ад якога адзін за другім ад'язджалі робаты.

— Працэс завершаны,— канстатаваў металічны голас робата.— Адно несупадзенне з першаснымі дадзенымі: дэфіцыт масы — 6 грамаў.

Разгубленасць ад гэтай навіны была кароткай, яе не было калі абдумваць, бо голая жанчына на ложы варухнулася і села. Агледзела сябе, пакой з люстранымі сценамі, устала і павольна стала падыходзіць — проста да мяне і Іллі.

Скрозь шкло на нас глядзеў роўны, халодны погляд пустых вачэй на абсалютна раўнадушным, мёртвым твары.

Хтосьці сказаў:

— Дэфіцыт масы — 6 грамаў. Сотню гадоў таму казалі, што гэтулькі важыць душа чалавека...

Ілля абярнуўся на гэты голас — і знайдзі ён поглядам таго, хто казаў, той, напэўна, мог бы загарэцца.

— Проста ёсць памылка! Проста мы нешта не ўлічылі! Трэба шукаць! Трэба шукаць! — амаль ашалела крычаў ён.

Праз гадзіну жанчына ў «акварыуме» зноў распалася на тэрабайты, якія былі зацёртыя Іллёй. Ён стварыў — ён і забіў.

## 5. КЛІЧ ОДРЫ

Ілля прыйшоў тым самым вечарам, хоць я амаль фізічна не мог вытрымліваць прысутнасці хоць некага.

— Я ведаю, у чым справа,— ціха загаварыў Ілля.— 6 грамаў — гэта маса хвалевай формы існавання...

Мне здалося, што ён трызніць. Мой погляд быў настолькі красамоўны, што Ілля асцярожна ўсміхнуўся.

— Не бойся, я не звар'яцеў. Мінулае існуе ў форме хваль. Але яно не проста існуе — яно жыве. 6 грамаў, якія губляе чалавек пры смерці — гэта вызваленне яго хвалевай сутнасці. Да гэтага фізічнае цела жыве разам з хвалевым. Смерць фізічнай формы азначае волю для формы хвалевай. Чалавек працягвае жыць — адразу ва ўсім сусвеце. Адразу з усімі, пранікаючы і датыкаючыся.

— І што? — злосна спытаў я.

Злосна — бо мне не хацелася нічога больш таго, што ў мяне ўжо было — ведання, што Одры была, і маёй галаграмы. І я не хацеў нічога больш атрымліваць.

— Я думаю, што можна не проста стартаваць-тармазіць колцамі Одры. Я паспрабую рэгуляваць хуткасць...

— Карацей.

— Карацей... наш прыймач перамяшчаўся ў тунэлі менавіта ў хвалевай форме — ніякая іншая форма ў такіх умовах немагчымая. Вось...

— Ідзі да чорта,— папрасіў я шчыра.

— Я... потым цябе папрашу...

Ілля папрасіў мяне праз паўгода — увесь гэты час ён, як пустэльнік, праседзеў у сваёй лабараторыі.

— Я знайшоў магчымасць кіравання хуткасцю ўсярэдзіне тунэля.

— Ды навошта ж, навошта? — амаль закрычаў я.— Ты хочаш яшчэ адзін жудасны эксперымент? Ты хочаш дабіць мяне, выцягваючы і ажыўляючы мярцвячыну?

— Прабач... Прабач, я не думаў... Не падумаў, што табе таксама Одры... не абыякавая. Не, я не буду яе... выцягваць. Разумееш, хвалевае жыццё — яно ёсць. Мы проста не змаглі штучна злучыць разам фізічную і хвалевую формы... Нешта мы не ўлічылі. Нейкія сігналы ляжаць па-за дыяпазонам прыймача. Мы іх наогул не можам пакуль улавіць — нам не зразумелая іх прырода. Але... я ведаю, як фізічную формуператварыць у хвалевую.

— А ты вар'ят,— працягнуў я.

— Ну і хай, — бяскрыўдна пагадзіўся Ілля і стаў тлумачыць: — У тунэлі цела Одры набывае хвалевую форму і хуткасць, большую за хуткасць святла. Яно... даганяе тое самае мінулае. А зараз... зараз

трэба не спыняць цела, а замарудзіць ягоную хуткасць да светлавой. І цела стане жыць у тым свеце... у мінулым.

— І... ты сам хочаш у тунэль?

— Так...

— А мне ты даверыш сачыць за ўсім гэтым і праз колькі часу выдраць цябе назад?

— Так... улучыць і сачыць...

Вы б спрачаліся з Іллёй? Я таксама не стаў.

На падрыхтоўку ў нас пайшло не так і шмат часу — тэхнічных змен у кіраванні колцамі было мала.

Ілля быў бледны, калі станавіўся ў круг.

— Прывітанне ёй там перадай,— сказаў я.

— Так, так... Я ўсё ёй апавяду.

Я адышоў да ноўтбука, запусціў праграму, напісаную Іллёй.

Такім чынам, ён мусіў апынуцца ў той самы дзень на тым самім беразе. У гэтай кропцы я павінен выставіць хуткасць роўную хуткасці святла. Ілля сказаў, што яму хопіць пяці хвілін. Пяці хвілін сапраўднага існавання побач з Одры. Пасля гэтага мне трэба змяніць кірунак на зваротны, задаць максімум і вылучыць усю гэтую чортаву штуку ў разлічаны час.

Мінула амаль чатыры гадзіны. Разліковая кропка. Я скінуў хуткасць да светлавой.

Зараз чакаем пяць хвілін.

І тут на маніторы з'явіўся надпіс: «Праграма выканана паспяхова. Рэжым падтрымкі». Я няўцямна чытаў тэкст, што пабег ніжэй:

«Прабач, дружа,— я змяніў табе: усё было пралічана мной сотню разоў: зваротны пераход жыцця з хвалевай формы ў фізічную пакуль немагчымы. Я застаюся тут. Не спрабуй мяне выцягнуць: ты вернеш труп, калі вернеш. Але без разліковых

праграмных дадзеных (а іх няма, праграма іх не лічыла), ты, вяртаючы мяне назад, прамахнешся абавязкова ў адлегласці. І мой труп апынецца альбо ў тоўшчы зямлі, альбо ў космасе. Я застаюся тут. Не забівай мяне. Ты сам разумееш, што я буду жыць, пакуль працуюць колцы Одры. Прашу цябе: нагледзь за імі. Усё, што я магу зрабіць для цябе — зраблю: я абавязкова скажу Одры, што ты яе таксама кахаеш».

## ЭПІЛОГ

У мяне цяпер адзін занятак: завесці генератар, адлучыць яго пасля васьмі гадзін працы і даць ноўтбуку разрадзіць свае акумулятары. Потым я ізноў заводжу генератар. І так — штодня. Ужо некалькі месяцаў. У мяне адна мэта, адзін сэнс, і ўсё маё жыццё ў гэтым ноўтбуку, які не можа быць спынены.

Нельга забіваць сябра, нават калі ён, а не ты з той, каго ты кахаеш.

## GAME BEGINS!

*Віртуальная рэальнасць*

«Гад! Вырадак няшчасны! Ты яшчэ пашкадуеш...»

Генку душыла злосць — адчайная, бездапаможная. Ён у які раз праверыў пошту — нічога, толькі спам, няма ліста ад Віцькі, няма... Набрыдзь... Аська ў ігноры, на форуме Генка забанены назаўжды, нумар тэлефона Віцька змяніў, у офісе Генку пасылаюць далёка.

«Гніда! Прысмактаўся тады: давай дапамагу, давай...» Ну так, у яго і сувязі ўжо былі, і ўчэпістасць — бач, як разгарнуў партал. А хто пачынаў? Хто збіраў інфу, хто дамен рэгістраваў? Ён, Генка. Ён сабраў першых карэспандэнтаў, пісаць сталі, наведвальнікі пайшлі. Ну, так, надакучыла потым Генку паліць час на партал, захапіўся варэзамі — там жывыя грошы былі. Тут і Віцька падгарнуўся, прапанаваў прадаць, пакінуць Генку месца галоўрэда. Потым, гад, чапляцца стаў: артыкулы ніякія, сур'ёзнага мала. А чаго было ў палітыку лезці? Ставала анекдотаў ды рэрайта прыкольных навін.

«Гад...» Дарма тады Генка заўпарціўся, пайшоў, запатрабаваўшы нейкія там капейкі. З варэзнікоў ледзь капала, застацца без вечарынак піўных,

сядзець гадзінамі над артыкуламі? Пайшло яно да чорта. Не верыў Генка пражэктам Віцькі.

Віцька тады ў бацькоў грошы пазычыў. Дызайн новы замовіў, рухавічок, карэспандэнтаў у горадзе знайшоў. І за год падняў партал — цяпер паўгорада навіны з раніцы там чытае, уначы сайт абнаўляецца. Вось тут і рэкламадаўцы пайшлі. Цяпер у Віцькі — грошы, каманда, свой офіс. Партал зарэгістраваў як СМІ. А Генку заблакаваў — наагул не рэагуе ніяк. «Я з табой разлічыўся».

«Гад...»

Узяў было адзін раз, журналістам, а потым звольніў — дрэнна пішаш, маўляў, і дысцыпліны няма. Каз-зёл... На два гады старэй, а глядзі, начальнікам зрабіўся, вырадак...

А чыя ідэя, а? Яны з яго ідэі грошы грабуць цяпер — а яму, Генку, кукіш?

«Пашкадуеце, яшчэ пашкадуеце...»

Злосць балюча біла па самім сабе, бо не ведаў Генка, што ён такога можа зрабіць, каб Віцька пашкадаваў...

Не падпальваць жа офіс... Добра было б, вядома, каго наняць, але знойдуць жа... Або Віцьку абрабаваць... Яшчэ б яго маладую жонку (сёлета ажаніўся) злавіць дзе... Але ў Віцькі жонка не слабая. А сам Генка ні ростам, ні сілай не выйшаў. Яшчэ здзярэ маску...

Стаў выдаляць спам і прыпыніўся на адным лісце:

«Прапаноўваю мапу вашага горада, маштаб 1:10, дадатковыя функцыі кіравання».

«Фіга сабе... Нешта не зразумеў: мапу любога горада зробіць? Маштаб 1 да 10? Што за функцыі?»

Генка імгненне глядзеў на тэкст, мяркуючы: навошта яму такая мапа? А калі выдраць адтуль асобныя кавалкі і зрабіць сайт-даведнік па горадзе?

Не надта ідэя, але можна паспрабаваць... У Віцькі на партале ёсць, але там дробна ўсё... Ідэя: мапа з устаўкамі рэальных фота!

І колькі каштуе? Блін, пісаць яму трэба... Адраса сайта няма...

Адправіў ліст і тут жа адказ атрымаў: дзе жыв'яце, нумар тэлефона, калі згодныя — даставяць неўзабаве па магчымасці.

Ого! Нармалёва, адразу і займецца... Хоць поўнач ужо амаль.

Генка адправіў ліст.

Яму патэлефанавалі праз пяць хвілін, а праз дваццаць пазванілі ўжо ў дзверы.

Чалавек невыразнага ўзросту саўгануў Генку кружэлку ў пакунку, запячатаную, і хутка знік у ліфце.

Генка разгарнуў пакунак. Дзіўна, усё шэра, ніякіх там малюначкаў. Уставіў кружэлку і толькі цяпер успомніў, што ён нічога не заплаціў. Наогул нічога. Ні ў лісце, ні па тэлефоне не было размовы пра грошы... Чорт, тут ключ, напэўна, трэба. Потым і спытаюць грошы...

Але ключа не было.

Праграма запатрабавала ўсталявання, і Генка завагаўся: дзіўна ўсё гэта, раптам вірус які? А, халера з ім. На кампе няма нічога вартага. Два сваіх сайты-варэзнікі ён тыдзень таму прадаў за бесцань — доўг аддаць трэба было... Усё адно мяняць збіраўся сістэму.

Прога ўсталёўвалася доўга — так доўга, што Генка пачаў турбавацца: нешта было не так. Але ўсталяванне не перапыніў. Што ўжо будзе.

«Абярыце ваш горад»

Ого! Сур'ёзная фірма... абраў. Крута — фармат 3D, выгляд не тое, каб проста згары, а трохі пад кутом. Дзе тут ягоны дом? Павялічым... Прыкольная штука. Прамалёўка выдатная, амаль мульцік. Дзівіся,

у двары машыны стаяць. Чорт, але ж так і стаяць! Гэта што ж, атрымліваецца, перадача са спадарожніка ў рэальным часе? Афігець... Што ж яны грошы не спыталі за такую крутасць? Заўтра патэлефануюць, відаць, кур'ер лахануўся. Ого — аўто паехала! Сапраўды — рэальны час! Вось гэта маеш... Стоп, гэта ж ідэя — зрабіць даведнік кшталту: скажу, хто дзе цяпер!

А ну-ка, дзе там офіс Віцькі? Чорт, вось гэта мапа...

«Абярыце паверх».

Не зразумеў... Добра, першы, офіс Віцькі на першым...

Еціцьма!... Офіс! Сталы стаяць, кампы... Тэлефон на стале... Ах, шкада, з такой адлегласці не пачытаць, што за паперы ў Віцькі... Калі б паролі...

О-о, які ў іх пакой адпачынку. Канапка... Цікава будзе сюды адвячоркам зазірнуць — з кім тут хто куляецца.

Генка аглядаў офіс Віцькі, не задумляючыся: чаму гэта магчыма. Толькі тонкай іголкай трывогі (нешта тут не так!) сядзела ў мозгу пытанне пра рэальную магчымасць таго, што ён бачыў, але Генка адмахваўся ад неадчэпнай думкі. Халера ведае, куды тэхналогія крочыла!

...У пакоі адпачынку — кубкі на стале. Вымытыя. Стрэлка мышкі, крануўшы кубак, раптам прыняла абрысы кружка з перакрыжаваннем. Прыцэл... Генка здрыгануўся. Потым асцярожна націснуў клавішу мышы. Перакрыжаванне афарбавалася ў чырвоны колер. Павёў мышкай...

Ваў! Кубак цягнецца па стале! Чорт, цікава як. А калі на край... Гахнуўся! Зваліўся!

Генка адкінуўся на спінку, выцер успацелы раптоўна лоб.

Паглядзеў на мапу. Пяць кубкаў на стале, шосты — на падлозе, разбіты. А, чорт, усё на падлогу!

Гы! Вось каб рэальна так было...

«Ваш бонус — шэсць балаў» — чырвоны надпіс з'явіўся ў куце манітора.

Не зразумеў... Што за балы і завошта? А што будзе, калі шмат балаў? Тупая гульня, блін, дзе ФАК? Галоўнае, назвы няма, каб у Сетцы пашукаць, папытацца... Добра, шэсць кубкаў — шэсць балаў. Што тут грукнуць яшчэ? Ап, тэлік пацягнем... Бэмс! Ого — 25 балаў адразу! Яшчэ засталося што? Канапу перацягнуць? Ап, прыкольна, дзверы ўнутр адчыняюцца — да дзвярэй канапу! Пацягнул-і-і-і...

Генка перацягнуў мышкай канапу да дзвярэй, падпёршы іх, і раптам адчуў стомленасць і боль у руках і целе — нібыта сам, у рэале цягнуў гэтую канапу.

Раптоўная стома ды і позні час (было каля трох ночы) змянілі захапленне пабачаным на абыякавасць. Захацелася спаць.

Назаўтра каля поўдня Генка зайшоў на партал і сярод іншых пабачыў навіну: «Да нас заходзіў палтэргейст».

Рукі дробна задрыжалі, халадок страху падцягнуў пусты жывот.

Глупства, гэтага не можа быць... Глупства, глупства...

Але ў навіне, падпісанай самім Віцькам, апавядалася пра пагром, учынены ў іхнім пакоі адпачынку. Віцька апісваў усё, што ўчора рабіў і бачыў Генка. Кубкі насамрэч пабіліся, тэлевізар — таксама. І канапа апынулася насупраць дзвярэй. Віцька жартаваў: «Акно зачынена і дзверы падпёртыя — значыцца, да нас прыходзіў палтэргейст! Будзем ганарыцца — мы першая рэдакцыя, дзе ён (або яно?) пабывала...»

Але ж напалохаўся Віцька... Бач, бравіруе, спрабуе жартаваць. Вядома, ён і са свайго страху трафік выцісне. Ну, і што цяпер у вас там робіцца ў офісе?

Запусціў праграму, унутрана прадчуваючы задавальненне ад назірання згары за ўсім офісам Віцькі. Нават каву варыць не стаў — потым!

«Пачатак работы праграмы для Вашага рэгіёна — 24.00».

Што за фокусы... Вырадкі... Патэлефанаваць ім, ці што? Ага, нагадай пра сябе — прыйдуць па грошы. Кур'ер лахануўся, цяпер адрас забыўся, напэўна, са сваёй кішэні заплаціў. Хрэн з імі. Пачакаем да ночы...

Поўначы Генка ледзь дачакаўся. Валяўся на канапе, глядзеў паўвокам фільмы, слухаў музыку. Добра, бацькі ў адпачынку, у яго — час вольны. Да вечара ўспомніў, што бацькі заўсёды пакідалі колькі грошай на ўсялякі нечаканы выпадак у кухонным століку. Падхапіўся, пабег на кухню — так і ёсць, хопіць ці на дзве пляшкі гарэлкі, ці на шмат піва. Лепш піва. Схадзіў, не спяшаючыся. Яшчэ і папіў разліванага.

Там і сустрэў Віцьку. Той падкаціў на сваёй «Маздзе», упэўнены такі...

Паскачаш у мяне, вой, паскачаш...

— Хелоў, як справы? — першы пачаў Генка.

— Нармалёва, прывітанне,— механічна адказаў Віцька, крыху здзіўлены.

А вочы яго бегалі, і ў вачах на донцы — спалох.

— Чаго на лісты не адказваеш?

— Абавязаны? — спыніўся ўсё ж Віцька.— Я іх не чытаю, я табе казаў. Нейкі ты смелы сёння. Піва не перапіў?

— Толькі пачынаю. Ну што, пракінуў мяне? Думаеш, табе ўсё сыдзе?

— Я сапраўды набыў у цябе сайт. Нават пераплаціў. Сапраўды даў табе працу рэдактара. Ты заваліў справу, я сапраўды даў табе магчымасць...

— Ты — даў? Ха! Ты маеш бабкі з маёй ідэі!

— Астынь. Ідэя нічога не каштуе. Мне няма часу тлумачыць табе тлумачанае сто разоў.

— Ты пашкадуеш!

Але Віцька пабег у гандлёвую залу, нават не адмахнуўся.

Гад, паскачаш сёння, не — заўтра паскачаш...

«У Вас 220 балаў. Для дасягнення Узроўню-2 засталося 100 балаў».

А што на другім? Ды фіг з вамі... Дзе тут офіс? Навялі парадак? Кубкі набылі? Вырадкі... Як манітор хараша стаіць — на самым краёчку. Таўхель яго лёгенька! Ха, 25 балаў! Яшчэ маніторчык... І гэты са стала! І гэты! Ды наогул — усё са сталоў! Чысціня — аснова здароўя! Выр-р-радкі...

...Піва якое файнае. Добра, шмат узяў. Хадзіць не трэба будзе, да раніцы хопіць.

«Вы дасягнулі Узроўню-2».

І што з таго, дурніца?

Прыцэліўся на апошні манітор, а перакрыжаванне не проста чырвоным стала — вакол яго пазначыліся дзве стрэлкі. Генка зразумеў — гэта, каб круціць тое, што круціцца. А што тут у іх круціцца? А, кран водаправодны! Што б гэта ў чарупіну скінуць... Халера з ім, і так запаўняецца хутка...

У, смех які! Пацешышся заўтра, Віцька, пацешышся! Я цябе папярэджваў: пашкадуеш!

Добрае піва!

...А што гэта Віцька сам робіць? Дзе тут твой дом, дзе кватэрка твая, Віцька? А, вось яна... Трэці паверх. Ну, спім ці куляемся ў ложку са сваёй жоначкай-кабылкай?

Бач, мэблі накупляў колькі... А былі калісьці камода ад бабкі ды канапка. На кухонным стале комп стаяў. Тут спачывальня... Што з праграмай такое, халера!? Ні фіга не зразумець: ляжаць тут людзі ці няма. Руху няма... Мусіць, дзесьці ў гасцях гуляюць. Ці прога жывых не паказвае? Ды і фіг з вамі.

Віцька, ты дзе? Вылазь: да цябе прыйшоў палтэргейст! Ха-ха-ха!

Не, мы посуд біць не будзем — суседзі прачнуцца. На кухню сходзім. Ваду пакруцім? Во, газавая пліта, а на ёй ручкі, а наша праграма можа круціць ручкі... Бэмс, бомс, бамс і бумс. Віцька! У цябе газ улучыўся! Цяпер бабахне!

«Вы перайшлі на Узровень-3».

Што на трэцім? Оп, удар з'явіўся! Куды стукнем? Зараз пап'ём піўка, падумаем і стукнем... Добрае піва...

Так, дык куды ж стукнуць? Вось, ваза на стале... Шлёп — звалілася ваза! Ай-ай-ай, пабілася...

Рух, здаецца, нейкі? Быццам цень, сілуэт чалавека... Не-а, здалося, гэта прога глючыць. Манітор змяніць трэба, цені ўсялякія... Куды яшчэ стукнем? Ага, па вылучальніку стукнем! Газу ўжо добра найшло... Віцю-ю-ня! Цяпер будзе феерверк!

Мякенька — пстрык!

Генка ледзь не адскочыў з крэслам ад манітора, які нібыта сам выбухнуў бязгучна, успыхнуў яскравым жоўтым святлом.

«Вынік — адна ахвяра, жанчына. Вы дасягнулі вышэйшага ўзроўню. Віншуем!».

Генку прабіў халодны пот — ён сядзеў і дробна дрыжэў. «Няма чаго было мяне дурыць... Няма чаго...» — білася ліхаманкава апраўданне, намагаючыся запоўніць сабой мозг. «Усё нармалёва... Ніхто не даведаецца... Я яе не бачыў, яе не было! Адкуль

я ведаў, што гэта чалавек? Прога глючыла... Я дома сяджу. Я ні пры чым».

Ён пацягнуўся да апошняй бляшанкі з півам. Скасавурыў позірк і замёр ад жаху, уціснуўся ў крэсла.

Бляшанка з півам павольна, сама сабой паўзла па стале, прыпынілася на краю, нібы разважаючы, і сарвалася долу.

Недапітае піва расцяклося па падлозе пеннай лужынкай. Генка тарашчыўся на гэтую жаўтлявую вадкасць так, нібы сам толькі што тут абмачыўся. Раптоўна пацямнелы экран манітора вымусіў павярнуцца да яго. Генка з агідным пачуццём страху глядзеў, як на экране праступаюць чырвоныя літары. Чырвоны надпіс на чорным фоне:

«Віншуем! Усе ўзроўні пройдзеныя. Вы залічаныя ў ганаровы лік Гульцоў!

Game begins! Гульня пачалася! Вы і яшчэ 12 Гульцоў выйшлі на паляванне! Застаньцеся ў жывых!»

# НА КАНАЛЕ

*Містычная рэальнасць*

Мы сустрэліся абодва маладыя: я — малады аўтар, а ён — проста малады чалавек. Ён сядзеў у зале чакання і чытаў кнігу. Ля яго было вольнае месца, я падсеў, крадком зазірнуў, што ён чытае. Выявілася, гэта таўсценная кніга ў яго руках мела назву «Эстэтыка і літаратурная крытыка» Пятра Вяземскага. Але чытаў ён (я быў упэўнены — нудотнае чытво) з такой цікавасцю, такой прагай у вачах, што я не вытрымаў і ветла пацікавіўся:

— Выбачайце, няўжо цікава? Гэта ж мінулае стагоддзе...

— Вядома ж, вядома цікава,— пераканаўча загаварыў ён. Потым усміхнуўся і дадаў спакайней: — Я хачу стаць крытыкам, літаратурным. Таму для мяне ўсё гэта — надзвычай цікава. І, трэба сказаць, яно мне проста неабходна.

— Дык вы пачынаючы крытык? — пацікавіўся я.— Вельмі прыемна: пачынаючы аўтар...

Так мы і пазнаёміліся.

Мяне здзівіла тады тое, як ён ставіўся да свайго будучага занятку: з такой адказнасцю выхаваная жанчына рыхтуецца стаць маці. Як ён мне сам

прызнаваўся, за дзень абавязкова прачытвае адну кнігу. Чытае крытыку і мастацкую прозу — каб зразумець: чаму так, а не іначай напісаў крытык, чым абгрунтоўвае, на што спасылаецца. Ён, амаль удвая маладзейшы за мяне, ведаў пра літаратуру, яе тэорыю столькі, што мне побач з ім зрабілася не зусім утульна. Постмадэрнізм, да прыкладу, быў для мяне зразумелым не больш, чым тэорыя Энштэйна, а слова «экзістэнцыялізм» крышку напружвала.

Але перад пасадкай у свае цягнікі парукаліся мы амаль сябрамі.

Наступным разам сустрэліся толькі праз сем гадоў.

Не ведаю, ці памятаў ён мяне гэты час, але я сачыў за ўсімі яго публікацыямі, мне было прыемна чытаць яго насамрэч глыбокія, абгрунтаваныя артыкулы. І хоць яны з'яўляліся не так часта і ў самых розных выданнях, але адчувалася: з яго атрымаўся крытык.

Гэтым разам сустрэліся мы невыпадкова — перамовіліся праз Фэйсбук, я сказаў, што прыязджаю ў сталіцу. Вось тады ён нечакана і папрасіў: давай сустрэнемся. Менавіта папрасіў, і ў тоне гэтай просьбы гучала трывога.

Сустрэліся ў невялікай кавярні, дзе людзей амаль не было, зайшлі ў самы зацішны куток, замовілі кавы.

— Здаецца, я не казаў табе раней,— пачаў ён.— Апрача літаратуры, ёсць у мяне яшчэ рыбалка. І гэта не проста адпачынак. Забрацца падалей, туды, куды на машыне прабіраешся паўзком, асцярожненька, спыніцца на беразе якога невядомага старога канала, агледзіцца. Вось дзе прыволле: цішыня, вакол — ніводнага рыбака. Выглядзець пралысіну чыстай вады, рыхтаваць вуды і пазіраць у гэтае цёмнае спакойнае люстэрка, пабачыць,

як адзін за адным кругі па ім разыходзяцца — і даць сэрцу забіцца часцей у радаснай узрушанасці. Закінуць і чакаць першага варушэння паплаўка.

Сонца яшчэ толькі ўзыходзіць, вялікае, чырвонае — добра на яго глядзець.

Добра, калі бярэ рыба. Але і калі не бярэ, таксама добра. Тады я ўспамінаю новыя прачытаныя ў тоўстых часопісах, кнігах аповеды, аповесці і раманы — і пішу, у думках, вядома, крытычныя матэрыялы.

Памятаеш, там на вакзале, я казаў табе, што мару стаць ім — вядомым, уплывовым, аўтарытэтным крытыкам? Мне падаецца, я ім і стаў. Ды, думаеш, лёгка мне цяпер? Пяць гадоў публікацый у розных часопісах, газетах, інтэрнэт-выданнях, а ворагаў — што карасёў у тым канале. Як толькі яны ні абзываюць, чым толькі ні пагражаюць, у якія толькі суды не абяцаюць пацягнуць. Але, папраўдзе, сам-насам са мной усе мілыя і пачцівыя. За пяць гадоў я сабе імя зрабіў. І зараз кожны чытач, кожны выдавец ведае: калі ўжо я пра аўтара і ягоныя творы адгукнуўся добра — яны таго вартыя. Таму сяброў у мяне ўсё ж больш. Гэта я табе зусім не затым кажу, каб пахваліцца. Прымем гэта як факт.

Рыбалка — гэта амаль казка. Калі набліжаецца поўдзень і ў сагрэтым яскравым сонцам канале гультаяватыя карасі засынаюць, калі паплавок замірае на вадзе і ніводнай самой маленькай хвалькі на бліскучай паверхні вады няма, калі толькі конікі трашчаць — я адкідваюся на пакатым беразе назад, закідваю рукі пад галаву і гляджу ў неба.

Тады такія думкі чыстыя і ясныя, тады так пуката бачныя ўсе агрэхі і ўсе поспехі таго, што прачытаў на тыдні...

Ты не крыўдуй, я зараз не зусім прыемную рэч пра тваіх калег скажу. Дык вось, пісьменнікі — вельмі

розныя. І сярод іх больш паловы папросту ненармальных. Асабліва цётак. У мяне ў адным куце кватэры вялікі стос іх кніг: бездапаможных, бляклых, убогіх. І цёткі мне тэлефануюць (я тры разы ўжо змяніў СІМ-карту), пішуць (скрыню мяняю штомесяц), лезуць у Скайп, зафлужваюць любы запіс у ЖЧ ці Фэйсбуку.

Ім, збольшага, трэба так мала: каб я прачытаў і сказаў: нармалёва. І яны панясуць гэта маё «Нармалёва», як сцяг, грукаючыся з ім ва ўсе дзверы і беручы штурмам усялякія рэдакцыі.

Але я не магу сказаць так. Бо прачытаць нават не магу іх кнігі. Мяне ўсяго літаральна паралізуе ад графаманства, выварочвае навыварат. Далібог, рэальна пачынае падванітоўваць.

А яны мне пішуць і пішуць. І якія лісты! Пачытала б мая Люда... Хоць павінна разумець, не першы месяц замужам...

Дык вось, у той дзень я забраўся далей звычайнага: усё берагам, берагам, паварочваў, не памятаю ўжо колькі разоў, пакуль не забраўся ў сапраўдную глухмень.

Мабыць, я уцякаў ад учарашняга. Люда позна ўвечары раптам папрасіла: паехалі на возера купацца. І так настойліва. Як быццам забылася, што для мяне рыбалка, забылася, што я ўвесь тыдзень трызніў гэтай суботай. Вядома, я псіхануў. А яна раніцай нават галавы не падняла — нібыта спіць. Пакрыўдзілася. А чаго? Вось мне і хацелася ад усяго далей. Ад людзей. Ад зносін усялякіх. Ад канфліктаў любых і размоў. Стомленасць ад гэтага найстрашнейшая. І лекуецца толькі адным — адзінотай.

Брала рыба слаба. А думалася, як заўсёды, добра. І сонца ўзышло хораша: чысцюткае ў чысцюткім небе. Наагул, усё выдатна было. І тут чую над самым вухам:

— Дзядзька, прывяжыце мне, калі ласка, гачок.

Я падскочыў.

Паверыш: у кроку ад мяне стаіць дзяўчынка, гадоў дзесяці. Трымае простае арэхавае вудзільна. І цягне да мяне канец лёскі і бліскучы маленькі гаплік на далоньцы.

— Ты адкуль узялася? — пытаю як мага спакайней.

— Прыйшла.

Прывязаў гаплік, паглядзеў уважлівей. Звычайная дзяўчынка. Трошкі хударлявы тварык з акуратным носікам, русыя валасы ў хвосцік сабраныя. На ёй — сукеначка простая, белая ў сінія, трошкі лінялыя кветкі, чысцюткая. Сандалікі на загарэлых ножках.

— Трымай, не адвяжацца.

— Дзякуй. Няхай вам пашанцуе.

Паднялася на грэбень канала, прыгледзелася ў далёкія кусты — відаць, туды ішла.

І раптам павярнулася да мяне і кажа:

— Яна плача.

— Хто... плача? — агаломшана пытаю я.

— Яна плача,— паўтарыла дзяўчынка.— Адна дома і плача.

І пайшла.

Бачу бочным зрокам — у мяне абодва паплаўкі, як вар'яты, заскакалі ў розныя бакі. Схапіў вуды — позна. Азірнуўся — няма дзяўчынкі.

Вось ты ўяві гэтую сітуацыю... Хто плача? Чаго плача? Ды ну яе...

І тут, ведаеш, мне як вочы адкрыла, успомніў: Люда ўчора зайшла ў пакой, абняла мяне ззаду, а я акурат пошту праглядаў. Вызваліўся з абдымкаў, падняўся папаліць... А калі Люда той ліст незнарок прачытала? Той, які я якраз адчыніў на ўвесь манітор? Там жа адна паэтка мне амаль што ў

каханні прызнавалася, у госці клікала, абяцала і намякала... ды ўспомніць страшна!

Вось жа чорт!!! Люда што падумала? На якую я рыбалку паехаў?

Што тут табе апавядаць... Выбраўся я з таго балота, не шкадуючы машыну, прыляцеў дадому. Добра, сістэма старых каналаў недалёка ад горада.

Паверыш: Люда і праўда плакала.

Я яе ў бярэмя ўсю сабраў і ў машыну. І на той самы бераг прывёз, дзе нават вуды пакінуў быў. І мы ўдваіх лавілі рыбу... Сам разумееш, якая там ў нас рыбалка была... найсвятлейшая мая рыбалка... Калі такая дзікая прыгажосць, такая глухая ціша вакол, а побач — каханы чалавек. І вада. І сонца. І неба ў белых аблоках, на якія з такім замілаваннем можна бясконца глядзець, калі ляжаць шчака да шчакі на плячы адзін у аднаго.

Але пра кнігі я ўсё адно падумаў...

І вось што далей было. У наступны панядзелак атрымаў замову на матэрыял: рэцэнзія на кнігу аднаго аўтара. Прачытаў кнігу. Дзве аповесці. Адна — нешта такое жыццёвае, з прэтэнзіяй на вострасацыяльны канфлікт. Але ўсё нежывое, усё штучнае. Вобразаў няма, руху няма, размовы, размовы... Ніякая проза. Ні-я-ка-я. А вось фантастыка дык быццам і нічога. Ідэя арыгінальная, рэалізацыя на ўзроўні. Мовай аўтар валодае. Але фантастыка — гэта не маё. Я ў рэальных жанрах працую. Падрыхтаваў рэцэнзію, настрой быў, дык і вельмі востра атрымалася, з'едліва. І з гумарам.

Вось зараз і нічым патлумачыць не магу, але ў наступную суботу паперла мяне на тое самае месца, хоць звычайна двойчы запар на адзін і той самы канал не езджу. Але паехаў, як цягнуў хто машыну і круціў за мяне стырно. Хочаш вер, хочаш — не, але яшчэ толькі апошні паварот зрабіў, гляджу: акурат

там, дзе я ў мінулую нядзелю зрабіў першы закід і сустрэў дзяўчынку, яна цяпер сядзіць на кукішках.

Уяўляеш? Наўрад ці... З канала выпаўзае густая смуга ранішняга туману, проста ля яе ног варушыцца. І далей уздоўж канала — туман, густы. І неба шэрае, ледзь прабіваецца праз гэтую шэрасць бляклачырвоны дыск сонца.

І яна, дзяўчынка — сярод шэрай пустэчы. Адкуль? Што? Як?

Праўду кажучы, мне вусцішна стала. Заглушыў машыну, выйшаў.

— Ізноў гаплік адчапіўся? — пытаюся як мага больш бадзёра.

Яна толькі галавой ледзь кіўнула. І глядзіць на ваду пад коўдрай смугі.

Прахалодна ёй, мусіць,— на ёй тонкая кофтачка, запэцканая ў зеляніну, старэнькія джынсы, выцертыя. Валасы ў хвост не сабраныя, не прычасаныя.

Павярнулася да мяне, мяне аж скаланула недзе ўсярэдзіне — тварык зусім худзенькі, вочы велізарныя, сум у іх ну зусім не дзіцячы.

— Вуда ў мяне зламалася.

А голас гэткі... слабы зусім, ледзь кажа.

— Я табе сваю дам... І, у мяне тэрмас, гарбата гарачая, налью табе, з канапкай. Будзеш?

Яна толькі кіўнула і прыкрыла свае вялікія вочы.

Ну, я хутчэй канапкі дастаў, гарбату гарачую (Людмілка мне збірала).

Дзяўчынка гарбату п’е, кусае ад канапкі — котка за раз больш укусіла б.

Адышоўся ад яе на крокі тры, каб яна сябе вальней пачувала. Стаю, не ведаю, што рабіць, што думаць. Вось ты б пра што думаў? Во, так і я...

Прысеў, запаліў. Вуды побач ляжаць, не разбіраю.

— Ты дзе жывеш, малеча? З кім прыйшла? — пытаю строга.

— А ён у ложку кнігі піша,— раптам недарэчна адказвае дзяўчынка.— Ляжыць і нагаворвае на дыктафон. Тады ягоная маці нясе запіс на раздрукоўку.

Я маўчу. Чакаю, бо адчуваю — гэта яшчэ не ўсё.

— Ён траўму атрымаў, калі пяць класаў школы скончыў. І ад таго часу ляжыць. Сёння яму трыццаць тры. А жывуць яны ў кватэры з маці. Бацька іх кінуў. У іх нікога няма. А гарбата вельмі смачная. Яна вас кахае, вельмі-вельмі кахае.

Калі дзяўчынка адразу ж пасля гэтых слоў паднялася і пайшла, я ні слова не сказаў. Паверыш: як сядзеў так і застаўся сядзець, як здзервянелы. Не мог і не ведаў, што казаць. І за ёй не пайшоў.

Праз гадзіну шэрань разагнала. Лавіў я да абеду. Быццам і добра бралася рыба, ды мне больш хацелася падумаць. І думаў я пра таго інваліда. Ты ж пішаш, сам павінен зразумець: вось чаму ў яго рэальнай аповесці няма жыцця: не ведае ён жыцця. Не бачыць. І не можа бачыць. І вось чаму яго фантастычны свет такі жывы, такі рэальны...

Ведаеш, першы раз са мной такое было: перапісаў я сваю рэцэнзію. Мімаходзь прайшоўся па недахопах аповесці, адзначыў, што яна не атрымалася. А ў фантастыцы знайшоў яшчэ больш добрага, калі перачытаў яе другім разам. Добрая фантастыка, свежая, не заезджаная тэма, арыгінальныя хады. І, галоўнае, свой, асабісты, арыгінальны погляд на многае вядомае праз сродкі фантастычнага.

Вось... Давай яшчэ па кубачку кавы возьмем, нейкія кубкі тут... маленькія зусім. Ты не спяшаешся? Ды ўжо амаль усё апавёў, яшчэ трошкі.... Два тыдні на каналы я не патрапіў. Адна субота дажджлівая была вельмі, пахаладала нешта, потым — да цешчы на лецішча, у яе там толькі пакажыся, работы на трох дурняў, а не на аднаго зяця. Дык вось... Не буду і казаць, што паехаў я на тое самае месца, што

і першыя два разы. Так, яна там была, нібыта чакала мяне, хоць і не паглядзела, як я пад'ехаў, як да яе падышоў.

Яна была ў строгім чорным гарнітурчыку: нагавічкі са стрэлачкамі, белая кашулька і чорны, аксамітны пінжачок. Зусім як вучаніца-выдатніца, толькі што з-за сваёй звыклай парты занесеная сюды незразумелай сілай. Валосікі ахайна ўкладзеныя і заплеценыя ў коску, а тая — у вузельчыку на патыліцы.

Тварык бледны і строгі. Павітаўся з ёй.

— Ён не сам піша,— ціха, але цвёрда адказала дзяўчынка на маё «Добры дзень».

— Я ведаю,— сказаў я.

— І кніга дрэнная.

Я прысеў каля яе, выцягнуў цыгарэты, ды прыпыніўся, не стаў запальваць — дзіця ж побач.

— Ведаю, што дрэнная,— стомлена пачаў я.— Але ты зразумей: гэта вельмі сур'ёзны праект! Яго трэба раскруціць. Так робяцца справы ў дарослых людзей. Мне прапанавалі ўдзел у гэтай справе, у якую ўкладзена ўжо гэтулькі грошай, што падумаць страшна! Не напішу я — напіша іншы, не менш аўтарытэтны. І атрымае такі ганарар, што мне і не сніўся. А я апынуся за бортам, яшчэ буду дзесяць гадоў збіраць на кватэру. Ты казала, што Люда кахае мяне, яна ж і дзіця ад мяне чакае. Дзе нам жыць? І там такія людзі — яны мне жыцця не дадуць, калі я адмоўлюся цяпер.

А дзяўчынка нічога не адказвае.

— І ў мяне дамова адназначная: адна рэцэнзія. Адна! Зразумей, усяго толькі адна рэцэнзія,— адчайна прагаварыў я.

Сказаў, а сам, павер, напужаўся. Не ведаю чаму. І тут...

— Я памру,— ціха сказала дзяўчынка, паднялася і пайшла.

Уздоўж канала, які сыходзіў далёка ў затуманеную лагчыну.

Гэта было ўчора. І вось... сёння — нядзеля. Артыкул мной падрыхтаваны яшчэ на мінулым тыдні. У панядзелак мне трэба... здаць яго. Я ведаю, ты мне не паверыш. Але...

# КРАМА ЗГУБЛЕНЫХ РЭЧАЎ

*Магчымая рэальнасць*

З працы зайшоў да сябра, паправіў яго сістэму ў камп'ютары, вяртаўся дамоў ускраінай горада. І пабачыў невялічкую крамку, заціснутую між двух прыватных дамоў. Шыльда здзівіла: «Магазін згубленых рэчаў». Адразу ўспомніў пра сваю ўлюбёную асадку. Атрамантавую. Яна была цяжкая, металічная, але зручная. Пяро я апрацаваў «нулёўкай», яно хадзіла мякка нават па шэрай газетнай паперы. Той асадкай я пісаў познімі вечарамі на маленькай кухні, калі ўсе клаліся спаць... Даўно, тады Жэнька ўмела толькі хутка поўзаць. Асадка згубілася, калі мы яшчэ не пераязджалі са старой хаткі ў новую кватэру. Я вельмі шкадаваў па згубе. Гэтулькі той асадкай было напісана — амаль усе апавяданні маёй першай кнігі. Быццам згубіў не проста асадку, а часцінку самога сябе, частку жыцця...

Заінтрыгаваны крыху, зайшоў у крамку. Відавочна, тут прадаюцца рэчы, якія згубіліся некалі і гаспадароў не знайшлося. Хто сюды тыя рэчы пастаўляе? Ну, вакзалы, мабыць, таксісты...

Мяне чакала расчараванне — ніводнай рэчы на паліцах не было! Ды і паліц не было — мноства невялікіх шуфлядак, нібы бібліятэчны каталог.

— Вечар добры, што вы згубілі?

Перада мной быў хлопец гадоў васямнаццаці. Ён прыўзняўся мне насустрач з-за невялікага стала, на якім улучаны ноўтбук свяціўся мяккім блакітным святлом манітора.

— О, шмат чаго згубіў,— пажартаваў я.

— Што са згубленага хочаце купіць?

— А што ў вас ёсць? — трохі разгубіўся я.

— Многае ёсць. Дык што вас канкрэтна цікавіць? — настойваў на дакладным адказе хлопец.

— Ну... — працягнуў я, хоць у галаве выразна, пуката маляваўся ад самага першага позірку на шыльду вобраз той асадкі і тых вечароў.— Асадка. Звычайная, атрамантавая. Белая, металічная, з бледназялёнай пластыкавай устаўкай пад пальцы...

— Калі згубілі? — хутка спытаў хлопец, прысеў, а пальцы яго спрытна і мякка зашчоўкалі па клавіятуры ноўтбука.

— Ды дзесяць гадоў таму, мабыць. Тады Жэньцы быў толькі годзік,— палічыў я гады.

— Так, ячэйка 794,— прагаварыў хлопец, нібы пацвярджаў праўдзівасць маіх слоў.

Устаў з-за стала, падышоў да тых шуфлядак, упэўнена выцягнуў адну — і павярнуўся да мяне з маёй асадкай!

І я раптоўна зразумеў, як нестае яе мне цяпер! Хоць і камп'ютар ёсць, і ноўтбук, але вось менавіта яе нестае. Быццам у асадку разам з атрамантам набіралася ўнутр маё натхненне, там яно жыло, адтуль тонкімі лініямі літар клалася на паперу... Нечакана захацелася напісаць нешта, хоць роспіс паставіць, адчуць, як мякка і хутка слізгае пяро, падпарадкаванае не пальцам нават — думкам. Хлопец бы ўгадаў мой намер, моўчкі працягнуў невялікі аркушык паперы.

Выразны, чорнага колеру (я купляў толькі такі атрамант) мой роспіс не на жарт узрушыў мяне.

— Колькі з мяне... за асадку? — раптоўна захваляваўся я.

Хлопец назваў суму — нешта каля кошту пачка цыгарэт.

Я расплаціўся, акуратна зачыніў асадку і паклаў у кішэню пінжака — дзе насіў яе і раней. Згарнуў удвая і паклаў у кішэню аркушык паперы са сваім роспісам — не пакідаць жа яго тут.

Незразумелыя пачуцці тлумілі галаву. Усё сённяшняе, істотнае стала аддаляцца, губляць сваю выразнасць і значнасць, а мінулае праступала ўсё яскравей, рабілася акрэсленым і набывала вагу. Мяне пацягнула ў наш колішні дом. Сёння ён стаіць пусты, мы скарыстоўваем яго як лецішча. І хоць трэба было зрабіць вялікі гак, я павярнуў, не задумляючыся. Мяне нікольkі не здзівіла жаданне зайсці туды, наадварот, раптам стала зразумелым, што яно і жыло ўва мне ўвесь гэты дзень.

Звечарэла добра, вокны дамоў успыхвалі жоўтым святлом. Адно мільганула наперадзе з-за кустоў язміну, сэрца усхвалявана затахкала. Ну, так і ёсць — свеціцца акно нашага лецішча. Хто тут можа быць?

Зайшоў на надворак. Нешта не так... І хоць прыцемкі былі, надворак выглядаў... не, не чужым, не незнаёмым. Проста не такім, якім быў учора і заўчора. Іншым. І ў той самы час я ведаў, што такім свой надворак я бачыў. Раней?

Дзверы ў веранду былі прыадчыненыя. Трывога сціснула сэрца. Хоць не злодзеяў я спужаўся, нават не падумаў пра іх. Зайшоў на веранду — чысцютка, ходнікі пасцеленыя. Што за д'ябальшчына? Калі і навошта мая жонка тут так прыбрала? Узяўся за

клямку дзвярэй хаты і адчуў, як узмакрэла ад поту далонь.

Дыхнула ў твар цяплом ад напаленай грубкі. І — тым хатнім духам, хатняй утульнасцю, якая была заўсёды ў нас па вечарах, калі... калі жонка была ў адпачынку, даглядала малую Жэньку. А мае вочы ўжо схапілі, адзначылі такую знаёмую прыбранасць пакоя...

...Жонка вызірнула з кухні.

— Жэнька! Тата прыйшоў!

Пачуўся шум у вялікім пакоі, шырэй адчыніліся дзверы, і малая Жэнька, трымаючы высока ўзнятай галаву, замілавана ўсміхаючыся, радасна папаўзла да мяне.

Я падхапіў дачушку на рукі, прыціснуў да сябе, а ў галаве білася думка — вар'яцею. Літаральна вар'яцею.

Размывалася, сплывала асобнымі ўрыўкамі сённяшняе, дзе Жэнька — 11-гадовая дзяўчынка, дзе ў нас ёсць кватэра, дзе я на працы маю другую пасаду, дзе ў мяне ёсць ЖЖ і сайт, дзе надрукаваныя некалькі маіх аповесцяў і апавяданняў у часопісах і сам я маю членскі білет Саюза пісьменнікаў. Затое аднекуль з глыбіні свядомасці ўзрастала пачуццё неабходнасці падпарадкавацца штодзённаму распарадку: памыць посуд, прыгатаваць неабходнае, каб пакупаць Жэньку, дапамагчы з урокамі сыну. Потым будзе вячэра, потым, калі ўсе пакладуцца спаць, прыйсці на невялічкую куханьку — сесці і дапісваць апавяданні ў сваю першую кнігу.

Хоць, я ведаю, ведаю ж! — яна выйшла, яна стаіць на паліцы ў пакоі Жэнькі, у нашай кватэры.

Ці не стаіць? Ці гэта мне мроіцца вось тут, вось цяпер, што будзе кніга, будзе кватэра, будуць апавяданні і аповесці, і Жэнька стане рослай дзяўчынкай, якая будзе саромецца ўжо прыціскацца

да мяне шчыльна з-за так рана адскочыўшых грудак? Гэта мая мара, і мроіцца яна з такой сілай, што для мяне стала часткай рэальнасці?

...Жэнька закруцілася на руках, я адчуў нешта ў кішэні. Асадка... Я набыў згубленую асадку...

Калі я набыў? Дзе гэта? Дзе тая крамка? Здаецца, на рагу, калі павярнуць ад сябра... Ад якога сябра? Чакай, у каго я сёння быў? Куды я заходзіў?

— Я зараз, мне вельмі трэба! — гукнуў я жонцы, апусціў Жэньку і хутка выбег на вуліцу.

Мне трэба разабрацца. Мне трэба зразумець...

На вуліцы, цёмнай ужо і вохкай, без хатняй утульнасці, у галаве стала трохі ясней. Сённяшняе, апушчанае ў цёмную ваду забыцця, быццам вынырнула на паверхню і хапіла глыток паветра. Цяпер ісці, шукаць...

Тут... Недзе тут... Чорт, вось жа тыя дамы, ну, дакладна тыя, хіба што другі, новы плот ля аднаго... Дзе ж крамка?

На месцы крамкі стаяла простая драўляная лаўка. Ліхтар свяціў над ёй белым нежывым святлом.

Я прысеў на лаўку і, адчуваючы, што губляю ў гэтыя хвіліны апошнія сувязі з сённяшнім, ліхаманкава шукаў выйсце. І не знаходзіў.

Пацягнуўся ў кішэню па цыгарэты. Выцягнуў пачак «Гранады». Гэтыя цыгарэты даўно зніклі з продажу. Але ТАДЫ я пачаў іх паліць. Хоць дарагія, але жонка налегла, каб калі паліў, дык добрыя цыгарэты з фільтрам.

І вось цяпер я зразумеў канчаткова, што адбылося. Зразумеў, што мне не вярнуцца. Гэта прынесла нейкае супакаенне (ну, маё ж жыццё, пражыву яшчэ раз), але толькі на момант. Што ж будзе? Не, не заўтра, што будзе потым, калі пройдзе год, трэці і дзясяты? Я дапішу апавяданні першай кнігі,

згубіцца асадка, мы пабудуем кватэру, вырасце дачушка, я надрукую яшчэ не адну аповесць, а потым.... Потым такім вось вечарам я зайду ў крамку, што з'явіцца на месцы гэтай лаўкі, і набуду згубленую некалі асадку...

Папярэдзіць, папярэдзіць сябе...

Дастаў той самы аркушык паперы са сваім роспісам і асадку і, ужо з цяжкасцю разумеючы сэнс сваіх слоў, таропка напісаў:

«Ні ў якім разе не трэба купляць згубленую атрамантавую асадку ў крамцы».

Адчайна закусіў вусны, салёны смак болю дапамог яшчэ раз цалкам вярнуцца ў рэальнасць і сабраць апошнія думкі пра ГЭТА. Я прымусіў сябе задумацца, каб вырашыць неабходнае: дзе ж захаваць гэтае пасланне самому сабе? Каб не згубілася, каб нікому не мазоліла вочы...

Пашпарт амаль заўсёды пры мне. Нават цяпер. Пашпарт у вокладцы. Пад вокладкай тонкі аркушык паперы будзе ляжаць гадамі. Не згубіцца. І ведаць, апрача мяне, ніхто не будзе. Я дастаў пашпарт, вызваліў палову ад вокладкі.

І пабачыў між вокладкай і пашпартам невялікі, складзены ўдвая аркушык паперы. Разгарнуў яго.

«Ні ў якім разе не трэба купляць згубленую атрамантавую асадку ў крамцы».

І мой выразны роспіс чорным атрамантам.

# АЎТОБУС

*Амаль рэальнасць*

Жанчыну бабулькай нельга было назваць, хоць відаць было, што ёй за 70 — высахлы маршчыністы твар, сівыя, аж белыя валасы. Апранута зграбна і годна. Так выглядаюць вясковыя настаўніцы-пенсіянеркі: з інтэлігентнасцю ў паставе, якая не знікла нават за гады іх няпростага вясковага жыцця, калі трэба было спалучаць штовечар і прагляданне вучнёўскіх сшыткаў, і даенне каровы, і гатаванне вячэры для мужа-трактарыста. Так думаў Антось пра гэтую сухенькую жанчыну, падыходзячы да аўтобуса.

Жанчына ля аўтобуса прытрымлівала адной рукой інвалідны вазок, у якім сядзеў хлопчык гадоў 10. «Зараз папросіць дапамагчы з вазком»,— падумаў Антось і вырашыў, што чакаць гэтай просьбы не будзе — сам прапануе.

— Дзень добры, дапамагчы? — прыпыніўся ён ля жанчыны.

— І вам добры,— вінавацячыся, заспяшалася жанчына.— Калі вас не затурбуе, дапамажыце. Сяргейка не цяжкі, у нас 12 і 13 месцы... Давайце, я торбу вашу патрымаю.

— Ну, хадзі да мяне, Сяргей,— Антось перадаў сваю невялікую торбу, дзе ляжалі кружэлкі з рукапісамі ды пляшка мінералкі, жанчыне, працягнуў рукі.

Хлопчык, усміхаючыся адкрыта, падаўся з вазочка насустрач.

Салон быў амаль пусты: хлопец і дзяўчына гадоў па васямнаццаць сядзелі разам у самым канцы салона, мажная кабета са сваім спадарожнікам, мужчынам гадоў сарака пяці — на самым пачатку. Тоўстая, няўклюдная, яна займала амаль усю прастору двух крэслаў, і мужчына, які сядзеў з ёй побач, быў літаральна прыціснуты ейным целам да акна.

Антось пасадзіў хлопчыка ў крэсла.

— Тут будзеш ці ля акна?

— Ля акна... я сам,— адказаў весела хлопчык і, не чакаючы нейкіх дзеянняў з боку Антося, сам пасунуў сваё цела на другое крэсла, потым падхапіў, перакінуў далей свае, быццам чужыя, ногі.

Антось выйшаў з салона, узяў у жанчыны сваю торбу. Запаліў.

— То ўнучак мой,— нібыта апраўдваючыся за нейкі грэх, ціха сказала жанчына.— Радавая траўма. Хто там вінаваты і ў чым — Бог ім суддзя. Разумны расце, гэтак добра маляваць навучыўся... То во цяпер у Мінску выстава ягоных карцін, у Духоўным цэнтры...

Антось прамаўчаў у адказ. Жанчына таксама замаўчала.

Яшчэ некалькі пасажыраў зайшлі ў аўтобус. Прыйшоў і кіроўца.

У гэты час да аўтобуса імкліва падкаціла аўто, адчыніліся дзверцы, невысокі мужчына, з вялікім жыватом, апрануты ў строгі дзелавы гарнітур, з гальштукам, вылез з пярэдняга пасажырскага седзіва.

— Пачакайце! — больш загадаў, чым папрасіў ён кіроўцу і такім самым загадным голасам загаварыў унутр салона аўтамабіля: — Забярэш мяне а 8-й вечара, каб не спазняўся.

— Ну што вы, Ігнат Вадзімавіч, я толькі цешчу адвязу — і адразу ў Мінск.

— Глядзі мне...

Кіроўца аўтобуса вачыма пералічыў пасажыраў, зірнуў у свае паперкі — усё супадала. Аўтобус крануўся з месца.

Антось вольна адкінуў крэсла назад — ззаду не было пасажыра, толькі жанчына сядзела на суседнім крэсле.

— Вам не будзе перашкаджаць? — папытаўся ў яе Антось.

— Што? — хутка перапытала жанчына, занятая сваімі думкамі так глыбока, што не толькі па вачах — па твары было відаць, што яна нечым вельмі заклапочаная: падціснутыя вусны, складкі на ілбе.— А, не, я тут буду сядзець,— адказала нечакана нервова, нібыта Антось спрабаваў заляцацца.

Мажліва, жанчына і была прыгожай раней, але не цяпер — твар яе перакрывіла незразумелая туга, вочы хваравіта паблісквалі. Непрыгожы твар, высахлы. І нечым нават варожы.

Антось уладкаваўся як мага лепей, заплюшчыў вочы. О, як ён чакаў гэтага моманту пасля цалкам бяссоннай ночы! Здавалася, што вось толькі заплюшчыць вочы — і засне, праваліцца ў цёмную, такую жаданую яміну забыцця. Але не атрымалася: перад вачыма ўзнікла клавіятура камп'ютара.

Аўтобус пагойдваўся, прыпыняўся на святлафорах, торгаўся. Сон не ішоў да Антося, аж млосна рабілася ад літар, што скакалі ў вачах.

«Перапрацаваўся»,— задаволена ўсміхнуўся Антось, падняў спінку, стаў глядзець у акно. Аўтобус выехаў з гарадка і паімчаў трасаю.

Шэсць гадзін, усяго шэсць гадзін — і справа будзе зроблена. Ды не адна, а дзве справы! Дзве — вялікія і неабходныя... Вось яны, тут — у торбе на дзвюх кружэлках: яго аповесць «Руйнаванне непабудаваных храмаў» і дэтэктыў «Последняя ставка Серого». Дэтэктыў — праца раба. А аповесць — гэта яго творчасць, яго галоўны твор на сённяшні дзень. Антось задумляў, выношваў сваю аповесць некалькі гадоў. Яна нараджалася пакутліва, у сумненнях і адчаі. І запісваў яе Антось толькі тады, калі быццам збоку нешта штурхала яго і падказвала: сядай, пішы. Былі сумневы — ці здолее, быў адчай — а хіба яна трэба некаму, апрача яго самога ды рэдакцыі? Што ён адзін са сваёй, няхай самай высокамастацкай аповесцю, можа зрабіць, што можа парушыць, каго прымусіць задумацца? Але нельга не пісаць, калі можаш пісаць. Гэта Антось разумеў, як правіла, як закон. Нельга змяніць свет, разбураючы. Трэба толькі ствараць. Гэта таксама закон. Вышэйшы закон...

І аповесць атрымалася. І сам ён адчуваў гэта, калі перачытваў старонкі, і ў рэдакцыі часопіса, куды аддаваў раней кавалак для азнаямлення, сказалі адразу: «Закончыш — вязі».

Толькі рэдактар ведаў пра аповесць. Алена ведала пра другое — пра дэтэктыў, які яе муж піша за грошы нейкаму невядомаму выдаўцу. Гэты дэтэктыў выйдзе зусім пад іншым імем. Антось жа атрымае тое, на што разлічваў, на што згаджаўся ад самага пачатку: паўтара долара за старонку тэксту. Ён напісаў 300 старонак — атрымае 450 долараў. Гэта былі рэальныя грошы. Іх так нестае... Колькі могуць зарабіць разам настаўнік літаратуры ды настаўніца пачатковых класаў у райцэнтраўскай школе, не маючы і пяці гадоў стажу?..

Плылі пералескі, палі, пагойдваўся аўтобус, рухаючыся роўна, без прыпынкаў. І мяккая млявасць авалодвала целам і розумам, і так прыемна было ў яе паглыбляцца, аддавацца яе волі.

— Дабрыдзень! Аляксандр? Гэта Валянціна. Так, я буду праз пяць гадзін. Вядома, флэшку з ключамі я вязу з сабой. А скажыце, курс застаўся ранейшым, так? Добра... Так-так, мне менавіта долары наяўныя трэба. Як мы і дамаўляліся. Я разумею, што 20 тысяч для вас — сума не маленькая... Выдатна, як толькі буду ў Мінску, я вам яшчэ раз патэлефаную...

Голас жанчыны ззаду быў узбуджаны, рэзкі, непрыемны. «Чорт, з-за гэтых камерсантаў не паспіш»,— незадаволена падумаў Антось. Вось жа: ён зарабляў тыя 450 долараў два месяцы, пішучы начамі, недасыпаючы так, што кругі пад вачыма не сходзілі тыднямі, а гэтай і 20 тысяч долараў — дробязь... Млявасць знікла, як яе і не было. «Але ж глядзі ты, як маскіруюцца: такімі грашыма варочаць — і аўтобусам ездзіць, ды і апранутая як сціпла... Ат, ну іх к чорту...» — без асаблівых эмоцый падумаў Антось.

Першы прыпынак.

— Пяць хвілін, не разбягайцеся,— папярэдзіў усіх кіроўца, пайшоў да будынка аўтакасы — невялікай бетоннай каробкі шэра-жоўтага колеру.

Той самы дзелавы пузаты мужчына адышоўся ўбок, пачаў тэлефанаваць некаму, голасна пакрыкваючы. І толькі апошні тэлефонны званок, які ён зрабіў, рыхтык змяніў яго самога — нібыта той нумар, які ён набіраў, быў асаблівым кодам па пераўтварэнні людзей. Мужчына загаварыў не проста ветла — ліслівa, ціха:

— Мікалай Сцяпанавіч? Вітаю вас. Так-так, як дамовіліся... Не, ну што вы, якое аўто — еду аўтобусам, я ж разумею... Не-не, усё акуратна...

Антось сплюнуў у думках — от жа, і тут нейкія камерцыйныя сакрэты. І вось няўжо гэтаму пуза-

таму трэба будзе ягоная аповесць пра духоўнае адраджэнне беларусаў? Ці той жанчыне, для якой 20 тысяч — не грошы?

...За акном стала нечакана цямнець — на неба напаўзала хмара, і аўтобус ехаў у гэтую хмару — Антось зірнуў наперад са свайго месца — было вельмі відовішчна: дарога ўздымалася ўгару, а там сустракалася з цёмна-фіялетавым, насычаным небам.

Яшчэ не дасягнулі вяршыні той гары, а дождж не лінуў, а суцэльнай хваляй накрыў аўтобус. У салоне стала вусцішна. Кіроўца збавіў хуткасць, а пасажыры ўціскаліся ў крэслы пры кожнай бліскавіцы і ўдары грому. Толькі пад'ехалі пад высакавольтную лінію, што навісала над шашой, як стрэльнула так аглушальна, што кіроўца спуджана націснуў на тармазы, а аўтобус завіхляў.

І адразу пасля гэтага аглушальнага стрэлу наступіла цішыня — дождж скончыўся. Неба, лічы, імгненна праяснілася. Хмара знікла недзе ззаду, быццам мела рэзка акрэслены край.

— Заікам стаць можна,— прагучаў голас маладой дзяўчыны.— Ды не трымай мяне так, сінякі застануцца,— вызвалілася яна з абдымкаў хлопца.

Павесялелі і іншыя пасажыры. Хлопчык-інвалід стаў зноў глядзець у акно. Мажная кабета выцягнула з-пад ног торбу і пачала разварочваць розныя кулькі, совала ў рукі свайго суседа хлеб, гурок, памідор і палову курынага азадка. Такі ж набор аказаўся і ў яе руках.

— Еш, не крывіся! — загадала яна мужчыне, як дзіцяці, а на твары таго не адбілася ніводнага пачуцця — толькі пакора ў выцвілых вачах і гатоўнасць з усім згадзіцца ва ўсёй паставе. Ён і не крывіўся ад пачатку, але, магчыма, такі выраз твару і падказваў жанчыне, што яе муж (ну, відавочна ж — муж) не хацеў есці.

Па-сапраўднаму пакутліва крывіўся твар толькі аднаго хлопца, што сядзеў амаль насупраць Антося, праз праход. Удар грому пабудзіў яго, ён з надзеяй было пацягнуўся да пляшкі з півам, засунутай у сеткавую кішэню сядушкі наперадзе, дастаў яе, адчуў пустую лёгкасць і злосна кінуў побач з сабой на сядзенне.

Паглядзеў па баках, сустрэўся позіркам з Антосем.

— Калі там спынімся? Гарыць усё...

— Хвілін праз 30,— падказаў Антось і дадаў, каб суцешыць хлопца: — Там станцыя вялікая, буфет ёсць.

— У-у-у,— прастагнаў хлопец і заплюшчыў вочы, адкінуў галаву.

Мінула хвілін дваццаць.

— Нешта ніяк да Рудакоў не даедзем,— з лёгкім хваляваннем сама сабе сказала бабуля, што сядзела побач з хлопчыкам-інвалідам.

Той неадрыўна глядзеў у акно і нечакана гучна сказаў:

— Зараз нас абгоніць белы «Мерсэдэс», а насустрач будзе рухацца сіні «МАЗ» з сіняй фурай!

Многія пасажыры ад няма чаго рабіць павярнулі галовы напачатку на хлопчыка, потым — да акон.

Міма аўтобуса бязгучна праплыў белы «Мерсэдэс», потым з шумам мільгануў сіні «МАЗ» з вялікай фурай.

— Э-е-е,— павярнуўся да салона хударлявы і лысаваты малады чалавек, на каленях якога ляжаў улучаны ноўтбук.— Міма гэтага павароту мы праязджалі! Чорт... Зараз справа будзе бярозка са зламанай вяршыняй!

Бярозка з'явілася як здзек.

— Што такое? — раздаўся ўпэўнены асуджальны голас, якому хацелася падпарадкавацца і адказаць

на пытанне, хоць ты нічога і не абавязаны адказваць.— Што за... выбрыкі ў нас на трасе?

Гэта той самы дзелавы мужчына ажно ўзняўся ў сваім крэсле. Ён звяртаўся да кіроўцы, але, было бачна, гатовы быў шукаць вінаватага і сярод пасажыраў.

Яму ніхто не паспеў адказаць, бо адразу ж пачуўся перапужаны крык мажнай цёткі, якая нядаўна старанна абгрызала да чыстага курыныя косткі:

— А-а-а!

Адказам на ейны крык стала запытальная, з улоўным страхам, цішыня салона. Не разгубіўся толькі ўпэўнены мужчына:

— Чаго вы крычыце? Што за прычына?

— Курыца... Во... — Жанчына падняла высока ўгару пакет са смажанай паловай курыцы.

— І што ў ёй страшнага? — ужо грозна перапытаў мужчына.

— Дык мы ж яе з'елі! А яна — во... Як і была...

— Што вы верзяце? Калі з'елі, дык адкуль ёй быць? Мо вы па пяць курэй берацe з сабой...

— Я адну брала,— замармытала жанчына.— І мы яе з'елі пятнаццаць хвілін таму.

Цішыня ў салоне напялася да звону.

— Кіроўца! — Пузаты павярнуўся наперад.— Па распарадку мы павінныя ўжо ад'язджаць з Рудакоў. Чаго мы ездзім сюды-туды!

— А я адкуль ведаю? — раздражнёна адказаў кіроўца.— Вы толькі заўважылі, а я ўжо тройчы адзін адрэзак еду. Не зварочваю ж нікуды...

Павісла маўчанне.

— Ёсць! — раздаўся пераможны крык лысаватага з ноўтбукам.

— Што ёсць? — імкліва павярнуўся дзелавы мужчына да яго.

— Толькі што час на маніторы пераскочыў на 10 хвілін назад. Я зірнуў — мы едзем там, дзе і раней былі якраз 10 хвілін таму.

— Гэта як? — крыху разгубіўся мужчына.

— Я думаю, апошні ўдар перуна прыйшоўся на лінію перадач, узнікла моцнае электрамагнітнае поле і мы патрапілі ў колца прасторы-часу, якое якраз утварылася. І круцімся ў ім...

— Калі б мы ў колцы былі, то ад пачатку пачалі б размаўляць,— устрэў Антось, якому такое тлумачэнне здалося неверагодным.— Лухта нейкая...

— Не абавязкова,— заўпарціўся ноўтбушнік.— Поле дзейнічае на фізічную мёртвую матэрыю. Вось час і пераскочыў, курыца аднавілася...

— І бензін ужо колькі часу на месцы,— падтрымаў кіроўца.— І спідометр пераскочыў...

— Так, спакойна, трэба разабрацца ва ўсім! — загадаў дзелавы мужчына, хоць ніхто і не збіраўся парушаць спакой салона, і загад гэты ён аддаў, відавочна, ад асабістай разгубленасці, каб супакоіцца самому.

— Гэта суд Божы! Час наш прыйшоў! — пачуўся зычны, упэўнены голас аднекуль з сярэдзіны салона, а потым узнялася над усімі жанчына ў стракатай хустцы.

— Сядзьце, не палохайце людзей!

Голас належаў жанчыне гадоў 50, апранутай у адмысловы гарнітур. Жанчына прыўзнялася з месца, і Антось унутрана ўсцешыўся — уся постаць жанчыны, яе твар выпраменьвалі ўпэўненасць і спакой.

— Ад таго, што мы тут зараз будзем крычаць і палохаць адзін аднаго, лепш нікому не будзе,— строга загаварыла жанчына.— Кажу вам гэта, як лекар. Малады чалавек, што вы казалі пра тое закальцаванае поле? — Гэта было пытанне да лысаватага мужчыны з ноўтбукам.

— Я ўжо казаў... Думаю, прастора і час вакол нас звярнуліся ў колца. Мы вяртаемся нейкім чынам назад. І мабільнікі не працуюць, мой дакладна...

— І што будзе далей?

— Не ведаю... Нешта павінна быць... Некалі скончыцца...

Хваляванне і напружанасць у салоне трохі зменшыліся. Пакуль ніякай пагрозы не было. А кожная дарога рана ці позна заканчваецца — у гэтым быў упэўнены кожны пасажыр. За адным дзеяннем ці з'явай надыходзяць іншыя, у наступстваў бываюць прычыны, а наступствы становяцца падставай для новых прычын. І ў тым, што ланцужок часова прыпыніўся, ніхто не бачыў асаблівай пагрозы.

Але прайшло паўгадзіны, і цыклічнасць карцінак пачала прыгнятаць.

— А мы не спознімся ў Мінск? Мы прыедзем у час? — звярнулася да Антося нервовая жанчына ззаду. У яе голасе выразна адчуваўся страх.

«Бач, хвалюецца з-за грошай»,— падумаў ён, а ўголас адказаў:

— Спадзяюся, прыедзем. Мне таксама сёння спазняцца нельга. І абавязкова трэба прыехаць...

І раптоўна нейкая неверагодная думка ўплішчылася ў галаву: а раптам ім вось так ехаць і ехаць, доўга, бясконца — і ніколі не прыехаць? Антось уважна глядзеў на пасажыраў і бачыў, што такія ж сумненні спакваля авалодвалі многімі, бо твары хмурнелі, неспакой выразна выяўляўся на іх.

Трэба было паспрабаваць нешта рабіць... Хоць нешта...

— Усё нічога, аднак варта падумаць і пра нашу фізіялогію,— загаварыў дзелавы мужчына, і адчулася, што гэтага голасу чакаюць усе, што чакаюць проста любога ўпэўненага голасу — салон імгненна ажывіўся.

— Вы пра «дзевачкі налева, хлопчыкі — направа»? — асцярожна пажартаваў нехта.

— І пра гэта таксама,— сур'ёзна заўважыў мужчына.— Я прапаную ўжо цяпер паспрабаваць спыніцца. Адчыніць дзверы, выйсці...

Нягледзячы на тое, што ў прапанове не было нічога незвычайнага, аднак насцярожанасць адбілася на тварах многіх пасажыраў. За акном — тое ж неба і сонца тое ж... Але ці тое ж усё іншае? Зямля ці цвёрдая? Паветрам ці можна дыхаць? І хоць сумневы былі проста смешнымі, але яны былі. Чаму б паветру не стаць шкляным і застылым, калі сам час закруціўся ў абаранак?

— Але спыняцца пакрысе! Вельмі павольна,— папярэдзіў-прапанаваў мужчына з ноўтбукам.— Мы не ведаем, якая там фізіка поля...

— А што можа быць? — нервова запытаўся нехта.

— Не ведаю,— шчыра прызнаўся малады чалавек.— Мы патрапілі ў колца часу і рухаемся... Можа, мы тут толькі таму, што рухаемся...

— Ну, тады я буду прытармožваць патрохі,— прыняў рашэнне кіроўца.

Аўтобус сцішаў ход надзвычай павольна, амаль незаўважна. Пасажыры ўпіліся позіркамі за вокны. Усё павольней і павольней рухаліся міма аўтобуса прыдарожныя кусты.

— Свеціцца! Сценка празрыстая! — пачуўся здзіўлены крык хлопчыка-інваліда.

У воклічах, якія імгненна запоўнілі салон пасля гэтага крыку, былі сабраныя разам і жах, і здзіўленне, і захапленне.

Было ад чаго: праз сценкі аўтобуса, яго падлогу стала відаць шэрая стужка бягучай дарогі.

— Газуй! Хуткасць давай! — закрычаў мужчына ў гарнітуры да кіроўцы, а той ужо і сам націснуў на газ, і матор узвыў, ірвануў наперад аўтобус.

— Божачка, што ж будзе, Божачка, выратуй, спыні гэта,— мармытала ззаду Антося нервовая жанчына.

Некалькі хвілін прайшлі ў поўнай разгубленасці ад той навіны, што аўтобусу нельга спыняцца. Антось адчуў, як страх сціскае яго свядомасць — рабілася млосна ад думкі, што і нсамрэч ніколі не спыніцца іх аўтобусу. Ён стаў глядзець у акно, быццам там магла быць падказка.

— Нешта мы хутчэй ехаць сталі,— заўважыў Антось уголас, бо за акном кусты і дрэвы мільгалі надта ж часта.— Напужалі кіроўцу...

— Тут напужаешся,— адгукнуўся кіроўца са свайго месца,— калі пад сабой дарогу пабачыш... Дарэчы, я дарогу бачыў праз самога сябе... Хто-небудзь яшчэ гэта заўважыў?

— Я таксама празрыстым пачаў быў рабіцца,— падаў голас хлопчык-інвалід.— У мяне нага забалела, гляджу — а праз яе відаць крэсла, а праз крэсла — дарогу...

— Як нага забалела, унучак? — спуджана выгукнула яго бабуля.— У цябе ж паралізаваныя ножкі, не могуць яны балець...

— Балела,— настойліва адказаў хлопчык.— І цяпер баліць...

Яго бабуля моўчкі затуліла рот рукой, глядзела на ногі ўнука, не адрываючыся.

— А насамрэч, чаму мы хутчэй едзем?

— Ды не ж,— нервова адгукнуўся кіроўца.— Тыя ж 90 на спідометры...

Загаварыў малады чалавек з ноўтбукам, хвалюючыся, быццам сам быў вінаваты ў тым, што адбывалася:

— Час пераходу мяняецца... ну, раней праз кожныя 10 хвілін мы вярталіся ў ранейшую кропку. А вось цяпер... праз 7... І толькі што — ужо праз 6...

— І пры чым тут рух аўтобуса? — зацікавіўся нехта, не разумеючы.

— Ну, мы ж праязджаем пэўную адлегласць ад той кропкі... да мяжы колца. За пэўны час. Цяпер час скараціўся, а адлегласць тая ж...

— Дык мы хутка пралятаць дарогу будзем,— робленa рагатнуў кіроўца, тут жа спытаўся сур'ёзна: — Калі час вяртання скарачаецца пастаянна, што будзе, калі дасягне нуля?

— Не ведаю,— паціснуў плячыма малады чалавек.— Для нас час спыніцца. Але мы рухаемся... Значыцца, для назіральніка збоку набудзем светлавую хуткасць...

— Нешта ты занадта па-вучонаму... З намі што будзе?

— Дык... Адкуль жа мне ведаць? Тэарэтычна фізічнае цела не можа мець такую хуткасць... Толькі поле...

— Станем полем? Што гэта значыць? Што з намі стане? — нервовая напорыстасць дзелавога мужчыны ў строгім гарнітуры была нечаканай для маладога чалавека, ён спалохана ўціснуўся ў крэсла.

— Не ведаю...

— Мы што, не вернемся? — адчайна выгукнула нервовая жанчына за Антосем, і сам ён адчуў агідны халадок страху, што стаў запаўзаць у жывот.

— Чаму вас толькі вучаць!..

— Не крычыце на яго,— раптам устала з месца жанчына ў гарнітуры, якая назвалася лекарам.— Мы ўжо прыехалі...

— Куды прыехалі? Што значыць — ужо прыехалі? — занерваваўся мужчына, які, гэта было відавочна, сам пачаў адчуваць прорву пад сабой і немагчымасць адысці ўбок ад гэтай прорвы.

— Вы хіба не зразумелі? — жанчына павярнулася да салона.— Ніхто не зразумеў ці не хоча зразумець?

— А што тут разумець? Час закручаны, поле нейкае... Дзе тут разбярэш,— буркнуў нехта.

— Тое мы мусім зразумець... — Лекар вытрымала паўзу, чакаючы большай увагі пасажыраў, хоць большай яна і не магла ўжо быць.

— Што зразумець? — умольна выгукнула нервовая жанчына, таксама ўзнялася са свайго месца.— Мне сёння трэба патрапіць у Мінск. Трэба, разумееце? І я нічога больш не хачу разумець. Што я павінна яшчэ ведаць?

— Тое, што мы — там! — Жанчына паказала рукой у зад салона.— Мы там, засталіся на дарозе,— сказала яна спакойна, але няўмольна, так, як можа гаварыць толькі лекар.— Той удар маланкі забіў нас усіх. Мы — мёртвыя! І мы не можам туды вярнуцца, не можам спыніцца. Нас ужо няма.

— Што-што? — патрос галавой дзелавы мужчына.

— Тое! Вось вам і пекла, і рай — вось такія яны. Мы — у свеце мёртвых. І нам усім так бясконца ехаць. І везці бясконца свае мары, думкі, свой боль, свае расчараванні, свае надзеі. Мы не пастарэем, не памром ужо, двойчы не паміраюць. Мы тут — вечныя. І вечныя будуць тыя пачуцці, з якімі мы селі ў аўтобус.

— Лухта! — выгукнуў мужчына.— Мы — ёсць, якія ж мы мёртвыя?

— Існуем не мы, а нашая свядомасць. Яна памятае вобразы і ставарае іх,— спакойна адказала жанчына.— Ужо колькі часу едзем — нехта захацеў піць? Некаму стала мулка? Наша фізічная абалонка — прыдумка мозгу...

— Якая такая прыдумка?!

— Найпрасцейшая,— стомлена адмахнулася жанчына.— Памацайце ў сябе пульс, прыкладзіце руку да сэрца... там нічога не б'ецца...

Услед за гэтымі словамі наступіла бадай што найбольш страшная хвіліна. Кожны мог праверыць на сабе...

— Карацей, скліфасоўскія, там станцыя хутка? — раздражнёна спытаў хлопец, у якога скончылася піва.— Мяне смага мучыць, а вы тут пра поле нейкае... Кіроўца, прыпыніся, блін, мне да ветру трэба...

Нехта нервова хіхікнуў. І гэта было адзіным адказам на голас хлопца.

— Баб, а я на ногі стаць магу!

Гэты радасны вокліч хлопчыка-інваліда нібыта страсянуў салон. На яго азірнуліся — а хлопчык і праўда стаяў між крэслаў, трохі прысагнуўшыся. Яго бабуля побач бязгучна заплакала, гладзіла абедзвюма рукамі ягоныя ногі.

І тыя, хто не верыў — паверылі. Зразумелі. Усвядомілі.

— Так нельга... так немагчыма... Не, я не магу памерці! Я не магу! Не магу!!!

Нервовая жанчына з непрыгожым худым тварам біла сваёй торбачкай сябе па каленях і крычала.

— Мы ўсе не можам памерці! — заўважыў Антось.— І я не магу. Не магу, бо не зрабіў, не дарабіў, не здолеў, не паспеў,— адчай прарваўся ў яго голасе.— І жонка засталася...

Жанчына павярнулася да яго — вочы яе, глыбока запалыя, у цёмным паўкружжы ценяў блішчэлі слязьмі.

— У мяне... У мяне памірае дачушка. Нямецкая клініка згадзілася прааперыраваць. Два месяцы мы збіралі грошы. 25 тысяч долараў ляжыць у маім электронным партманеце. Я еду, каб вывесці іх. І не змагла, я не змагла....

— Дык... нехта выведзе,— паспрабаваў супакоіць Антось жанчыну.

— Не зможа! Ніхто не зможа! — жанчына зноў біла сваёй торбачкай сябе па каленях.— Ніхто, апрача мяне, не ведае пароля. Ключы ад партманетаў вось, у торбачцы, на флэшцы... Божа, што ж ты так караеш маю дачушку! Яна ж не вінаватая ні ў чым!..

— А... муж? — асцярожна запыталася жанчына-лекар.

— Збег... Збег наш татачка, як толькі дыягназ выставілі... Я не магу, мужчыны, ну прыдумайце ж нешта! Нельга мне забіраць з сабой гэтыя грошы! Я ж забіваю дачку. Ёй жа толькі 7 гадочкаў, Божа! Ты чуеш, ці не? Дзе той твой свет, дзе брама і Пётра?

— Супакойцеся,— мякка, але настойліва сказала жанчына-лекар.

— Не супакойвайце мяне! — істэрычна закрычала жанчына, у роспачы падхапілася і апынулася ля мужчыны з ноўтбукам.

— Ну выйдзіце, выйдзіце ў сеціва, напішам ліст, я скажу паролі, перадам ключы!

Мужчына ўздрыгнуў, сцяўся, нібыта чакаў удару, і адказаў:

— Я магу выйсці ў сеціва... Але... мне нічога не ўдаецца перадаць. Я пішу... а дадзеныя не перадаюцца... Як быццам нас няма...

— Нас і няма. Нас няма для свету жывых,— катэгарычна паўтарыла сваю выснову жанчына-лекар.— А свет мёртвых не можа стасавацца са светам жывых.

— Ы-ы-ы,— раптам завыла тоўстая жанчына, з нянавісцю павярнулася да свайго худога суседа, якога карміла нядаўна курыцай.— Праз цябе! Няўклюда! Бздыр! Ты нават машыну не здолеў купіць! Не змог навучыцца кіраваць! Праз цябе! Усё жыццё загубіла, што я бачыла? Тхор смярдзючы! 25 гадоў табе аддала, а што бачыла? У-у-у, смактункрывасос!

— Праз мяне? — нечакана весела адрэагаваў мужчына.— Ты калі-небудзь лічыла мяне за чалавека, не кажучы ўжо пра мужчыну? Ты са сваёй мамай зрабіла з мяне свайго слугу — і ты хацела ад мяне нечага, вартага чалавека?

— От і пражыў пад спадніцай маёй! Хоць гэта мяне супакойвае!

— Ты ніколі не вызначалася розумам,— з усмешкай працягваў мужчына.— Думаеш, калі ты не бачыла ўва мне чалавека і мужчыну, то і ніхто не бачыў?

— Што-о-о? — разгублена акругліла вочы таўстуха.

— Тое. Усе гэтыя 25 гадоў у мяне была жанчына. Не проста жанчына — сям'я! Яна нарадзіла мне сына, і той ужо вырас. І прозвішча ён мае ўзяў. І мы былі шчаслівыя.

Таўстуха хапала ротам паветра, імкнулася нешта сказаць. Але мужчына не стаў чакаць, пакуль яна здолее выціснуць з сябе слова, устаў і загадаў ёй:

— Выпусці! Хоць памерлі мы разам, ды пасля смерці я з табой не буду!

І яна павольна, быццам у сне, паднялася, саступіла. Ён выйшаў і сеў на свабоднае месца ў заднім шэрагу.

— Эх, людзі... І мёртвым няма спакою,— ціха прагаварыла лекар.

— А вы не занадта спакойныя? — з выклікам спытаў Антось.

— Усё нармальна,— ціха адказала жанчына.— Я ўдзячная Богу, што два дні таму мама памерла ў мяне на руках, і яе пахавала. Дачка замужам, сын заканчвае ўніверсітэт. Муж — чалавек самастойны... Шкада, што яны будуць гараваць па мне. А так... я рабіла свае справы так, нібыта была гатовая памерці ў любы дзень,— горка ўсміхнулася жанчына.

— Ага, дзякаваць Богу... — скептычна пакрывіўся Антось.— Цяпер дакладна вядома пра мілыя казкі...

— У цябе не б'ецца сэрца,— павольна прагаварыла дзяўчына, што сядзела побач з хлопцам, паклаўшы яму галаву на грудзі.

Хлопец мякка пагладжваў яе па плячах, глядзеў за акно, дзе мільгацелі шэра-зялёныя плямы.

— Ды і выдатна, яно не забаліць, мне не стане блага, я не памру ад сардэчнага прыступу,— усміхнуўся хлопец.— У цябе ж вось таксама не б'ецца — а ты ж мяне кахаеш так, як і кахала, праўда?

— Праўда,— падняла галаву дзяўчына, усміхнулася.— Мы цяпер можам пачаць цалавацца — і будзем цалавацца вечна...

— Ага,— усміхнуўся і хлопец.— Пачнём?

Антось не вытрымаў — адчай стаў душыць яго. Гэта немагчыма! Яму трэба выжыць, яму трэба вярнуцца туды, хоць на хвілінку, хоць на імгненне! Ён павінен сказаць Алене, што ў ягоным камп'ютары ў асобнай папцы пад назвай «Рознае» ляжыць яго аповесць — аповесць яго жыцця. Ён павінен перадаць дэтэктыў заказчыку, атрымаць грошы і аддаць іх жонцы, ён павінен папрасіць прабачэння за тое, што не здолеў зрабіць яе шчаслівай...

Антось устаў і накіраваўся да мужчыны з ноўтбукам. У яго не было ніякай асаблівай надзеі, не было нават думкі нейкай, але здавалася: падыдзе ён бліжэй да тэхнікі — і нешта народзіцца, нейкі выхад адшукаецца. Нечакана давялося зрабіць шмат крокаў, а потым, прысеўшы побач з мужчынам, Антось пабачыў, што ягонае крэсла можа на цэлы метр аддалена ад крэсла хлопца.

— Не разумею...— пачаў Антось, паказваючы вачыма на крэсла.— Што адбылося?

— Нічога такога, я думаю,— ахвотна адказаў лысаваты.— Мы ўжо набылі досыць вялікую хуткасць адносна нерухомага назіральніка. Так што мы набываем для яго форму кропкі. А для нас унутры гэтая кропка азначае бясконцасць. Наш аўтобус з кожнай хвілінай будзе рабіцца ўсё большым і большым. І стане ўрэшце адным сусветам. Бясконцым.

Антось пракаўтнуў.

— Слухай... Можа, ёсць магчымасць нешта зрабіць? У мяне... рукапіс... Не магу я яго з сабой тут пакінуць. Ён там трэба...

— Не магу,— адмоўна пакруціў галавой хлопец.— Я праўду сказаў — адсюль мы нічога не перадамо. Зараз ужо час звярнуўся да трох хвілін...

За шыбамі вокнаў салона нічога амаль не было відаць — адзіная шэра-зялёная паласа.

Пачуліся крокі ззаду. Антось азірнуўся — да іх ішла жанчына з непрыгожым худым тварам. Яна ішла доўга — салон стаў падобным да паўпустой кіназалы з чатырма шэрагамі крэслаў.

— Я не магу тут застацца! — сказала жанчына, і Антось зразумеў, што калі жанчыне адказаць нешта банальнае, то пачнецца істэрыка.

— Я таксама не магу,— адказаў ён шчыра.

Жанчына нібы чакала такога адказу менавіта ад Антося, зрабіла некалькі крокаў наперад (хоць раней гэта было адразу, побач), стала ля кіроўцы.

— Спыніцеся і адчыніце дзверы. Я выйду!

Салон быццам уздрыгнуў. Жанчына-лекар прайшла наперад.

— Які сэнс? Вы што, не зразумелі, што прыпынак — гэта наша поўнае знікненне? Вы не бачылі хіба, як мы распускаемся?

— Дык чаго мне баяцца? Чаго? — закрычала жанчына з хударлявым тварам.— Я ж — мёртвая!

Як можна баяцца яшчэ адной смерці?! Спыніце! Кіроўца! Мне ўсё адно. Калі ёсць магчымасць зрабіць хоць крок некуды — я абавязаная яго зрабіць. Я не магу паміраць проста так!

— Ён не будзе спыняцца! — катэгарычна запратэставала лекар.— У нас усіх — аднолькавы лёс. І прыміце свой так, як і трэба — як свой крыж — і нясіце яго.

— Калі смерць такая, маёй дачушцы, як мне, як нам усім, не ехаць аўтобусам, ёй цэлую вечнасць, бясконца, пакутаваць ад болю, лежачы пад кропельніцай! Завошта ж ёй будзе такая смерць? Бог наш — міласэрны ці кат бессардэчны? Што вы яго малявалі чалавекалюбцам?.. Пусціце мяне! Кіроўца! Адчыніце дзверы! Я скочу на хаду, калі вы так баіцеся! Я буду біць вокны! Спыніцеся!

— Разаб'ецеся! — данеслася папераджальна аднекуль з салона.

Жанчына нервова засмяялася з папярэджання:

— Мёртвы баіцца разбіцца! Кіроўца! Спыняйцеся!

— Дурніца, чым ты можаш дапамагчы жывому, калі сама мёртвая! Што гэта дасць?

— Кіроўца! Не спыняйцеся! Невядома што здарыцца можа!

— Яна з глузду з'ехала, а нам потым разлічвайся з-за яе!

— Кіроўца! Прытармазіце да таго часу, як і раней, калі пачнецца свяціцца абшыўка аўтобуса! — толькі з яму зразумелай прычыны ўладна загадаў нечакана для самога сябе Антось.— Потым зноў сабе паедзеце. Адчыніце дзверы. Мы скочым удваіх...

Кіроўца нічога не адказаў, але толькі зірнуў аднекуль згары здалёк — ад свайго крэсла на Антося і жанчыну, пералучыў рычаг. Зялёнае месіва за акном стала разбівацца на асобныя плямы.

Антось уважна сачыў за падлогай. Калі праз яе стала ўгадвацца шаша, ён сказаў:

— Адчыняйце дзверы...

— Мяне пачакайце! — пачуўся голас аднекуль ззаду.

Антось азірнуўся — з глыбіні салона, ужо так далёка ад іх, з месца ўзняўся хлопчык-інвалід.

— Куды ж ты, унучак? — з болем спытала яго бабуля.

— Баб, тут жа я магу на сваіх нагах! — весела і перакананаўча загаварыў хлопчык.— Дык пусці мяне пабегаць — я ж ніколі не бегаў...

— Бяжы, унучак любы,— бабуля ўзнялася з крэсла, выпусціла хлопчыка і перахрысціла яго ў спіну.— Бяжы, родненькі,— і ўпала ў крэсла, а слёзы пакаціліся з яе вачэй, хоць старая ўсміхалася.

Хлопчык дабег да Антося і жанчыны, якія стаялі ля адчыненых дзвярэй. Мабыць, час яшчэ скараціўся, бо нічога не было відаць, адно адчувалася велізарная хуткасць аўтобуса. Адразу за парогам нібыта ўзнікала сцяна — цвёрдая, аб якую абавязкова разаб'ешся.

Жах сціснуў сэрца Антося.

— Спыніцеся, дурні! — аднекуль здалёк закрычаў дзелавы мужчына.— Яшчэ некалькі хвілін патрываць — і мы дакладна будзем ведаць праўду! Там жа — немінучая пагібель! Вы проста знікніце, як знікаў аўтобус! Час вернецца ў нуль — і мы вернемся назад! Як вам гэтага не зразумець? Спыніцеся!

Антось завагаўся. Тыя ж ваганні ён пабачыў на твары жанчыны. Але потым ягоны позірк спыніўся на хлопчыку — і Антось рашуча ўзяў яго за руку, працягнуў другую жанчыне:

— Давайце скочым разам. Мы і насамрэч мёртвыя. Двойчы не паміраюць... Ну, на лік тры: адзін, два, тры!..

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

З паведамленняў у СМІ:

«Пярун патрапіў у аўтобус. Трагедыя адбылася на трасе аб 11.25. Магутны разрад маланкі патрапіў у пасажырскі аўтобус. Відавочцы бачылі, як той літаральна асвяціўся блакітным полымем, потым з'ехаў на поўнай хуткасці з трасы і тройчы перакуліўся. З 18 пасажыраў аўтобуса і яго кіроўцы ў жывых засталося толькі трое пасажыраў: мужчына, жанчына і хлопчык 10-ці гадоў, якіх невядомым чынам выкінула з аўтобуса — іх целы былі знойдзеныя ў некалькіх метрах побач. Цяпер яны ў рэанімацыі. Медыкі кажуць пра іх цяжкі, але ўстойлівы стан».

# Я РАЗМАЛЮЮ ДЛЯ ЦЯБЕ НЕБА

*Амаль казка*

## 1

Мама — гэта нешта вялікае, пяшчотна-цёплае, з лёгкай незразумелай журбінкай. Яно гатовае ўсё выслухаць, усё зразумець, усё прабачыць. Гэта вялікае пастаянна ахутвае Жэньку, яму лёгка і ўтульна, калі ён адчувае гэта ахутванне.

Тата — гэта нешта рэзка-вуглаватае, строгае і прамое, як іх дом, цвёрдае, халоднае. Яно заўсёды насцярожанае, гатовае паправіць, асудзіць і нават накрычаць. Але яно моцнае, яно надзейнае, яно абяцае абарону...

А яшчэ ёсць кплівае, яхіднае, якое адно і чакае моманту, каб пакрыўдзіць і зняважыць,— гэта Мікіта.

І яшчэ... Пра гэта Жэнька нікому не кажа, нават маме, хоць яна іншы раз мякка стукаецца да яго, спрабуе знайсці і зразумець сярод усіх яго пачуццяў і адчуванняў і гэты маленькі пухнаты камочак чагосьці дрыгатліва далікатнага, што хочацца схаваць ад усіх, абараніць, зрабіць нешта добрае-добрае, каб яму, камочку, стала весела і радасна.

Гэта калі Жэнька нікога не бачыць, а толькі адчувае.

А калі бачыць, тады мама — вельмі прыгожая жанчына. Жэнька ведае, чаму мама прыгожая: у яе добры генетычны патэнцыял — так усе кажуць. І таму ёй дазволілі нараджаць. Жэнька не разумее, што гэта такое, але яму і не трэба гэтага. Ён проста любіць глядзець на маму, але крадком. Празрыстае адзенне не хавае ейнага цела. Жэнька чамусьці бянтэжыцца гэтай адкрытасці, хоць мама толькі смяецца. А тата злуецца, кажа на Жэньку, што ён — мамчын сынок.

Тата — высокі і моцны мужчына. Калі Жэнька вырасце, ён павінен быць такім прыгожым, як мама, і дужым, як тата. Бо ён — прадаўжальнік роду.

Праўда, яго трэба яшчэ выхаваць як след, часта паўтарае тата. Інакш будзе дарма страчаны генетычны патэнцыял.

Калі Жэнька бачыць, тады той далікатны камячок становіцца проста Лінай. Дзяўчынкай з суседняга дома. Калі цямнее вялікае Сонца над галавой, а Купал з белага становіцца шэрым, ён любіць глядзець на Ліну праз празрыстыя сцены іх дамоў. У Ліны пакой такі ж, як і ў Жэнькі, у тым самым куце дома. Толькі паміж імі пакой дарослых, і яны часта засланяюць сабой Ліну. Добра было б, каб людзі, якія жывуць у празрыстых дамах і носяць празрыстую вопратку, самі рабіліся празрыстымі. Калі ты захочаш.

А Мікіта — гэта хлопчык з дома праз вуліцу. Яго таксама Жэнька часта бачыць. Як толькі Жэнька глядзіць туды, Мікіта адразу крывіць на розны манер свой твар і паказвае яму, Жэньку, нейкія незразумелыя, дурныя жэсты. Мусіць, для яго неаднойчы ўжо гучаў званок. Хай яму будзе горш — калі часта звініць званок, тады ў цябе менш шанцаў стаць сапраўдным грамадзянінам Купала. Так кажа тата...

## 2

— ...І тады лепшыя сыны нашага народа вырашылі абараніць сябе і сваіх дзяцей ад немінучай смерці і стварылі Вялікі Купал і запалілі ў ім Сонца. І стаў Купал выратаваннем для іх, для ўсіх, хто верыў у Вялікі Шлях. А ўсё іншае — загінула ў страшнай Цемры. Тысячы людзей самаахвярна працуюць сёння, каб працягвалася жыццё — адзінае жыццё сярод Цемры. І вы ўсе, маленькія грамадзяне Купала, павінныя расці і вучыцца, каб змяніць потым сваіх бацькоў, каб працягнуць вялікую справу жыцця...

Жэньку не цікава. Ён ужо ведае пра ўсё гэта — нешта апавядалі ў дзіцячым садку, а больш тлумачыў тата. Жэнька цяпер у школе. Ён адчувае спакой мамы за яго, тата і зусім пра яго не думае, калі працуе. Вакол Жэнькі — толькі Ліна. І Мікіта. А яшчэ — строгі Настаўнік. Ліна побач — яе можна крануць рукой. Жэнька баіцца, што яна адчуе яго, ён з усёй моцы спрабуе стрымаць у сабе моцнае пачуццё пяшчоты да яе, якое ўспыхнула невядома з якой нагоды. І яна адчула, забылася на голас Настаўніка, паглядзела на Жэньку і... усміхнулася. Жэнька адчуў кволую, асцярожную пяшчоту ў адказ. І ў тое ж імгненне ўсё запоўніла сабой злосць і пагроза — гэта Мікіта, ён сочыць, ён таксама адчувае іх пяшчоту адно да аднаго.

— Уважліва слухайце мяне! — грозна прамаўляе Настаўнік.

Зваротная пяшчота згасае, а злосць толькі ледзь прытухае...

Дрэнна, што ты не можаш адчуваць усяго Настаўніка, а толькі ягоную строгасць. Але нічога, яны хутка вырастуць. Калі ім будзе па 16 гадоў, ім замест дзіцячага абруча на назе апрануць на рукі бранзалеты сапраўдных грамадзян. І тады Жэнька

будзе адчуваць не толькі маму, тату і сваіх сяброў, але ўсіх-усіх жыхароў Купала. Усе іх пачуцці. І ўсе будуць адчуваць твае. Тата кажа, што гэта завецца поўным улучэннем у адзінае эмацыйнае поле. І гэта вельмі добра — калі ўсе людзі вакол адчуваюць адзін аднаго. Тады нельга задумаць ліхое. Бо калі нехта задумае ліхое, Купал загіне.

...Дома Жэнька маляваў толькі алоўкамі: свой горад, увесь празрысты, з аднолькавых празрыстых дамоў-каробак. Маляваць горад было сумна — ён увесь аднолькавы ўсюды, аднолькавыя вуліцы разбіваюць яго на аднолькавыя кварталы. Тата кажа, што такое ўладкаванне горада аптымальнае. Што значыць — аптымальнае, Жэнька пакуль не разумее, але калі кажа тата — значыцца, так трэба.

Аднастайныя кварталы з празрыстых дамоў дзеляцца на чатыры вялікія часткі. У адной жывуць рабочыя, у другой — службоўцы, у трэцяй — інжынеры, у чацвёртай — ахоўнікі і кіраўнікі. У цэнтры горада — велізарны белы пляц. Такі роўны і бліскучы, як сцены дамоў. Толькі ён не празрысты, а белы-белы. Пасярод пляца ўзвышаецца велічны будынак Кіравання Купалам — высокі прастакутнік чорнага колеру.

Гэта адзіны ў Купале будынак, дзе сцены не празрыстыя. Толькі ў гэтых сценах ёсць прастакутныя праёмы — дзверы і вокны. Але і праз іх не відаць, што там, усярэдзіне. Бо гэтыя праёмы не празрыстыя, а белыя.

Перад гэтым будынкам усе адчуваюць глыбокую павагу. У гэтым будынку працуюць і жывуць найразумнейшыя грамадзяне Купала. Ад іх залежыць само Жыццё.

Жэнька павінен добра вучыцца — яго генетычны патэнцыял падыходзіць для кіраўніка. Так кажа тата.

Невялікі пляц ёсць у кожным асобным квартале. Пасярод яго — вялікі празрысты дом з прасторнымі заламі — гэта Страўні. Сюды ўсе прыходзяць двойчы ў дзень атрымліваць сваю порцыю Жыццёвай сілы.

...Сёння на ўроку малявалі фарбамі. Настаўнік павесіў на сцяне вялікі малюнак: гэта Першы Кіраўнік Купала, яго партрэты вісяць у кожным доме, толькі там яны невялікія.

— Вы павінныя паспрабаваць намаляваць партрэт Вялікага Першага Кіраўніка,— даў заданне Настаўнік.— Галоўнае: дамагайцеся дакладнай перадачы мужнасці і розуму на ягоным твары, да дакладнага падабенства не імкніцеся.

Жэнька стараўся. У яго ўсё атрымлівалася: фарбы роўна кладліся на шурпаты аркуш. Набіраючы чарговы раз фарбу, ён адчуў раптам выбліск нянавісці. Абярнуўся і пабачыў злы погляд Мікіты. І ўсё зразумеў — у Мікіты на аркушы былі нейкія брудныя плямы. Хлапчукі неадрыўна глядзелі ў вочы адзін аднаму некалькі імгненняў, а потым нечакана Мікіта пхнуў руку Жэнькі з заціснутым пэндзлем.

Пэндзлем Жэнька мазануў проста па празрыстым стале.

Мікіта зласліва засмяяўся — не ўголас, вядома.

«Чаму яму не звініць званок? — разгублена падумаў Жэнька, гледзячы на пляму фарбы на сваім стале.— Учынак Мікіты няправільны ж?» Але новая думка раптам завалодала ім. Ён не мог пакуль яшчэ зразумець усяго сэнсу яе, але думка забілася ў галаве нечаканым адкрыццём: фарба...

— Што ты такі ўзбуджаны сёння? — спытала мама, калі вярнулася з працы і яны разам з усімі ішлі ў Страўню.— У цябе ўсё атрымалася ў школе?

— Так, мама, усё атрымалася,— адказаў Жэнька.— Мне спадабалася маляваць фарбамі. Я магу імі маляваць дома?

— Я спытаю Настаўніка, ці можна табе фарбы дадому,— паабяцала мама.— Думаю, табе дазволяць, калі твой малюнак быў удалым.

— Мой малюнак быў лепшым,— без гонару адказаў Жэнька.

Мусіць, мама вырашыла, што Жэнька ўзбуджаны менавіта з-за поспехаў у маляванні.

### 3

— А кім ты хочаш стаць?

— Мая мама рабочая, а тата — інжынер,— адказала Ліна.— Яны хочуць, каб я вырасла і стала вучоным інжынерам. А ты кім будзеш?

— Не ведаю,— паціснуў плячыма Жэнька.— Тата кажа, што я павінен стаць кіраўніком.

— Ты станеш рабочым і будзеш працаваць у шахце! — пачуўся рэзкі выкрык.

Гэта Мікіта нечакана апынуўся перад Лінай і Жэнькам, якія стаялі, трымаючы адно аднаго за руку.

— І адыдзі ад яе! — з пагрозай дадаў Мікіта.— Яна — мая будучая жонка. Мы падыходзім паводле генаў — так сказаў мне тата, а ён працуе ў сектары Шлюбаў!

— Ідзі сам адсюль! — адчайна, але са страхам, вымавіла Ліна.— Мама казала мне, што мне прызначаць мужа, калі мы станем дарослымі.

— Маўчы і хадзі сюды,— Мікіта схапіў дзяўчынку за руку і пацягнуў да сябе.

— Адпусці яе! — Жэнька адпусціў руку Ліны, а яго кулачкі міжволі сашчаміліся.

— Хлюпік! Пайшоў вон! Яна — мая!

Што здарылася і як гэта здарылася — Жэнька і сам не зразумеў. Але ў наступны момант яго сціснуты кулак урэзаўся проста ў пульхныя вусны Мікіты.

І тут жа зазвінеў званок, другі, потым тата паслаў свой выбліск гнеўнага асуджэння, захвалявалася мама.

А Мікіта стаяў, усміхаўся крыва і яхідна, на боль нават не звяртаў увагі:

— Атрымаў два званкі? Ты яшчэ не тое атрымаеш! Я табе яшчэ пакажу...

Але Ліну ён адпусціў, і дзяўчынка са страхам і жалем глядзела на Жэньку: атрымаць два званкі, такіх гучных і працяглых за адзін дзень — гэта страшна.

— Ты ўсё зразумеў? — перад дзецьмі паўстаў Настаўнік.

— Так, Настаўнік,— адказаў Жэнька.

— Табе засталося тры званкі. Пасля іх ты будзеш выгнаны з школы. І гэта значыць, што тваё месца — шахты Далёкай Мяжы.

— Я ведаю гэта, Настаўнік...

...Тата крычаў. Вельмі злосна і доўга. Мама маўчала. Жэнька адчуваў яе жаль, страх і яшчэ нейкае дзіўнае, незразумелае, ледзь улоўнае пачуццё. Гэта было падобна да... ціхай радасці і яшчэ да нечага незразумелага, дарослага — гонар.

...Фарбы мама прынесла праз тры дні — Жэньку дазволілі дома маляваць партрэт Першага Кіраўніка. Ён спяшаўся ў той дзень дадому, не застаўся гуляць у двары школы. Толькі папрасіў Ліну, каб яна потым прыйшла да яго.

Мама і тата, вядома, адчуваюць яго хваляванне. Ну і што, хай... Ён будзе маляваць...

Жэнька ўсе гэтыя гадзіны памятаў той момант, як пад мазком пэндзля празрысты стол у класе перастаў быць празрыстым. Гэта так проста і так нечакана: фарба зрабіла празрыстае — каляровым. І не празрыстым...

Ён расставіў на сваім стале фарбы, потым прыцягнуў крэсла. І стаў маляваць. Жэнька маляваў

акно. Яго вельмі проста маляваць — трэба толькі зафарбаваць усё тое, што не акно.

І ў першую чаргу — тую сцяну, за якой яму крывіць рожы Мікіта. Тут акно будзе вельмі маленькае, каб толькі ледзь-ледзь бачыць вуліцу. Акно вялікае будзе там, дзе Ліна. А ў сцяне, што дзеліць ягоны пакой з пакоем дарослых, акна не будзе: Жэнька не хоча бачыць, як мама і тата абдымаюцца і цалуюцца ў ложку.

Скончылася сіняя фарба, ён адкаркаваў зялёную, потым памаранцавую і блакітную, жоўтую і чорную. Якой незвычайнай рабілася сцяна! Як раптам утульна стала ў ягоным пакойчыку, хай і не было ў ім дзвярэй, толькі тры сцяны, хай была празрыстая столь!

Жэнька не зразумеў, чаму не званок зазвінеў, а раптам завыла сірэна. З-за яго, ён адчуў гэта. З-за яго завыла сірэна?! Ён, Жэнька, зрабіў нешта надзвычайнае. Бо па дробязях сірэна не гучыць ніколі.

А потым перад хатай пачуўся шум — гэта пад'ехалі ахоўнікі ў сваіх шаломах. Яны ў маўклівай разгубленасці спыніліся перад іх домам і ва ўсе вочы глядзелі на амаль непразрыстыя рознакаляровыя сцены Жэнькінага пакоя. Потым з'явіліся мама, тата, з імі нейкі дзіўны чалавек з абручом на галаве. Па тым, як яго баяліся, Жэнька зразумеў, што гэта — нехта з кіраўнікоў.

Жэнька стаяў пасярод свайго пакоя з рознакаляровымі сценамі і намаляванымі вокнамі і разгублена ўсміхаўся: калі яны так здзіўлены яго адкрыццём, чаму ж яны не радуюцца? Няўжо яны не бачаць, як цудоўна будзе, калі сцены ўсіх дамоў у горадзе размаляваць у розныя колеры?

Чаму так спалохалася мама? Чаму гатовы выбухнуць ад злосці і адчаю бацька? Чаму тата крычыць,

каб ён станавіўся ў кут і глядзеў сабе пад ногі? І навошта ў дом цягнуць агідны доўгі шланг... Чаму ліецца вада? Чаму так зацята маўчыць мама, а ў іх доме гаспадараць чужыя людзі?

Вартаўнікі адмылі сцены дома, і яны ізноў зазіхацелі сваёй празрыстасцю.

— ...Навошта ты гэта зрабіў, сынок?

— Што ты лашчышся з ім! — не стаў далей стрымліваць сваю злосць бацька.— Ты падчас цяжарнасці атрымала два папярэджанні за свае сюсюканні! Табе забаранілі нараджаць другое дзіця з-за твайго залішняга мацярынскага інстынкту! Ты сапсавала яго сваёй ласкай! Ён павінен расці мужчынам, а ты!..

— Навошта ты гэта зрабіў, сынок? — усё гэтак жа далікатна, нібы не чуючы крыку бацькі, перапытала мама.

— Я хацеў тут пацалаваць Ліну,— прызнаўся Жэнька.

— Дурненькі,— з палёгкай засмяялася мама.— Але ж яе можна пацалаваць пры ўсіх. Мы ж казалі табе, што ніхто не хавае сваіх пачуццяў. Ты хочаш пацалаваць дзяўчынку? Пацалуй яе. Які сэнс хаваць дзеянні, калі ўсе мы адчуваем адзін аднаго, калі нам вядомыя пачуцці?

— Ну і хай адчуваюць... Я не хачу пры ўсіх... рабіць. Я хачу, каб толькі яна і я,— Жэнька амаль плакаў. Чаму мама не разумее яго!?

— Гэтага нельга! Ты разумееш? Нельга гэтага рабіць! — чаканячы кожнае слова, строга загаварыў бацька.— У нашым грамадстве ўсе ўсё робяць адкрыта, пры ўсіх. Бо мы — адзінае цэлае. Мы — Купал. Мы — адзіны народ. Наша грамадства — незвычайна датклівы арганізм з-за сваіх памераў. Кожнаму з нас вядома ўсё пра ўсіх: пачуцці і справы. І толькі дзякуючы гэтаму мы жывём, дзякуючы гэ-

таму выжылі. Ты з-за сваёй неразумнасці здзейсніў адно з самых страшных злачынстваў — утойванне! За гэта караюць адным: Трубой Смерці.

Мама здрыганулася.

— Не, не, што ты кажаш, ён жа зусім дзіця!

— Заўтра Кіраўнікі вынесуць сваё рашэнне! — цвёрда адказаў бацька.

Мама раптам напружылася, адказала хоць і ціха, але так цвёрда, што бацька разгублена замаўчаў:

— Я не аддам сына!

— Яго ніхто не забірае,— урэшце хмыкнуў ён.— Але тое, што яму не быць сярод кіраўнікоў — факт! Яшчэ што выкіне — і пойдзе на Далёкую Мяжу. Рабочым! У шахту!

Жэнька ведаў, што такое Далёкая Мяжа — яе відаць, калі залезці на пляскаты дах дома. Там дымяць трубы. Там здабываюць вугаль і нафту, высяцца чорныя горы. Там шмат рабочых, але сярод іх ёсць асобная група — злачынцы. Яны правініліся перад горадам, і таму там і жывуць, пазбаўленыя права заводзіць сям'ю і мець дзяцей.

## 4

Жэнька ведаў і пра Трубу Смерці. Яна вельмі далёка, але іх аднойчы вазілі туды — паказаць, бо ўсе грамадзяне Купала, нават самыя маленькія, павінныя ўсё ведаць.

Гэта было адно з тых месцаў перыметра, дзе заканчваўся Купал. Труба і была трубой — тунэль на той бок Купала. Туды, у вечную Цемру, адпраўлялі памерлых. А яшчэ — найстарэйшых жыхароў горада, калі тыя не паміралі ў час. Бо гораду няма куды расці, таму Кіраўнікам трэба строга глядзець, каб у горадзе заўсёды была роўная колькасць жыхароў. Калі хтосьці са старых не паміраў да нараджэння

чарговага дзіцяці, яго ўсё адно адпраўлялі за Купал. Гэта сурова, але так трэба.

А яшчэ ў Цемру адпраўлялі самых небяспечных злачынцаў. Гэта тых, хто займаўся ўтойваннем. Бацька казаў, што калісьці даўно такія былі. Але ўжо шмат гадоў як грамадства цалкам ачысцілася ад такой брыдоты. І вось — Жэнька вырашыў зрабіць непразрыстымі сцены свайго пакоя...

Але назаўтра Жэнька адчуў сярод сваіх пакаранняў толькі тыя два званкі за сутычку з Мікітам. Яго не пакаралі за размаляваныя сцены! Бацька быў вельмі рады, і мама была побач, толькі чамусьці старанна хавала лёгкую незразумелую трывогу.

Труба Смерці... Чаму Жэньку так цягнула да яе, ён не мог зразумець. У першы раз, калі пабачыў, нешта ўнутры яго тузанулася, быццам гэтае нешта пабачыла знаёмае, прывіталася... Ды не сама труба, празрыстая, як і ўсё пад Купалам, вабіла... Там, унізе, дзе труба заходзіла пад Купал, калыхалася чорнае полымя. Яно здавалася жывым, заварожвала сваімі павольнымі рухамі.

Яно нібыта чакала нечага згары, запрашала...

Хоць, як казалі, гэта Цемра імкнецца сюды, ды канструкцыя самой Трубы, узнятай на вышыню пад кутом, перашкаджае, не пускае.

Бацька апавядаў, што напачатку трубы не было — быў просты тунэль, і жыхарам Купала даводзілася часта мяняць заслонку — Цемра адтуль раз'ядала яе. Тады навукоўцы прыдумалі спосаб і высока ўзнялі трубу. А Цемра не можа ўздымацца ўгару. І яшчэ Цемра спрабуе прабіцца побач з Трубой — таму высока і шырока вакол Трубы, з гэтага боку Купал пакрыты спецыяльнымі панэлямі з вельмі трывалага матэрыялу. Гэтыя пліты не празрыстыя, яны чорныя... Як тая Цемра.

...У той дзень пісалі вялікую Кантрольную Работу па гісторыі Купала. Жэнька напісаў яе вельмі хутка, бо столькі ведаў! Ён надакучваў бацьку па вечарах сваімі пытаннямі. І цяпер без хвілінаў роздуму запісваў, як шмат-шмат гадоў таму Першы Кіраўнік іх народа загадаў навукоўцам будаваць Купал, бо з усіх бакоў стала набліжацца Цемра. Навукоўцы працавалі нястомна многія гады, але паспелі пабудаваць Купал і запаліць у ім Сонца. Праўда, адбылося непапраўнае: Сонца ўспыхнула з сілай, большай за разлічаную, і ўсе навукоўцы тады загінулі. І ніхто не ведае, як працуюць Купал і Сонца.

Але гэта было ўжо няважна сёння: Купал стаў непранікальны для Цемры, Сонца свяціла паводле зададзенага раскладу. І вось ужо на працягу многіх стагоддзяў Купал і Сонца ў ім падтрымліваюцца аўтаматычнай устаноўкай, якая была распрацаваная тымі навукоўцамі. Тая ўстаноўка глыбока ўнізе, пад Домам Кіравання. У той устаноўцы — бяспека і жыццё Купала...

Жэнька запісваў, ледзь паспяваў за сваімі думкамі. Хваляваўся, каб не забыцца напісаць пра нешта такое, пра што не апавядаў Настаўнік, прыгадваў бацька. Да прыкладу, пра тое, што ў першыя гады жыцця Купала Першы Кіраўнік ледзь не загінуў ад рук ворагаў, якія пад выглядам простых грамадзян выпрасілі сабе тут жыццё. Усіх ворагаў потым адлавілі, іх выявілася вельмі шмат, і выкінулі ў Цемру праз Трубу Смерці.

А яшчэ трэба напісаць пра Рэвалюцыю Свядомасці, калі жыхары Купала вырашылі жыць адкрыта і нічога не ўтойваць адзін ад аднаго. Тады сталі будаваць празрыстыя дамы і насіць празрыстае адзенне. І вельмі важна напісаць, як Галоўны намеснік Першага Кіраўніка прыдумаў эмацыйнае

поле — і цяпер ніхто не зможа крадком ад іншых задумаць нешта дрэннае...

Як можна задумаць нешта дрэннае супраць Купала, Жэнька не разумеў. Тут жа так проста і так добра жыць...

Настаўнік заўважыў, што некалькі хвілін Жэнька сядзіць без справы, узяў ягоную работу, пабачыў, што яна ўжо зробленая і... дазволіў ісці дадому! Такое правіла на Вялікай Кантрольнай.

І вуліца, і дом былі пустыя. Глядзець тэлевізар не хацелася. Тое ўзбуджэнне, якое апанавала Жэньку падчас напісання Вялікай Кантрольнай Работы, не адпускала. Яму хацелася яшчэ больш судакрануцца з гісторыяй Купала, хацелася даведацца яшчэ пра нешта. Але ў каго спытаць? Бацькі дома няма, усе кнігі, што ёсць дома, ім даўно перачытаныя па некалькі разоў. І Жэнька выйшаў з дому — пайшоў у бок пустэльні. Яго клікала найвялікшая таямніца — Труба Смерці.

Ішоў ён, можа, з гадзіны дзве. Пачалі трапляцца скалы, усё гусцей і гусцей, напачатку нястрашныя, круглыя амаль, гладкія, а потым — вышэй і вастрэй, цёмна-шэрыя, самотныя, сумныя. Жэнька памятаў падчас той экскурсіі, што скал вельмі шмат там, дзе заканчваецца Купал. Дзе Труба Смерці. Ён ведаў і тое, што блізка да Трубы падысці не зможа — яна абнесеная агароджай, яе ахоўваюць. І ахоўнікі могуць прагнаць. Але калі з-за самай блізкай скалы паназіраць... Тое жывое чорнае полымя будзе бачна.

Купал над галавой стаў імкліва зніжацца, яго белая паверхня ўжо навісала над паверхняй зямлі. Жэнька абагнуў адну скалу, другую, і раптоўна перад ім паказалася знаёмая пляцоўка. Толькі цяпер яна не была пустой, як тады, калі ён бачыў яе першы раз. Так, была ахова, была агароджа ля Трубы Смерці, была сама Труба. Але яшчэ былі некалькі

вялікіх і малых незразумелых механізмаў. Было шмат людзей, якія нешта рабілі. А галоўнае — тая сцяна, якая закрывала Купал вакол Трубы Смерці, была напалову разабранай. Людзі мітусіліся, чуліся кароткія нервовыя загады.

Жэнька неспадзявана адчуў, што стаў сведкам таго, на што яму глядзець нельга. Але прага бачыць новае перасіліла жаданне ўцячы — і ён застаўся назіраць з-за скалы за тым, як з дапамогаю механізмаў дарослыя людзі здымалі чорныя пліты, адкрываючы Купал ля Трубы Смерці. Адначасова да Купала падносіліся новыя бліскучыя пліты, ставіліся, мацаваліся. Што ж, усё зразумела — Цемра хоча ўварвацца ў іх дом, яна грызе Купал, трэба час ад часу мяняць ахоўныя пліты. Ну вось, гэта вельмі цікава ведаць і можна будзе апавесці на ўроку, зарабіць падзяку ад Настаўніка.

Дзіўна толькі, што Купал за гэтымі плітамі заставаўся такі ж белы, як і ў іншых месцах. Адно што ў адным месцы Цемра пакінула на ім сляды... Шэрыя...

Жэнька ўглядаўся ў гэтыя сляды Цемры, якія вось зараз адкрыліся, калі знялі некалькі пліт. Сляды роўна віліся акурат над Трубой, і Жэнька раптоўна зразумеў, што гэта — нейкія знакі. Як надпіс...

Ад хвалявання ягонае сэрца забілася так моцна, што ажно ён сам пачуў яго стук. Так, гэта былі знакі! Нечым так падобныя да літар... Жэнька да болю напружваў зрок, імкнучыся адшукаць у гэтых незвычайных знаках хоць нешта знаёмае... Яно было, было! Хоць і няўлоўнае, незразумелае, але і ад такога сыходзіла на Жэньку агромністае адчуванне таямніцы — велічнай і адначасна страшнай у сваёй велічы. Ён бачыў, як яшчэ большы вэрхал узняўся ля Трубы, як спяшаліся людзі ўсталёўваць

новыя шчыты-пласціны, быццам сапраўдная пагроза была не ў Трубе, не ў той Цемры, якая варочалася на яе дне і за Купалам — а ў гэтым надпісе, у гэтых сямі таямнічых знаках.

Вакол Трубы Смерці зноў паўстала чорная бліскучая сцяна. Жэнька асцярожна стаў адступаць назад, хаваючыся за скаламі. Яму неспадзявана стала страшна. Дамоў ён практычна бег — бо адчуў выразнае хваляванне маці за яго і гнеў бацькі.

Жэнька не змог схлусіць бацькам: што рабіў у школе і пасля школы. І сказаў, што хадзіў да мяжы Купала.

Гнеў бацькі быў куды мацнейшы за той, калі Жэнька размаляваў свой пакой. Бацька крычаў доўга, і маці маўчала, не заступалася — Жэнька парушыў забарону — за горад нельга выходзіць без дазволу нават дарослым. Ён ведаў гэта? Ведаў. Але пайшоў...

— Мама, а што такога страшнага ў тым, што я пайшоў адзін за горад? — ціха запытаўся Жэнька, калі маці ўкладвала яго спаць.

— Не ведаю, сыночак,— з жалем адказала маці.— Пад Купалам шмат законаў, якія трэба проста выконваць. Без тлумачэнняў. І запомні, сынок: няма законаў нязначных. Усе правілы надзвычай важныя. І для дзяцей, і для дарослых...

Жэнька не стаў пытацца ў маці пра знакі — яна не будзе ведаць. А ў бацькі пытацца было страшна, бо нешта падказвала Жэньку, што пабачыць без дазволу тыя літары куды страшней, чым выйсці без дазволу за горад. Ён засынаў і трымаў іх перад сабой у памяці: каб толькі не забыцца, каб толькі дакладна, да кожнай рысачкі запомніць...

# 5

— Настаўнік, я хацеў вас спытаць...

— Яўген, няўжо школьная праграма, якую вы сёння закончылі, не дала табе адказаў на ўсе пытанні? Зрэшты, у лепшага вучня школы пытанні мусяць быць заўсёды.— Настаўнік прысеў, жэстам запрашаючы Яўгена прысесці побач.— Пытайся...

— Калі скончыліся экспедыцыі ў Цемру? І чаму спынілі даследаванні Цемры?

— Тады, калі зразумелі, што з Цемры нельга вярнуцца. Мой хлопчык, павер, да цябе шмат хто спрабаваў знайсці спосаб павелічэння нашай жыццёвай прасторы. Але яго няма. Нам няма куды ісці.

— А шахты?

— Без святла нашага Сонца мы гінем вельмі хутка. Жанчыны губляюць магчымасць рэпрадукцыі. Шахты даюць нам вугаль і нафту — усё, што нам трэба для жыцця...

Яўген задумаўся, потым ціха спытаў:

— Я ні ў каго не пытаў... Няўжо так можа быць, што ўсіх жывых істот — толькі мы, людзі і мікраарганізмы? За тыя сотні гадоў пасля наступу Цемры нашыя навукоўцы вывелі сотні гатункаў салатнай расліны. Калі такі разнастайны свет раслінны, не можа быць свет жывых такім бедным...

— Хлопчык мой, сумневы — адзін з найцяжкіх грахоў, ты гэта ведаеш,— з сумнай усмешкай адказаў Настаўнік.— Наш свет трымаецца яшчэ і таму, што ў ім ёсць Вера — Вера ў правільнасць Шляху.

— Я ведаю, Настаўнік... Але... Глядзіце яшчэ, я нікому ніколі не паказваў іх...— Яўген дастаў аркуш паперы і хутка стаў пісаць тыя незразумелыя знакі, што пабачыў малым на Купале: 

І раптам Настаўнік, які з лёгкай паблажлівай усмешкай напачатку сачыў за рукой Яўгена, імкліва

схапіў, скамячыў аркушык, пачаў ірваць на дробныя шматкі.

Яўген перапалохаўся. Не за сябе — за Настаўніка. Бо ягоны твар стаў шэрым, бы Купал бліжэй да вечара, і Яўген адчуў хвалю сапраўднага страху.

— Ты ж у сне бачыў гэтыя знакі, праўда? — дрыжачым голасам, але лагодна-настойліва, чакаючы менавіта дадатнага адказу, спытаў урэшце Настаўнік.

— Так, Настаўнік, я сніў гэтыя знакі на сцяне Купала. Акурат ля Трубы Смерці, над ёй. Яны нібыта падпісвалі яе. І гэтыя знакі былі закрытымі ад нас. Схаванымі. І яны як быццам былі напісаныя... на тым баку Купала...

Настаўнік уздрыгнуў яшчэ раз. У адзін момант ён згубіў усю сваю строгасць і выгляд сапраўднага Настаўніка, стаў проста амаль што старым мужчынам. Ён маўчаў колькі хвілін, але не прасіў, каб Яўген пайшоў — і хлопец чакаў.

— Некалі даўно-даўно ў нас была іншая мова. На той мове размаўлялі яшчэ задоўга да Цемры. Праўда, яе імкліва пачалі забываць, бо лічылі непатрэбнай — ставала другой мовы, якая здавалася ўсім зручнай і сучаснай. На старой мове адно запісвалі розныя гісторыі... Вясёлыя гісторыі... Разумныя гісторыі... Добрыя... Калі наступіла Цемра, сярод нас былі яшчэ тыя, хто ведаў гэтую мову. Але тут, пад Купалам, яна стала наагул непатрэбнай. І нават шкоднай. Бо нам было не да гісторый — мы прызвычайваліся жыць пад Купалам, мы сталі жыць паводле новых правілаў. Мы павінныя былі забыцца на гісторыі. І забыліся. І на мову забыліся — навошта яна? Гэтыя знакі, што ты прысніў — літары з тае мовы. Але я не ведаю, што там напісана. Скажу больш — ніхто не ведае. Некалі я палову жыцця патраціў на тое, каб адшукаць хоць які дакумент... Я быў навукоўцам...

— І ніхто не скажа, што азначаюць гэтыя сем літар? — з недаверам і горыччу спытаў Яўген.

— Ніхто,— непахісна адказаў Настаўнік, матлянуў галавой, нібы страсаючы з яе фізічна прылепленыя думкі, і стаў ранейшым Настаўнікам — строгім і сухаватым: — Скажы лепш, ты абраў сабе шлях? Заўтра — дзень Прысвячэння. Вы станеце грамадзянамі Купала. Табе, як аднаму з лепшых, даецца права выбару. Чаму ты хочаш сябе прысвяціць?

Яўген паціснуў плячыма, потым абыякава адказаў:

— Мне прапанавалі некалькі шляхоў. Стварэнне адзінага разумовага поля — яно разам з эмацыйным полем зробіць Купал адзінай суцэльнай супольнасцю... Бацька настойвае на кар'еры кіраўніка. А мне... мне хочацца даследаваць Цемру.

— Пакінь Цемру ў супакоі,— амаль загадаў Настаўнік.— Сказана: за Купалам жыцця няма...

— Сказана ці няма? — ціха-ціха спытаў Яўген.

Настаўнік нічога не адказаў...

— Грамадзяне Купала! Сёння мы прымаем у свае шэрагі новае пакаленне. Гэтае пакаленне, выгадаванае і выхаванае на аснове Вучэння Вялікіх Бацькоў Купала, стане заўтра нашай апорай, нашай сілай, нашым гонарам...

Прамова была доўгай. Яўгену было сумна, яго пакідала безуважным гэтая падзея Прысвячэння. Званок у яго галаве настойліва патрабаваў хвалявацца і цешыцца, але радасць не прыходзіла.

Потым была працэдура Выбару. Яўген абраў шлях навукоўца, распрацоўшчыка адзінага разумовага поля. Абраў у апошнюю хвіліну, падпарадкаваўся нейкаму няўцямнаму, неакрэсленаму дакладна жаданню.

Потым... Потым здарылася тое, што мусіла здарыцца. І цуду не адбылося, і памылкі не было —

потым называлі будучых мужоў і жонак, пары, складзеныя Кіраваннем Шлюбаў. І тая пагроза, якая жыла з дзяцінства, раптам адкрылася жахлівай пустэчай страты: Ліна павінна была стаць жонкай Мікіты. А яму... Яму ў жонкі прыпісвалі нейкую дзяўчыну. Невядомую.

Эмоцыі, якія ўспыхнулі пасля агучвання гэтага спісу, былі мацней за эмоцыі пасля Выбару. Сярод гэтай бурапеннай ракі Яўген адчуў боль Ліны і злараднасць Мікіты.

Мікіту выпаў шлях ахоўніка — і ён цешыўся гэтаму не менш, чым абвешчанаму цяпер спісу жонак і мужоў.

Праз тры гады яны стануць мужам і жонкай. А цяпер абвешчаны спіс забараняе ўсім іншым, апрача абранага будучага мужа, жадаць чужых нявест.

Для супакаення юначага цела існуюць асобныя жанчыны — тыя, каму не дазволена нараджаць з-за іх недасканалага геннага кода. Такія часам нараджаюцца. Іх адпраўляюць у Дом Выканання мужчынскіх Жаданняў.

Потым быў рытуал апранання абручоў на левую руку. І ў першае імгненне Яўгену здалося, што ягоны мозг не вытрымае той хвалі эмоцый, якая абрынулася на яго. Ён стаў адчуваць усіх жыхароў Купала — у гэтым хаосе імгнення страціліся і мама, і Ліна. І толькі Мікіта... Мікіта адшукаў яго адразу і паслаў яхідную насмешку.

Так, Мікіту нездарма адпраўляюць у ахоўнікі — ён лепш за ўсіх у іх класе арыентаваўся ў эмацыйным полі.

Пасля святочнага абеду ў Страўнях былі канцэрт і гульні на Галоўным пляцы, потым усім быў абвешчаны вольны час — цэлых тры гадзіны да пацямнення Сонца.

## 6

— Пойдзем, сынок,— паклікала маці Яўгена за сабой, павяла ўздоўж вуліцы з празрыстымі скрынкамі дамоў кудысьці ад цэнтра горада.

— Куды мы ідзем? — Яўген разгублена азіраўся.

Здавалася, увесь горад цяпер выходзіў вуліцамі за межы горада. Маці ішлі з сынамі, дочкі — з бацькамі.

— Сёння — Дзень Прысвячэння,— незразумела нагадала маці.

— Я ведаю... Але няўжо не ўсё прайшло?

— Не, не ўсё. Сёння маці з сынамі, а дочкам з бацькамі дазволена пакінуць горад да змяркання. Маці павінныя апавесці, навучыць сыноў быць мужчынамі. А бацькі — дачок...

— Я не пайду з табой,— спыніўся аглушаны Яўген.— Я не пайду.

— Пойдзем, сынок... — ласкава ўсміхнулася маці.— Пойдзем. Я абяцаю табе... Я абяцаю табе, што ўсё будзе не так...

— Мама!..

— Я цябе вельмі прашу, сынок...

Маці ўзяла Яўгена за руку, і ён пайшоў, даверыўся яе пачуццю — яе перапаўняла ў гэты момант незвычайнае хваляванне.

Яны адыходзілі ўжо ад ускраін горада. Шматлікія пары бацькоў і дзяцей вахлікам разыходзіліся з адной вуліцы далей і далей ад горада і адзін ад аднаго.

Ішлі цвёрдай жаўтлява-шэрай паверхняй. Яўген ведаў, што глеба пад іх нагамі стала такой на многія кіламетры ўглыб пры будаўніцтве Купала. Пакрысе на аднастайнай раўніне сталі трапляцца невысокія скалы. Маці вяла яго ўпэўнена, быццам яе клікала нейкая нябачная кропка.

Удалечыні нешта зачарнела на жоўтым, дзве плямы. Яны падышлі да гэтых плям, і Яўген пабачыў,

што гэта — дзве аплаўленыя часткі скал, якія крышку ўзвышаліся над агульнай паверхняй.

Спыніліся. Яўген агледзеўся — горад ляжаў унізе, проста перад імі, чатырма велізарнымі зіхоткімі квадратамі. Чорны будынак Кіравання вырастаў з цэнтра і чатырма шчупальцамі шырокіх галоўных вуліц усмоктваўся ў горад. За спінай Яўгена, у некалькіх гадзінах хады Купал плаўна апускаўся ўніз, зліваўся з шэрай зямлёй. Дзесьці там стаіць Труба Смерці...

— Цяпер, сынок, я апавяду табе тое, што апавядала мне мая мама, а ёй — яе бацька, яму — яго мама, і яшчэ раней бацькі перадавалі сваім дзецям,— ціха загаварыла маці.— Не пытай мяне ні пра што, за даўнасцю часу многія словы страцілі для мяне сэнс і значэнне. Я толькі выконваю волю маці, волю нашых продкаў. Стань на гэты камень — і я стану на другі...

Маці падышла і стала на цёмную пляму. Яўген раптам адчуў, што ў маці зніклі эмоцыі. Не, яна, вядома, адчувала нешта сама, але ён не адчуваў яе.

У поўнай разгубленасці ён сам стаў на гладкую цёмную паверхню — і раптам нібы аглух.

Усе пачуцці зніклі. Не, не ягоныя пачуцці — зніклі чужыя пачуцці. Імгненне назад ён адчуваў увесь горад, бацькоў, настаўнікаў, Мікіту, Ліну — і ўсё раптам знікла, толькі яго ўласнае здзіўленне і незвычайнае, усё нарастальнае захапленне запоўнілі сабой яго свядомасць. Дык вось як гэта — калі ў табе жыве толькі тваё...

— Што гэта, мама? — шэптам запытаўся Яўген.

— Гэтыя камяні... экрануюць эмацыйнае поле,— з цеплынёй гледзячы ў вочы сыну, адказала маці.— Можа быць, недзе яшчэ ёсць такія месцы, але ў памяці нашых продкаў засталося толькі гэта. Нам нельга тут доўга быць... Паслухай тое, што я мушу

табе перадаць. Але перш пакляніся, што ты перадасі гэта свайму сыну ці дачцэ... І нікому больш, нікому!

— Клянуся, мама,— ледзь утаймоўваючы нечаканую дрыготку, адказаў Яўген.

Маці лёгка прысела на камень, падабраўшы пад сябе ногі.

— Сядай і ты... Слухай, сынок,— ласкава запрасіла яна, пачакала, пакуль сын сядзе і зусім нечакана для Яўгена заспявала:

Дзе неба найсіней,
Пад ім злат-горад ёсць
З празрыстай вострай брамаю
І зорнай яскрынёй.
А ў горадзе тым сад.
Там красак не злічыць.
Звяры там ходзяць гожыя,
Што нельга і ўявіць.
Адзін — агністы жаўтагрывы леў,
Другі — бушлівы шматвачысты вол.
А яшчэ арол там — дзіва-птушка,
Златакрылая і яснавокая.
Дзе неба найсіней,
Там зорка ёсць адна.
Яна з табой, анёле мой,
З табой заўжды яна.
Хто любіць, той і люб.
Хто светлы, той і свят.
І ты за гэтай зоркаю
Ў дзівосны крочыш сад.
Цябе сустрэнуць жаўтагрывы леў,
Бушлівы сіні шматвачысты вол.
А яшчэ арол там — дзіва-птушка,
Златакрылая і яснавокая.[1]

---

[1] Верш Анры Валахонскага, пераклад з рускай мовы Сяргея Балахонава.

Маці замоўкла.

Яўгена душыла знутры.

— Што гэта, мама? Гэта было? Такім быў наш Купал? Ці гэта ёсць, мама? Скажы?

— Сынок, сыходзь з каменя...

Маці сама сышла з цёмнай каменнай плашчыні, узяла нерухомага Яўгена за руку і вымусіла яго ступіць крок і другі.

Чужыя пачуцці ізноў уварваліся ў ягоны мозг, але яны цяпер нікольні не турбавалі Яўгена.

— Мама, але цяпер... Я не ведаю, што са мной. Я баюся... Адчуюць іншыя.

— Не бойся, сынок. Калі ты сапраўды будзеш фізічна першы раз з жанчынай, у цябе ў душы будзе вельмі падобнае: нечаканая радасць адкрыцця, замілаванне і шчасце, вера і смага...

— Ты не адказала, мама,— з надзеяй перапытаў Яўген.— Гэты горад — быў Купалам, ці ён — ёсць?

— Не ведаю, сынок... — маці са светлым смуткам зірнула яму ў вочы.— Але калі б ён быў — мабыць, тады трэба было б спяваць «пад ім злат-горад быў»?

Некаторы час яны ішлі моўчкі. Яўген пра сябе паўтараў радкі песні, якая адным пякучым зігзагам легла на ягоную памяць.

— Леў, вол, арол... Гэта не людзі, але гэта жывыя істоты, так? — разважаў ён напаўголаса.

— Так, сынок. Гэта жывёлы. Арол — гэта птушка. Праўда, я не ведаю, што значыць — птушка. Адно — яна мае крылы, і быццам бы з іх дапамогай можа лётаць. І не ведаю, як выглядалі вол і леў. Сад — гэта такое зялёнае, там расце шмат розных раслін. Краскі... я не ведаю, што гэта. Але гэта — вельмі прыгожае. Я ведаю, што такое неба. Неба — гэта калі няма Купала,— сказала маці.

— Яшчэ, мама... — Яўген запнуўся, потым упэўнена працягнуў: — Калі ты апавяла мне, а сёння

за горад выйшла столькі шмат пар — можа быць, хтосьці з маці або бацькоў таксама апавёў сваім дзецям... пра нешта?

— Ты неўзабаве можаш даведацца гэта,— спахмурнела, з нечаканай горыччу адказала маці.— Бо ты здольны, я заўсёды верыла ў цябе. І калі ты будзеш працаваць над стварэннем разумовага поля — неўзабаве Купал будзе ведаць думкі кожнага...

Яўген спыніўся.

Да гэтага часу яны ўжо наблізіліся да горада, разам з іншымі парамі і горад заглынаў гэты рэдкі раўчук людзей, якія вярталіся з пустэльні.

— Ведаеш, мама... Я абраў у самы апошні момант. І тады я не разумеў, чаму абраў. Мне нібы падказаў хтосьці. Але зараз... Зараз я зразумеў. Калі Купал непранікальны для нас, для людзей, для прадметаў — раптам праз яго можна прайсці думкай? — горача скончыў ён.

Маці ўсміхнулася светла.

— Толькі асцярожна, сынок...

## 7

— Інжынер Яўген, дайце справаздачу Радзе пра ход работ. Да нас дайшлі чуткі, што вы пэўным чынам стрымліваеце поўнамаштабнае ўкараненне разумовага поля. Мы чакаем тлумачэнняў.

Яўген падняўся, зірнуў у вочы Старшыні і не змог вытрымаць яго цяжкі, пранікальны ў самы мозг, позірк. Апусціў вочы ў дакументы, хоць кожную лічбу з іх ведаў на памяць.

— Прашу паважаную Раду выслухаць справаздачу пра апошні тыдзень доследаў. Агулам, у эксперыменце ўдзельнічала 10 злачынцаў. Трое з іх загінулі ад празмернай напругі ў галаўным мозгу. Прапанаваны варыянт галаўнога абруча мае вялікую вагу, не

эстэтычны і найгалоўнейшае, спажывае гэтулькі энергіі, колькі 100 наручных бранзалетаў. Прыймальна-перадавальная станцыя таксама значна больш энергаёмістая, чым задумлялася напачатку. Сама схема працаздольная. Канкрэтна па лічбах...

— І што вы прапаноўваеце? Чакаць, калі насельніцтва выйдзе з-пад кантролю, пакуль вы прыдумаеце прыгожы абруч? — з'едліва перапыніў яго адзін з удзельнікаў Рады, хударлявы, з вялікай лысінай і густымі вусамі.

— Мы мяркуем, што запускаць станцыю ў такім выглядзе нельга, пакуль не выключаныя смяротныя выпадкі і энергаспажыванне перакрывае зададзенае на 500 адсоткаў...

— А вас ніхто не ўпаўнаважваў меркаваць і прымаць рашэнні,— свідруючы вачыма Яўгена, сказаў Старшыня.— Смерці надыходзілі ўварыянце абмену?

— Так, Старшыня.

— Значыцца, вылучыць абмен, пакінуць толькі перадачу думак. На прыём працуе толькі цэнтральная станцыя. А фільтраваць сігналы мы зможам... Далей... Няма эстэтыкі ў абручах... У рабочых кварталах эстэтыка не асабліва патрэбна. Будзьце гатовыя праз дзесяць дзён запусціць на поўны прыём станцыю ў зоне Далёкай Мяжы. Праз 20 дзён — у зоне рабочага квартала. Сектару ідэалогіі патлумачыць рабочым і ўсяму насельніцтву Купала важнасць... э-э-э... эксперыменту. Так, гэта будзе эксперыментам. Патлумачыць, што пакуль станцыя працуе толькі на прыём. Але... Паабяцайце, што кожны можа атрымаць па асобным запыце запіс думак чалавека, які яго цікавіць. Любога. Як і ў бранзалетах, прадугледзець немагчымасць здымання галаўнога абруча. Усё, працуйце.

Яўген прыйшоў у свой аддзел, сабраў работнікаў і абвясціў пра рашэнне Рады.

— Мы не паспяваем у зададзеныя тэрміны, таму прашу ўсіх выйсці на працу ў выхадны дзень.

— Выхадны прысвечаны пакаранню смерцю, няўжо ты не чуў? — спытаў безуважна найстарэйшы ў аддзеле інжынер Анатоль.

— Не... Я не ўслухоўваюся ў перадачы тэленавін.

— Дрэнна...

— Спадзяюся, гэта не злачынства супраць Купала? — сумна ўсміхнуўся Яўген.— Я працую па вечарах. А што за пакаранне смерцю?

— У, такіх не было дзесяць гадоў! Злачынства супраць Купала. І — вылет у Трубу,— гэтаксама без эмоцый стаў апавядаць Анатоль.— Нейкі службовец звар'яцеў. Пакінуў працу, схапіў чужую жонку і ўцёк з ёй у пустэльню, дзе яны сталі савакупляцца ў засені скал.

— Савакупляцца... А можа, яны кахалі адно аднаго?

Анатоль змяніўся тварам — упершыню на ім адбіліся нейкія эмоцыі. Яўген адчуў сумесь гаркаты і болю.

— Што вы ведаеце пра каханне, малады чалавек?.. Дарэчы, на пакаранні смерцю трэба прысутнічаць усім.

— Я гэта ведаю... Добра, тады частку работы трэба будзе браць з сабой дадому. У першую чаргу трэба давесці фільтр сінфазнасці і блок здушэння эмацыйных перашкод...

На пакаранне смерцю да Трубы Смерці было дастаўлена ўсё дарослае насельніцтва горада. Труба ўзвышалася над паверхняй на вышыню каля сямі метраў і сыходзіла ўніз, пад самы Купал пад невялікім кутом. Яна была празрыстая, і было відаць, як у ніжняй частцы яе варушылася густая чарната.

На верхняй частцы Трубы была невялікая пляцоўка — каб стаць двум чалавекам: злачынцу і Выканаўцу прысуду.

Прывезлі асуджанага. Ён быў нікчэмны і бездапаможны.

— У той жанчыны адабралі дзяцей, а саму змясцілі ў Дом Выканання Жаданняў,— каментаваў падзеі Анатоль.— З яе мужам з гэтага часу будзе жыць жонка асуджанага. Нішто не павінна знікаць дарма...

Яўген пільна зірнуў на Анатоля — твар яго заставаўся безуважным. І пачуццяў — ніякіх. Так, лёгкая цікавасць...

Злачынцу паднялі ў клетцы на верх трубы. Хтосьці нябачны стаў чытаць прысуд, і голас яго, узмоцнены, паляцеў, здавалася, да вяршыні Купала:

— ...Таму, што сказана нашым Бацькам, Першым Кіраўніком Купала, і свята паважаецца намі няўхільны Закон: «Не чапай жонкі чужой!» Гэта адна з дзесяці нашых запаведзяў, запаведзяў самога Купала, і парушэнне іх — злачынства супраць Купала і яго народа...

Прысуд чытаўся доўга.

Потым выступалі суседзі злачынцы, вінавацячы і ганячы яго. Гэтыя суседзі і былыя сябры з жахам раптам усвядомілі, што жылі побач з такім здраднікам іх агульнай справы і прасілі ўсіх быць паблажлівымі да іх саміх і не судзіць строга за тое, што своечасова не ўгледзелі, не папярэдзілі Кіраўнікоў...

Потым злачынцу дазволілі сказаць слова. Мужчына выпрастаўся ў клетцы, наколькі мог і стаў крычаць у натоўп пад ім, што ён — страшны злачынец, але ён усё ўсвядоміў і нечуванае па дзёрзкасці злачынства гатовы загладзіць самааддданай працай на Далёкай Мяжы...

Устаў суддзя і ўзмахам рукі аддаў загад.

Выканўца прысуду дастаў аднекуль з-пад свайго шырокага плашча невялікі шпрыц і хутка зрабіў упырск у руку мужчыне, якая была прышпіленая кайданкамі да клеткі. Асуджаны, дзіка азірнуўшыся на боль ад упырску, раптам пачаў ашалела трэсці краты з празрыстага пластыка, кідацца па клетцы і ўрэшце закрычаў адчайна:

— Гэта нячэсна! Мне абяцалі! Вы абяцалі, што памілуеце! Вы абяцалі жыццё за мае словы! Я невінаваты! Гэта ўсё яна... Гэта яна... Яна вінаватая! Яна звяла мяне! Яна ведзьма! Вы яе павінны выкінуць у Цемру! А-а-а! Будзьце вы праклятыя! Здраднікі! Ілгуны! А-а-а!

Атрута падзейнічала — яго голас раптоўна аслабеў, мужчына апусціўся на калені і ўпаў бы, каб не прыкутая да рэбраў клеткі рука.

Суддзя марудна махнуў рукой яшчэ раз — і клетка панеслася ўніз, няроўныя языкі чарнаты ірвануліся, як жывыя, ёй насустрач. Мужчына нечакана зноў закрычаў уголас, крычаў так страшна і так моцна, крычаў яшчэ і тады, калі, прагна з'яднаўшыся над клеткай, цемра паглынула яе...

— Яго б можна было і памілаваць,— глуха вымавіў Яўген, калі яны з Анатолем адышлі са сваімі напоямі ад усталяваных проста ля Трубы сталоў — адзначаўся Дзень пакарання смерцю.

— Вы, малады чалавек, вучыцеся ўспрымаць усё спакайней,— не гледзячы на яго адказаў Анатоль.— Адкрыю вам маленькі сакрэт: эмоцыі вельмі хутка супакойваюцца тады, калі вы пераканаеце сябе ў тым, што нічога змяніць нельга.

— Няўжо я хачу нешта змяніць?

— Я не кажу вам перастаць жадаць ці пачаць. Я кажу вам, дарэчы, шчыра кажу, паколькі вы залішне эмацыйны для свайго веку, пасады і

становішча, што калі вы прызвычаіце сябе да думкі, што гэты свет — непарушны пад стагоддзямі і тысячагоддзямі, вы станеце спакайней.

— Каму перашкаджае маё хваляванне?

— Вам. Не забывайце, вы сёння датычны да Кіравання — а там памылак не даруюць,— спакойна скончыў Анатоль.

— Вы збіраліся мне нешта сказаць пра маю рэпліку ў адносінах да памілавання,— заўважыў Яўген.

— Вось, у вас атрымалася куды лепш,— усміхнуўся Анатоль.— Я амаль нічога не адчуў. А наконт пакарання смерцю... нашаму грамадству нельга без пакарання смерцю. Гэтак сама, як і без нараджэнняў. Згодны, мой сябар?

**8**

...Яўген і Ліна сустрэліся на мяжы сваіх дамоў у звычайны час — калі прыцемкі Купала былі максімальнымі.

— Праз дваццаць дзён у зоне рабочага квартала пачне працаваць разумовае поле,— сумна загаварыў Яўген.

— Я чула пра гэта... Шмат кажуць пра тое, што поле зробіць нас яшчэ больш згуртаванымі...— адказала Ліна.

— Яшчэ больш голымі... Зусім голымі...

— Ты такі смешны,— усміхнулася Ліна.— Ты ніяк не можаш жыць так, як ёсць? Як можна тут жыць інакш? Хаваць сябе і сваё цела? Навошта?

— Не тое... ты не пра тое кажаш.

— А пра што ты? — пасур'ёзнела дзяўчына.

— Пра тое, што... Я думаю, проста ўпэўнены, што многія сем'і маюць свае таямніцы, свае паданні, якія перадаюць ад бацькоў дзецям. І гэтыя

паданні, думаю, часам разыходзяцца з тым, што мы даведваліся ад Настаўнікаў. Гэтыя паданні... могуць зрабіць шкоду тым, хто іх захоўвае. Упэўнены, такіх гісторый больш менавіта сярод рабочых...

— Пра якія паданні ты кажаш? — узрушана запытала Ліна.

— Адкуль жа мне ведаць... Так, мімаходзь пачуў ад аднаго... старога рабочага пра нейкі... горад залаты.

Ліна прыглушана ўскрыкнула, прычыніла рот далонню. Яўген разгублена глядзеў на яе і раптам, сам таго не чакаючы, ціха-ціха, аднымі вуснамі заспяваў:

— Дзе неба найсіней,
Пад ім злат-горад ёсць...

Ліна адгукнулася як ледзь чутнае рэха:

З празрыстай вострай брамаю
І зорнай яскрынёй...

І заплакала, ступіла насустрач Яўгену, адчайна парушыўшы непарушную раней мяжу паміж імі — нельга ёй быць на тэрыторыі яго дома, бо яны — не жаніх і нявеста.

Яўген прыціснуў Ліну да сябе, а яна рыдала, глуха, скаланаючыся ўсім сваім тонкім гарачым целам.

— Зараз гэты віж, ён дзяжурыць, прымчыць...

— Не прымчыць, ён абвык да майго плачу,— адказала Ліна, выцерла вочы.— Я часта плачу. Праз паўгода — Дзень Вяселляў для нас.

— Я памятаю.

— І ты яшчэ прыдумаў такое поле, якое нават у думках не дасць мне цябе кахаць,— лёгка ўпікнула Ліна юнака.

— Я думаў пра зусім іншае... — стаў апраўдвацца Яўген.— Употай... мы распрацоўваем другі прыбор. Ён павінен канцэнтраваць думкі многіх людзей і перадаваць іх... за Купал.

— Навошта? — хутка спытала дзяўчына і, імгненна зразумеўшы ўсё, яшчэ мацней прыціснулася да яго.— Я веру... Я паверыла бацьку...

— І я паверыў маці... — прызнаўся Яўген.

Яны маўчалі — але маўчалі пра адно.

— Значыцца, там... тады і цябе, і мяне вучылі зусім не таму, для чаго ўсіх адпраўлялі за горад? — з незразумелым падтэкстам, ніякавеючы, спытала дзяўчына.

— Так, значыцца,— усміхнуўся Яўген.— Я б і не пайшоў, калі б мама адразу не сказала... Думаю, не толькі нас вучылі зусім іншаму. Чаму ты пра гэта пытаеш?

— Бо... Я хачу... стаць жанчынай з табой.

— Гэта злачынства... — прагаварыў Яўген і засаромеўся сваёй баязлівасці.— Я таксама вельмі гэтага хачу...

Ліна нячутна праслізнула ў пакой Яўгена.

Яны кахалі адно аднаго горача і няўмела, саромеючыся свайго няўмення і асцярожна смеючыся з яго, замiраючы ад пачуцця ўсёпаглынальнай пяшчоты адно да аднаго, якое апальвала іх...

Яўген успомніў у той момант словы маці — у яго душы жыло шчымлівае шчасце і радасць судакранання з самым патаемным. І гучала мелодыя песні.

...Нарад вартаўнікоў з'явіўся ля дома тады, калі Ліна ўжо была на сваёй тэрыторыі. Нянавісць Мікіты булькатала ў галаве Яўгена, яна адчувалася амаль фізічна.

— Ты яшчэ паплачаш! — выцiснуў Мікіта скрозь зубы, не знаходзячы больш слоў.— Табе пашанцавала, што мы прыбіралі адну сямейку ў рабочай зоне.

Яўген толькі ўсміхаўся ў адказ — пачуццё трапяткога шчасця перапаўняла яго і не давала прабрасціся ў свядомасць ні нянавісці, ні пагрозам.

## 9

...Проста на прахадной Яўгена спынілі і запатрабавалі неадкладна з'явіцца да кіраўніка праекта. Яўген злёгку здзівіўся — калі гэты гнюс, Мікіта, напісаў на яго данос, чаму разбіраць павінен кіраўнік праекта, а не Кіраванне маралі? Ды і даносы на побытавыя тэмы даўно патрабуюць фактаў...

Кіраўнік праекта рэзкім жэстам запрасіў яго бліжэй да стала, дзе стаяў іх другі прыбор — той самы канцэнтратар думак, пра які ён казаў Ліне.

— Што гэта? — рэзка спытаў кіраўнік.

— Альтэрнатыўны прыбор перадачы думкі на адлегласць,— спакойна адказаў Яўген.— Мы вялі распрацоўку адразу ў двух кірунках...

— Што за кірунак? Чаму я пра гэта не ведаю? — голас кіраўніка рабіўся ўсё больш пагрозлівым.

— Гэта — канцэнтратар разумовых палёў,— імкнучыся трымацца спакойным, стаў тлумачыць Яўген.— Саму думку нельга ўзмацніць да некаторай крытычнай велічыні. Але думкі сотні, тысячы людзей можна сінхранізаваць і перадаць накіравана.

— Куды перадаць? — прагучала хуткае пытанне.

— За Купал.

— За Купал? Хто... Даваў... Табе... Паўнамоцтвы?! — не пракрычаў, люта вышыпеў Кіраўнік.

— Але гораду даўно трэба жыццёвая прастора! Мы павінны нейкім чынам пазнаць — што ёсць за Купалам, ёсць там яшчэ жыццё ці...

— Маўчаць! Шчанюк! Табе было дадзена заданне! Ты расходаваў матэрыялы, неверагодна дарагія матэрыялы, якія здабываюцца намі па граму ў год, на стварэнне таго, каб разбурыць Купал!

— Пры чым тут разбурэнне... Вы мяне няправільна зразумелі...

— Маўчаць! Неадкладна ў аддзел! Працаваць 24 гадзіны ў суткі! Паскорыць усё! Не адна, а ўсе чатыры

станцыі павінны быць гатовыя, і не праз 20, а праз 10 дзён!

Яўген пайшоў у аддзел.

Тут ужо ўсе аб усім ведалі — гэта адчувалася па засяроджанай працы і хвалі шкадавання.

Падчас кароткага абедзеннага перапынку Яўген адышоў з Анатолем убок ад усіх.

— Я вось задумаўся ў вольны час, чаму Трубу Смерці так дбайна ахоўваюць? — нібыта пра нейкую дробязь спытаў Яўген.— Што Вы на гэта скажаце?

— Скажу, што ў вас вельмі шмат вольнага часу,— суха адказаў Анатоль.

— Можа, і так... І вось яшчэ пра што падумаў: запусцім мы станцыю, і што будзе з залатым горадам, калі...

Ён не паспеў дагаварыць, агаломшаны тым, як сказіўся твар старога інжынера, і якая хваля страху лінула ад яго.

— Маўчыце! Прашу вас!

Мінула імгненне — і ён ізноў стаў абыякавым і спакойным. Памаўчаў, мабыць, збіраючыся з думкамі. Урэшце загаварыў.

— Я доўга думаў пра гэта. Шукаў дакументы аб даследчых экспедыцыях у Цемру. Так, ні адна з іх не вярнулася. Ваш канцэнтратар — гэта была апошняя надзея. Я меў рацыю... Нішто не можа быць зменена...

— Экспедыцыі не вярталіся... Але хто сказаў, што яны — гінулі? Я не веру,— суха адказаў Яўген.

— У што вы не верыце?

— Што экспедыцыі былі...

— Вось як? Вы разумееце, што вы зараз сказалі? — Анатоль не змог і цяпер схаваць свайго хвалявання.

— Разумею... Дарэчы, сачыце за маім пальцам...— Яўген павольна выводзіў на роўнай паверхні сцяны

тыя самыя незразумелыя літары невядомай мовы, якія памяць дбайна захоўвала ўсе гады.

— Дзе... Дзе вы іх бачылі?

— У сне,— усміхнуўся Яўген.— Так сказаў мой Настаўнік.

— Ваш настаўнік... Мы сябравалі,— сцішана загаварыў Анатоль.— Яго пераявілі ў Настаўнікі... калі ён занадта шмат часу стаў аддаваць пошукам.

— Але ж ён нешта знайшоў? — Яўген імкліва павярнуўся тварам у твар да Анатоля.— Ён прасіў мяне паверыць, толькі я не паверыў. Я бачыў па яго твары — ён ведае сэнс гэтых літараў!

— Гэта... паданне. Іх сямейнае паданне. Прабачце, яго я вам апавесці не магу. Я вам тут наказаў шмат лішняга... для сябе... Але мне мала засталося. Праз чатыры месяцы народзіцца тое жыццё, якое стане маім канцом...

— Так нельга! Нельга! — закрычаў Яўген, і на іх сталі азірацца.

— А як — можна? — безнадзейна запытаў Анатоль.

Яўген не адказаў, пайшоў у аддзел.

**10**

Ніхто не адарваўся ад сваіх спраў, калі празвінеў званок, што абвясціў канец рабочага часу. У аддзеле ўсе працавалі. І толькі Яўген рашуча падняўся з-за свайго стала, адсунуўшы ўбок прыборы.

— Да сустрэчы, сябры,— незразумела сказаў ён і выйшаў.

Яго праводзілі агаломшанымі позіркамі.

Відавочна, навіна пра незразумелыя паводзіны Яўгена распаўсюдзілася вельмі хутка — ён адчуваў, як вакол яго ўзрастае пачуццё здзіўлення і страху. А потым адчуў насцярожанасць ахоўнікаў, калі звярнуў на пляц, да будынка Кіравання. Яго спынілі.

Яўген моўчкі, амаль урачыста, нібы выконваў незвычайны рытуал, прысеў, паклаў левую руку з бранзалетам на гладкую пліту паверхні пляца. У правай яго руцэ была заціснутая важкая дэталь ад прыбора настройкі палёў.

Яўген размахнуўся і стукнуў той дэталлю па бранзалеце.

Разам з аскепкамі бранзалета, што стрэльнулі ў розныя бакі, у святым жаху кінуліся ад Яўгена ахоўнікі — яны ніколі яшчэ не бачылі такога надзвычайнага злачынства, амаль што святатацтва. Толькі іх старэйшы застаўся на сваім месцы, і Яўген адчуў, колькі радасці выклікаў ён сваім учынкам у гэтага служакі: арыштаваць за самае страшнае злачынства перад Купалам — што можа быць лепшым для кар'еры!

Яўген не супраціўляўся ніколькі арышту. Ён трымаўся годна і спакойна ўвесь час, пакуль складаліся пратаколы, запаўняліся незлічоныя паперы: дакладная справаздача пра кожнае здарэнне была жыццёва неабходнай для Купала, а тут — здарэнне не проста надзвычайнае, але выключнае...

Дзень пакарання смерцю быў прызначаны ў дзень арышту.

— Савет Кіравання не хоча смерці аднаму з найразумнейшых сваіх інжынераў,— казаў Яўгену суддзя раніцай перад карай.— Скажу вам больш, як асобе не простай: Першы Кіраўнік жадае паказаць людзям сваю дабрыню і чалавекалюбства — мы збіраемся вас памілаваць. Але для гэтага вы павінны сапраўды прызнаць сваю віну, спаслаўшыся на кароткае вар'яцтва з-за напружанай працы. Апрача таго, вы мусіце апавесці, якім страшна самотным і чужым самі сабе сталі ў той момант, калі пазбавіліся бранзалета. Гэта ўсё, што ад вас патрабуецца. Вы вернецеся да сваёй работы, паколькі яна павінная

быць закончана. Праўда, жыць вы будзеце ў іншым месцы, і сям'ю вам завесці не дазволяць. Пакуль... Вам усё зразумела?

— Зразумела.

— Добра. Пасля вашага апошняга слова будзе зачытана рашэнне аб памілаванні.

Калі клетку з Яўгенам паднялі на пляцоўку перад Трубой Смерці, ён адшукаў сярод натоўпу маці. Яна плакала... Але твар яе быў напоўнены цёплым святлом любові і... надзеі. Побач з ёй стаяла Ліна з незвычайна сухімі вачыма.

Вяшчальнік чытаў прысуд суддзяў, а натоўп перад Яўгенам у страху сціскаўся: за апошнія сто гадоў здзейснена найстрашнейшае злачынства супраць Купала — спроба ўтойвання і наўмыснае знішчэнне эмацыйнага бранзалета.

Потым вяшчальнік сказаў, што Яўген можа сказаць свае словы.

Яўген не змог бы выпрастацца ў сваёй клетцы, таму ён проста сеў, перакрыжаваўшы ногі, чым выклікаў гул здзіўлення.

— Людзі! Я — без бранзалета, я не адчуваю вас. І вы не адчуваеце мяне. Але я скажу вам словы, якія ўсе вы зразумееце. Якія адчуеце без бранзалетаў...

Натоўп унізе здрыгануўся і заціх. Цішыня дасягнула крышталёвай мяжы. І Яўген моцным, упэўненым голасам заспяваў:

Дзе неба найсіней,
Пад ім злат-горад ёсць
З празрыстай вострай брамаю
І зорнай яскрынёй.
А ў горадзе тым сад.
Там красак не злічыць.
Звяры там ходзяць гожыя,
Што нельга і ўявіць.
Адзін — агністы жаўтагрывы леў,

Другі — бушлівы шматвачысты вол.
А яшчэ арол там — дзіва-птушка,
Златакрылая і яснавокая...

Ён спяваў у поўнай цішыні, голас яго лунаў над людзьмі, а яны там, унізе, агаломшаныя застылі, і толькі вусны, так, вусны ў многіх ледзь-ледзь уздрыгвалі.

— Шпрыц! Рабі ўпырск! — узарваў цішыню рэзкі загад.

Выканаўца прысуду за спінай Яўгена, вытарашчыўшы вільготныя вочы, стаяў нерухома, калені яго дробна трэсліся, з рукі выслізнуў і пакаціўся ўніз, у цемру Трубы шпрыц.

— Клетку пхай!

Суддзя падбег да лесвіцы, што вяла да пляцоўкі на Трубе Смерці, блытаючыся ў доўгім плашчы, стаў караскацца ўгару. За ім кінулася некалькі ахоўнікаў, палезлі следам.

І тут з натоўпу вырваўся дрыжачы дзявочы голас:

Дзе неба найсінейшае,

У наступны момант да яго далучыўся ўпэўнены голас жанчыны. І ўжо ў два жаночыя галасы прагучаў узнёсла канец радка:

...Там зорка ёсць адна.

Узмацняючыся шматкроць новымі галасамі з кожным словам, узнесліся да Купала другі радок, потым трэці і чацвёрты...

Яна з табой, анёле мой,
З табой заўжды яна.
Хто любіць, той і люб.
Хто светлы, той і свят.
І ты за гэтай зоркаю
Ў дзівосны крочыш сад.

Суддзя ўрэшце дасягнуў пляцоўкі і, люта аддзімаючыся і сапучы, пхнуў клетку ўніз, у чорнае жэрла трубы.

Натоўп здрыгануўся, быццам праз яго — ад кожнага да кожнага чалавека асобна — прайшоў электрычны разрад, імгненна наэлектрызаваўшы людзей, і яны, не ў стане ўправіцца з гэтай наэлектрызаванасцю, сталі цiснуцца адзін да аднаго і да лесвіцы, што вяла да Трубы. Натоўп перастаў быць натоўпам, стаў нечым адным, вялікім, рашучым, і адлегласць паміж гэтым нечым і лесвіцай няўмольна змяншалася...

## ЗМЕСТ

Ксюхіна поле .......... 3
Сертыфікат .......... 67
Вартаўнік, альбо Колцы Орды .......... 123
Game begins! .......... 137
На канале .......... 146
Крама згубленых рэчаў .......... 156
Аўтобус .......... 162
Я размалюю для цябе неба .......... 184

**Гапееў, В. М.**

Г19 Я размалюю для цябе неба: аповесць, п'еса, апавяданні: Рэальнасць, містыка, фантастыка / Валеры Гапееў.— Мінск : Маст. літ., 2013.— 222 с.

ISBN 978-985-02-1377-8.

Рана ці позна кожны чалавек трапляе ў такую сітуацыю, калі неабходна рабіць выбар. Выбар жорсткі, цяжкі, калі крочыць можна толькі ў адзін ці другі бок, калі і адзін і другі крок патрабуюць ахвяры і разумення, пакутлівага пераасэнсавання каштоўнасцей. Добра, калі побач ёсць нехта, хто падкажа, але героі твораў гэтай кнігі застаюцца заўсёды сам-насам з неабходнасцю свайго жыццёвага выраку. У гэтым не толькі трагізм сітуацыі, але і самая сапраўдная школа сталення.

Гэта вельмі важна — зрабіць самастойна і правільна свой першы цяжкі выбар...

**УДК 821.161.3-31/-32**
**ББК 84(4Беи)-44**

Літаратурна-мастацкае выданне

**ГАПЕЕЎ** Валеры Мікалаевіч

Я РАЗМАЛЮЮ ДЛЯ ЦЯБЕ НЕБА

*Аповесць, п'еса, апавяданні*
*Рэальнасць, містыка, фантастыка*

Рэдактар *А. В. Спрынчан*
Мастацкі рэдактар *В. І. Сенчанка*
Тэхнічны рэдактар *В. М. Максімовіч*
Стылістычныя рэдактары *М. М. Адам, Л. Г. Ганчарэнка, М. У. Віцько*

Падпісана да друку 28.08.2013. Фармат 84×108 $^{1}/_{32}$.
Папера афсетная.
Гарнітура GaramondC. Афсетны друк. Умоўн. друк. арк. 11,76.
Улік.-выд. арк. 9,08. Тыраж 2000 экз. Заказ 1650.

Выдавецкае рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства
«Мастацкая літаратура»
Міністэрства інфармацыі
Рэспублікі Беларусь. ЛИ № 02330/0494049 ад 03.02.2009.
Праспект Пераможцаў, 11, 220004, Мінск.
www.mastlit.by; e-mail:mail@mastlit.by

ААТ «Типография «Победа». ЛП № 02330/492 ад 28.01.2013.
Вул. У. Таўлая, 11, 222310, Маладзечна.

ISBN 978-985-02-1377-8

9 789850 213778

Валеры Гапееў

# Я РАЗМАЛЮЮ ДЛЯ ЦЯБЕ НЕБА